Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі
“Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»”
Віцебскага філіяла

Л.С. Васюковіч

ПРАЦА З ТЭКСТАМ ЯК АСНОВА ФАРМІРАВАННЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ В У Ч Н Я Ў

Манаграфія

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2024

УДК 811.161.3’42:028-057.87
ББК 81.411.3-51+78.07
В20

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета Установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі “Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»”. Пратакол № 7 ад 22.01.2024.

Аўтар: дацэнт кафедры правазнаўства і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Віцебскага філіяла установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі “Міжнародны ўніверсітэт “МІТСО”, доктар педагагічных навук **Л.С. Васюковіч**

Р э ц э н з е н т ы :
галоўны навуковы супрацоўнік аддзела лінгвадыдактыкі НМУ “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар педагагічных навук, прафесар *М.Г. Яленскі;*
галоўны навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар *В.К. Мароз*

Васюковіч, Л.С.

В20 Праца з тэкстам як аснова фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў : манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. – 177 с.

ISBN 978-985-30-0097-9.

У манаграфіі даследуецца фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці, вядучым кампанентам якой выступае чытацкая дзейнасць, праца з класічна-традыцыйнымі і сучаснымі малафарматнымі тэкстамі.

Выданне адрасуецца навукоўцам і практыкам сістэмы школьнай адукацыі.

УДК 811.161.3’42:028-057.87
ББК 81.411.3-51+78.07

ISBN 978-985-30-0097-9

© Васюковіч Л.С., 2024
© УА ФПБ “Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»”, 2024
© Афармленне ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024

З М Е С Т

УВОДЗІНЫ 4

I. ФАРМІРАВАННЕ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ ЯК НАВУКОВАЯ І ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМА 8

1.1 Функцыянальная пісьменнасць як выніковы кампанент адукацыйных дасягненняў вучняў 8

1.2 Праблема фарміравання функцыянальнай пісьменнасці ў айчыннай педагогіцы 16

1.3 Трансфармацыя тэксту ў рэчышчы пазнавальных інтарэсаў сучасных навучэнцаў 44

1.4 Патэнцыял малафарматных тэкстаў для развіцця сучасных адукацыйных вынікаў 51

II. ЧЫТАННЕ ЯК КАМПАНЕНТ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ 56

2.1 Чытанне як адукацыйная тэхналогія 56

2.2 Мадэлі далучэння навучэнцаў да чытання: вопыт айчыннай і замежнай школы 73

2.3 Фарміраванне навыкаў асэнсаванага чытання як фактар павышэння функцыянальнай пісьменнасці 89

2.4 Фарміраванне чытацкай пісьменнасці сродкамі беларускамоўнай адукацыйнай прасторы 101

III. ТЭКСТ У РЭЧЫШЧЫ ФАРМІРАВАННЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ: НОВЫ ФАРМАТ 114

3.1 Фотаздымак як тэкст у сучаснай культурнай прасторы 115

3.2 Сістэма заданняў на аснове фотаздымкаў 122

3.3. Праца з рэкламным тэкстам на ўроках мовы 138

3.4 Сістэма заданняў на аснове рэкламнага тэксту 156

3.5 Аўтограф як спецыфічны тып тэксту 166

ЗАКЛЮЧЭННЕ 174

УВОДЗІНЫ

Сённяшні этап развіцця айчыннай лінгвадыдактыкі характарызуецца як поліпарадыгмальны, для якога ўласцівыя сінтэз, гарманізацыя навукова-метадычных падыходаў (сістэмна-дзейнаснага, культуралагічнага, аксіялагічнага, асобасна арыентаванага, кампетэнтнаснага і інш.). Разнастайная панарама падыходаў, ідэй, тэхналогій не можа быць прадстаўлена як адзінавызначальная ў кантэксце сучаснай адукацыі.

Дынамізм грамадскага жыцця, множнатэкставасць асяроддзя, з'яўленне новых тэхналогій, сродкаў сувязі не могуць не ўплываць на педагагічную прастору. Адукацыйная рэальнасць перажывае працэс мадэрнізацыі, што выяўляецца праз:

– змены патрэбнасцей, інтарэсаў, каштоўнасных арыенціраў навучэнцаў;

– абнаўленне зместу адукацыі і дасягненне новай якасці яе вынікаў;

– арыентацыю на гарманічнае, паўнацэннае развіццё асобы.

У кантэксце сённяшніх трансфармацый якасць адукацыі выступае інтэграваным паказчыкам, што ўлічвае "патрэбнасці асобы, грамадства і дзяржавы, патрабаванні рынку працы, інтарэсы ўсіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу… Пры гэтым любая нацыянальная сістэма абавязана рэагаваць на выклікі сучаснага грамадства і ўлічваць міжнародныя тэндэнцыі ў галіне адукацыі". [1] Арыентацыя адукацыйнага асяроддзя на новыя вектары якасці знайшла адлюстраванне ў стандартах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь, у якіх актуалізавана фарміраванне:

метапрадметных вынікаў – развіццё ўніверсальных спосабаў дзейнасці, агульнаінтэлектуальных уменняў, навыкаў праектнай і вучэбна-даследчай працы;

прадметных вынікаў, пазначаных пераходам ад апісальна-рэпрадуктыўных спосабаў засваення матэрыялу да самаарганізацыі самастойнай дзейнасці праз пошук інфармацыі, яе аналіз, сістэматызацыю і інтэрпрэтацыю;

асобасных вынікаў, скіраваных на матывацыю пазнавальных патрэбнасцей, творчых здольнасцей асобы.

Рознааспектнасць накірункаў сучасных адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі аўтар манаграфіі паспрабаваў адлюстраваць у падрыхтаваным выданні. Тэарэтычны і практычны матэрыял даследавання прадстаўляе разнастайнасць аспектаў сучаснай моўнай адукацыі, у канцэнтраваным выглядзе ён арыентаваны на фарміраванне і развіццё функцыянальнай пісьменнасці, вядучымі кампанентамі якой з'яўляюцца чытацкая дзейнасць, культура чытання сучаснай школьнай моладзі, праца з тэкстамі. Кожны з раздзелаў манаграфіі выступае як элемент агульнай кампазіцыі выдання.

[1] Развитие системы оценки качества образования в Республике Беларусь. Общее среднее образование / М.Б. Горбунова [и др.]; под науч. ред. В.Ф. Русецкого. – Минск: НИО, 2022. – С. 9.

У *першай главе* манаграфіі прапанаваны гісторыка-педагагічны аналіз праблемы станаўлення паняцця функцыянальнай пісьменнасці, што разглядаецца як гатоўнасць да прымянення набытых ведаў і сфарміраваных уменняў, якія забяспечваюць камфортнае функцыянаванне асобы ў грамадстве.

Фарміраванне *функцыянальнай пісьменнасці* ў адукацыйных стандартах Рэспублікі Беларусь сфармулявана як стратэгічная задача школьнага навучання: “Дасягненне выпускнікамі ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці запатрабаванае ў сучасным грамадстве як на матэматычным і прыродазнаўчым, так і гуманітарным, сацыякультурным накірунках” [2] . Гэта падразумявае валоданне агульнавучэбнымі ўменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці, кампетэнцыямі, неабходнымі для сацыялізацыі, асэнсаванага і адказнага выбару жыццёвага і прафесійнага шляху. Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці мае на выхадзе рэалізацыю задачы “*навучыць вучыцца*”: навучыць вырашаць пазнавальныя і практычныя праблемы, арыентавацца ў свеце маральных і матэрыяльных каштоўнасцей, працаваць з рознымі тыпамі тэкстаў, наладжваць камунікаванне з членамі групы/каманды/соцыуму; навучыцца арганізоўваць уласную дзейнасць.

Другая глава манаграфічнага даследавання актуалізуе праблему фарміравання чытацкай культуры навучэнцаў, якая набыла як нацыянальнае, так і міжнароднае абмеркаванне. Чытанне ў выданні, услед за знакамітымі педагогамі, метадыстамі, філосафамі, разглядаецца як:

– сродак самаразвіцця, самавыхавання, інтэлектуальнага патэнцыялу асобы (В.А. Барадзіна, Т.Г. Бражэ і інш.);

– стратэгія жыцця (Ю.П. Мяленцьева, Н.М. Смятаннікава і інш.);

– практыка ўзнаўлення культуры (В.К. Громава, Н.Д. Юмашава і інш.);

– духоўная каштоўнасць (Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, Н.А. Стэфаноўская, М.Г. Яленскі і інш.);

– культурна-гістарычная традыцыя (Якуб Колас, В.У. Протчанка, В. Ф. Русецкі і інш.);

– спосаб захавання нацыянальнай ідэнтычнасці (І.А. Бродскі, Н.А. Каракаўцава, В.А. Факееў, І.І. Ціхамірава і інш.).

Так, І.А. Бродскі ў нобелеўскай лекцыі, ацэньваючы ролю чытання ў станаўленні інтэлігентнага чалавека, зазначае: “Сярод злачынстваў супраць літаратуры самае цяжкае – ігнараванне кнігамі, іх не-чытанне. За гэтае злачынства чалавек расплочваецца ўсім сваім жыццём; калі ж гэтае злачынства ўчыняе нацыя – яна разлічваецца за гэта сваёй гісторыяй”[3].

Асобны параграф главы прысвечаны чытанню як адукацыйнай тэхналогіі, што запатрабавала вылучэння этапаў фарміравання навыкаў асэнсаванага чытання. Чытанне выступае разумовым працэсам, паколькі выхаванне паўнацэннага чытача нельга звесці да тэхнікі чытання, да навучання

[2] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023. – С. 36.

[3] Бродский, И. Сочинения: в 4 т. / И. Бродский / сост. Г.Ф. Комаров. – Т. 1. – СПб.: Пушкинский фонд, 1992. – С. 12.

граматыцы. Уменне чытаць падразумявае асобую інтэлектуальную дзейнасць, якая інтэгравана ўключае такія “асобасныя характарыстыкі, як культура меркаванняў, перакананняў, эмоцый, маўлення, эстэтычнага густу, паводзін”[4].

Фарміраванне чытацкай пісьменнасці будзе паспяховым пры ўмове, калі:

– развіццё культуры чытання адбываецца на кожным уроку з выкарыстаннем тэхналогій, адэкватных актуальным патрэбнасцям навучэнцаў;

– у працэсе развіцця культуры чытання прымаюць удзел усе настаўнікі-прадметнікі;

– культура чытання ўспрымаецца педагогамі як самастойны, значымы адукацыйны вынік.

Асобная глава манаграфіі прысвечана новым фарматам тэкстаў у рэчышчы фарміравання функцыянальнай пісьменнасці. Так званыя малафарматныя тэксты (напрыклад, фотаздымак як патэнцыяльны тэкст, рэкламны слоган, аўтограф і інш.) выступаюць кампанентам філалагічнай нацыянальнай культуры. Адрасаванасць малафарматнага тэксту самай шырокай аўдыторыі ўспрымаецца як адлюстраванне культуры/бескультур’я паўсядзённасці, усведамляецца як феномен, неаддзельны ад жыцця соцыуму, яго культуры і гісторыі. У сучасных умовах малафарматныя тэксты паступова перамяшчаюцца ў цэнтр лінгвістычных і педагагічных даследаванняў. Гэта можна патлумачыць наступнымі фактарамі:

– імклівы рост інфармацыі, неабходнасць яе прадстаўлення ў сціслых фарматах;

– высокая ступень сэнсавай арганізацыі тэксту на фоне невялікага аб’ёму;

– адаптаванасць тэкстаў да новых сфер камунікацыі;

– метадычная запатрабаванасць тэкстаў паўсядзённага характару, аформленых у стылістыцы заданняў PISA;

– развіццё лічбавага кантэнту спараджае пошук новых прыёмаў, спосабаў прадстаўлення інфармацыі, адпаведных ідэі “камунікатыўнай, нелінейнай дыдактыкі” (В.Б. Даутава).

Праца з малафарматнымі тэкстамі, іх тэарэтычнае асэнсаванне спрыяюць рэалізацыі патэнцыялу праектнай дзейнасці навучэнцаў, становяцца адпраўным пунктам для вучэбна-даследчых пошукаў. Засваенне падобных тэкстаў паслужыць асновай для факультатыўных курсаў, пасяджэнняў гуртка. Асобныя заданні з прапанаванага практычнага матэрыялу могуць папярэднічаць (або завяршаць) уроку як яго кампанент/фрагмент/пяціхвілінка, развіваць цікавасць да мовы, мабільнасць, гібкасць мыслення, фарміраваць творчыя здольнасці. Прыведзеныя заданні можна расцэньваць як базу для сістэматычнай працы з рознафарматнымі паведамленнямі, што прадугледжвае наступную паэтапнасць: чытанне, уразуменне тэкставай інфармацыі, выяўленне яе жанравых,

[4] Браже, Т.Г. Гуманитарные знания в образовании личности / Т.Г. Браже // Совершенствование школьного образования и проблемы преподавания гуманитарных предметов: сб. науч. ст. – СПб.: С.-Петерб. ун-т, 2000. – 109 с.

стылістычных асаблівасцей, фармуляванне ўласнай пазіцыі, самастойных ацэнак прачытанага.

Кожны раздзел манаграфіі структураваны паводле адзінай схемы, утрымлівае тэарэтычны і практычны блокі, што аблягчае ўспрыманне зместу і дапамагае аналізаваць, класіфікаваць, супастаўляць інфармацыю. Прапанаваны матэрыял арыентаваны на вырашэнне мэтавых арыенціраў сучаснай адукацыі, што абагульнена інтэрпрэтуюцца аўтарам як фарміраванне кампетэнтнаснай асобы, якая засвоіла не толькі прадметныя веды, але і каштоўнасці айчыннай і сусветнай культуры, здольная паўнацэнна функцыянаваць у сучасным грамадстве, валодае высокімі маральнымі якасцямі – духоўнасцю, патрыятызмам, грамадзянскай адказнасцю, ініцыятыўнасцю.

Такім чынам, выданне з'яўляецца падсумоўваннем уласнага і чужога вопыту працы, адным з варыянтаў вырашэння задач айчыннай моўнай адукацыі. Аўтар перакананы: сучасная ўстанова адукацыі зможа выканаць сваю ганаровую місію, высокае прызначэнне, калі будзе выступаць прасторай культуры, эталонам культуры маўленчых зносін (міжасабовых, прафесійных), тэрыторыяй з культурнай аўрай, на якой культывуюцца традыцыі паважлівых і адказных адносін да слова, тэксту, асобы, грамадства.

У інтэлектуальнай прасторы школы, універсітэта роля Педагога не змяншаецца, а ўзрастае, паколькі дзецям неабходны найперш, акрамя сучасных інфармацыйных тэхналогій, разумны, інтэлігентны праваднік, арганізатар, каардынатар, канструктар адукацыйнага асяроддзя, гід у свеце тэарэтычных і эмпірычных ведаў, носьбіт класічных узораў, эталонаў дзейнасці, бо культура асобы выкладчыка прадвызначае ўзровень выхаванасці вучняў. Пагаджаемся, што "пры любой якасці матэрыялаў і рэкамендацый канчатковы адукацыйны вынік будзе залежыць толькі ад асаблівасцей асобы настаўніка, яго педагагічнага стылю, кампетэнтнасці, прафесіяналізму, вопыту, майстэрства" [5]

Мэтавыя арыенціры фарміравання функцыянальнай пісьменнасці прадвызначаюць сферу самастойнасці і адказнасці навучэнцаў, актуалізуюць ключавую задачу – *навучыць вучыцца*, паказчыкамі якой выступаюць уменні:

– арганізоўваць уласную пазнавальную дзейнасць, выбіраць шляхі і сродкі рэалізацыі мэты, узаемадзейнічаць пры яе дасягненні;

– тлумачыць факты і з'явы навакольнага асяроддзя – маўленчага, сацыяльнага, прыроднага, выдзяляць істотныя прыметы, сістэматызаваць і абагульняць іх, выяўляць прычынна-выніковыя сувязі, ацэньваць значнасць, ролю засвоенай інфармацыі;

– арыентавацца ў свеце каштоўнасцей (сацыяльных, маральных, эстэтычных), фармуляваць і параўноўваць вывады, бачыць розніцу ў меркаваннях і ацэнках розных людзей, фарміраваць уласную пазіцыю, выпрацоўваць здольнасць карэктна абгрунтоўваць самастойныя меркаванні.

[5] Теоретико-методологические основания развития дошкольного, общего среднего и специального образования в Республике Беларусь: в 2 ч. Ч.1/Н.П. Баранова [и др.]; под науч. ред. В.Ф.Русецкого. – Минск: Национальный институт образования, 2023. – С. 11.

I. ФАРМІРАВАННЕ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ ЯК НАВУКОВАЯ І ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМА

1.1 Функцыянальная пісьменнасць як выніковы кампанент адукацыйных дасягненняў вучняў

Удасканаленне школьнай адукацыі абумоўлена павышэннем патрабаванняў да яе якасці, што праяўляецца ў функцыянальнай гатоўнасці выпускнікоў вырашаць не толькі пазнавальныя, але і жыццёвыя задачы ў розных сферах дзейнасці. *Якасць ведаў, уменняў, кампетэнцый* як паказчык выніковасці працэсу пазнання адносіцца да ключавых у кантэксце характарыстык стратэгіі развіцця айчыннай сістэмы адукацыі. На думку даследчыкаў, пра гарманічнае развіццё нацыянальнай сістэмы ацэнкі якасці адукацыі сведчаць наступныя крытэрыі: "*Сацыяльна-філасофскія* (змены ў грамадстве, што ўплываюць на каштоўнасныя мадэлі соцыуму); *псіхолага-педагагічныя* (якім павінен быць адукацыйны працэс, каб раскрываць прыродны патэнцыял асобы); *інфармацыйна-кваліметрычныя* (якія ўласцівасці сістэмы падпадаюць пад вымярэнні і з'яўляюцца індыкатарамі для фармулёўкі вывадаў пра якасць сістэмы.[6] На сённяшні дзень, паводле міжнароднага даследавання якасці адукацыі PISA, эталонным крытэрыем узроўню дасягненняў вучняў становіцца іх функцыянальная пісьменнасць, што ўстанаўлівае канцэптуальныя рамкі якасці і вызначае, "у якой ступені 15-гадовыя падлеткі набылі навыкі для паўнацэннага ўдзелу ў жыцці грамадства".[7] Павышаны інтарэс прадстаўнікоў розных прадметных галін да праблем функцыянальнай пісьменнасці школьнікаў зразумелы: менавіта ўзровень асноўных разнавіднасцей пісьменнасці (чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай) служыць індыкатарам якасці засваення праграм адукацыі.

Якасць выступае комплекснай характарыстыкай, што выяўляе ступень адпаведнасці вынікаў стандартам і вучэбным праграмам, у якіх кансалідавана сфармуляваны патрабаванні да адукацыйнага працэсу. Паняцце якасці адукацыі мае дыялектычны характар, абумоўлены імператывамі грамадства на канкрэтным этапе развіцця школы. У сучасных умовах ацэнка якасці падразумявае "комплекс задач, што ажыццяўляюцца на розных узроўнях адукацыйнай сістэмы суб'ектамі пазнавальнага працэсу, з мэтай атрымаць інфармацыю не толькі для ацэнкі дасягненняў вучняў як спосабу іх рэйтынгавання, але і для функцыянавання сістэмы ў цэлым".[8]

---

[6] Теоретико-методологические основы развития национальной системы оценки качества педагогического образования: монография / А.И. Жук [и др.]; под ред. А.И. Жука, А. В. Торховой. – Минск: БГПУ, 2023. – С. 4.

[7] Титовец, Т.Е. PISA-2018 в Республике Беларусь. Общая характеристика исследования. Социокультурный контекст / Т.Е. Титовец, М.Б. Горбунова, О.В. Бурак; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск, 2021. – С. 6.

[8] Развитие системы оценки качества образования в Республике Беларусь. Общее среднее образование / М.Б. Горбунова [и др.]; под науч. ред. В.Ф. Русецкого. – Минск: Нац. ин-т образования, 2022. – С. 5.

Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці заяўлена сёння як адна са стратэгічных задач агульнай сярэдняй адукацыі, паколькі навыкі, набытыя ў школе, паглыбляюцца ў працэсе далейшага навучання асобы. У Рэспубліцы Беларусь на працягу апошніх год адбываецца мадэрнізацыя сістэмы адукацыі, скіраваная на павышэнне яе канкурэнтаздольнасці. Адпаведна ўзрастае неабходнасць вывучэння феномена ў тэарэтычным і прыкладным аспектах з мэтай выявіць спецыфіку паняцця ў розных дыскурсах.

На сённяшні дзень як ніколі "важны выхад да міждысцыплінарнасці, у першую чаргу, праз абмеркаванне і ўлік сучасных геапалітычных тэндэнцый, іх уплыву на сусветную адукацыйную прастору і нацыянальныя сістэмы". [9] У рэчышчы сінтэзу, рухомасці межаў паміж рознымі галінамі ведаў, культуры цяжка ўявіць працы, "ізаляваныя" ад патэнцыяльных паралеляў, кантэкстаў, супастаўленняў. Навізна як дамінанта сучаснага існавання грамадства выклікае патрэбнасць у міждысцыплінарных даследаваннях, прыметам якіх, на думку І.М. Асмалоўскай, выступаюць "агульны прадмет; узаемадапаўненне метадаў; распрацоўка тэарэтычных асноў даследавання; прыналежнасць вынікаў міждысцыплінарнага навуковага даследавання розным галінам навукі". [10] Вывучэнне функцыянальнай пісьменнасці на стыку розных навук валодае ўсімі якасцямі дысцыплінарнага даследавання: прадмет навуковай увагі сканструяваны ў кантэксце некалькіх дысцыплін; сінтэз выкарыстаных паняццяў, метадаў адбываецца ў агульнапедагагічным рэчышчы; веды інтэгруюцца на мяжы розных навуковых галін – філасофіі, псіхалогіі, сацыялогіі, культуралогіі, узроставай фізіялогіі і інш.

Канкрэтызуем аспекты вывучэння функцыянальнай пісьменнасці з улікам яе міждысцыплінарнага статусу. Найперш адзначым *культурна-гістарычны характар* паняцця функцыянальнай пісьменнасці. Даследчыкі прыходзяць да адназначнага вываду пра залежнасць пісьменнасці ад узроўню тэхналагічнага і культурнага развіцця грамадства (А. Е. Лебедзеў, Л.М. Палішчук, П.І. Фралова і інш.). Пры гэтым змест паняцця эвалюцыянаваў на працягу станаўлення чалавецтва, паколькі разуменне пісьменнасці непасрэдна дыктуецца ўзроўнем духоўнай культуры соцыуму. Натуральна, што ўяўленне пра функцыянальную пісьменнасць у розныя гістарычныя перыяды залежыць ад здольнасці асобы да паспяховай сацыялізацыі і адаптацыі на рынку працы. На думку айчынных вучоных, станаўленне паняцця адбывалася пад уплывам працэсаў глабалізацыі і праходзіла тры ступені: "… як праблема элементарнай пісьменнасці, што найперш мела адносіны да краін у стадыі развіцця; як праблема функцыянальнай пісьменнасці ў індустрыяльна развітых краінах; як праблема дасягнення новага парога пісьменнасці, абумоўленага імклівым развіццём грамадства". [11]

---

[9] Иванова, С.В. Современные направления компаративных исследований образовательного пространства / С.В. Иванова // Педагогика. – 2016. – № 7. – С. 108.

[10] Осмоловская, И.М. Дидактика: от классики к современности: монография / И.М. Осмоловская. – М.; СПб.: Нестор-История, 2020. – С. 58–59.

[11] Фридман, Л.С. Анализ ситуации. Запрос на функциональную грамотность / Л.С. Фридман, В.Ф. Малаш // Майстэрства. – 1997. – № 2. – С. 29.

Эвалюцыя лексічнага значэння слова, на думку Л.М. Палішчук, пачыналася ад агульнай трактоўкі пісьменнасці “як здольнасці асобы чытаць, разумець і складаць простыя сціслыя тэксты, што мелі адносіны да паўсядзённага жыцця”, да больш шырокага разумення – “набор ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для нармальнай жыццядзейнасці чалавека”.[12]

На *філасофскім узроўні* функцыянальная пісьменнасць разглядаецца як лагічны этап непарыўнага развіцця чалавека, як “культурны стандарт” функцыянавання грамадства (Б.С. Гершунскі, С.А. Крупнік, У.У. Мацкевіч, В.А. Ярмоленка і інш.). У агульнафіласофскім плане функцыянальная пісьменнасць усведамляецца беларускімі даследчыкамі С.А. Крупнік і У.У. Мацкевічам як “мера гуманітарнага развіцця нацыі, краіны або групы людзей. Толькі ў такім варыянце пісьменнасць можа выступаць у якасці паказчыка развіцця асобнага чалавека”.[13] Вучоныя лічаць, што адказнасць за паспяховыя вынікі фарміравання пісьменнасці павінна раздзяляць не толькі школа, але і грамадства. У манаграфіі (2008 год) С.А. Крупнік і У.У. Мацкевіч прапанавалі праграму развіцця функцыянальнай пісьменнасці ў Беларусі на 2000–2010 гады. Варта зазначыць, што падобныя працы выклікалі ўстойлівы навуковы інтарэс да праблемы сярод шырокага кола педагагічнай грамадскасці, тэарэтыкаў і практыкаў у галіне адукацыі. Дзякуючы менавіта гэтым даследаванням паняцце функцыянальнай пісьменнасці атрымала зместавае напаўненне ў слоўнікавых артыкулах лексікаграфічных прац (дарэчы, гэта зроблена раней за рускамоўныя слоўнікі, якія і па сённяшні дзень непаслядоўна фіксуюць тэрмін нават у педагагічных выданнях). Яшчэ ў 2010 годзе тэзаўрус сацыялагічных даследаванняў папоўніўся асобным артыкулам, у якім функцыянальная пісьменнасць раскрываецца як “здольнасць чалавека ўступаць у адносіны са знешнім асяроддзем і максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім. У адрозненне ад элементарнай пісьменнасці як здольнасці чытаць, разумець, складаць простыя сціслыя тэксты і ажыццяўляць найпрасцейшыя арыфметычныя дзеянні, функцыянальная пісьменнасць ёсць атамарны ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў, што забяспечвае нармальнае функцыянаванне ў сістэме сацыяльных зносін і які лічыцца мінімальна неабходным для жыццядзейнасці асобы ў канкрэтным культурным асяроддзі”.[14] Пазней, у 2015 годзе, слоўнікавы артыкул “Функцыянальная пісьменнасць дарослага” з’явіўся ў “Беларускай педагагічнай энцыклапедыі”. Паняцце кантэкстуалізуецца як “здольнасць чалавека ўступаць у адносіны са знешнім асяроддзем і максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім; як мінімальны ўзровень валодання знакавымі сістэмамі, што дазваляе дарослым рэалізаваць свае сацыяльныя функцыі, забяспечваць камфортную жыццядзейнасць, сацыяльны статус і самарэалізацыю ў грамадстве. У цэлым

[12] Полищук, Л.Н. Функциональная грамотность: сущность и становление: монография / Л.Н. Полищук. – Мозырь: МГПУ им. И.П. Шамякина, 2008. – С. 17.

[13] Крупник, С.А. Функциональная грамотность в системе образования Беларуси / С.А. Крупник, В.В. Мацкевич. – Минск: Акад. последипломн. образования, 2003. – С. 16.

[14] Мацкевич, В.В. Функциональная грамотность / В.В. Мацкевич, С.А. Крупник // Новейший социологический словарь / сост. А.А. Грицанов [и др.]. – Минск: Книжный Дом, 2010. – С. 1185–1186.

функцыянальная пісьменнасць дарослых характарызуе здольнасць чалавека жыць і ўзаемадзейнічаць у пэўных цывілізацыйных умовах, гэта азначае, што яго веды аб навакольным жыцці і мове зносін фарміруюць уменне – быць паспяховым". [15] Філасофскае асэнсаванне функцыянальнай пісьменнасці ўзмацніла гуманітарную састаўную паняцця, што дазваляе аналізаваць сучасную сітуацыю ў сацыякультурным кантэксце і прымаць абгрунтаваныя, рацыянальныя рашэнні ў розных сферах дзейнасці.

Сацыяльны аспект паняцця функцыянальнай пісьменнасці прымаўся пад увагу першасна, паколькі ўзнікненне гэтага феномена тлумачыцца ўздзеяннем сацыяльных фактараў. Яшчэ ў 1979 годзе ЮНЕСКА характарызавала функцыянальна пісьменнага чалавека наступным чынам: ён свабодна карыстаецца чытаннем, пісьмом і матэматычнымі падлікамі, не толькі развівае свае індывідуальныя здольнасці, але і садзейнічае далейшаму развіццю сацыяльнага акружэння.[16] Сацыяльны кантэкст даследаванняў функцыянальнай пісьменнасці прысутнічаў і надалей у змесце дакументаў такіх міжнародных арганізацый, як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Напрыклад, 1990-ты быў аб'яўлены ЮНЕСКА Міжнародным годам пісьменнасці. Генеральная Асамблея ААН абазначыла 2003–2012 гады прысвечанымі 10-годдзю пісьменнасці. З мэтай дасягнення ўсеагульнай адукацыі ААН прыняла рэзалюцыю "Десятилетие грамотности ООН: образование для всех" (2009 год). У дакуменце выразна акрэслівалася характарыстыка функцыянальна пісьменнага чалавека – гэта паўнацэнны і эфектыўны ў функцыянальным плане бацька (маці), грамадзянін, член грамадства. [17] У сацыяльным кантэксце *функцыянальная пісьменнасць* на сённяшні дзень разумеецца як грамадская практыка, што спадарожнічае культурнаму супольніцтву, ацэньваецца як аснова развіцця чалавечага капіталу ва ўмовах глабалізацыі, як індыкатар эканамічнага ўзроўню краіны, паказчык эфектыўнага функцыянавання рынку працы з высокай канкурэнцыяй. Варта пагадзіцца з Л.М. Палішчук, што сучаснае разуменне функцыянальнай пісьменнасці ўключае "падрыхтоўку чалавека да прафесійнай і рознага віду сацыяльнай дзейнасці, паколькі катэгорыі пісьменнасці належыць статус ключавога паняцця ў тэорыі дзейнасці сацыяльнага суб'екта". [18] Адпаведна асновай, базісам функцыянальнай пісьменнасці выступае гатоўнасць і здольнасць канструктыўна ўзаемадзейнічаць у соцыуме, якія фарміруюцца на базе ведаў, уменняў, вопыту самастойнай грамадскай практыкі.

Да інтэрпрэтацыі аспектаў функцыянальнай пісьменнасці актыўна далучаюцца працы, выкананыя ў *псіхалагічным рэчышчы* (А.Г. Асмолаў, К.М. Паліванава, М.А. Халодная, А.А. Юрына і інш.). Псіхалагічныя даследаванні (Н.Ф. Галаванава, І.У. Дубровіна, Л.С. Калмагорава, А.В. Мудрык,

[15] Кошель, Н.Н. Функциональная грамотность взрослого / Н.Н. Кошель// Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. / Н.П. Баранова [и др.]. – Минск: АіВ, 2015. – Т. 2. – С. 478–479.
[16] ЮНЕСКО. Акты генеральной конференции. Двадцатая сессия. – М.: ЮНЕСКО, 1979. – С. 9.
[17] Десятилетие грамотности ООН: образование для всех. – М.: ЮНЕСКО, 2009. – С. 5.
[18] Полищук, Л.Н. Функциональная грамотность: сущность и становление: монография / Л.Н. Полищук. – Мозырь: МГПУ им. И.П. Шамякина, 2008. – С. 27.

В.С. Мухіна, А.А. Рэан, М.А. Халодная і інш.) раскрываюць асаблівасці сацыялізацыі асобы на розных узроставых этапах яе станаўлення, што падразумявае вопыт рашэння жыццёвых задач як кампанента функцыянальнай пісьменнасці, практыку асэнсавання праблем, з якімі сустракаюцца навучэнцы ў рэальным жыцці. Назапашванню станоўчага вопыту сацыяльных адносін спрыяе псіхалагічная пісьменнасць як “веды і сродкі, што дазваляюць чалавеку свядома, рацыянальна адносіцца да сябе і акружэння, ведаць, разумець і ўлічваць свае індывідуальныя магчымасці і асаблівасці”.[19]

Перад установамі адукацыі фармулюецца задача фарміравання асобы з развітымі духоўна-маральнымі каштоўнасцямі, здольнай да рэфлексіі ўласных магчымасцей, псіхалагічна падрыхтаванай да “дарослага” жыцця. У адукацыйных стандартах указваецца, што мэтамі агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляюцца: фарміраванне асобы навучэнца, яе сацыяльных кампетэнцый і маральнай сталасці, развіццё кампетэнцый сацыяльнага ўзаемадзеяння, улік спецыфікі псіхафізічнага развіцця.[20]

Псіхалагічная пісьменнасць мае на ўвазе не толькі веды аб сусвеце, прыродзе і людзях, але і пазнанне суб’ектам самога сябе – сваіх здольнасцей, інтарэсаў, жаданняў, асэнсаванне ўласнага статусу. На этапе ўключэння ў сацыяльнае акружэнне важна падтрымаць імкненне да самапазнання, самавызначэння жыццёвых перспектыў. Пазітыўным вынікам працэсу будзе свядомая дзейнасць да самааналізу, самакантролю, устойлівая адэкватная самаацэнка. Псіхалагічная пісьменнасць выступае ўмовай паўнацэннага маральнага развіцця асобы, у кантэксце якога фарміруецца індывідуальная іерархія каштоўнасцей, адбываецца прызнанне ідэалаў, традыцый, норм, характэрных для культурнага акружэння, прымяненне да сябе тых жа крытэрыяў, што і да іншых, пры гэтым акцэнтуецца здольнасць улічваць уласныя і чужыя патрэбнасці, інтарэсы. Адэкватныя псіхалагічныя ўстаноўкі забяспечваюць дасягненне выпускніком асобасных вынікаў засваення адукацыйных праграм. Сфарміраваная псіхалагічная пісьменнасць як фактар сацыялізацыі асобы навучэнца дапамагае “праходзіць шлях ад самаўспрымання праз самасцвярджэнне да самавызначэння, сацыяльна адказных паводзін і самарэалізацыі”.[21]

У кантэксце псіхалагічных работ найбольш доказнай уяўляецца пазіцыя М.А. Халоднай, перакананай, што тлумачэнне функцыянальнай пісьменнасці празмерна пашырылася ў параўнанні з першапачатковым, выйшла з рэчышча вузкага практычнага прымянення ў больш шырокую сферу – агульнакультурную. На думку псіхолага, асноўныя рысы функцыянальнай пісьменнасці абмежаваны сацыяльным вопытам, скіраваны на вырашэнне

[19] Дубровина, И.В. Современное образование: проблемы и поиски / И.В. Дубровина // Известия Российской академии наук. – 2019. – № 3. – С. 68.

[20] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[21] Шамионов, Р.М. Личность и её становление в процессе социализации / Р.М. Шамионов. – Саратов: Саратовский пед. ин-т, 2010. – С. 82.

бытавых праблем, выступаюць сітуатыўнай характарыстыкай (паколькі праяўляюцца ў канкрэтных сацыяльных абставінах), абумоўленай рашэннем стандартных, стэрэатыпных задач, звязаных з элементарным (базавым) узроўнем навыкаў чытання і пісьма; непасрэдна суадносяцца з ацэнкай якасці адукацыі дарослых людзей, выкарыстоўваюцца пераважна ў кантэксце спосабаў ліквідацыі функцыянальнай непісьменнасці.[22]

Перспектыўнай бачыцца ідэя М.А. Халоднай адносна аднамернай арыентацыі на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці. Аднабаковая ацэнка з'явы можа прымітызаваць мэты школьнай адукацыі і перашкодзіць станаўленню гарманічна развітай асобы. Прыярытэтам адукацыі, на думку даследчыцы, павінна быць інтэлектуальнае выхаванне, паколькі здольнасці людзей з'яўляюцца самай эфектыўнай крыніцай чалавечай цывілізацыі. З гэтай прычыны "ў эканамічным і культурным спаборніцтве будуць выйграваць тыя краіны, што змогуць стварыць найбольш дасканалую сістэму адукацыі, якая гарантуе паўнацэннае развіццё разумовых магчымасцей навучэнцаў".[23]

Прызнаючы неабходнасць быць у метадычным "трэндзе" міжнародных дасягненняў, мы падзяляем пазіцыю вучоных, якія выказваюць трывогу адносна ўстановак сучаснай школы выключна на адукацыйныя паказчыкі. Лічым, што акцэнт варта рабіць не толькі на функцыянальнай пісьменнасці, кампетэнцыях, уменнях. Задачай адукацыі павінна выступаць фарміраванне асобы, што валодае ведамі, уменнямі, вопытам, маральнымі якасцямі, характарызуецца ўласнай пазіцыяй. Так, І.А. Зімняя справядліва сцвярджае: галоўнае ў працэсе навучання – "гэта сам чалавек, яго вопыт як сукупнасць сфарміраваных інтэлектуальных якасцей, ведаў і ўменняў, што дазваляюць адэкватна дзейнічаць на іх аснове ў любой сітуацыі".[24] Паводле перакананння В.І. Слабодчыкава, вынікам становіцца інтэграваная характарыстыка чалавека, які "з'яўляецца мэтай і асноўным крытэрыем эфектыўнасці сістэмы адукацыі".[25]

Мы прытрымліваемся думкі названых даследчыкаў і сцвярджаем, што ў цэнтры сучасных адукацыйных рэалій павінен быць сам навучэнец, а не набор кампетэнцый, разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці. Выпускнік спасцігае сістэму ведаў, спосабы дзейнасці, вучыцца бачыць і аналізаваць праблемы, жыццёвыя сітуацыі як задачы, што падразумяваюць пошук і рэалізацыю аптымальных варыянтаў рашэння. Аднак найперш ён усведамляе сябе асобай, носьбітам нацыянальных і культурных каштоўнасцей, "становіцца суб'ектам уласнага развіцця".[26]

---

[22] Холодная, М.А. Приоритеты современного школьного образования: способность адаптироваться к социуму или интеллектуальное развитие и воспитание? / М.А. Холодная // Психология и современное российское образование: материалы IV Всероссийского съезда психологов России, Москва, 8–12 декабря 2018 г. – М., 2018. – С. 14.

[23] Гельфман, Э.Г. Психодидактика школьного учебника. Интеллектуальное воспитание учащихся / Э.Г. Гельфман, М.А. Холодная. – СПб.: Питер, 2016. – С. 62.

[24] Зимняя, И.А. Педагогическая психология: учебное пособие / И.А. Зимняя. – М.: МПСИ, 2010. – С. 59.

[25] Слободчиков, В.И. Психология развития человека. Развитие субъективной реальности в онтогенезе: учебное пособие / В.И. Слободчиков, Е.И. Исаев. – М.: Школьная пресса, 2000. – С. 121.

[26] Бушная, Н.В. Формирование социальной культуры старшеклассников в условиях воспитательного пространства школы мегаполиса: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / Н.В. Бушная. – Минск, 2013. – С. 14.

Аналіз развіцця паняцця ў кантэксце міждысцыплінарнага падыходу дае магчымасць выявіць яго шматмерны статус. Вызначальнымі для функцыянальнай пісьменнасці з'яўляюцца наступныя аспекты:

– дэфініцыя функцыянальнай пісьменнасці павінна будавацца з улікам не толькі педагагічных, але і псіхалагічных, сацыяльных, дзейнасных параметраў;

– зместавае поле праблемы развіваецца пад уплывам сучаснай адукацыйнай практыкі, адпаведнасць новым дыдактычным арыенцірам патрабуе праектавання працэсу навучання на актуальнай тэарэтычнай аснове;

– даследаванні функцыянальнай пісьменнасці маюць, як правіла, полідысцыплінарны характар, таму павінны выкарыстоўвацца вынікі "рэсурсных" дысцыплін (філасофскіх, сацыялагічных, мовазнаўчых, педагагічных, псіхалагічных);

– паняційнае поле праблемы пашыраецца ў каардынатах развіцця сучаснага грамадства, навукі, культуры, змяненняў інфармацыйных патрэбнасцей суб'ектаў працэсу пазнання, у выніку чаго з'яўляюцца новыя віды пісьменнасці, нараджаюцца класіфікацыі, сістэматызуецца назапашаны эмпірычны матэрыял, што спараджае "часавы кантэкст" разумення паняцця;

– у залежнасці ад аспекту аналізу функцыянальная пісьменнасць можа быць прадстаўлена ў розных інтэрпрэтацыях: як устойлівая характарыстыка асобы; норма культурных форм існавання чалавека і разнавіднасцей грамадскіх адносін; паказчык якасці агульнай і прафесійнай адукацыі; своеасаблівы "цэнз" на ўваходжанне ў пэўныя сацыяльныя групы; мера якасці жыцця; асаблівасці развіцця сацыяльна-эканамічнай сістэмы;

– функцыянальная пісьменнасць выступае інтэграваным індыкатарам адукацыйных дасягненняў, што характарызуе патрэбнасці асобы, грамадства і дзяржавы. З улікам працэсаў інтэграцыі ўзровень функцыянальнай пісьменнасці павінен вызначацца праз супастаўленне з міжнароднымі паказчыкамі;

– дыялектычны характар разумення функцыянальнай пісьменнасці абумоўлены культурна-гістарычным кантэкстам, у якім адбываецца развіццё паняцця. Прадэманструем працэс дыялектыкі паняцця на прыкладзе прац аднаго даследчыка ў храналагічным парадку. Так, на пачатку распрацоўкі праблемы паняцце разумелася А.А. Лявонцьевым як элементарная пісьменнасць (1969 год): "Навучанне пісьменнасці (чытанню і пісьму) ёсць свайго роду рэальная прапедэўтыка ўсіх іншых прадметаў. Калі засвойваецца гэтая грамата, школьнік атрымлівае неабходны сродак валодання нямоўнымі ведамі".[27] У пошуках сутнасці на фоне разнастайнасці праяўленняў паняцця даследчык з часам прапануе канкрэтызаванае азначэнне пісьменнасці. У кантэксце паглыблення паняцця, спасціжэння яго шматграннага характару знакаміты вучоны прыходзіць да вываду, што "функцыянальная пісьменнасць ёсць уменне вырашаць жыццёвыя задачы і праблемы".[28]

[27] Леонтьев, А.А. Язык, речь, речевая деятельность / А.А. Леонтьев. – М.: Просвещение, 1969. – С. 165.
[28] Леонтьев, А.А. Место психологии чтения в современной науке о чтении / А.А. Леонтьев // Проблемы социологии и психологии чтения: сб. науч. ст. /ред. Э.Г. Храстецкий. – М.: Книга, 1975. – С. 39–46.

З часам даследчык выяўляе спецыфіку функцыянальнай пісьменнасці праз супастаўленне з фармальнай: “Калі фармальная пісьменнасць – гэта валоданне навыкамі і ўменнямі тэхнікі чытання, то функцыянальная пісьменнасць – гэта здольнасць чалавека свабодна выкарыстоўваць гэтыя навыкі, атрымліваць інфармацыю з рэальнага тэксту – для яго разумення, скарачэння, трансфармацыі” (2002 год);[29]

– вывучэнне праблемы функцыянальнай пісьменнасці павінна мець сістэмны, полідысцыплінарны характар. Б.С. Гершунскі яшчэ ў 1990 годзе пісаў: “Немагчыма вырашаць праблему пісьменнасці, застаючыся на вузкаведамасных, уласна педагагічных пазіцыях, як і на пазіцыях так званых грамадскіх прыярытэтаў, якія часта падмяняюць строгі навуковы аналіз публіцыстычнымі дэкларацыямі, ускладненым стылем паспешлівых рашэнняў любой складанай праблемы”[30];

– паняцце функцыянальнай пісьменнасці мае дыскурсіўны, непарыўны ў часе характар. На думку Г.П. Зінчанкі, “чалавека немагчыма навучыць раз і на ўсё жыццё. Нават самая лепшая ўстанова адукацыі не можа даць веды сваім вучням у поўным аб’ёме. Затое патрабуецца ўменне іх своечасова атрымліваць і правільна выкарыстоўваць. З гэтай прычыны важна сфарміраваць у кожнага патрэбнасць да бесперапыннай адукацыі, навыкі самастойнага здабывання ведаў, уменне ўключаць новыя веды ў сістэму засвоеных”.[31]

Такім чынам, функцыянальная пісьменнасць трактуецца як інтэграванае ўтварэнне, што фарміруецца на працягу ўсяго жыцця і выступае характарыстыкай асобы, з’яўляецца вынікам развіцця, абумоўленым сацыяльнымі, асобаснымі фактарамі адукацыйнай прасторы. Функцыянальны кантэкст засваення ведаў, сфарміраванасць уменняў і навыкаў у значнай ступені прадвызначаюць жыццёвы і сацыяльны поспех чалавека.

Новыя вектары ў развіцці грамадства актуалізуюць сацыяльны, адукацыйны, асобасны і практыка-арыентаваны кампаненты паняцця. Акцэнтуецца сацыяльная састаўная, што праецыруе самавызначэнне асобы, асэнсаванне ўласнай значнасці, ролі ў жыцці і грамадстве. Практычны кампанент абумоўліваецца назапашваннем сацыяльнага і культурнага вопыту навучэнцаў. Істотным складнікам выступаюць якасці і характарыстыкі асобы, якія дазваляюць эфектыўна дзейнічаць у соцыуме – камунікатыўнасць, адказнасць, крэатыўнасць, уменне наладжваць дыялог як аснову для паўнацэннага ўзаемадзеяння з іншымі членамі грамадства, уменні арганізоўваць уласную дзейнасць і прадбачыць, ацэньваць яе вынікі.

Актуалізацыя праблемы фарміравання функцыянальнай пісьменнасці прадвызначае скіраванасць сучаснай адукацыі не толькі на прадметныя, але і на метапрадметныя, асобасныя вынікі навучэнцаў.

---

[29] Леонтьев, А.А. От психологии чтения к психологии обучения чтению / А.А. Леонтьев // Чтение как социально-педагогическая проблема: материалы V Международной научно-практической конференции, Москва, 26-28 марта 2001 г.: в 2 ч. – Ч. I. – М., 2002. – С. 112.

[30] Гершунский, Б.С. Грамотность для XXI века / Б.С. Гершунский // Педагогика. – 1990. – № 4. – С. 63.

[31] Зинченко, Г.П. Универсальный способ деятельности / Г.П. Зинченко // Педагогика. – 1990. – № 4. – С. 67.

1.2 Праблема фарміравання функцыянальнай пісьменнасці ў айчыннай педагогіцы

Арыентацыя на фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў замацавана ў “Адукацыйных стандартах агульнай сярэдняй адукацыі”, зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.12.2018 года № 125, у “Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года” (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 02.12.2021 года № 683). Названыя нарматыўныя дакументы вызначаюць перспектывы і накірункі ўдасканалення агульнай сярэдняй адукацыі з улікам “распрацоўкі галіновай навукова-тэхнічнай праграмы “Функцыянальная пісьменнасць” [32] . Паспяховае дасягненне сфармуляваных канцэптуальных задач падразумявае такі ўзровень развіцця сістэмы адукацыі, які “адпавядае сучасным цывілізацыйным выклікам і прагназуе апераджальны характар пераўтварэнняў у галіне педагагічнай навукі і адукацыйнай практыкі”. [33] Згодна з адукацыйнымі стандартамі ў Рэспубліцы Беларусь, адной з вядучых мэт выступае “*дасягненне* выпускнікамі *ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці*, неабходнай у сучасным грамадстве як па матэматычным і прыродазнаўчым, так і па гуманітарным і сацыякультурным накірунках, валоданне агульнымі ўменнямі, навыкамі, спосабамі дзейнасці, кампетэнцыямі, неабходнымі для сацыялізацыі свядомага і адказнага выбару жыццёвага і прафесійнага шляху”.[34] Якія ж трансфармацыі адбываюцца ў айчыннай педагогіцы ў кантэксце фарміравання функцыянальнай пісьменнасці?

На нашу думку, праблема, заяўленая ў вызначальных дакументах, мае на ўвазе вырашэнне першачарговых задач:

– асэнсаванне ролі і статусу функцыянальнай пісьменнасці ў працэсе фарміравання метапрадметных кампетэнцый вучняў;

– фармулёўка прыярытэту кампетэнтнасных вынікаў навучэнцаў на фоне прадметных ведаў;

– рэалізацыя зместу адукацыі праз міждысцыплінарнае бачанне праблемы, вырашэнне якой “не знаходзіцца ў плоскасці адной канкрэтнай дысцыпліны. Відавочна, што ў грамадстве развітых тэхналогій любая дзейнасць заснавана на інтэграцыі ведаў і вопыту”[35];

– вызначэнне характару ўзаемадзеяння суб’ектаў адукацыйнага працэсу ў кантэксце калектыўнай дзейнасці, супрацоўніцтва, наладжвання дыялогу;

---

[32] Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda/%D0%BA%D0%BE%D0%BD%D1%86%D0%B5%D0%BF%D1%86%D0%B8%D1%8F.pdf. – Дата доступа: 12.08.2023.

[33] Русецкий, В.Ф. Перспективные фундаментальные научные исследования Национального института образования / В.Ф. Русецкий, О.В. Зеленко // Веснік адукацыі. – 2021. – № 4. – С. 6.

[34] Образовательные стандарты Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[35] Тагунова, И.А. Междисциплинарное содержание общего образования: концептуальные подходы / И.А. Тагунова // Педагогика. – 2023. – № 5. – С. 115–122.

– дамінаванне ў адукацыйным працэсе прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці – практыка-арыентаванай, даследчыцкай, праектнай;

– фарміраванне “мягкіх” навыкаў, якія забяспечваюць камфортную жыццядзейнасць асобы ў грамадстве;

– развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу навучэнца як умовы паспяховай сацыялізацыі і асобаснага росту на працягу жыцця.

Трэба зазначыць, што па меры тэарэтычнага асэнсавання праблема функцыянальнай пісьменнасці паступова пераводзіцца ў практычны кантэкст, што надае яе вырашэнню выразны дзейнасны характар. Так, у найноўшых айчынных метадычных дапаможніках для настаўнікаў-прадметнікаў паслядоўна з’яўляюцца раздзелы (параграфы), прысвечаныя спасціжэнню зместу, структуры і сутнасным характарыстыкам функцыянальнай пісьменнасці. Напрыклад, у гласарыі да вучэбнага выдання “Настольная кніга настаўніка гісторыі” азначэнне паняцця падаецца наступным чынам: “Функцыянальная пісьменнасць – вынік авалодання сістэмай кампетэнцый, якія дазваляюць эфектыўна ўжываць засвоеныя веды ў практычнай сітуацыі, здольнасць уступаць у адносіны з навакольным асяроддзем і максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім… Функцыянальная пісьменнасць уяўляе сабой вынік авалодання сістэмай прадметных кампетэнцый”.[36]

Спашлёмся яшчэ на прыклады. У вучэбна-метадычным дапаможніку для настаўнікаў матэматыкі функцыянальная пісьменнасць трактуецца як “інтэгральная якасць асобы, што фарміруецца з акцэнтаваннем на інварыянтных састаўных паняцця: чытацкая, матэматычная і прыродазнаўчая пісьменнасць”.[37] У якасці спосабаў дасягнення функцыянальнай пісьменнасці вучняў аўтар разглядае рашэнне комплексных заданняў праз мадэляванне прадметнага і сацыяльнага зместу пазнавальнай дзейнасці. Кантэкст падобных задач праецыруе ўмовы прымянення ведаў пры вырашэнні праблем з рэальнага жыцця навучэнцаў (пазнавальная, бытавая і грамадская сферы). На думку даследчыцы, для фарміравання матэматычнай пісьменнасці кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні павінны разглядацца праз прызму канцэптуальнага падыходу, які рэалізуе базісныя матэматычныя ідэі: *прастора і формы, пераменныя, колькасныя адносіны, змяненне і залежнасць* і інш. Пошукі аптымальнага рашэння падобных задач актуалізуюць веды навуковага і практычнага характару, акцэнтуюць поліварыянтнасць адказаў навучэнцаў.

Сучасны стан айчынных даследаванняў праблемы прадстаўлены найперш набыткамі супрацоўнікаў Навуковай метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навуковы калектыў установы валодае багатым вопытам правядзення даследаванняў у сферы адукацыі. Так, В.Ф. Русецкі, В.У. Зелянко фармулююць задачу фарміравання функцыянальнай пісьменнасці з пазіцыі прыярытэтаў дзяржаўнай

[36] Корзюк, А.А. Настольная кніга настаўніка гісторыі: вучэб. дапаможнік / А.А. Корзюк. – Мінск: АіВ, 2023. – С. 261.

[37] Пирютко, О.Н. Методика преподавания математики в 5–6 классах. Функциональная грамотность / О.Н. Пирютко. – Минск: АіВ, 2023. – С. 14–15.

адукацыйнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Пад функцыянальнай пісьменнасцю даследчыкі разумеюць найперш “здольнасць і гатоўнасць да прымянення ў разнастайных жыццёвых сітуацыях атрыманых ведаў і сфарміраваных уменняў”. [38] Вучоныя акрэсліваюць круг кампетэнцый для сучаснага выпускніка: здольнасць комплексна вырашаць праблемы, каардынаваць свае дзеянні з іншымі людзьмі, узаемадзейнічаць з імі, фармуляваць уласныя разважанні, прымаць на іх аснове рашэнні; валодаць крытычным мысленнем, крэатыўнасцю, эмацыянальным інтэлектам.[39]

Аўтары адзначаюць, што навуковыя даследаванні па праблеме функцыянальнай пісьменнасці праводзіліся ў рэспубліцы з канца XX стагоддзя на ўзроўні выканання дзяржаўных праграм: “Вызначэнне зместу функцыянальнай пісьменнасці ў сістэме адукацыі Беларусі” (Нацыянальны інстытут адукацыі, 1998 год); “Распрацоўка праектаў і праграм рэалізацыі канцэпцыі забеспячэння функцыянальнай пісьменнасці ў сістэме адукацыі Беларусі” (Рэспубліканскі інстытут паслядыпломнай адукацыі, 1999 год). Гэтыя праграмы напачатку мелі дачыненне ў асноўным да сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі, паколькі на той час феномен функцыянальнай пісьменнасці трактаваўся, як правіла, у кантэксце адукацыі дарослых. Спецыфіка паняцця зафіксавана ў слоўнікавым артыкуле “Беларускай педагагічнай энцыклапедыі” (2015 г.).

В.Ф. Русецкі і В.У. Зелянко разглядаюць праблему фарміравання функцыянальнай пісьменнасці як стратэгічную дзяржаўную задачу ў сферы сучаснай адукацыі. З мэтай павышэння якасці беларускай адукацыі і яе ацэнкі ў супастаўленні з узроўнем у іншых краінах зацверджана галіновая навукова-тэхнічная праграма “Функцыянальная пісьменнасць”, разлічаная на 2021–2025 гады, задачы якой акрэслены наступным чынам: “Распрацаваць канцэптуальныя асновы фарміравання функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў з улікам аналізу і абагульнення айчыннага і замежнага навуковага і адукацыйнага вопыту; распрацаваць патрабаванні да адукацыйных вынікаў навучэнцаў, якія дэманструюць гатоўнасць да функцыянальнай пісьменнасці, і ўзроўні яе сфарміраванасці. Распрацаваць нацыянальныя вучэбна-дыягнастычныя матэрыялы па вучэбных прадметах па адукацыйных галінах, скіраваныя на развіццё функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў і падрыхтоўку педагагічных работнікаў па яе фарміраванні”.[40] У якасці вынікаў выканання галіновай праграмы “Функцыянальная пісьменнасць” запланаваны публікацыі – манаграфіі, серыі навуковых артыкулаў у беларускіх і замежных выданнях, абароны дысертацый. Рэалізаваная праграма аб’ектыўна адлюструе нацыянальныя адукацыйныя рэаліі ў кантэксце міжнародных патрабаванняў да сфарміраванасці функцыянальнай пісьменнасці. У рэчышчы заяўленай

[38] Русецкий, В.Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В.Ф. Русецкий, О.В. Зеленко // Веснік адукацыі. – 2020. – № 9. – С. 18.

[39] Русецкий, В.Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В.Ф. Русецкий, О.В. Зеленко // Веснік адукацыі. – 2020. – №10. – С. 16.

[40] Русецкий, В.Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В.Ф. Русецкий, О.В. Зеленко // Веснік адукацыі. – 2020. – № 11. – С. 7.

галіновай праграмы супрацоўнікі НІА як вядучага навукова-педагагічнага цэнтра краіны забяспечваюць тэарэтычную платформу фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, неабходную для выяўлення, апісання, вытлумачэння і прагназавання сучаснай педагагічнай сітуацыі.

Метадалагічныя напрамкі даследаванняў функцыянальнай пісьменнасці вызначаюць працы В.Л. Жук [41], скіраваныя на забеспячэнне абгрунтаваных рашэнняў, аптымальнага характару кіраўніцтва адукацыйнай сістэмай. Аналіз айчыннымі экспертамі (В.Л. Жук, Т.М. Канашэвіч, А.В. Пазняк) [42] дасягненняў беларускіх навучэнцаў у даследаваннях PISA-2018 дае права ацэньваць вынікі вучняў як вышэйшы за сярэдні міжнародны ўзровень. Выяўлены таксама тыповыя складанасці ў выкананні заданняў, звязаных з разуменнем і ацэнкай тэкстаў, прадстаўленых у розным фармаце (дыяграмы, схемы, графікі, табліцы і інш.), арыентаваных на распазнаванне, аналіз і вытлумачэнне сітуацыі (з'явы); на самастойнае фармуляванне гіпотэз і абгрунтаванне шляхоў рашэння задачы, а таксама на ацэнку і інтэрпрэтацыю (перанос у іншыя кантэксты) атрыманых вынікаў. Так, каля чвэрці беларускіх навучэнцаў не пераадолелі другі (парогавы) узровень па трох разнавіднасцях пісьменнасці (чытацкай – 23,4%, матэматычнай – 29,4%, прыродазнаўчай – 24,2%). Найвышэйшыя (5 і 6) узроўні змагла прадэманстраваць даволі абмежаваная колькасць удзельнікаў: па прыродазнаўчай пісьменнасці – 2,6%, па чытацкай – 4,0%, па матэматычнай – 7,3% вучняў.[43]

На думку прафесара В.Л. Жук, цяжкасці абумоўлены тым, што ў падручніках, напрыклад, па матэматыцы, для старшакласнікаў пераважаюць задачы з навуковым (матэматычным) кантэкстам; прыводзіцца невялікая колькасць міжпрадметных задач, практычна адсутнічаюць заданні са збыткоўнымі дадзенымі ў невербальным выглядзе; нестае практыкаванняў на аналіз дадзеных або тэксту, пастаноўку матэматычных задач, выкарыстанне атрыманых матэматычных вынікаў для вытлумачэння працэсаў і з'яў у іншым кантэксце. Большасць задач падразумявае непасрэднае прымяненне вядомых стандартных формул, тэарэм, алгарытмаў[44].

Аналіз нарматыўных дакументаў, праведзеных даследаванняў сведчыць: функцыянальная пісьменнасць у айчыннай педагагічнай навуцы асэнсоўваецца як перспектыўная навуковая і адукацыйная праблема, як дамінанта новых

---

[41] Жук, О.Л. Актуальные направления развития образования и научно-педагогических исследований в условиях цифровой трансформации / О.Л. Жук // Педагогика. – 2020. – № 3. – С. 5–14.

Жук, О.Л. Организация научно-педагогических исследований по проблеме формирования функциональной грамотности и компетенций / О.Л. Жук // Вышэйшая школа. – 2022. – № 4. – С. 3–7.

[42]Позняк, А.В. PISA-2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А.В. Позняк; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск: Медиасонт, 2021. – 68 с.

Жук, О.Л. PISA -2018 в Республике Беларусь. Математическая грамотность / О.Л. Жук; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск: Медиасонт, 2021. – 50 с.

Канашевич, Т.Н. PISA-2018 в Республике Беларусь. Естественнонаучная грамотность / Т.Н. Канашевич; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск: Медиасонт, 2021. – 62 с.

[43] Титовец, Т.Е. PISA-2018 в Республике Беларусь. Общая характеристика исследования. Социокультурный контекст / Т.Е. Титовец, М.Б. Горбунова, О.В. Бурак; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск: Медиасонт, 2021. – 112 с.

[44] Жук, О.Л. Математическая грамотность учащихся в исследованиях PISA: сущность, результаты и условия формирования / О.Л. Жук // Адукацыя і выхаванне. – 2021. – № 9. – С. 3–14.

педагагічных ведаў. Такі прыярытэт не выпадковасць, а заканамернасць, вызначаная сучаснымі каштоўнасна-сэнсавымі адукацыйнымі арыенцірамі, што выступаюць індыкатарамі канкурэнтаздольнасці школьнай адукацыі, своеасаблівымі паказчыкамі рэйтынгу эфектыўнасці нацыянальнай сістэмы. Набыткі ствараюць тэарэтычную базу для асэнсавання функцыянальнай пісьменнасці як самастойнага навуковага накірунку, што абумоўлена інтэнсіфікацыяй даследаванняў, прысвечаных зместавым аспектам паняцця граматнасці. Павышаная ўвага да праблемы тлумачыцца сацыяльнай і асобаснай арыентацыяй сучаснай сістэмы адукацыі. Пры гэтым, як зазначае У.І. Загвязінскі, "асобаснасць не засланяе сацыяльнай скіраванасці адукацыі, фарміравання імкнення служыць грамадству і дзяржаве, не адмяняе пачуцця доўгу, калектывізму. Яна толькі патрабуе, каб чалавек уключаўся ў грамадскія працэсы як сацыяльна ўстойлівая і адначасова мабільная, свабодная і адказная, творчая асоба"[45].

Актуалізацыя паняцця функцыянальнай пісьменнасці звязана з задачамі развіцця інфармацыйнага грамадства – эканамічнымі (патрэбнасць у падрыхтаваных, высокакваліфікаваных кадрах), сацыяльнымі (камфортная жыццядзейнасць у грамадстве), тэхналагічнымі (інфарматызацыя, лічбавізацыя), агульнаадукацыйнымі (заказ на падрыхтоўку актыўных, творчых людзей, мабільных да сацыяльных запытаў грамадскай супольнасці). Рэалізацыя названых задач падразумявае, што выпускнікі ўстаноў адукацыі маюць не толькі базавыя веды, уменні і навыкі, але і валодаюць вопытам самастойнай, культуратворчай дзейнасці.

Сучасны этап асэнсавання праблемы пазначаны ўвагай да спецыфікі фарміравання розных відаў функцыянальнай пісьменнасці: моўнай, камп'ютарнай, музычнай, метадычнай і інш. У апошнія гады ў Беларусі актывізавалася выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў, прац для папулярызацыі фінансавай, лічбавай, сацыяльнай, падатковай пісьменнасці.[46] На сённяшні дзень разнавіднасці пісьменнасці ўяўляюць сабой стракатую карціну: традыцыйная, палітычная, крытычная, экалагічная, рытарычная, метадычная, фінансавая, лічбавая, картаграфічная, камп'ютарная, субкультурная, электаральная (як ідэнтыфікатар грамадскай нормы), мастацка-эстэтычная, прававая, жыццёвая, сацыяльная, аўдыявізуальная, грамадзянская, лагічная, алгарытмічная, кроскультурная, грамадска-прававая, інструментальная, сацыяльна-камунікатыўная, маргінальная, медыяграматнасць, палітычная, крытычная і інш.

---

[45] Загвязинский, В.И. Теория обучения. Современная интерпретация: учебное пособие / В.И. Загвязинский. – М.: Академия, 2016. – С. 10.

[46] Бушная, Н.В. Сущность, структура и функции социальной компетентности старшеклассников / Н.В. Бушная // Образование и наука в XXI веке: сб. науч. трудов БГПУ. – 2019. – Вып. 2. – С.12–19.

Основы финансовой грамотности: пособие для учащихся / А.А. Королева, С. Н. Костюкова, О. В. Машевская [и др.]. – Минск: Белстан, 2021. – 320 с.

Энциклопедия налоговой грамотности / Н.М. Цвирко, Э.В. Свидинская. – Минск: Белорусская энциклопедия имени П. Бровки, 2020. – 120 с.

Князькова, В.С. Цифровая грамотность населения Республики Беларусь: курс на повышение / В.С. Князькова // Бизнес. Образование. Экономика: сб. ст.: в 2 ч. / редкол.: В.В. Манкевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Ин-т бизнеса БГУ, 2020. – Ч. 1. – С. 68–71.

У каардынатах беларускіх адукацыйных рэалій праблема эфектыўна вырашаецца на ўзроўні паспяхова абароненых кандыдацкіх дысертацый па фарміраванні аўдыявізуальнай пісьменнасці старшакласнікаў сродкамі анімацыйнага кіно (С.І. Колбышава) [47] . Функцыянальная пісьменнасць даследавана ў кантэксце карэкцыйнай (С.М. Фяклістава) [48] і спецыяльнай педагогікі (Н.С. Жлудава). [49] На нашу думку, у пералік даследаванняў, выкананых па праблеме функцыянальнай пісьменнасці, варта ўключыць дысертацыю В.І. Цірынавай, у якой фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці ўсведамляецца як мэтанакіраваная праца па засваенні спосабаў ажыццяўлення пазнання. Вылучаны аўтарам састаў уменняў разглядаецца як інтэграванае ўтварэнне, што характарызуе засваенне ўніверсальных вучэбных дзеянняў. Вызначаная паслядоўнасць, узаемасувязь этапаў арганізацыі дзейнасці – ад прыняцця вучэбнай мэты да ацэньвання (у кантэксце ацэнкі, самаацэнкі) атрыманых вынікаў – адэкватныя сучаснаму разуменню працэсу фарміравання функцыянальнай пісьменнасці (калі кваліфікаваць гэты працэс у адпаведнай для сённяшняй адукацыйнай парадыгмы тэрміналогіі). Праца, выкананая ў 2006 годзе, адпавядае сутнасным ідэям сучаснай методыкі фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, тым больш, што аўтар разглядае вылучаныя ўменні (напрыклад, усведамляць вучэбную мэту і фармуляваць этапы яе ажыццяўлення, выдзяляць вучэбную задачу, аналізаваць яе ўмову, вызначаць паслядоўнасць выканання дзеянняў, планаваць этапы дзейнасці, ажыццяўляць кантроль/самакантроль/ацэнку/самаацэнку) як асноўныя састаўныя ўмення вучыцца.[50]

Пра эпіцэнтр даследаванняў праблем функцыянальнай пісьменнасці сведчаць шматаспектнасць і шматпланавасць дэфініцыі, яе інтэграваных параметраў, спробы структураваць паняцце праз вылучэнне кампанентаў як састаўных функцыянальнай пісьменнасці. Адштурхоўваючыся ад тэзіса пра поліструктурны характар пісьменнасці, даследчыкі вылучаюць розныя кампаненты паняцця. Прадэманструем рэестр вылучаных функцыянальна-зместавых кампанентаў функцыянальнай пісьменнасці рознымі даследчыкамі ў наступнай табліцы. Зазначым: прыведзены ў табліцы пералік разнавіднасцей не канчатковы, ён пашыраецца і ўдакладняецца па меры з’яўлення найноўшых прац. Разам з тым ён сведчыць пра рознааспектнасць падыходаў да праблемы.

---

[47] Колбышева, С.И. Формирование аудиовизуальной грамотности старшеклассников средствами анимационного кино (на материале факультативных занятий «Искусство кино»): автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / С.И. Колбышева; Витебский гос. ун-т им. П.М. Машерова. – Витебск, 2011. – 26 с.

[48] Феклистова, С.Н. Научно-методическая система коррекционной работы по развитию устной речи детей с нарушениями слуха: автореф. дис. … д-ра пед. наук: 13.00.03 /С.Н. Феклистова; Нац. ин-т образования. – Минск, 2021. – 55 с.

[49] Жлудова, Н.С. Формирование грамотности у старшеклассников с интеллектуальной недостаточностью: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.03 / Н.С. Жлудова; Нац. ин-т образования. – Минск, 2016. – 28 с.

[50] Тиринова, О.И. Формирование умений учебной деятельности у младших школьников: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / О.И. Тиринова; Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка. – Минск, 2006. – С. 6.

Табліца 1.2.1 – Кампанентны састаў функцыянальнай пісьменнасці

Разнавіднасць функцыянальнай пісьменнасці	*Кампанентны састаў функцыянальнай пісьменнасці*	*Аўтар ідэі*
Моўная пісьменнасць	– функцыянальная пісьменнасць маўлення; – функцыянальная пісьменнасць працы з тэкстам; – функцыянальная пісьменнасць чытання; – інфармацыйная функцыянальная пісьменнасць	Т.І. Акатава
Камп'ютарная пісьменнасць	– сістэмна-інфармацыйны кампанент; – офісны кампанент; – пошукавы кампанент; – псіхалагічны кампанент	А.У. Данілаў
Функцыянальная пісьменнасць у сферы карэкцыйнай педагогікі	– інфармацыйна-камунікатыўная пісьменнасць; – фінансава-эканамічная пісьменнасць; – пісьменнасць пры вырашэнні бытавых праблем; – грамадска-прававая пісьменнасць	Н.С. Жлудава
Лагічная і алгарытмічная пісьменнасць	– навучанне лагічным прыёмам; – навучанне лагічным аперацыям; – выпрацоўка алгарытмічных уменняў; – прымяненне логіка-алгарытмічных ведаў і ўмоў для рашэння граматычных задач	А.Г. Сарока
Базавая інструментальная пісьменнасць	– чытацкі кампанент; – матэматычны кампанент; – вылічальны і алгарытмічны кампаненты	Д.І. Паўлаў
Новая пісьменнасць	– кампетэнтнасць мыслення; – кампетэнтнасць узаемадзеяння з іншымі; – кампетэнтнасць узаемадзеяння з сабой	Д.І. Паўлаў

Разнавіднасць функцыянальнай пісьменнасці	*Кампанентны састаў функцыянальнай пісьменнасці*	*Аўтар ідэі*
Аўдыявізуальная пісьменнасць	– перцэптыўныя ўменні (чытанне, аналіз, інтэрпрэтацыя і ацэньванне кінафільма); – практыка-аперацыйныя ўменні (стварэнне ўласнага кінафільма)	С.І. Колбышава
Функцыянальная пісьменнасць студэнтаў педагагічнай УВА	– кагнітыўны кампанент (практычныя веды); – дзейнасны кампанент (прадметныя ўменні і навыкі); – асобасны кампанент (асобасныя якасці); – прафесійна-педагагічны кампанент (прафесійна-педагагічныя ўменні і навыкі)	Н.А. Назарава
Крэатыўнае мысленне як кампанент функцыянальнай пісьменнасці	– кагнітыўныя навыкі; – веданне прадмета; – гатоўнасць да засваення новага вопыту; – мэтанакіраванасць; – супрацоўніцтва; – матывацыя да выканання задання	М.Б. Гарбунова
Функцыянальная пісьменнасць	– чытацкая пісьменнасць; – камунікатыўная пісьменнасць; – інфармацыйная пісьменнасць; – сацыяльная пісьменнасць	Інстытут стратэгіі развіцця адукацыі РАА
Функцыянальная пісьменнасць	– тэхналагічны кампанент (вызначаецца базіснымі кампетэнцыямі); – асобасны кампанент (выяўляецца праз якасці асобы, неабходныя для паспяховага функцыянавання ў грамадстве)	В.А. Ярмоленка
Сацыяльная пісьменнасць	– матывацыйна-каштоўнасны кампанент; – кагнітыўны кампанент; – аперацыянальны кампанент	Н.У. Бушная

Разнавіднасць функцыянальнай пісьменнасці	*Кампанентны састаў функцыянальнай пісьменнасці*	*Аўтар ідэі*
Функцыянальная пісьменнасць навучэнцаў асноўнай школы	– зместава-дзейнасны кампанент (агульнавучэбныя, міжпрадметныя, практычныя, прадметныя веды і ўменні); – патрэбнасна-матывацыйны кампанент (гатоўнасць да павышэння ўзроўню адукацыі, выбар прафесіі, камунікатыўная дзейнасць у новым сацыякультурным асяроддзі)	Л.М. Пермінава
Функцыянальная пісьменнасць	– веды агульнатэарэтычнага, спецыяльнага і прыкладнога характару; – дзейнасны кампанент; – уменне выбіраць сродкі, адэкватныя сфармуляванай мэце; – навыкі хуткага рэагавання	В.Г. Анушкін, Я.І. Агароў

Зразумела, што паняційны апарат канчаткова не выпрацаваны, дэталізацыя дэфініцыі эвалюцыянуе ў адпаведнасці са зменамі ў адукацыі, грамадстве. Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці не завяршаецца з набыццём агульнай сярэдняй адукацыі. Гэты працэс працягваецца пастаянна, паколькі “трансфармацыі ў каштоўнасных арыенцірах адбываюцца ў кантэксце сацыяльных спадзяванняў на школу, якія змяняюцца з развіццём грамадства. І гэта знаходзіць адлюстраванне ў новых патрабаваннях да вынікаў функцыянавання адукацыйнай сістэмы”.[51]

Аналіз разнавіднасцей пісьменнасці (табліца 1.2.1) дае падставу для наступных вывадаў. Зместавае напаўненне разнавіднасцей пісьменнасці трансфармуецца разам з ускладненнем патрабаванняў грамадства да адукацыі, якія прадвызначаюць наступныя параметры:

– пастаянная зменлівасць, залежная ад сацыяльнага заказу школе. Напрыклад, дапаўненне пераліку кампетэнцый паняццем *глабальная пісьменнасць*, уведзеным упершыню ў рамках міжнародных даследаванняў PISA ў 2015 годзе. Глабальная пісьменнасць уключае гатоўнасць разумець і прымаць каштоўнасці, меркаванні, пазіцыі іншых людзей, здольнасць да ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі другіх культур. Увядзенне паняцця дазваляе ўдакладніць агульны змест пісьменнасці, інтэрпрэтаваць яго не толькі як

[51] Лебедев, О.Е. Воспитание в школе: диалектика прошлого и будущего: монография / О.Е. Лебедев. – СПб.: СПбГУР, 2022. – С. 282.

здольнасць выкарыстоўваць інфармацыю, але і як уменне кантактаваць, знаходзіць шляхі разумення з суб'ектамі камунікацыі;

– арыентаванасць на будучае, што выяўляецца ў імкненні арганізаваць уласную адукацыйную прастору з улікам "зоны найбліжэйшага развіцця", актуалізаваць фарміраванне розных відаў пісьменнасці, абумоўленых патрэбнасцямі ўласнага жыццёвага кантэксту. На думку Б.С. Гершунскага, любая пісьменнасць вызначаецца ўзроўнем адукацыі, вопытам і індывідуальнымі здольнасцямі чалавека, творчымі адносінамі да справы. Аднак "эмбрыёны" ўсіх гэтых якасцей павінны прысутнічаць не толькі ў структуры і змесце агульнай адукацыі, але і ў пісьменнасці"[52];

– дзейнасны характар, абагульненасць усіх відаў пісьменнасці, дзейнасны характар, абагульненасць усіх відаў пісьменнасці, сінтэз універсальных уменняў, іх гарманізацыю з прадметнымі ведамі;

– імкненне ажыццяўляць выбар, зыходзячы з адэкватнай ацэнкі ўласных магчымасцей у канкрэтнай сітуацыі.

Асноўным дакументам, што вызначае перспектыўныя вектары развіцця адукацыі ў адпаведнасці з дзяржаўнай палітыкай, з'яўляюцца агульнаадукацыйныя стандарты пачатковай, базавай і сярэдняй адукацыі,[53] якія забяспечваюць адзінства адукацыйнай прасторы, пераемнасць ступеняў адукацыі, агульнасць метадалагічных і духоўна-маральных арыенціраў выхавання і навучання. Стандарты ў кантэксце запытаў інфармацыйнага грамадства актуалізуюць пазнавальныя, камунікатыўныя, каштоўнасна-арыентацыйныя кампаненты адукацыйных вынікаў у фармаце асобасных, прадметных і метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў. Адукацыйны стандарт як нарматыўны дакумент вызначае ўзровень засваення сістэмы ведаў, уменняў, неабходных для развіцця кампетэнцый, праецыруе своеасаблівы "партрэт" сучаснага выпускніка, яго маральныя якасці, спосабы назапашвання сацыяльнага вопыту, метады і прыёмы фарміравання гатоўнасці асобы да ўзаемадзеяння з іншымі членамі грамадства.

Стандарт для кожнай ступені адукацыі прагназуе пэўны ўзровень адукацыйных дасягненняў. Падразумяваецца, што, атрымаўшы пачатковую адукацыю, вучань дасягае элементарнай пісьменнасці, пасля базавай адукацыі фарміруецца функцыянальная пісьменнасць як аснова для вядучых кампетэнцый, неабходных для прафесійнага станаўлення. Фармулююцца патрабаванні да вучэбных праграм, умоў іх рэалізацыі і – надзвычай важна – вынікі засваення адукацыйных праграм. Акцэнтуецца станаўленне асобы навучэнца як носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, грамадзяніна і патрыёта, а таксама дасягненне асобасных, метапрадметных і прадметных адукацыйных вынікаў, развіццё творчых здольнасцей, формы ўдзелу ў сацыяльна значнай дзейнасці.

[52]Гершунский, Б.С. Грамотность для XXI века / Б.С. Гершунский // Педагогика. – 1990. – № 4. – С. 61.

[53] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

Прыводзіцца пералік уменняў і навыкаў, якія павінны быць засвоены ў межах кожнага вучэбнага прадмета. Акцэнтуецца неабходнасць развіцця функцыянальнай пісьменнасці як асновы адукацыйных дасягненняў. Зазначым, што ў стандартах гэтае паняцце ўжываецца спарадычна, напрыклад, пры фармулёўцы мэты базавай адукацыі: "Дасягненне выпускнікамі ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці, неабходнай у сучасным грамадстве як па матэматычным і прыродазнаўчым, так і па гуманітарным і сацыякультурным накірунках".[54] Узнікае пытанне: якія аспекты зместу дакумента даюць падставу сцвярджаць пра карэляцыю паняццяў *функцыянальная пісьменнасць* і *адукацыйныя вынікі*, зафіксаваных у стандартах?

Па-першае, прызнанне ў якасці прыярытэтнага кампетэнтнаснага падыходу, "скіраванага на фарміраванне кампетэнцый, універсальных вучэбных дзеянняў, узмацненне практычнай скіраванасці пазнавальнай дзейнасці" [55] , што і запатрабавала фармулёўкі адукацыйных вынікаў у кампетэнтнасным фармаце.

Па-другое, стандарты, арыентаваныя на дасягненне навучэнцамі інтэграваных вынікаў – асобасных, метапрадметных, прадметных, – прадугледжваюць: выпускнікі засвойваюць пэўную сукупнасць звестак, выкарыстоўваюць іх у практычнай дзейнасці, у тыповых і нестандартных сітуацыях, што вымушае сінтэзу ведаў і сацыяльнага вопыту: "Для стымулявання пазнавальнай дзейнасці неабходна фармуляваць веды, шукаць шляхі для іх дасягнення, планаваць паслядоўнасць вучэбных дзеянняў, аналізаваць іх розныя варыянты, ацэньваць магчымыя вынікі, мадэляваць спосабы рашэння сітуацыйных задач, ствараць мадэлі рэальнага жыцця"[56].

Па-трэцяе, стандарты пастуліруюць правобраз выпускніка, які ўмее дзейнічаць у жыццёвых абставінах, што з'яўляецца своеасаблівым крытэрыем сфарміраванасці кампетэнцый: "Засваенне пры вывучэнні школьных прадметаў спосабаў дзейнасці, якія прымяняюцца як у межах школьных прадметаў, так і ў рэальных умовах" (пачатковая адукацыя); "развіццё ўменняў выкарыстоўваць засвоеныя веды, вопыт у вучэбных і жыццёвых сітуацыях" (базавая адукацыя); "валоданне сістэмай ведаў і ўменняў, неабходных для прымянення ў практычным аспекце" (сярэдняя адукацыя). Якраз функцыянальная пісьменнасць і характарызуецца найперш назапашаным вопытам, уменнем рашаць нестандартныя задачы, дзейнічаць у незнаёмых умовах. Функцыянальная пісьменнасць з'яўляецца асновай паспяховага супрацоўніцтва ў дынамічным соцыуме. Як сведчаць навукоўцы, "функцыянальна пісьменны чалавек – той, які здольны выкарыстоўваць набытыя на працягу жыцця веды,

[54] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[55] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[56] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023. – С.8.

уменні, навыкі для вырашэння максімальна шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах чалавечай дзейнасці, зносін і сацыяльных кантэкстах”.[57]

Аналіз адукацыйных стандартаў дэманструе: асноўныя кампаненты функцыянальнай пісьменнасці прадстаўлены праз вядучыя кампетэнцыі навучэнцаў. Фармулёўкі адукацыйных дасягненняў як пэўны набор эталонных параметраў раскрываюць вынікі, што непасрэдна суадносяцца з функцыянальнай пісьменнасцю (асобасныя, метапрадметныя, прадметныя): “*Асобасныя вынікі* выяўляюцца ў тым, што навучэнец: прымае і кіруецца маральнымі каштоўнасцямі; мае сфарміраваную цэласную сістэму поглядаў на свет; усведамляе сябе грамадзянінам беларускай дзяржавы, сваю этнічную прыналежнасць; дэманструе павагу да нацыянальнай культурнай спадчыны; успрымае сям’ю як асабістую каштоўнасць, асэнсоўвае значнасць сацыяльна адказных паводзін; характарызуецца міжэтнічнай і міжкультурнай талерантнасцю ў адносінах да чужых меркаванняў, праяўляе ўстойлівы інтарэс да самастойнай дзейнасці і самаразвіцця, самапазнання”.[58]

Метапрадметныя вынікі спасціжэння зместу адукацыйнай праграмы адлюстроўваюць гатоўнасць да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, засваенне ўніверсальных вучэбных дзеянняў, міжпрадметных паняццяў і праяўляюцца ў наступным: навучэнец мае сфарміраваныя агульнавучэбныя ўменні і навыкі, што забяспечваюць здольнасць да самастойнага спазнання новых ведаў і ўменняў (уключаючы і арганізацыю гэтага працэсу), да эфектыўнага вырашэння разнастайных жыццёвых задач, на аснове якіх фарміруюцца і развіваюцца кампетэнцыі; кіруецца этычнымі і маральнымі нормамі зносін і супрацоўніцтва; здольны пісьменна і аргументавана выказваць свае думкі ў пісьмовай і вуснай формах, адстойвае і абгрунтоўвае ўласную пазіцыю; умее свядома выкарыстоўваць маўленчыя сродкі з камунікатыўнымі мэтамі, мае сфарміраваныя навыкі асэнсаванага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў, умее працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй.[59]

Прадметныя вынікі заключаюцца ў выпрацоўцы ўменняў, спецыфічных для канкрэтных вучэбных прадметаў, назапашванні відаў пазнавальнай дзейнасці ў межах пэўнай галіны ведаў, у іх трансфармацыі і прымяненні.

Такім чынам, сфармуляваныя стандартамі адукацыйныя вынікі непасрэдна суадносяцца з чытацкай, матэматычнай і прыродазнаўчай пісьменнасцю як кампанентамі функцыянальнай пісьменнасці, цэласна адлюстроўваюць метапрадметныя дасягненні. Іх можна супаставіць з паняццем *ключавыя кампетэнцыі,* якія, маючы метапрадметны характар, вызначаюць гатоўнасць навучэнцаў да інтэграцыі пазнавальных і практычных уменняў як асновы для

[57] Образовательная система «Школа – 2100». Педагогика здравого смысла: сборник материалов / под науч. ред. А.А. Леонтьева. – М.: Баласс, 2003. – С. 35.

[58] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[59] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

паспяховых рашэнняў, што не супярэчаць маральным і этычным нормам асобы. Ключавыя кампетэнцыі ствараюць перадумовы для фарміравання каштоўнасных арыентацый, норм паводзін у соцыуме, служаць базай для вызначэння запланаваных вынікаў у кожнай прадметнай галіне. Менавіта сродкамі вучэбных прадметаў засвойваюцца агульныя прыёмы пошукавай дзейнасці, прагназавання і ацэнкі ўласных вучэбных дзеянняў.

У сучаснай беларускай адукацыйнай прасторы пералік традыцыйных разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці – *чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай* – дапаўняецца *фінансавай,* пад якой разумеецца "выяўленне ў тэксце фінансавай інфармацыі, аналіз інфармацыі ў фінансавым кантэксце, ацэнка фінансавых праблем; прымяненне фінансавых ведаў для рашэння жыццёвых праблем".[60]

Сфармуляваныя адукацыйныя вынікі непасрэдна звязаны з разнавіднасцямі функцыянальнай пісьменнасці агульным – *вынікова-дзейнасным* – кампанентам: "Прымаць вучэбную задачу, кіравацца ёю ў пазнавальнай дзейнасці, планаваць свае дзеянні, вызначаць іх алгарытм, ажыццяўляць ацэнку ўласных рашэнняў, задумвацца над прычынамі асабістых поспехаў або няўдач у вучэбнай дзейнасці, выяўляць памылкі і выпраўляць іх, карэктаваць працу ў ходзе яе выканання". [61] Вынікова-дзейнасны характар фармулёвак абумоўлены практыка-арыентаваным, сістэмна-дзейнасным падыходамі як метадалагічнай асновай распрацаванага дакумента.

У дакуменце пры вызначэнні кампанентаў функцыянальнай пісьменнасці акцэнтуецца грамадская значнасць ведаў, паколькі працэс навучання "садзейнічае паспяховай сацыялізацыі асобы ў працэсе яе інтэграцыі ў сацыякультурнае асяроддзе Беларусі", "фарміруе якасці асобы, неабходныя для паўнацэннага жыцця ў сучасным грамадстве", раскрывае "ўзаемасувязі чалавека, грамадства і прыроды, асобы і соцыуму", падкрэсліваецца "неабходнасць іх гарманічнага ўзаемадзеяння". Сацыяльны партрэт сучаснага выпускніка раскрываецца ў стандартах наступным чынам: асоба, якая засвоіла "нормы адказных і бяспечных паводзін", характарызуецца сфарміраванымі кампетэнцыямі сацыяльнага ўзаемадзеяння; падрыхтаваная "да выканання сацыяльна значных праектаў", выяўляе гатоўнасць да ўключэння ў разнастайныя віды сацыяльна значнай дзейнасці; здольная да "асобаснай самарэалізацыі праз засваенне новага сацыяльнага вопыту".[62]

У стандартах дэталізуюцца метапрадметныя дасягненні як паказчыкі паспяховага фарміравання функцыянальнай пісьменнасці. *Разнавіднасці функцыянальнай пісьменнасці* – чытацкая, матэматычная, прыродазнаўчая –

[60] Горбунова, М.Б. Курс на функциональную грамотность: дань моде или социальная необходимость? Подготовка к Национальному исследованию качества образования / М.Б. Горбунова, В.И. Короткевич // Народная асвета. – 2023. – № 9. – С. 3–7.

[61] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[62] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

раскрываюцца ў кантэксце метапрадметнасці, а спосабы і аб'ём іх засваення канкрэтызуюцца праз прадметныя веды і ўменні.

Чытацкая пісьменнасць акрэсліваецца праз практычныя ўменні вучняў. Напрыклад, перад вучэбным прадметам "Гісторыя Беларусі" фармулюецца агульнакультурная задача – развіццё чытацкай культуры, разуменне аўтарскай пазіцыі, праца з тэкставай і графічнай інфармацыяй. Агульная задача дэталізуецца праз уменні: адэкватна выкарыстоўваць гістарычныя паняцці, прымяняць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях; працаваць з тэкстам вучэбнага дапаможніка, выдзяляць галоўнае ў тэксце параграфа, складаць разгорнуты план адказу на канкрэтныя пытанні; задаваць пытанні да тэксту, ілюстрацыі; фармуляваць адказы на пытанні, інтэрпрэтаваць і абагульняць факты; знаходзіць у тэксце інфармацыю і выкарыстоўваць яе для рашэння вучэбных задач, устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі на аснове аналізу прачытанага.

Матэматычная пісьменнасць як разнавіднасць функцыянальнай пісьменнасці раскрываецца праз фармуляванне метапрадметных адукацыйных вынікаў. Акцэнтуецца фарміраванне выразнасці і дакладнасці пры выражэнні думкі, лагічнасці мыслення, алгарытмічнай культуры, прасторавых паняццяў, здольнасці да пераадолення цяжкасцей; выпрацоўка ўяўленняў аб ідэях і метадах матэматыкі як універсальнай мовы навукі і тэхнікі, сродку мадэлявання з'яў і працэсаў, выхаванне культуры асобы, адносін да матэматыкі як часткі агульначалавечай культуры, разуменне ролі матэматыкі для навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Прыродазнаўчая пісьменнасць як разнавіднасць функцыянальнай пісьменнасці асэнсоўваецца праз прадметныя і метапрадметныя адукацыйныя вынікі вучэбных прадметаў "Геаграфія", "Біялогія", "Хімія", "Астраномія" ў кантэксце развіцця ўяўленняў пра навуковую карціну свету, уласцівасці кампанентаў прыроды, іх узаемасувязі; засваенне паняццяў, заканамернасцей развіцця прыроды, насельніцтва і гаспадаркі розных тэрыторый, аб навакольным асяроддзі і рацыянальным прыродакарыстанні; аналіз статыстычных матэрыялаў, сучасных тэхналогій для пошуку, інтэрпрэтацыі дадзеных; выхаванне пазітыўных каштоўнасных адносін да прыроднага асяроддзя, экалагічнай культуры, любові да сваёй мясцовасці, свайго рэгіёна, сваёй краіны; фарміраванне ўменняў самастойнага ацэньвання ўзроўню бяспекі навакольнага асяроддзя як сферы жыццядзейнасці.

Зазначым: *засваенне ўсіх разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці немагчыма без чытацкай пісьменнасці як базы кагнітыўнай дзейнасці*, абумоўленай інтэграваным характарам чытання як віду маўленчай дзейнасці. У адукацыйных стандартах сістэматычна падкрэсліваецца значэнне чытацкай пісьменнасці праз агульную звышзадачу – развіццё чытацкай культуры на ўзроўні кожнага вучэбнага прадмета (працаваць з матэматычным/фізічным/біялагічным тэкстамі, здабываць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, прадстаўленую ў розных фарматах (табліцы, дыяграмы, графікі, схемы і г.д.), адэкватна ўспрымаць, аналізаваць і даваць ацэнку медыятэкстам. Чытацкая пісьменнасць разумеецца складальнікамі адукацыйных стандартаў не

як элементарнае валоданне тэхнікай чытання, а найперш як здольнасць свабодна выкарыстоўваць навыкі і ўменні чытання для атрымання інфармацыі з тэксту з мэтай яго разумення, кампрэсіі, трансфармацыі.

Чытацкая пісьменнасць як базавая састаўная знаходзіцца ў аснове іншых разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці. У адукацыйных стандартах асэнсаванае чытанне ўсведамляецца найважнейшым метапрадметным вынікам вывучэння розных прадметаў. У сумарным выглядзе чытацкія ўменні разгортваюцца ў сучасным трохадзінстве: *знаходзіць інфармацыю* ў тэкстах з рознымі фарматамі прадстаўлення (тэкставым, візуальным, схематычным, картаграфічным і інш.); *інтэграваць і інтэрпрэтаваць змест* тэкстаў; *ацэньваць прачытанае*.

Прадметныя дасягненні ў кантэксце фарміравання функцыянальнай пісьменнасці фармулююцца праз пералік адукацыйных вынікаў у сферы кожнай адукацыйнай галіны. Праілюструем гэта на прыкладзе педагагічна адаптаванага зместу вучэбнага прадмета “Хімія”. *Інфармацыйны кампанент* акрэсліваецца праз уменні знаходзіць, аналізаваць і ацэньваць інфармацыю: засваенне ведаў на аснове найважнейшых паняццяў і законаў хіміі, хімічнай сімволікі; самастойныя пошукі новых ведаў у адпаведнасці з жыццёвымі патрэбнасцямі. *Практыка-арыентаваны кампанент* прадстаўлены наступнымі ўменнямі і навыкамі: выкарыстоўваць веды ў паўсядзённым жыцці; назіраць хімічныя з’явы, праводзіць хімічны эксперымент, рабіць разлікі на аснове хімічных формул, рэчываў і ўраўненняў хімічных рэакцый; прымяняць атрыманыя веды для бяспечнага выкарыстання рэчываў у бытавой сферы, сельскай гаспадарцы і на вытворчасці для вырашэння практычных задач.

Сацыяльна арыентаваны кампанент скіраваны на асэнсаванне вынікаў засваення прадмета ў кантэксце адаптацыі да зменлівых умоў быцця, фарміравання актыўнай пазіцыі ў грамадскім жыцці: выхаванне адносін да хіміі як аднаго з фундаментальных кампанентаў прыродазнаўства і агульначалавечай культуры; развіццё пазнавальных інтарэсаў і інтэлектуальных здольнасцей у працэсе правядзення хімічных эксперыментаў; вырашэнне бытавых практычных задач, звязаных з веданнем хіміі; прадбачанне і прадухіленне з’яў, сітуацый, што прыносяць шкоду здароўю чалавека і навакольнай рэчаіснасці.

Такім чынам, у адукацыйных стандартах паняцце *функцыянальнай пісьменнасці* аперацыяналізуецца праз вылучэнне сістэмы ведаў, уменняў, каштоўнасцей, што складаюць аснову для адукацыйных вынікаў па кожным вучэбным прадмеце; праз асэнсаванне кампетэнцый як здольнасці выкарыстоўваць веды ў практычнай дзейнасці, праводзіць рэфлексійны аналіз пазнавальнай дзейнасці, выкарыстоўваць разнастайныя метады навучання і формы арганізацыі заняткаў, улічваць дыялогавую скіраванасць і камунікатыўныя магчымасці вучэбнага прадмета; стратэгіі асобаснага развіцця навучэнцаў, што выяўляюць інтэлектуальны і маральна-этычны профіль сучаснага выпускніка: носьбіт каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры, здольны да гарманічнага ўзаемадзеяння з іншымі суб’ектамі адукацыйнага працэсу, да канструктыўнага дыялогу, да крытычнага ўспрымання інфармацыі, атрыманай з розных крыніц; які праяўляе цікавасць да

творчай дзейнасці, пошуку нестандартных рашэнняў, які валодае прыёмамі вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці, падрыхтаваны да выканаанння розных відаў сацыяльна значнай дзейнасці.

Сфарміраваная функцыянальная пісьменнасць цэласна рыхтуе навучэнца да вырашэння як пазнавальных, так і практычных задач. Адукацыя павінна быць скіравана, паводле міжнароднай праграмы па ацэнцы дасягненняў навучэнцаў PISA, на "паўнацэннае функцыянаванне асобы ў сучасным грамадстве, вырашэнне шырокага дыяпазону задач у разнастайных сферах чалавечай дзейнасці, зносін і сацыяльнага ўзаемадзеяння".[63]

У змесце сучасных адукацыйных стандартаў асноўныя разнавіднасці функцыянальнай пісьменнасці – чытацкай, матэматычнай, прыродазнаўчай – непасрэдна сфармуляваны праз змест кожнага вучэбнага прадмета. Разнавіднасці функцыянальнай пісьменнасці паўнацэнна прадстаўлены на трох узроўнях: *інфармацыйная пісьменнасць* (уменне атрымліваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю з розных крыніц); *камунікатыўная пісьменнасць* (уменне эфектыўна абменьвацца інфармацыяй, здольнасці да ўзаемадзеяння з іншымі суб'ектамі адукацыйнага працэсу, да канструктыўнага дыялогу, да ролі маўленчага партнёра); *сацыяльная пісьменнасць* (уменне прымяняць інфармацыю ў сацыяльнай практыцы; мадэляванне сітуацый вырашэння камунікатыўных задач).

Зварот міжнароднага супольніцтва да ацэнкі функцыянальнай пісьменнасці як аднаго з паказчыкаў паспяховай жыццядзейнасці соцыуму вызначае статус функцыянальнай пісьменнасці ў нацыянальных адукацыйных стандартах. Аналіз зместу стандартаў выяўляе, што тэрмін *функцыянальная пісьменнасць* як здольнасць вырашаць пазнавальныя і жыццёвыя праблемныя сітуацыі ўведзены толькі на ўзроўні базавай адукацыі. Аднак арыентацыя адукацыйных стандартаў на сістэмна-дзейнасны, кампетэнтнасны падыходы дазваляе гаварыць пра фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці як сістэмы ведаў і ўменняў прымяняць набытыя веды ў кантэксце як вучэбных, так і сацыяльных задач. Чытацкая, матэматычная і прыродазнаўчая пісьменнасць лагічна суадносяцца з універсальнымі вучэбнымі дзеяннямі і адукацыйнымі вынікамі метапрадметнага характару.

Прыведзены ў адукацыйных стандартах канкрэтызаваны пералік уменняў па розных вучэбных прадметах выяўляе агульныя дамінанты, што характарызуюць функцыянальную пісьменнасць: інтэграваны падыход да вынікаў (асобасныя, метапрадметныя і прадметныя); гатоўнасць прымяняць атрыманыя веды як у рамках адукацыйнага працэсу, так і ў рэальных сітуацыях; засваенне алгарытмаў пошуку нестандартных рашэнняў; валоданне прыёмамі вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці; веданне працэдур ацэньвання ўласных дасягненняў, методык рэфлексійнай дзейнасці; уменні самастойна знаходзіць выхад з праблемных сітуацый, планаваць і ацэньваць пазнавальную дзейнасць індывідуальна і калектыўна.

[63] Титовец, Т.Е. PISA-2018 в Республике Беларусь. Общая характеристика исследования. Социокультурный контекст / Т.Е. Титовец, М.Б. Горбунова, О.В. Бурак; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск: Медиасонт, 2021. – С. 22.

У адукацыйных стандартах агульнай сярэдняй адукацыі тэрмін прыводзіцца аднаразова, аднак на зместавым узроўні дакумента выразна прадвызначаны вектары развіцця функцыянальнай пісьменнасці:

– трансфармацыя сучаснай адукацыйнай парадыгмы ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу;

– эвалюцыя зместу навучання, акцэнтаванне міждысцыплінарных сувязей, рашэнне сітуацыйных нестандартных задач, якія разглядаюць праблемы, рэальныя сітуацыі ў кантэксце рознааспектных каардынат: грамадскае/асабістае жыццё, адукацыя, будучая прафесійная дзейнасць і інш. Такія заданні, як правіла, патрабуюць творчай актыўнасці, нестандартнага мыслення (напрыклад, *матэматычную задачу – вылічэнне працэнтаў – можна сфармуляваць па-за прадметнымі межамі: разлічыць працэнтную стаўку па крэдыце за пакупку новага камп'ютара*). Аналіз практычных сітуацый актуалізуе ролю матэматычнага кампанента функцыянальнай пісьменнасці – уменне фармуляваць праблему на мове матэматыкі; трансфармаваць матэматычныя паняцці, факты, працэдуры, выкарыстоўваць і ацэньваць ролю прадметных ведаў у жыцці;

– узмацненне ролі ўзаемадзеяння суб'ектаў адукацыйнага працэсу праз супрацоўніцтва, дыялог, камунікатыўны патэнцыял вучэбнага прадмета;

– абнаўленне працэдур ацэньвання якасці падрыхтоўкі навучэнцаў з улікам сучасных адукацыйных тэндэнцый;

– павышэнне матывацыі суб'ектаў адукацыйнага працэсу, зацікаўленасць у выніках, станоўчай дынаміцы дасягненняў.

Паслядоўны характар развіцця функцыянальных уменняў, незавершанасць працэсу фарміравання кампетэнцый навучэнцаў у рамках пазнавальнага працэсу маюць на ўвазе выяўленне суадносін зместу паняццяў *функцыянальная пісьменнасць і кампетэнцыя* (табліца 1.2.2).

Табліца 1.2.2 – Змест паняццяў *функцыянальная пісьменнасць* і *кампетэнцыя* паводле сучасных педагагічных даследаванняў

Змест паняцця *функцыянальная пісьменнсць*	Змест паняцця *кампетэнцыя*
Функцыянальна пісьменным лічыцца той, хто можа ўдзельнічаць ва ўсіх відах дзейнасці, у якіх пісьменнасць неабходная для эфектыўнага функцыянавання яго групы і якія даюць яму магчымасць карыстацца чытаннем, пісьмом і лічэннем для свайго ўласнага развіцця і развіцця калектыву (ЮНЕСКА, 1978 год)	Кампетэнцыя – здольнасць прымяняць веды, уменні, навыкі, асобасныя якасці з мэтай арганізацыі і выканання паспяховай дзейнасці ў пэўнай галіне (С.С. Котава, 2008 год)

Змест паняцця *функцыянальная пісьменнсць*	Змест паняцця *кампетэнцыя*
Функцыянальная пісьменнасць – гэта ўзровень ведаў і ўменняў, зменлівы па меры развіцця грамадства (у прыватнасці, уменняў чытаць і пісаць), неабходны для паўнапраўнага і эфектыўнага ўдзелу ў палітычным, грамадскім і культурным жыцці з мэтай садзейнічаць прагрэсу сваёй краіны і для ўласнага развіцця (С.А. Тангян, 1990 год)	Агульная здольнасць і гатоўнасць асобы да дзейнасці, заснаваныя на ведах і вопыце, набытых праз навучанне, самастойную дзейнасць, накіраваныя на паспяховае выкананне працоўнай дзейнасці (Я.В. Ткачэнка, 2009 год)
Здольнасць самастойна набываць, асэнсоўваць і эфектыўна выкарыстоўваць веды не толькі ў вузкапрафесійнай сферы дзейнасці, але і ў грамадскіх справах, у жыцці сваёй сям'і, у інтарэсах уласнага ўсебаковага развіцця; сфарміраваная патрэбнасць і гатоўнасць да бесперапыннай адукацыі, уменне ўключаць новыя веды ў сістэму засвоеных (Г.П. Зінчанка, 1990 год)	Загадзя зададзенае патрабаванне (норма) да адукацыйнай падрыхтоўкі навучэнца, неабходнае для якаснай прадуктыўнай дзейнасці ў пэўнай сферы (А.В. Хутарскі, 2010 год)
Функцыянальная пісьменнасць з'яўляецца неабходнай састаўной прафесійнай адукацыі і непасрэдна звязана з паняццем кампетэнтнасці (А.М. Новікаў, 1997 год)	Кампетэнцыя – інтэграваная прафесійна-асобасная якасць, што характарызуе гатоўнасць да вырашэння вучэбных і прафесійных задач (Л.З. Кувандыкава, 2011 год)
Пісьменны – гэта чалавек, падрыхтаваны да развіцця ўласнага адукацыйнага патэнцыялу, для набыцця кампанентаў пісьменнасці: ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці, паводзін, светапоглядных якасцей (Б.С. Гершунскі, 1998 год)	Інтэграванае ўтварэнне, якое ўключае здольнасць і гатоўнасць да выканання прафесійнай дзейнасці, заснаваныя на сукупнасці ведаў, уменняў, навыкаў (Т.А. Юр'ева, 2012 год)
Пад пісьменнасцю разумеецца сацыяльна-педагагічная характарыстыка асобы, якая выяўляе здольнасць да прачытання, успрымання і разумення неабходнага аб'ёму сацыяльна-культурнай інфармацыі (І.А. Калеснікава, 2004 год)	Кампетэнцыя ўяўляе сабой інтэграваную якасць асобы, што ўключае сістэму спецыяльных ведаў, уменняў, матываў і якасцей, што забяспечваюць гатоўнасць да ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці (Г.М. Гарэева, 2013 год)

Змест паняцця *функцыянальная пісьменнсць*	Змест паняцця *кампетэнцыя*
Функцыянальная пісьменнасць – гэта здольнасць прымяняць універсальныя метады дзейнасці, заснаваныя на пэўных правілах і нормах, для выкарыстання ведаў (звестак, навуковых паняццяў, інструкцый), атрыманых з розных крыніц інфармацыі, з мэтай вырашэння праблем сацыяльнай адаптацыі (А.Е. Лебедзеў, 2004 год)	Кумулятыўная гатоўнасць, здольнасць і вопыт праяўлення ведаў, навыкаў, уменняў у сітуацыі рэальнай камунікацыі (Б.А. Крузе, 2014 год)
Функцыянальная пісьменнасць – узровень адукаванасці, які характарызуе здольнасць вырашаць стандартныя жыццёвыя і прафесійныя задачы ў розных сферах дзейнасці на аснове пераважна прыкладных ведаў (Н.А. Назарава, 2007 год)	Базавыя ўменні *камунікатыўнай кампетэнцыі* – гэта здольнасць вучняў на аснове засвоеных ведаў выконваць тэарэтычныя і практычныя дзеянні – аперыраваць моўнымі сродкамі ў працэсе маўлення і наладжваць камунікатыўны кантакт пры суразмоўніцтве (С.В. Мартынкевіч, 2014 год)
Функцыянальная пісьменнасць – адно з праяўленняў актыўнай пісьменнасці (В.Г. Анушкін, 2010 год)	Сукупнасць ведаў, уменняў, вопыту, матываў і каштоўнасцей, неабходных для ажыццяўлення зносін у дзелавой і вытворчай сферах дзейнасці (А.Л. Макарава, 2015 год)
Функцыянальная пісьменнасць – сістэма ўменняў вырашаць практычныя задачы ў асноўных сферах жыццядзейнасці… Функцыянальная пісьменнасць складае аснову жыццёвай кампетэнцыі (Н.С. Жлудава, 2016 год)	Дынамічнае, структурна-ўзроўневае ўтварэнне, дэтэрмінаванае сукупнасцю маўленчых і камунікатыўных здольнасцей наладжваць эфектыўнае, мэтанакіраванае дыялагічнае ўзаемадзеянне, заснаванае на інтэграцыі ведаў, уменняў, навыкаў, вопыту і асобасных якасцей суб’екта (А.Ю. Чыстабаева, 2017 год)
Здольнасць і гатоўнасць да прымянення ў разнастайных жыццёвых сітуацыях атрыманых ведаў і сфарміраваных уменняў (В.Ф. Русецкі, В.У. Зелянко, 2020 год)	Сукупнасць прадметных і метапрадметных ведаў, уменняў, вопыту прымянення ўніверсальных спосабаў дзейнасці, асобасных каштоўнасных арыентацый (Г.М. Валочка, 2020 год)

Змест паняцця *функцыянальная пісьменнсць*	Змест паняцця *кампетэнцыя*
Функцыянальная пісьменнасць – уменне навучэнца прымяняць атрыманыя веды ў рэальных сітуацыях, аналізаваць, шукаць і выяўляць прычынна-выніковыя сувязі, выказваць уласныя ідэі, пераадольваць цяжкасці, з якімі вучні могуць сустрэцца ў жыцці (А.І. Кудратава, 2023 год)	*Чытацкая кампетэнцыя* – сукупнасць ведаў, уменняў, навыкаў і ўніверсальных спосабаў дзейнасці, неабходных для ажыццяўлення самастойнай чытацкай дзейнасці праз разуменне, інтэрпрэтацыю прачытанага (Г.М. Юсцінская, 2021 год)
Функцыянальная пісьменнасць – вынік авалодання сістэмай прадметных кампетэнцый (А.А. Корзюк, 2023 год)	Здольнасць навучэнца прымяняць веды, уменні і асабістыя якасці для паспяховай дзейнасці ў пэўнай сферы (І.А. Кудратава, 2023 год)

З азначэнняў, прыведзеных у табліцы 1.2.2, вынікае: функцыянальная пісьменнасць і кампетэнцыя – катэгорыі аднапарадкавыя, але не тоесныя. *Функцыянальная пісьменнасць* забяспечвае асобе пэўныя стартавыя магчымасці, гэта свайго роду неабходны атрыбут, першасная ступенька для ўваходжання ў соцыум, дэтэрмінаваная не толькі асабістымі, але і грамадскімі патрэбнасцямі. Гэта своеасаблівы мінімум для камфортнага функцыянавання ў грамадстве. *Кампетэнцыя* – катэгорыя, што характарызуе найперш асобасныя адукацыйныя дасягненні, якія адпавядаюць перспектыўным запытам грамадства.

У любым выпадку разнавіднасці функцыянальнай пісьменнасці з’яўляюцца вынікам развіцця і ўскладнення жыцця грамадства ў яго сучасных каардынатах і вымярэннях. Яны як адукацыйныя вынікі праецыруюць светаўспрыманне, паводзіны, адносіны асобы ў разнастайных жыццёвых сітуацыях. У падобным разуменні функцыянальная пісьменнасць становіцца асновай для станаўлення кампетэнцый навучэнцаў і перадумовай іх інтэлектуальнага развіцця.

Такім чынам, зместавае напаўненне паняцця *функцыянальная пісьменнасць* змяняецца разам з развіццём грамадства і патрабаваннямі, якія прад’яўляюцца да ўзроўню адукацыі. Улічваючы вынікі асэнсавання феномена ў педагагічных даследаваннях (Г.М. Валочка, А.А. Гулецкая, В.У. Зелянко, В.Л. Жук, Г.П. Зінчанка, А.Е. Лебедзеў, А.М. Новікаў, Н.Ф. Радзівонава, В.Ф. Русецкі, В.Г. Стуканаў, С.А. Тангян, А.П. Трапіцына, А.В. Хутарскі, М.Г. Яленскі і інш.), лічым вызначальнымі параметрамі паняцця наступныя:

– функцыянальная пісьменнасць з’яўляецца лагічнай састаўной адукацыйных вынікаў, якая непасрэдна суадносіцца з паняццем кампетэнцыі;

– функцыянальная пісьменнасць выступае асновай для фарміравання кампетэнцый;

– функцыянальная пісьменнасць уяўляе сабой сукупнасць ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў самастойнай дзейнасці, абумоўленымі ўспрыманнем,

трансфармацыяй інфармацыі, здольнасцю вырашаць задачы ў розных сферах жыццядзейнасці;

– функцыянальная пісьменнасць – гэта здольнасць да кампетэнтных і эфектыўных дзеянняў, ад сфарміраванасці якой залежыць якасць рэалізацыі жыццёвых інтарэсаў асобы ў соцыуме.

Сучасная педагагічная навука дэманструе дыялектыку традыцыйных уяўленняў пра пісьменнасць у кантэксце інфармацыйнага грамадства. Гэта абумоўлена зменамі ў мэтах, змесце школьнай адукацыі, якая ва ўмовах лічбавых тэхналогій характарызуецца шматзадачнасцю. Адпаведна новаму сутнаснаму напаўненню падвяргаюцца шматлікія асноватворныя паняцці са сферы адукацыі, у тым ліку і паняцці *пісьменнасць, пісьменны*.

Задача забяспечыць паўнацэннае ўваходжанне навучэнцаў у сучасны соцыум з новай сістэмай грамадскіх адносін выклікае неабходнасць пошукаў шляхоў супрацоўніцтва, узаемадзеяння суб'ектаў адукацыйнага працэсу. Аднак шматлікасць варыяцый, дыферэнцыяцый паняцця *пісьменнасць* (вучоныя налічваюць на сённяшні дзень каля 35 разнавіднасцей пісьменнасці) прыводзіць да неабходнасці сістэматыкі тэрміналагічнага апарату праз "удакладненне і пераасэнсаванне атрыманых вынікаў з прычыны пастаяннай эвалюцыі навукова-педагагічнага дыскурсу".[64]

Разгалінаванасць і шматлікасць разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці, безумоўна, адлюстроўвае працэс назапашвання і асэнсавання ведаў, характэрны для станаўлення любой навуковай сферы. Аднак азначэнні некаторых паняццяў, прапанаваныя асобнымі даследчыкамі, у пэўных выпадках адлюстроўваюць суб'ектыўна-аб'ектыўнае бачанне педагагічнай тэрмінатворчасці, больш таго, ігнаруюць вопыт папярэднікаў па сістэматызацыі тэрмінасферы. Звернемся да азначэнняў разнавіднасцей пісьменнасці, прапанаваных у навуковых даследаваннях апошніх гадоў.

Так, *сацыяльная пісьменнасць* з'яўляецца мэтай, вынікам і найважнейшай састаўной сацыяльнага выхавання, якая забяспечвае паспяховую сацыялізацыю асобы на ўсіх этапах сацыяльнага станаўлення. Яна ўяўляе сабой *сукупнасць сацыяльных ведаў, уменняў і навыкаў*, неабходных выпускніку для паспяховай жыццядзейнасці і прадуктыўнага вырашэння сацыяльна-прафесійных задач.[65]

Субкультурная пісьменнасць – асобасная якасць, што характарызуецца асэнсаваным засваеннем сацыякультурных ведаў праз падабенства і спецыфіку розных субкультур (каштоўнасцей, норм паводзін, рытуалаў зносін, сімволікі). Субкультурная пісьменнасць утрымлівае *пазнавальную* (сістэматызацыя сацыякультурных ведаў аб асаблівасцях і спецыфіцы разнастайных субкультур), *рэгулятыўную* (сістэма норм і патрабаванняў да ўзаемадзеяння

[64] Систематика терминологического аппарата педагогики в условиях парадигмальных изменений как фактор обновления содержания педагогического образования: монография / А.И. Жук [и др.]; под науч. ред. А.В. Торховой, О.Б. Даутовой. – Минск: БГПУ, 2019. – С. 7.

[65] Куратов, А.О. Формирование социальной грамотности у курсантов в информационной образовательной среде военного вуза: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / А.О. Куратов. – Кострома, 2010. – С. 8.

прадстаўнікоў субкультур з іншымі членамі соцыуму), *каштоўнасную* (фарміраванне ўласнага меркавання пра нормы і эстэтыку любой субкультуры) і *арыентацыйную* (здольнасць самастойна наладжваць паўнацэнныя сацыяльныя адносіны) састаўныя.[66]

Камп'ютарная пісьменнасць – ступень валодання апаратным і праграмным забеспячэннем камп'ютара з мэтай яго выкарыстання ў вучэбнай і будучай прафесійнай дзейнасці, а таксама *гатоўнасць* засвойваць новыя камп'ютарныя сродкі.[67]

Моўная функцыянальная пісьменнасць усведамляецца як "*наяўнасць навыкаў* нарматыўнага пісьма і чытання, здольнасць да ўспрымання і сэнсавай перапрацоўкі тэксту, *валоданне* элементарнымі сродкамі пошуку і адбору інфармацыі".[68]

Лічбавая фінансавая пісьменнасць – гэта *сукупнасць ведаў, уменняў і асобасных якасцей*, неабходных для бяспечнага і адказнага выкарыстання лічбавых фінансавых прадуктаў і паслуг.[69]

Кроскультурная пісьменнасць азначае *разуменне культуры* іншага народа як адна з найважнейшых разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці, пры гэтым разуменне выступае яе асноватворным, сістэмаўтваральным элементам. Кроскультурная пісьменнасць усведамляецца і як *уменне* ўспрымаць змест і формы культуры іншага народа, удзельнічаць у сумеснай культурнай дзейнасці, што ўзбагачае і развівае асобу.[70]

Аналіз прыведзеных і падобных азначэнняў дае падставу для наступных вывадаў:

– множнасць вылучэння (часам беспадстаўнае, нематываванае) разнавіднасцей пісьменнасці нагадвае "парад пісьменнасцей" (па аналогіі з выразам "парад парадыгм як рэакцыя на мноства разнавіднасцей адукацыйных парадыгм у педагагічных даследаваннях (трансцэндэнтальная, тэхнакратычная, гуманістычная, гуманітарная і інш.");[71]

– мноства дэфініцый функцыянальнай пісьменнасці, адрозных ад класічнай формулы азначэння, пры адсутнасці родавага адзінства ўяўляюць сабой дастаткова суб'ектыўнае разуменне паняцця. Як справядліва зазначае праф. В.Л. Жук, "каб выдзеліць у такіх выпадках галоўнае, сутнаснае для

[66] Ситникова, Е.Н. Формирование субкультурной грамотности подростка в условиях взаимодействия школы и семьи: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Е.Н. Ситникова. – Волгоград, 2014. – С. 10–11.

[67] Данилов,А. В. Формирование компьютерной грамотности студентов-билингвов на основе двуязычного обучения: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / А.В. Данилов. – Казань, 2019. – С. 7.

[68] Акатова, Т.И. Языковая функциональная грамотность и языковая культура студентов (психолого-педагогический аспект): монография / Т.И. Акатова. – М.: Дашков и К, 2016. – С. 20.

[69] Салахова, Е.А. Формирование цифровой финансовой грамотности студентов вузов: автореф. дис. … канд. пед. наук: 5.8.7 / Е.А. Салахова. – Челябинск, 2022. – С. 9.

[70] Рощупкин, В.Г. Кросскультурная грамотность студента – будущего учителя (диагностика и формирование): научное издание / В.Г. Рощупкин. – М.: Изд-во Московского психолого-социального ин-та, 2006. – С. 78–79.

[71] Краевский, В.В. Методология педагогики: новый этап: учебное пособие / В.В. Краевский, Е.В. Бережнова. – М.: Академия, 2006. – С. 68.

сучаснай педагогікі, неабходны пошук канцэптаў… Ускладненне сённяшняй педагагічнай рэальнасці патрабуе яе метадалагічнага абгрунтавання”;[72]

– рознатыповасць структуры функцыянальнай пісьменнасці, разнароднасць родавага кампанента наяўных дэфініцый, вызначэнне функцыянальнай пісьменнасці праз *узровень ведаў і ўменняў, узровень адукаванасці; веды, уменні, навыкі, спосабы дзейнасці; здольнасць асобы набываць і выкарыстоўваць веды; сацыяльна-педагагічную характарыстыку асобы; здольнасць прымяняць універсальныя метады дзейнасці* прыводзяць да метадалагічнага дысанансу, выкліканага некрытычным асэнсаваннем тэрміна. Варта зазначыць, што функцыянальная пісьменнасць не можа выступаць як механічная сукупнасць ведаў, уменняў, навыкаў. Паняцце павінна быць цэласным, інтэграваным, міждысцыплінарным, адэкватным сучаснаму разуменню і характару культурна-інфармацыйнага адукацыйнага асяроддзя. У паняцці павінны акумулявацца гуманітарныя і прыродазнаўчыя аспекты дзейнасці ў гармоніі і ўзаемадапаўненні. Інакш “прыпісванне” функцыянальнай пісьменнасці рыс, характэрных для кампетэнцый, пераўтварае іх у блізказначныя паняцці, што не адпавядае класічным установкам педагагічнай тэрмінатворчасці. Як вядома, тэрмін як ідэальны знак “не можа мець сінонімаў. Любое новае адценне паняцця павінна атрымліваць у межах тэрміналогіі ўласнае абазначэнне”.[73]

Сэнсавае падабенства функцыянальнай пісьменнасці і кампетэнцыі заключаецца ў іх інтэграваным характары, арыентацыі на вынікі, на сучасны змест адукацыі. Будучы адкрытым для абгрунтаваных змен, пэўных карэкцый, змест адукацыі нязменна адлюстроўвае ўніверсальныя каштоўнасці чалавечай цывілізацыі. У сучасным кантэксце функцыянальная пісьменнасць “прарастае” ў культуры, становіцца формай пазнання навакольнага асяроддзя, спосабам цэласных, гарманічных адносін з соцыумам. Кампетэнцыі, набытыя ў выніку засваення культуры, выступаюць цэласнай характарыстыкай навучэнца як носьбіта нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей у адзінстве ведавай, дзейнаснай і аксіялагічнай падструктур.

Сувязь адукацыі і культуры пры вызначэнні зместу паняццяў найбольш арганічная. Гэта сутнасная ўзаемаабумоўленасць, паколькі адным з асноватворных прынцыпаў існавання і развіцця адукацыі выступае культураадпаведнасць, у рэчышчы якога адукацыя разглядаецца найперш як “сацыяльны інстытут з функцыяй культурнага станаўлення чалавека, або ўзнаўлення культуры чалавека ў грамадстве”.[74]

---

[72] Систематика терминологического аппарата педагогики в условиях парадигмальных изменений как фактор обновления содержания педагогического образования: монография / А.И. Жук [и др.]; под науч. ред. А.В. Торховой, О.Б. Даутовой. – Минск: БГПУ, 2019. – С. 26.

[73] Куликова, И.С. Введение в металингвистику (системный, лексикографический и коммуникативно-прагматический аспекты лингвистической терминологии): учебное пособие / И.С. Куликова, Д.В. Салмина. – СПб.: САГА, 2012. – С. 36.

[74] Розов, Н.С. Методологические принципы ценностного прогнозирования образования / Н.С. Розов // Социально-философские проблемы образования: монография. – М.: Просвещение, 2002. – С. 20.

На этапе паглыблення паняцця ўзнікае праблема канцэптуальнай шматзначнасці, што патрабуе размежавання *функцыянальнай пісьменнасці* і *кампетэнцыі*. Абодва паняцці маюць устойлівы статус, аднак іх паралельнае суіснаванне ў сферы пазнавальнай дзейнасці ўносіць пэўныя карэктывы ў іх трактоўку. Так, паводле А.П. Трапіцынай, функцыянальная пісьменнасць – гэта "ўменне вырашаць жыццёвыя задачы ў розных сферах дзейнасці на аснове прыкладных ведаў". Кампетэнцыя акрэсліваецца як "здольнасці, што дазваляюць асобе вырашаць тыповыя праблемы і задачы, якія ўзнікаюць у рэальных сітуацыях паўсядзённага жыцця на базе тэарэтычных ведаў і жыццёвага вопыту". Прыведзеныя дэфініцыі адрозніваюцца родавым кампанентам (уменне і здольнасць), якія вызначаюцца дзейнасным характарам. Калі браць пад увагу розніцу ў *тэарэтычных ведах* (якія, дарэчы, дапаўняюцца кампанентам *жыццёвы вопыт*) *і практычных*, то цяжка правесці дэмаркацыйную лінію паміж паняццямі. Устаноўка на адрозненне ў тэарэтычных і практычных аспектах не можа быць вырашальнай, паколькі некаторыя вучоныя настойліва праводзяць думку пра адсутнасць розніцы паміж тэарэтычнымі і практычнымі ведамі, паміж ведамі і ўменнямі (напрыклад, У.П. Бяспалька, С.А. Шапарынскі і інш.). Так, У.П. Бяспалька фактычна атаясамлівае, ураўноўвае іх, вылучаючы наступныя ўзроўні сфарміраванасці ведаў: *веды-знаёмства, веды-копіі, веды-ўменні, веды-трансфармацыі.* [75] Тым самым усталёўваецца ўзровень, які паўнацэнна праяўляецца толькі ў практычным выкарыстанні. У такім разе засваенне вопыту адбываецца праз спосабы дзейнасці, што трансфармуе *веды* ў *веды-ўменні*. Тым больш, што пераважная колькасць даследчыкаў актыўна выкарыстоўвае гэтыя паняцці пры распрацоўцы канцэпцый мадэрнізацыі школьнай адукацыі. У якасці *аб'яднальных момантаў* можна адзначыць:

– адзінства інтэлектуальнай і навыкавай састаўных;

– сходную інтэрпрэтацыю зместу, сфарміраванага ў кантэксце адукацыйных вынікаў;

– інтэграцыю аднародных або блізкароднасных ведаў і ўменняў, арыентаваных на арганізацыю дзейнасці.

Некаторыя педагогі дыферэнцыруюць паняцці, сцвярджаюць, што функцыянальная пісьменнасць – гэта здольнасць асобы адаптавацца да асяроддзя, а кампетэнцыя выяўляе, у якой ступені выпускнік здольны адказаць на выклікі часу, рынку працы, запыты грамадства, у якой ступені школа рыхтуе канкурэнтаздольную асобу.[76] Сэнсавая блізкасць трактоўкі паняццяў назіраецца ў працах А.Е. Лебедзева: "*Функцыянальная пісьменнасць* – здольнасць прымяняць універсальныя метады дзейнасці, заснаваныя на пэўных нормах, для выкарыстання ведаў (звестак, навуковых паняццяў, інструкцый), атрыманых з

[75] Беспалько, В.П. Киберпедагогика: учебное пособие / В.П. Беспалько. – М.: Лабиринт, 2018. – С. 22.

[76] Назарова, Н.А. Развитие функциональной грамотности студентов педагогического вуза в условиях гуманитаризации образовательного процесса: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.08 / Н.А. Назарова; Омский гос. пед. ун-т. – Омск, 2007. – С. 12.

розных крыніц з мэтай вырашэння праблем сацыяльнай адаптацыі на аснове прымянення правілаў і норм да канкрэтнай сітуацыі”.[77]

Азначэнне *кампетэнцыі* падаецца як “здольнасць прымяняць універсальныя метады дзейнасці, заснаваныя на навуковых ідэях і прынцыпах, для выкарыстання сістэмы ведаў (звестак, паняццяў, правілаў і норм, тэорый і канцэпцый), атрыманых з арыгінальных крыніц навуковай інфармацыі і ў выніку ўласнай даследчай дзейнасці, з мэтай тэарэтычнага абгрунтавання шматкрытэрыяльнага выбару рашэнняў”.[78] Пры такім зместавым напаўненні функцыянальную пісьменнасць можна разглядаць як інтэграваную, асобасную кампетэнцыю, якая заключаецца ва ўменні рашаць задачы ў розных сферах жыццядзейнасці на базе атрыманых ведаў.

Паняцці *функцыянальная пісьменнасць* і *кампетэнцыя* маюць яшчэ адну інтэграваную якасць – выніковасць у дасягненні мэты. Мы не можам пагадзіцца з нівеліроўкай, атаясамліваннем, адсутнасцю розніцы паміж паняццямі – на фоне сэнсавага падабенства, – абумоўленага першасным прызнаннем межаў навуковага пазнання, імкненнем некаторых даследчыкаў праігнараваць пэўныя дэталі, а часам і аўтарытэтныя меркаванні, ацэначныя суджэнні. Гэтыя паняцці розныя па сваёй сутнасці, што пацвярджаецца значнасцю аргументаваных вывадаў, агульнапрызнаных меркаванняў. Аналіз сучасных прац, выкананых у педагагічнай сферы па праблеме кампетэнцый, дазваляе вылучыць асноўныя параметры ў характарыстыцы паняцця *кампетэнцыя* ў супастаўленні з функцыянальнай пісьменнасцю:

– *дзейнасны параметр:* кампетэнцыя выяўляецца найперш у фармаце дзейнасці. Адпаведна ўрокі мовы – гэта засваенне мовы ў дзеянні (А.Г. Асмолаў, Н.В. Кузьміна, Л.М. Міціна, Л.М. Пермінава, П.І. Фралова, І.Д. Фрумін, С.Я. Шышоў, М.Г. Яленскі, В.А. Ярмоленка і інш.). Так, А.Г. Асмолаў адзначае, што “ў шырокім сэнсе слова кампетэнцыя – гэта веды ў дзеянні. Эфектыўнае выкананне дзеяння заўсёды ўтрымлівае веды як жаданы прадбачаны вынік дзеяння, так і сродкі дасягнення гэтага выніку”.[79] Аднак метадалагічны падыход да сістэматызацыі педагагічных ведаў патрабуе “на фоне разнастайнасці і супярэчлівасці трактовак даследаваных фактаў адукацыйнай рэальнасці дакладнага, абагульненага разумення педагагічнага аб’екта” [80];

– *культуралагічны параметр:* кампетэнцыя суадносіцца з паняццем культуры; мадэль сучаснай адукацыі трактуецца як працэс трансляцыі ўзораў

[77] Лебедев, О.Е. Образованность учащихся как цель образования и образовательный результат / О.Е. Лебедев // Контроль качества и оценка в образовании: материалы междунар. конф. – СПб.: РГПУ им. А.И. Герцена, 2003. – С. 127.

[78] Лебедев, О.Е. Образованность учащихся как цель образования и образовательный результат / О.Е. Лебедев // Контроль качества и оценка в образовании: материалы междунар. конф. – СПб.: РГПУ им. А.И. Герцена, 2003. – С. 113–129.

[79] Асмолов, А.Г. Социальная компетентность классного руководителя: режиссура совместных действий: учебное пособие / А.Г. Асмолов, Г.У. Солдатова. – М.: Смысл, 2006. – С. 221.

[80] Систематика терминологического аппарата педагогики в условиях парадигмальных изменений как фактор обновления содержания педагогического образования: монография / А.И. Жук [и др.]; под науч. ред. А.В. Торховой, О.Б. Даутовой. – Минск: БГПУ, 2019. – С. 25.

агульначалавечай і нацыянальнай культуры (Я.В. Бандарэўская, В.У. Зелянко, В.А. Маслава, А.М. Новікаў, М.А. Халодная і інш.);

– *асобасны параметр:* кампетэнцыя разглядаецца як індывідуальная характарыстыка асобы, навучэнец дзейнічае “як індывідуальнасць, непаўторная самарэгуляваная сістэма” [81] (Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, В.У. Протчанка, І.У. Таяноўская, М.Г. Яленскі);

– *адукацыйны параметр:* кампетэнцыя характарызуецца як узровень адукаванасці асобы. Набытая сістэма ведаў, уменняў становіцца “своеасаблівым рэгулятарам, цэнзарам вербальных паводзін, моўных учынкаў” [82] (Б.С. Гершунскі, А.У. Данілаў, І.А. Калеснікава, Д.І. Паўлаў, В.У. Протчанка, М.Г. Яленскі);

– *матывацыйны параметр*: (Н.У. Бушная, В.Л. Жук, С.І. Колбышава, Н.А. Назарава). Гэты паказчык у першую чаргу вызначае “асабістыя каштоўнасці, сацыяльныя і палітычныя перакананні і меркаванні, а таксама ўяўленні чалавека пра тое, якое месца ён сам і іншыя займаюць у грамадстве”.[83] На думку Дж. Равена, менавіта “ацэнка прыярытэтаў і каштоўнасцей павінна быць не перыферыйнай, а цэнтральнай задачай”.[84]

Змест паняцця *кампетэнцыя*, апроч агульнапрызнаных – веды, уменні, навыкі, вопыт дзейнасці, – уключае каштоўнасны кампанент, які характарызуе духоўную састаўную светаўспрымання асобы, ступень асэнсавання, ацэньвання ўласных дасягненняў, якасць узаемаадносін з іншымі, вопыт засваення рэфлексійных уменняў, што забяспечваюць адэкватную ацэнку і самаацэнку. Аб’ядноўваюць паняцці структурная разгалінаванасць, шматкампанентнасць кампетэнцый (каштоўнасна-сэнсавая, агульнакультурная, вучэбна-пазнавальная, тэхналагічная, эканамічная, грамадзянска-прававая, палітычная, метадалагічная і інш.) і структурная дыферэнцыяцыя разнавіднасцей функцыянальнай пісьменнасці. Так, А.Е. Лебедзеў вылучае ў структуры функцыянальнай пісьменнасцт 26 элементаў, падкрэсліваючы, што “дадзены састаў яшчэ можа быць удакладнены, а кожны элемент функцыянальнай пісьменнасці ўяўляе сабой склад, шматграннае ўтварэнне”.[85]

На сённяшні дзень назапашаны дастаткова багаты арсенал даследаванняў па праблеме функцыянальнай пісьменнасці. Апублікаваны працы расійскіх сацыёлагаў, філосафаў, педагогаў, псіхолагаў (С.Г. Вяршлоўскі, Б.С. Гершунскі, І.А. Калеснікава, А.Е. Лебедзеў, Л.М. Пермінава, І.У. Шутава і інш.), беларускіх вучоных (В.У. Зелянко, С.І. Колбышава, С.А. Крупнік, У.У. Мацкевіч, В.Ф. Русецкі і інш.). Распрацоўваюцца метадычныя аспекты

[81] Протчанка, В.У. Роднае слова – крыніца развіцця асобы, духоўнасці народа / В.У. Протчанка // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 12. – С. 60–65.

[82] Яленскі, М. Г. Мова – сродак навучання, выхавання і развіцця асобы вучня / М.Г. Яленскі // Пачатковая школа. – 2013. – № 3. – С. 42–45.

[83] Бушная, Н.В. Сущность, структура и функции социальной компетентности старшеклассников / Н.В. Бушная // Образование и наука в XXI веке: сб. науч. трудов БГПУ. – 2019. – Вып. 2. – С. 16.

[84] Равен, Дж. Компетентность в современном обществе: выявление, развитие и реализация / Дж. Равен. – М.: Когито-Центр, 2002. – С. 6.

[85] Лебедев, О.Е. Воспитание в школе: диалектика прошлого и будущего: монография / О.Е. Лебедев. – СПб.: СПбГУР, 2022. – С. 57.

фарміравання асобных кампанентаў функцыянальнай пісьменнасці ў працэсе вывучэння школьных прадметаў (Т.Н. Канашэвіч, В.Л. Жук, А.В. Пазняк, В.І. Цірынава, Т.Е. Цітавец і інш.). Маюцца станоўчыя вынікі беларускіх навучэнцаў у міжнародных даследаваннях PISA. Аднак айчыннай адукацыі яшчэ трэба зрабіць крок наперад у плане практычнага выхаду за межы звыклых, стэрэатыпных вучэбных сітуацый, стандартызаваных задач у школьных падручніках. Варта пашыраць фармат заданняў, што патрабуюць комплекснай працы з тэкстам, скіраванай на разуменне, трансфармацыю, ацэнку інфармацыі.

З улікам змен у трактоўцы зместу паняцця *функцыянальная пісьменнасць* на сучасным этапе развіцця адукацыі разумеецца як інтэграваная здольнасць чалавека ажыццяўляць дзейнасць у грамадстве, вырашаць пазнавальныя, камунікатыўныя задачы, абапіраючыся на засвоены сацыяльны вопыт. Такое разуменне функцыянальнай пісьменнасці карэлюе са зместавымі ўстаноўкамі сучаснага інавацыйнага праекта Міністэрства асветы Расійскай Федэрацыі "Маніторынг фарміравання функцыянальнай пісьменнасці": "Функцыянальная пісьменнасць – здольнасць чалавека дзейнічаць у сучасным грамадстве, вырашаць разнастайныя задачы, выкарыстоўваючы пры гэтым пэўныя вучэбна-навуковыя навыкі".[86] Прыведзеная дэфініцыя адпавядае кантэксту вызначэння паняцця ў айчынным праекце, распрацаваным вучонымі НІА Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.[87]

Сучасная трактоўка функцыянальнай пісьменнасці акцэнтуе наступныя аспекты дэфініравання адзінкі, абумоўленыя відазмяненнем паняцця ў кантэксце патрабаванняў грамадства да сённяшняй сістэмы адукацыі:

– акцэнтаванне ў сучасных стандартах вынікаў навучання як адукацыйных і сацыяльных патрэбнасцей, рэалізаваных у інтарэсах асобы і грамадства;

– актуалізацыя сацыяльнага кантэксту фарміравання функцыянальнай пісьменнасці як выкарыстанне атрыманых ведаў, уменняў, вопыту ў пазнавальных і сацыяльных сітуацыях для "рашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач" (А.А. Лявонцьеў);

– разуменне ўніверсальнага характару навыкаў працы з інфармацыяй у кантэксце функцыянальнай пісьменнасці, пры гэтым інфармацыйныя ўменні прызнаюцца інтэграваным кампанентам агульнай падрыхтоўкі.

Паўнацэннасць праведзеных даследаванняў пацвярджаецца і фактам наяўнасці азначэння ў слоўніку метадычных тэрмінаў і паняццяў: "Функцыянальная пісьменнасць – здольнасць чалавека ўступаць у адносіны са знешнім асяроддзем і максімальна адаптавацца, функцыянаваць у ім. Функцыянальная пісьменнасць ёсць узровень ведаў, уменняў, навыкаў, што забяспечваюць нармальнае функцыянаванне асобы ў сістэме сацыяльных адносін, узровень, які лічыцца мінімальна неабходным для жыццядзейнасці

[86] Басюк, В.С. «Мониторинг формирования функциональной грамотности»: основные направления и первые результаты / В.С. Басюк, Г.С. Ковалева // Отечественная и зарубежная педагогика. – 2019. – Т. 1. – № 4. – С. 18.

[87] Русецкий, В.Ф. Перспективные фундаментальные научные исследования Национального института образования / В.Ф. Русецкий, О.В. Зеленко // Веснік адукацыі. – 2021. – № 4. – С. 6.

асобы ў канкрэтным культурным асяроддзі”. [88] Як вядома, факт лексікаграфічнай стандартызацыі ўстанаўлівае нарматыўныя межы зместу адзінкі і замацоўвае сэнсавыя сувязі з іншымі тэрмінамі.

Зазначым, што не ўсе вучоныя схільныя разглядаць вынікі засваення адукацыйных праграм выключна ў фармаце функцыянальнай пісьменнасці (А.А. Лявонцьеў, М.А. Халодная і інш.). Гэта вымушае да пошукаў рацыянальнай асновы распрацоўкі інтэграваных методык. Асабліва дадзеная праблема патрабуе вырашэння ў сферы выкладання школьных прадметаў. Тым больш, што для стварэння інтэграваных методык ёсць неабходная аб’ектыўная аснова – кумулятыўны характар кампетэнцый – “…узаемазамяняльнасць адных кампетэнцый іншымі для паспяховага вырашэння праблем. Гэтая асаблівасць мае сваёй перадумовай выяўленне комплекснага нелінейнага характару развіцця кампетэнцый ва ўзаемасувязі”.[89]

У сучаснай адукацыі перавага надаецца не ведам, а якасцям асобы, што дапамагаюць хутка адаптавацца ў новых умовах, уменням самастойнага пошуку і трансфармацыі інфармацыі, навыкам вызначэння і вырашэння праблем, разумення таго, што прафесійнае станаўленне залежыць не столькі ад аб’ёму ведаў, колькі ад сфарміраванасці функцыянальнай пісьменнасці і кампетэнцый. Як сцвярджае прафесар Г.У. Пальчык, “зменлівы свет патрабуе пастаяннай гатоўнасці вучыцца і развіваць навыкі на працягу ўсяго жыцця”.[90] У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі найважнейшай задачай прызнаецца фарміраванне “мяккіх” навыкаў (soft skills): *камунікацыі* (устанаўленне кантактаў, уменне адстаяць уласны пункт погляду), *крэатыўнасці* (комплексная ацэнка сітуацыі і спосабы яе эфектыўнага рашэння), *кааперацыі* (уменне працаваць у камандзе), *крытычнага мыслення* (ацэнка інфармацыі, яе адбор для адэкватнага рашэння).

Зазначым, што існуе пэўная рызыка засяроджанасці школьнай адукацыі толькі на развіцці функцыянальнай пісьменнасці вучняў. З аднаго боку, валоданне “наборам” разнавіднасцей пісьменнасці – чытацкая, лічбавая, інфармацыйная – гэта аб’ектыўная патрэбнасць для забеспячэння якасці жыцця ў соцыуме. Гэты “набор” можа папаўняцца пералікам новых кампетэнцый і разнавіднасцей пісьменнасці. З другога боку, сфакусіраванасць адукацыйных мэтаў толькі на прагматычнасці функцыянавання чалавека ў грамадстве ўтрымлівае небяспеку “засланіць” змест крэатыўнай дзейнасці, суб’ектнасці, індывідуальнасці асобы. У гэтым рэчышчы надзвычай важна захаваць рацыянальны баланс паміж “цвёрдымі” і “мяккімі” кампетэнцыямі, што фарміруюць інтэлектуальны і творчы патэнцыял асобы, грамадства, дзяржавы.

---

[88] Азимов, Э.Г. Новый словарь методических терминов и понятий (Теория и практика обучения языкам) / Э.Г. Азимов, А.Н. Щукин. – М.: Икар, 2009. – С. 342.

[89] Жук, О.Л. Организация научно-педагогических исследований по проблеме формирования функциональной грамотности и компетенций / О.Л. Жук // Вышэйшая школа. – 2022. – № 4. – С. 6.

[90] Пальчик, Г.В. Профессиональная ориентация как объект научных исследований и социально значимое направление образовательной деятельности / Г.В. Пальчик // Веснік адукацыі. – 2023. – № 1. – С. 6.

1.3 Трансфармацыя тэксту ў рэчышчы пазнавальных інтарэсаў сучасных навучэнцаў

Павышэнне статусу ведаў, інфармацыйных тэхналогій спараджае новы этап развіцця сучаснай адукацыі. Так, “Канцэпцыя нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 года” сярод вядучых трэндаў дзейнасці грамадства вылучае рэсурсы, заснаваныя “на лічбавых тэхналогіях і моўнай пісьменнасці” як стратэгію адукацыі XXI стагоддзя.[91] У адпаведнасці з канцэпцыяй, прыярытэтным напрамкам у развіцці сістэмы адукацыі становіцца “фарміраванне асобы з сістэмным светапоглядам, крытычным, сацыяльна і экалагічна арыентаваным мысленнем і актыўнай грамадзянскай пазіцыяй”.[92]

Сістэма адукацыі, будучы часткай соцыуму, заўсёды вылучалася дынамізмам, паколькі не можа не рэагаваць на трансфармацыі, не ўлічваць асаблівасцей сацыяльнай сітуацыі. Сённяшняя адукацыйная прастора адлюстроўвае змены, выкліканыя ўздзеяннем сацыякультурных фактараў: інфарматызацыя грамадства, інтэнсіўнасць лічбава-камунікатыўных тэхналогій, перабудова кагнітыўнай сферы маладых людзей. Сучасная адукацыйная прастора характарызуецца развіццём наступных тэндэнцый:

– разуменне зместу адукацыі не як сукупнасці прадметных ведаў, а як сістэмы культуры – інфармацыйнай, працэдурнай, рэфлексійнай;

– устойлівы інтарэс да рашэння практыка-арыентаваных задач, якія прадугледжваюць выкарыстанне розных інфармацыйных крыніц, павышэнне ролі працэдурных ведаў;

– запатрабаванасць у прымяненні тэхналогій, скіраваных на задавальненне асабістых запытаў, на самасцвярджэнне, у старшых класах – на ажыццяўленне праектна-даследчай дзейнасці, на выбар прафесійнага шляху;

– павышэнне ўдзельнай вагі рэфлексійных ведаў, скіраваных на спазнанне ўласнага патэнцыялу, развіццё асобаснай матывацыі.

Віртуальныя зносіны, новыя спосабы навучання і камунікацыі адлюстроўваюць варыянты кантактавання з дапамогай медыйных сродкаў: адукацыйныя парталы, шматлікія педагагічныя форумы, блогі, лекцыйныя і практычныя матэрыялы, прадстаўленыя інтэрнэт-сервісам YouTube. Як вядома, традыцыйныя формы зносін – пісьмовая і вусная – знаходзяцца ў адносінах актыўнага ўзаемаўплыву. Сучасная сітуацыя парушае гэтую камунікатыўную гармонію. Камунікатыўны дысбаланс выклікаецца тым, што, з аднаго боку, віртуальныя формы зносін маюць вялікі патэнцыял для самаадукацыі, узбагачэння інтэлектуальных магчымасцей. З другога боку, скарачэнне часу на рэальныя кантакты прыводзіць да фармальнага і фрагментарнага “жывога” ўзаемадзеяння, якое набывае паверхневы, няўстойлівы характар.

---

[91] Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 года // Экономический бюллетень Науч.-исслед. экон. ин-та М-ва экономики Республики Беларусь. – 2015. – № 4. – 99 с.

[92] Валочка, Г.М. Прыярытэтныя задачы моўнай адукацыі (вучэбны прадмет “Беларуская мова”) у сучасных умовах / Г.М. Валочка // Педагогическая наука и образование. – 2017. – № 3. – С. 3–8.

Псіхолагі адзначаюць: развіваецца тэндэнцыя да зніжэння ўзроўню сацыяльнай адаптацыі падлеткаў, што тлумачыцца павелічэннем удзельнай вагі не рэальнай, а віртуальнай камунікацыі. Сучасная моладзь характарызуецца больш высокай ступенню эмацыянальнай нестабільнасці і інфантыльнасці. Фарміруецца такая негатыўная тэндэнцыя, як павелічэнне дыстанцыі паміж суб'ектамі адукацыйнага працэсу, зніжэнне значнасці зносін паміж настаўнікамі і вучнямі, рост трывогі, напружанасці ў адносінах. Так, аўтар дысертацыі З.М. Чакуева акцэнтуе ўвагу на дэструктыўным, адчужаным стылі ўзаемаадносін педагога і дзяцей, на "безасобасным" падыходзе да вучняў.[93] У сучасных умовах усведамляецца неабходнасць выключна прафесійнага ўзаемадзеяння педагога з навучэнцамі. Актуальным і запатрабаваным у партрэце сучаснага настаўніка з'яўляецца набор такіх якасцей, як "стрэсаўстойлівасць (праца з навучэнцамі і іх бацькамі з улікам канфесійных, этнічных і нацыянальных аспектаў), працаздольнасць (наладжванне кантактаў з вучнямі і іх бацькамі па-за ўрокамі праз сацыяльныя сеткі), амбіцыйнасць (актыўны рост па кар'ернай лесвіцы), што ў пэўнай ступені адносіцца да функцый спецыяліста са сферы бізнеса – менеджара".[94]

Псіхолагі вылучаюць адчужаны стыль узаемаадносін у школе, што характарызуецца найперш адсутнасцю станоўчых эмоцый. Безэмацыянальнасць у адносінах – трывожны сімптом для сучаснага пакалення, паколькі і лінгвістычная, і псіхалагічная навука сцвердзіліся ў прызнанні: эмоцыі – неад'емная частка жыцця, матывацыйная аснова добразычлівых сацыяльных паводзін: "Уся лексіка мовы/маўлення мае эмацыянальны характар". [95] Нездарма знакамітыя вучоныя выказваюцца за фарміраванне і развіццё эмацыянальнай пісьменнасці вучняў, што падразумявае здольнасць кіраваць эмоцыямі з мэтай паляпшаць узаемаадносіны паміж людзьмі, выклікаць пачуццё агульнасці інтарэсаў, духоўнай, а значыць, і эмацыянальнай еднасці. Псіхолагі сцвярджаюць: "Сапраўдная мэта агульнай адукацыі павінна вызначацца адным, але дастаткова ёмістым словам – адухоўленасць. Адухоўленасць чалавека як асэнсаванне ім свайго адзінства з гэтым цудоўным і дзіўным светам, а гэта не магчыма без шчырай зацікаўленасці да разумення яго ўнутранай сутнасці, без сфарміраванага пачуцця адказнасці за яго".[96]

У кантэксце змен у соцыуме, інтэнсіўнага развіцця тэхналогій і сацыяльных сетак сфарміравалася новае пакаленне, якое нарадзілася або выросла ў новым – інфармацыйным – грамадстве. Зразумела, што сучасная методыка павінна ўлічваць псіхалінгвістычныя асаблівасці сённяшніх падлеткаў, спецыфіку пазнавальнай сферы прадстаўнікоў пакалення Z, паводле

[93] Чеккуева, З.Н. Речевая агрессия педагога как деструктивный фактор межличностного взаимодействия в системе «учитель–ученик»: автореф. дис. … канд. пед. наук: 19.00.07 / З.Н. Чеккуева. – Ставрополь, 2004. – С. 18.

[94] Ершова, О.В. Портрет педагога в реальном времени / О.В. Ершова // Педагогика. – 2019. – № 1. – С. 100.

[95] Мягкова, Е.Ю. Эмоционально-чувственный компонент значения слова: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.19 / Е.Ю. Мягкова. – М., 2000. – С. 17.

[96] Васильев, И.А. Эмоции и мышление / И.А. Васильев, В.Л. Поплужный, О.К. Тихомиров. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1990. – С. 162.

тэрміналогіі псіхолагаў і сацыёлагаў. Сярод найменняў прадстаўнікоў новай генерацыі фігуруюць шматлікія назвы: лічбавае пакаленне, лічбавыя абарыгены, лічбавыя з нараджэння, лічбавікі і інш. Аб'яднальным момантам усіх назваў з'яўляецца станаўленне пакалення ва ўмовах лічбавай рэвалюцыі, новых інфармацыйных тэхналогій, развіццё грамадства ў так званы постіндустрыяльны перыяд. Актыўная ўвага да прадстаўнікоў новага пакалення вытлумачваецца як колькаснымі, так і якаснымі паказчыкамі новай генерацыі. Паводле дадзеных інфармацыйнага агенцтва Bloomberg, у 2019 годзе колькасць Z (зэтаў) складала трэцюю частку (32%) насельніцтва планеты.[97]

Сярод характарыстык пакалення Z даследчыкі (А.А. Вярбіцкі, О.В. Дружба, Т.В. Конюхава, Дж.М. Твендж, В.В. Яршова і інш.) вылучаюць:

– ранняе авалоданне лічбавымі тэхналогіямі;

– пастаяннае знаходжанне ў фармаце online, што выклікае адпаведную залежнасць і спараджае рызыку online-асяроддзя;

– шматвектарнасць, паралельнасць у вырашэнні некалькіх задач;

– павелічэнне хуткасці ўспрымання інфармацыі на фоне праблемы засяродзіцца, сканцэнтраваць увагу;

– дамінаванне візуальнай інфармацыі, прыярытэт невербальных тэкстаў;

– развіццё кліпавага мыслення;

– запамінанне алгарытмаў атрымання інфармацыі, а не самой інфармацыі (эфект Google);

– цяжкасці з успрыманнем складанага/аб'ёмнага тэксту.

Як зазначаюць вучоныя, сучаснае пакаленне здольна адначасова вырашаць некалькі задач, паралельна знаходзіцца на некалькіх сайтах, аднак, як правіла, не прыстасавана да выканання лінейных заданняў, адсутнічае навык канцэнтраваць увагу. Як правіла, адказы на ўсе пытанні шукаюцца ў Інтэрнэце.

Што да мультызадачнасці, то яе ацэнка пралягае ў дыялектычнай плоскасці – як станоўчай, так і негатыўнай. Доктар псіхалагічных навук Джын Твендж перакананы: мультызадачнасць суправаджаецца непазбежнай праблемай, паколькі "чалавечы мозг не можа выконваць больш за адну задачу ў кожны дадзены момант. Калі вы спрабуеце займацца дзвюма справамі адначасова, вам прыходзіцца пераключаць сваю ўвагу. Гэта патрабуе часу, намаганняў і не з'яўляецца самым эфектыўным спосабам… Рэальная мультызадачнасць не пад сілу ніводнаму чалавеку".[98]

Адна з асаблівасцей прадстаўнікоў лічбавага пакалення, як падкрэсліваюць навукоўцы, – сфарміраванасць кліпавага мыслення. Вучоныя з дыяметральных пазіцый ацэньваюць кліпавае мысленне як здольнасць чалавека ўспрымаць сусвет праз яркія карцінкі, сцісліыя фрагменты ў фармаце відэакліпа або тэлевізійных навін. Гэта свайго роду абарона, засцярога ад залішняй інфармацыі, сродак пазбаўлення ад інфармацыйнай перагрузкі. Здольнасць

[97] Медийный портрет подростка двухтысячных годов / сост. С.Б. Цымбаленко. – М.: НИИ школьных технологий, 2020. – С. 26.

[98] Твендж, Джин М. Поколение селфи: науч.-попул. издание / Джин М. Твендж. – М.: Эксмо, 2018. – С. 273.

хутка пераключацца з адной інфармацыі на іншую мабілізуе чалавека, фарміруе звычку арганізоўваць сябе, уласны час. Што да адмоўных прымет кліпавага мыслення, то яны праяўляюцца ў няўстойлівай здольнасці выбудоўваць лагічныя, прычынна-выніковыя ланцужкі, у адсутнасці ўменняў аналізу, сінтэзу, супастаўлення, абагульнення інфармацыі, у няўменні асэнсаваць іерархію задач, вылучыць падзадачы як этапы дасягнення вынікаў. У кантэксце канцэнтрацыі на інфармацыі паслабляюцца эмацыянальныя сувязі, пачуццё суперажывання за агульны поспех. З улікам спецыфікі кліпавага мыслення сённяшніх навучэнцаў, сфарміраванага пад уплывам візуальнага фармата прадстаўлення матэрыялу, варта адэкватна асэнсоўваць асаблівасці іх успрымання, запамінання і ацэньвання інфармацыі. Вучоныя выказваюць трывогу, што “дзеці, якія не ўмеюць чытаць і аналізаваць лінейныя тэксты як паслядоўнасць слоў, сказаў, думак, не развіваюцца інтэлектуальна”.[99]

Адпаведна ўзнікае праблема пераасэнсавання падыходаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу, абумоўленага актыўнай інфарматызацыяй грамадства і адпаведнымі зменамі пазнавальнай сферы навучэнцаў. Псіхалагічны партрэт лічбавага пакалення дыктуе неабходнасць улічваць асаблівасці яго кагнітыўнага і асобаснага развіцця, з’яўленне новых культурных практык і формаў камунікацыі. Веданне спецыфікі “лічбавых” дзяцей дапаможа эфектыўна і адэкватна знаходзіць рацыянальныя метадычныя рашэнні. Прызнанне феномена кліпавага мыслення сведчыць пра пераход ад лінейнай мадэлі мыслення да новай, сеткавай. Заканамерна ўзнікае пытанне: што рабіць настаўнікам у сучасных умовах? Н.А. Барысенка фармулюе рытарычны адказ наступным чынам: “Ісці ўслед за развіццём новых формаў мыслення (праз выкарыстанне дробных яркіх слайдаў на прэзентацыях, паказ відэаролікаў, фрагментацыю матэрыялу і т.п.) або супрацьстаяць ім, паніжаць рызыку іх узнікнення”.[100]

На нашу думку, нягледзячы на педагагічныя навацыі, вядучым паняццем метадычнай навукі павінен заставацца *тэкст* у абноўленым, адпаведным часу фармаце. Праблема вызначэння ролі тэксту ў адукацыйным асяроддзі, яго сутнасці, характару працы з ім не толькі не вычарпала сябе, але па-ранейшаму захоўвае актуальнасць. У залежнасці ад прадмета даследавання паняцце тэксту трактуецца ў розных аспектах. Як вядома, пад тэкстам у шырокім сэнсе слова разумеецца сістэма знакаў, створаных культурай. М.М. Бахцін усведамляў тэкст як “звязаны знакавы комплекс”, як першааснову гуманітарных дысцыплін. Вучоны сцвярджаў: “Тэкст з’яўляецца той непасрэднай рэальнасцю (рэальнасцю думак і перажыванняў), з якой толькі і могуць нараджацца гэтыя дысцыпліны і гэтае мысленне. Дзе няма тэксту, там няма і аб’екта для даследавання і мыслення”. [101] Якраз у разнастайнасці азначэнняў тэксту выразна бачыцца тая сістэма каардынат, у якой традыцыйна асэнсоўваецца

[99] Холодная, М.А. Интеллектуальность, креативность, обучаемость: ресурсный подход (о развитии идей В.Н. Дружинина) / М.А. Холодная // Психологический журнал. – 2015. – № 5. – С. 12.

[100] Борисенко, Н.А. Что нужно знать учителю-словеснику о психологических особенностях поколения Z / Н.А. Борисенко // Русский язык в школе. – 2021. – № 3. – С. 11.

[101] Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества/ М.М. Бахтин. – М.: Искусство, 1986. – С. 297.

сутнасць паняцця: камуніканты (суб'екты адукацыйнага працэсу), адлюстраваная рэчаіснасць (рэальная або віртуальная), кантэкст, паралелі з іншымі тэкстамі.

Нагадаем, што сучаснае навуковае прачытанне тэксту дазваляе кваліфікаваць яго шматаспектны статус:

– знакавая форма існавання культуры (Г.В. Калшанскі);

– спецыфічны від маўленчай дзейнасці, скіраваны на адлюстраванне рэчаіснасці (А.А. Лявонцьеў);

– універсальны сродак апісання свету (В.А. Маслава);

– прадуктыўная дзейнасць камунікантаў (Ю.С. Сарокін);

– веды, прадстаўленыя сістэмай лінгвістычных адзінак (В.Я. Шабес);

– асноўны прадукт камунікатыўнай дзейнасці, цэнтральны кампанент камунікацыі (В.С. Каменская);

– складаная сэнсавая прастора (Т.М. Нікалаева);

– шмат'яруснае ўтварэнне, якое ўтрымлівае самыя разнастайныя коды; "інфармацыйны генератар, які валодае якасцямі інтэлектуальнай асобы" (Ю.М. Лотман).

Мноства азначэнняў тэксту сведчыць пра шматмерную культурную, інфармацыйна-каштоўнасную прастору, у якой існуе гэтае паняцце. Сучасныя айчынныя і замежныя вучоныя адзінагалосна прызнаюць у тэксце метадалагічны і метадычны цэнтр кніжнай культуры, ключавы сродак навучання, паколькі менавіта на ўзроўні тэксту раскрываецца камунікатыўная сутнасць мовы. На аснове тэксту, праз тэкст як сродак стварэння развіццёвага асяроддзя адбываецца спазнанне моўных з'яў, граматычных катэгорый, фарміруецца сістэма лінгвістычных паняццяў, забяспечваецца фарміраванне маральна-каштоўнасных якасцей, адбываецца станаўленне асобасных адукацыйных вынікаў (Г.М. Валочка, А.Д. Дзейкіна, В.У. Зелянко, А.П. Ерамеева, Н.А. Іпалітава, Н.Л. Мішаціна, Т.М. Пахнова, В.Ф. Русецкі, Л.А. Хадзякова, М.Г. Яленскі).

Сучасная тэкстарыентаваная методыка расцэньвае тэкст як базу для фарміравання чытацкай пісьменнасці, пошуку інфармацыі, яе разумення, ацэньвання, аснову для пабудовы ўласных выказванняў, разважанняў, арганізацыі ацэначнага інструментарыю, у якім выкарыстоўваецца сукупнасць разнастайных тэкстаў (суцэльных, несуцэльных, змешаных). Праца з тэкстам усведамляецца як рэсурс развіцця праектна-даследчых, камунікатыўных, ацэначных, рэфлексійных уменняў.

Увага спецыялістаў розных сфер да тэксту (лінгвісты, перакладчыкі, псіхолагі, спецыялісты ў галіне рыторыкі, выкладання замежных моў) тлумачыцца прызнаннем за гэтым феноменам адзінкі найвышэйшага камунікатыўнага ўзроўню: "Зносіны ўяўляюць сабой абмен інфармацыяй, што падразумявае стварэнне і ўспрыманне тэкстаў".[102] Уменне зразумець "чужое"

[102] Кулибина, Н.В. Зачем, что и как читать на уроке: методическое пособие / Н.В. Кулибина. – СПб.: Златоуст, 2015. – С. 24.

выказванне і пабудаваць уласнае – узаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя працэсы.

Розныя сацыякультурныя коды даюць падставу спадзявацца на паўнацэнную гарманізацыю лагічна-структураванай і вобразнай інфармацыі. Шматфарматнасць інфармацыі не гарантуе стапрацэнтнага поспеху, аднак дае надзею на пераадоленне негатыўных наступстваў кліпавага мыслення на характар пазнавальнай дзейнасці. Гэтая акалічнасць мае істотнае значэнне, паколькі сённяшні ўзровень светапогляду маладых людзей, іх сістэма каштоўнасцей будуць вызначаць заўтрашні дзень грамадства. Больш таго, педагагічная грамадскасць вядзе настойлівыя пошукі кампрамісу паміж цэласным успрыманнем кніжнай і электроннай культуры, сінтэзам сістэмнага, лагічнага і кліпавага, "сканіраванага" мыслення.

Новыя магчымасці лічбавай рэальнасці маюць і пазітыўны патэнцыял: разнастайнасць крыніц новай інфармацыі, самавыяўленне праз уласную творчасць, фарміраванне асобаснай пазіцыі. Адпаведна ўзнікае неабходнасць планаваць адукацыйны працэс з улікам трансфармацыі грамадства пад уплывам новых тэхналогій. Тэксты новай прыроды арганічна інтэгруюць слова, гук, анімацыю, карцінку, патрабуюць назапашвання вопыту працы з мультымадальнымі фарматамі. Варта пагадзіцца з меркаваннем Т.Г. Галакціёнавай: "Калі мы прызнаём факт існавання тэкстаў новай прыроды, то лагічна прыняць неабходнасць фарміравання ўменняў, звязаных з разуменнем і стварэннем падобных камунікатыўных канструкцый".[103]

У рэчышчы новых пазнавальных інтарэсаў сучасных школьнікаў патрэбныя трансфармацыі метадычных падыходаў да сучаснага адукацыйнага працэсу. Так, адзін з сутнасных паказчыкаў лічбавага пакалення – час, які траціцца на знаходжанне ў Інтэрнэце. У часткі "зэтаў" Інтэрнэт займае палавіну або трэцюю частку сутак. Гаворка ідзе, на думку расійскіх сацыёлагаў, не пра дзяцей з камп'ютарнай залежнасцю, а пра звычайных падлеткаў. Аналіз інтэрнэт-кантэнту выяўляе, што час размяркоўваецца наступным чынам: пошук разнастайнай цікавай інфармацыі для асабістых мэтаў складае 58% часу, чытанне навін – 54%, пошук інфармацыі для вучобы – 47 % і кантактаванне ў сацсетках – 43%.[104] Лічбавая рэальнасць як сфера дзейнасці і зносін становіцца для сучаснага дзіцяці адным з ключавых фактараў паспяховай сацыялізацыі. Ігнараванне гэтага факта можа паглыбіць разрыў паміж асаблівасцямі лічбавага пакалення і сучаснай школы. Прызнанне факта канцэнтруе ўвагу педагагічных даследаванняў на пошуку адэкватных трансфармацый і своечасовых рашэнняў аб зменах у методыках навучання і выхавання сучаснай моладзі.

Паводле сцвярджэнняў псіхолагаў, актыўная прысутнасць у інтэрнэт-прасторы фарміруе звычку ўспрымаць інфармацыю невялікімі порцыямі, яна

[103] Галактионова, Т.Г. Тексты новой природы и новая грамотность / Т.Г. Галактионова // Тексты новой природы в образовательном пространстве современной школы: материалы VIII Междунар. науч.-практич. конф. «Педагогика текста», Санкт-Петербург, 21 октября 2016 г. / под ред. Т.Г. Галактионовой, Е.И. Казаковой. – СПб.: ЛЕМА, 2016. – С. 14.

[104] Медийный портрет подростка двухтысячных годов/ сост. С.Б. Цымбаленко. – М.: НИИ школьных технологий, 2020. – С. 34.

павінна быць прадстаўлена сцісла, наглядна, спалучацца з невербальным фарматам. Адсутнасць навыкаў аналізаваць, дыферэнцыраваць факты актуалізуе ўменне вылучаць і вырашаць праблемы. Альтэрнатывай інтэрнэт-залежных паводзін можа быць толькі школа з яе класічнай задачай – фарміраванне паняційнага мыслення, цэласнага ўспрымання з'яў, устанаўленне лагічных, прычынна-выніковых сувязей паміж імі. У метадычным арсенале сучаснага настаўніка павінны знаходзіцца традыцыйныя, "не модныя" прыёмы класіфікацыі і параўнання фактаў, шматаспектнага аналізу галоўнай і другаснай інфармацыі, фарміравання ўласнай пазіцыі, крытычнай ацэнкі прачытанага.

Як вядома, "знакавая рэальнасць адукацыі – гэта найперш рэальнасць тэкставая", адукацыя пры гэтым вызначаецца "як праца з тэкстам".[105] Аднак змяшчэнне акцэнтаў у сферы пазнавальнай дзейнасці, пераход ад рэпрадуктыўнай да развіццёвай парадыгмы скіроўвае сучасны адукацыйны працэс на самастойную творчую дзейнасць з самавызначэннем яе задач, метадаў працы і ацэньвання яе вынікаў. У пошуках эфектыўнай працы з тэкстам запамінанне і ўзнаўленне інфармацыі адпавядае толькі першаму ўзроўню таксаноміі Б. Блума. "Рэканструкцыя разумення цэласнасці тэксту", на думку Я.Ф. Карпіевіч і Т.І. Красновай, павінна выбудоўвацца як стратэгія абмену ўражаннямі аб прачытаным, як дыскусія чытачоў вакол пытанняў-праблем: *Якую пазіцыю / думку / тэзіс аўтар крытыкуе, праблематызуе, трактуе неадназначна? Якое значэнне ён надае..? Што аўтар прапануе ў якасці альтэрнатывы для вырашэння праблемы? Як у храналагічным парадку адбывалася ваша разуменне пазіцыі аўтара? Якую думку развівае аўтар у гэтым фрагменце? Паспрабуйце сфармуляваць гэтую думку больш зразумела, доказна. Распрацуйце карту ідэй / паняццяў да тэксту. Падрыхтуйце рэзюмэ асноўнай ідэі артыкула. Якія тэрміны, паняцці трэба ведаць загадзя, каб зразумець прачытанае? З якімі меркаваннямі, дапушчэннямі мы павінны пагадзіцца, каб сфармуляваць вывад, які робіць аўтар?* і інш.[106]

У каардынатах абнаўлення пазнавальнай дзейнасці запатрабаванымі застаюцца ўменні працы з інфармацыяй, паколькі многія сучасныя навучэнцы не маюць вопыту паўнацэнных зносін з тэкстам: "…Навыкі ўважлівага прачытання падручніка і канспектаванння замяняюцца пошукам інфармацыі ў Інтэрнэце, а разумовыя аперацыі аналізу і сінтэзу – выкананнем тэставых заданняў, арыентаваных на элементарнае ўзнаўленне".[107]

Тэксты ва ўмовах трансфармацыі інфармацыйнага асяроддзя патрабуюць *інтэграванай методыкі працы,* паколькі на сённяшні дзень "без інтэгратыўнага падыходу немагчыма даследаваць складаныя феномены, да якіх

[105] Тягунова, Т.В. Образование как работа с текстом / Т.В. Тягунова // Университет как центр культуропорождающего образования / М.А. Гусаковский [и др.]; под ред. М.А. Гусаковского. – Минск: БГУ, 2004. – С. 103.

[106] Карпиевич, Е.Ф. Задачи и способы организации работы с текстом (на основе таксономии Б. Блума) / Е.Ф. Карпиевич, Т.И. Краснова // Работа с текстом. Современные технологии университетского образования. – Минск: БГУ, 2003. – С. 21–47.

[107] Печенева, Т.А. Кто Вы, мистер Z? (или Как понять студента нового поколения) / Т.А. Печенева // Научные разработки: решения и практика: материалы междунар. науч.-практ. конф., Москва, 18 августа 2017 г. / отв. ред. Д.Р. Хисматуллин. – М.: Инфинити, 2017. – С. 38–43.

адносяцца мова, культура, свядомасць. Ён становіцца найважнейшым светапоглядным накірункам усёй навукі XXI стагоддзя”.[108]

Інтэграванасць методыкі праяўляецца праз фарміраванне наступных тэндэнцый:

– прызнанне інфармацыі сэнсавай дамінантай у сучасным грамадстве. Пры гэтым галоўную каштоўнасць уяўляе не інфармацыя сама па сабе, а ўменне ёю карыстацца;

– дыдактычная адаптацыя сродкаў навучання да ўмоў інфармацыйнага грамадства, у якім сфарміравалася лічбавае пакаленне. Варта падкрэсліць: праца з аўдыторыяй новай фармацыі – аб’ектыўная рэальнасць сённяшняга, а не заўтрашняга дня;

– абнаўленне методыкі працы з тэкстам, што дыктуе якасныя змены ў змесце чытання, выбар стратэгіі чытання, спосабы перапрацоўкі інфармацыі. Чытанне ў інфармацыйным грамадстве пашырае аб’ём базавых уменняў, уключае не толькі ўменне разумець, але і інтэрпрэтаваць тэкст, знаходзіць патрэбную інфармацыю, пераключацца з адной крыніцы на іншую, крытычна ставіцца да прачытанага, ствараць новы прадукт на аснове зместу.

Спосабамі выяўлення лінгваметадычнага патэнцыялу тэкстаў выступаюць: інтэлектуалізацыя адукацыйнага кантэнту (суправаджэнне гіперспасылкамі); візуалізацыя вучэбных тэкстаў за кошт рознафарматнай інфармацыі; павышэнне лексікаграфічнай культуры працы з электроннымі слоўнікамі; фарміраванне ўменняў праектнай дзейнасці, назапашванне вопыту вучэбна-даследчай працы; стварэнне маўленчага асяроддзя сродкамі байнэту. Новы фармат адукацыйных рэсурсаў спараджае праблему гарманізацыі традыцыйнай методыкі навучання і метадаў працы з электроннымі тэкстамі. Дыдактычная платформа традыцыйных і новых тэкстаў інтэграваная і заключаецца ў назапашванні інтэлектуальна-маўленчага вопыту навучэнцаў, здольных скарыстаць сфарміраваныя кампетэнцыі для вырашэння пазнавальных і жыццёвых задач.

1.4 Патэнцыял малафарматных тэкстаў для развіцця сучасных адукацыйных вынікаў

Сённяшняя лінгвістыка разглядае з’яўленне малафарматных тэкстаў як сітуацыю “станаўлення новай, неафункцыянальнай або канструктыўнай парадыгмы ведаў, вызначальнай рысай якой з’яўляецца паспяховы сінтэз кагнітыўнага і камунікатыўнага падыходаў да моўных з’яў”.[109] Уключанасць у дыяпазон навучання падобных тэкстаў сведчыць пра імкненне “падстроіцца” пад сучаснага чытача, які акрэсліўся ў перавагах: “Фармат міні-навін, фармат твітаў і статусаў у сацыяльных сетках, што дазваляе змясціць сціслы аб’ём

[108] Маслова, В.А. Через синергетический союз лингвистики с другими науками – к новым проблемам и направлениям / В.А. Маслова // Вестник РУДН. Серия: Теория языка. Семиотика. Семантика. – 2021. – Т. 12. – № 3. – С. 823–847.

[109] Кубрякова, Е.С. Текст и его понимание / Е.С. Кубрякова // Русский текст. – 1994. – № 2. – С. 19.

інфармацыі пра падзеі рознай ступені значнасці, якія адлюстроўваюць толькі знакавыя моманты”.[110]

З улікам характару кліпавага мыслення спынімся на сутнасці малафарматных адзінак як тэкстаў новай прыроды, наяўнасць якіх у сённяшняй школьнай практыцы з’яўляецца адным са спосабаў развіць/не страціць цікавасці да чытання. У метадычным аспекце распаўсюджанасць малафарматных тэкстаў абумоўлена інтэнсіўнасцю лічбавых тэхналогій, дысплэйнымі спосабамі падачы інфармацыі, што мае вынікам скарачэнне часу, затрачанага на чытанне, азнаямленне з матэрыялам. Гэта прыводзіць да трансфармацыі ў спосабах успрымання і разумення звестак (А.А. Аўдзеева, Э.М. Берагоўская, Т.Г. Галакціёнава, В.Л. Жук, А.І. Казакова, Т.А. Печанёва, Г.У. Салдатава і інш.). Хуткі тэмп жыцця, пастаянны рэжым запатрабаванасці, нестабільнасці фарміруюць новы тып мыслення, які дапамагае чалавеку адаптавацца да зменлівага асяроддзя. Менавіта гэтымі абставінамі тлумачыцца тэндэнцыя да скарачэння аб’ёму “жывой” камунікацыі, вербальных тэкстаў.

Імкненне да сцісласці і кампактнасці тэкстаў выразнае ва ўсіх без выключэння сегментах камунікатыўнай прасторы – у сферах дзелавых і асабістых зносін, СМІ, адукацыі. Прыярытэт неаб’ёмных тэкстаў (эсэ, sms, мем, каментарый і інш.), трансфармацыі традыцыйных жанраў (навіны, анонсы, аб’явы) скіраваныя на малы фармат пры забеспячэнні паўнацэннага эфекту ўзаемадзеяння. Прыярытэт малых формаў у сучаснай дыялагічнай прасторы, іх высокая ўдзельная вага ў камунікацыі спараджаюць распаўсюджанасць малафарматных адзінак. Аб’ём як колькасны паказчык малафарматнасці вар’іруецца ў характарыстыках розных даследчыкаў. Так, В.І. Таюпава прызнае за малафарматным тэкстам аб’ём да 600 слоў, Я.А. Трунова замацоўвае за такімі тэкстамі 150–160 слоў. Больш таго, некаторыя даследчыкі сыходзяцца ў меркаванні (У.А. Звегінцаў, В.І. Таюпава, В.Е. Чарняхоўская і інш.), што падобныя тэксты могуць утрымліваць адно слова. На думку Я.А. Труновай, слова ў адпаведнай камунікатыўнай сітуацыі можа забяспечыць усе неабходныя прыметы тэкстуальнасці: цэласнасць, звязнасць, адрасаванасць, інфарматыўнасць, сітуацыйную абумоўленасць, інтэртэкстуальнасць, адпаведна аднаслоўныя тэксты “з’яўляюцца паўнацэннымі, у якіх думка можа быць выказана абсалютна свабодна”.[111]

Фармальная і семантычная самадастатковасць прадвызначаюць функцыі малафарматных тэкстаў, іх варыятыўнасць у плане арганізацыі. Тэндэнцыя да эканоміі моўных і паралінгвістычных сродкаў дыктуе сцісласць і лаканізм структурнага афармлення. І.Б. Руберт адной з першых прызнала за малафарматным выказваннем самастойны статус у тыпалагічнай класіфікацыі, замацавала за ім асобны тып тэксту як утварэнне “больш высокага ўзроўню

[110] Тумашева, О.В. Средства формирования и оценивания метапредметных результатов обучающихся поколения Z / О.В. Тумашева, М.Б. Шашкина // Азимут научных исследований: педагогика и психология. – 2020. – Т. 9. – № 1. – С. 286.

[111] Трунова, Е.А. Малоформатный текст как объект лингвистического исследования / Е.А. Трунова // Вестник РУДН. Серия: Русский и иностранные языки и методика их преподавания. – 2010. – № 1. – С. 51.

абстракцыі ў параўнанні з рэальнай маўленчай маніфестацыяй”.[112] Пад тыпам тэксту, следам за В.Е. Чарняхоўскай, разумеецца “культурна-гістарычная прадуктыўная мадэль, узор, які прадвызначае функцыянальныя і структурныя асаблівасці канкрэтных тэкстаў рознага тэматычнага зместу”.[113]

Малафарматны тэкст як кампанент камунікатыўнай прасторы атрымаў “сталую” прапіску ў розных галінах жыццядзейнасці чалавека: пазнавальнай, бытавой, працоўнай, гандлёвай. Малафарматны тэкст як спецыфічны тэкстатып характарызуецца шэрагам параметраў, што забяспечваюць іх камунікатыўна-пазнавальны статус у адукацыйнай сферы. Паводле В.В. Бокавай,[114] асноўнымі крытэрыямі тэкстуальнасці малафарматных адзінак выступаюць:

– *інтэнцыянальнасць*. Кожны тэкст характарызуецца камунікатыўным намерам, задачай, сфармуляванай аўтарам;

– *інфарматыўнасць.* Як вядома, каб называцца тэкстам, пэўная паслядоўнасць моўных сродкаў павінна ўтрымліваць паведамленне, звесткі для адрасата;

– *сітуацыйнасць.* Тэкст ёсць адносна закончанае ўтварэнне, залежнае ад канкрэтных умоў бытавання;

– *інтэртэкстуальнасць* як сувязь, суадносіны з іншымі тэкстамі;

– *цэласнасць* як адзінства зместу і формы;

– *завершанасць* формы і аб’ёму адзінкі для перадачы інфармацыі ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай аўтара.

Названыя крытэрыі забяспечваюць рэалізацыю вядучых функцый малафарматных тэкстаў – інфармацыйнай і сацыяльнай. *Інфармацыйная функцыя* перадае праз змест аб’ектыўныя характарыстыкі прадмета, аб’екта, з’явы. *Сацыяльная функцыя* заключаецца ў адаптацыі выказвання да кантэксту.

Аднак некаторыя даследчыкі лічаць, што разглядаць у якасці тэксту адно слова (напрыклад, шыльду з назвай *Сталовая*) немэтазгодна, паколькі тэкст, як правіла, уяўляе сабой “структураванае ўтварэнне, якое адрозніваецца ад намінатыўнай адзінкі тым, што паведамленне як камунікатыўна арыентаваны твор характарызуецца такой базавай рысай, як звязнасць”.[115] На нашу думку, адзінкі, прадстаўленыя адным словам, варта кваліфікаваць як акт камунікацыі, што мае зместавую цэльнасць, закончанасць. Самае галоўнае – такі слова-тэкст першасна, зыходна нават у згорнутым выглядзе ўтрымлівае праграму сэнсавага “нарошчвання”.

Лінгвісты бачаць вялікі лінгвадыдактычны патэнцыял малафарматных тэкстаў, характарызуюць іх як “згустак інфармацыі”, якая адразу звяртае ўвагу,

---

[112] Руберт, И.Б. Типологические характеристики английских малоформатных текстов “рецепт” и “полезный совет”: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.04 / И.Б. Руберт. – Ленинград, 1991. – С. 3.

[113] Черняховская, В.Е. Лингвистика текста. Лингвистика дискурса / В.Е. Черняховская. – М.: Флинта, 2020. – С. 60.

[114] Бокова, О.В. Малоформатный текст: особенности его семантической и структурной организации (на материале конкретных немецкоязычных медиатекстов): автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.04 / О.В. Бокова. – Воронеж, 2011. – С. 3.

[115] Кубрякова, Е.С. В поисках сущности языка: когнитивные исследования / Е. С. Кубрякова. – М.: Знак, 2014. – С. 76.

з лёгкасцю засвойваецца адрасатам. На думку Э.М. Берагоўскай, нельга недаацэньваць эўрыстычную каштоўнасць падобных адзінак: “Уменне правільна зразумець тэкст, улічваючы прэсупазіцыю, уменне правільна скласці тэкст, захоўваючы не толькі норму, але і узус, павінна быць адной з мэтаў навучання мове”.[116]

Вучоныя адзначаюць не толькі прагматычны, але і лінгвакультуралагічны, лінгваэкалагічны кантэкст малафарматных формаў. Іх рэпрэзентатыўнасць (налічваецца больш за 70 разнавіднасцей) дазваляе даследаваць сучаснае маўленчае асяроддзе ў культурным кантэксце бытавання падобных адзінак. Напрыклад, М.Л. Гаспараў сведчыць: “Калі прыязджаю ў новы горад, я найперш павінен прачытаць радок за радком усе шыльды, афішы і іншыя малыя вулічныя жанры. Толькі потым я пачынаю заўважаць двухмерныя фасады і трохмерныя будынкі горада”.[117]

Праілюструем культуратворчую ролю малафарматных тэкстаў у маўленчым жыцці грамадства на прыкладзе беларускіх прыказак на тэму “Радзіма, патрыятызм”, прыведзеных у адпаведным раздзеле зборніка пад рэдакцыяй Ф.М. Янкоўскага. Прапануем нізку прыказак з выдання[118]:

Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюць. Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуецца. Далёкая старонка без ветру сушыць. Для ўсякай птушачкі сваё гняздо мілае. Жонка як жонка, але мілей родная старонка. З роднага боку і варона мілая. Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай. Калі змалку з матчынай гаворкі пасмяецца, то на старасці ад маткі адрачэцца. Кожнаму дразду жаль па сваім гнязду. Мілы той куток, дзе рэзан пупок. На чужыне і камар загіне. Той не перамагае, хто ў бядзе са сваёй зямелькі ўцякае. Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы. У роднай стараначцы птушачкі пяюць, а ў чужой стараначцы часта слёзы льюць. Хто страціў радзіму, той плача ўсё жыццё. Чым за морам віно піць – лепей з Нёмана вадзіцу.

Прыказка як малафарматны тэкст узбагачае маўленне, ператварае выказванне ў факт самавыяўлення асобы: “Стаўшы часткай народнай мудрасці, думка ў прыказцы ўздзейнічае аўтарытэтам народа”. [119] У сціслым тэксце матэрыялізуюцца філасофія жыцця, гістарычнае існаванне, нацыянальная місія і прызначэнне ў свеце. Малафарматны тэкст прыказкі здольны перадаць маральныя імператывы нацыі, грамадскай супольнасці, сфармуляваць сістэму адносін чалавека да Радзімы, да краіны, да сям’і, да блізкіх і чужых людзей. Прыказка пры сваёй малафарматнасці выяўляе самае складанае сцісла і вобразна, раскрывае лепшыя маральныя якасці народа, яго высокія імкненні, мудрасць, разгортвае сістэму народнай філасофіі, сэнсу жыцця.

---

[116] Береговская, Э.М. Стилистика однофразового текста (на материале русского, французского, английского и немецкого языков): монография / Э.М.Береговская. – М.: ЛЕНАНД, 2015. – С. 308.

[117] Гаспаров, М.Л. Записи и выписки: дневниковые заметки / М.Л. Гаспаров. – М.: Новое литературное обозрение, 2000. – С. 125.

[118] Янкоўскі, Ф.М. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / пад рэд. Ф.М. Янкоўскага. – 3-е выд., дапрац. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

[119] Янкоўскі, Ф.М. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / пад рэд. Ф.М. Янкоўскага. – 3-е выд., дапрац. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – С. 9.

Аналіз прыказак як малафарматных тэкстаў у тэрмінах канцэптаў *Радзіма, Бацькаўшчына, родная старонка, мілы край* (*куток*)*, гняздо, птушка* дазваляе выявіць светапоглядныя пастулаты, якія рэалізуюцца ў выказваннях. Аксіялагічныя каардынаты соцыуму, характэрныя для пэўнага перыяду яго развіцця, дапамагаюць асэнсаваць культураносныя маркеры тэкстаў. Малафарматныя тэксты з'яўляюцца своеасаблівай ячэйкай нацыянальнай культуры, што разгортваюць моўную карціну свету. Сістэма канцэптаў увасабляецца ў выглядзе ключавых паняццяў і вобразаў, значымых для фарміравання лінгвакультуралагічных кампетэнцый навучэнцаў.

Канцэптасфера асноватворных малафарматных адзінак традыцыйна карэлюе з сістэмай артэфактаў, аб'ектаў, паняццяў культуры. У згорнутым кантэксце вызначальныя канцэпты становяцца аб'ектыўнай ілюстрацыяй да спасціжэння народнай культуры. Менавіта з гэтай прычыны ў адукацыйным працэсе істотным выступае адэкватнае дэкадзіраванне інфармацыі, што падразумявае веданне лінгвістычных і нацыянальна-культурных адзнак малафарматных тэкстаў.

У сённяшняй тэкставай рэальнасці варта прызнаць: аб'ём не вызначае і не гарантуе інфарматыўнасці выказвання. І сціслы малафарматны тэкст можа выступаць інфармацыйна насычаным, змястоўным, быць цікавым і карысным для чытача (асабліва пры наяўнасці дадатковых невербальных кампанентаў). Малафарматныя тэксты дазваляюць дэманстраваць культуру працы з інфармацыяй, якая патрабуе разгортвання, адаптаваць дыдактычны матэрыял да прагматычных інтарэсаў сучасных маладых людзей.

II. ЧЫТАННЕ ЯК КАМПАНЕНТ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

2.1 Чытанне як адукацыйная тэхналогія

Эвалюцыя паняцця *чытанне* мае сваю гісторыю. Аналіз сучасных здабыткаў па праблеме выяўляе, што чытанне як сукупнасць практык працы з тэкстам не з'яўляецца пастаяннай велічынёй, паколькі людзі чыталі заўсёды па-рознаму. Мадэлі, прыёмы чытання не заставаліся нязменнымі. Яны эвалюцыянавалі, трансфармаваліся ў залежнасці ад таго, якое разуменне паняцця існавала ў пэўны перыяд. На думку акадэміка Расійскай акадэміі адукацыі У.А. Лектарскага, "праблема чытання – гэта праблема чалавека і культуры. Лёс чытання – лёс чалавека. Каб асэнсаваць гэты лёс, трэба зразумець, якая прырода чытання, як яно ўзнікла, як развівалася".[120]

Уменне чытаць і пісаць, пачынаючы з працэсу хрысціянізацыі ў IX–X стагоддзях, цанілася надзвычай высока. Як сцвярджае Ю.П. Мяленцьева, вядомы расійскі бібліятэказнаўца, аўтар больш за 400 публікацый, "само сугучча слоў "*читать*", "*почитать*", "*чтить*" гаворыць пра гэта. Першасна ўменне чытаць мела сакральны характар, яно было даступным толькі найвышэйшым прадстаўнікам царквы, потым – знаці. Чалавека, які спасцігаў грамату, чытанне, называлі на "Вы" (нават падлетка), паколькі лічылася, што ён авалодаў мудрасцю многіх людзей". [121] Паступова чытанне становіцца кампанентам свецкай адукацыі, масавага навучання. Разуменне сутнасці чытання як сродку спазнання свету дамінавала на працягу доўгага гістарычнага перыяду. З часам усведамляецца арганічная сувязь чытання і асветы, што "надае яму характар сацыяльна-карыснай з'явы, яднае чытанне з вырашэннем педагагічных, грамадскіх і дзяржаўных задач. Менавіта ў гэты перыяд асэнсоўваюцца сацыяльная і педагагічная састаўныя чытання".[122]

"Першавобраз" метадычнай сутнасці чытання фарміруецца ў працах прагрэсіўных педагогаў XIX стагоддзя. Прызначэнне чытання заключалася ва ўзбагачэнні слова, адукацыі гуманітарнай, духоўнай састаўной. Звернемся да пазіцыі вядомых, аўтарытэтных педагогаў. Пачынаючы з традыцыі, закладзенай у кнізе "О преподавании отечественного языка" (1818 год) Ф.І. Буслаева, чытанне разглядаецца як "аснова тэарэтычных ведаў і практычных заданняў". Знакаміты філолаг, заснавальнік навуковай методыкі выкладання мовы ў сярэдняй школе прызначэнне кнігі, асветы фармуляваў наступным чынам: "Усякае элементарнае выданне павінна быць сродкам выхавання…

[120] Лекторский, В.А. Чтение в мире современных информационных технологий / В.А. Лекторский // Чтение в образовании и культуре: материалы междунар. науч. конф. Доклады научного совета по проблемам чтения. – М., 2012. – С. 42.

[121] Мелентьева, Ю.П. Общая теория чтения / Ю.П. Мелентьева. – М.: Наука, 2015. – С. 28.

[122] Мелентьева, Ю.П. Общая теория чтения / Ю.П. Мелентьева. – М.: Наука, 2015. – С. 37.

У настаўніку мовы бачыцца выхавальнік дзяцей, які фарміруе розум і нясе святло ў маладыя душы, каб асвяціць іх разважлівасцю і дабрачыннасцю”.[123]

Ідэі Ф.І. Буслаева атрымалі развіццё ў падручніках, метадычных дапаможніках наступных пакаленняў педагогаў. Так, Л. Паліванаў у 1877 годзе называе чытанне “неабходным сродкам выхавання, які з цяжкасцю можа быць заменены чымсьці іншым. Яно мае найвышэйшую ступень значнага ўплыву на разважанні, норавы і фарміраванне густу маладога пакалення”.[124] Паслядоўнік Ф.І. Буслаева В.П. Шарамецеўскі сцвярджаў: “Галоўная мэта выкладання мовы і славеснасці – навучыць чытаць і пісаць у шырокім значэнні гэтага слова, г.зн. давесці да разумення вучняў, каб яны былі гатовы растлумачыць сабе пабудову прачытанага твора, маглі зразумець сістэму ідэй, што заключаюцца ў ім, былі падрыхтаваныя правільна ў лагічных і граматычных адносінах выказвацца і пісаць… Дзеля агульначалавечага самаўдасканалення наогул і ўдасканалення дару слова ў прыватнасці”.[125] Педагог Ц.П. Балталон перад урокамі чытання ставіў наступныя мэты: “Уплываць на разумовае і маральнае развіццё, а таксама – узбагачэнне маўлення вучняў; пасябраваць з кнігай і навучыць карыстацца ёю так, каб пасля заканчэння школы чытанне з’яўлялася пастаяннай патрэбнасцю і дапамогай у жыцці… Галоўная задача школы – навучыць свядомаму, разумнаму чытанню і абудзіць далейшую цікавасць да кнігі”.[126]

Савецкая педагогіка культывавала корпус тэкстаў, скіраваных на *ўдумлівае, глыбокае, аналітычнае чытанне*. Такое чытанне арыентавала як на разуменне, так і на маральнае выхаванне, паўнацэннае развіццё асобы. Пры вырашэнні пастаўленых задач педагагічныя працы фарміравалі розныя варыянты вучэбнага чытання, якое нязменна мела на ўвазе выхаваўчыя моманты. Атрымала метадычную прапіску *аналітычнае чытанне*, у ходзе якога дабіваліся разумення вучнямі тэксту, а таксама *выразнае, пазакласнае, дамашняе, чытанне на лета.*

У працах С.І. Абакумава знайшло дэталёвую распрацоўку *творчае* і *выразнае чытанне.* Цікава, што меркаванні, пазіцыі, абвешчаныя і агульнапрызнаныя стагоддзі таму назад, гучаць актуальна і па сённяшні дзень: “Выразнае чытанне – часта ключ да разумення мастацкага твора. Хто не ўмее чытаць выразна, той не толькі не здолее даць іншым адчуць сілу і прывабнасць мастацкага твора, раскрыць яго вобразны змест, растлумачыць – без залішніх паясненняў – яго эмацыянальную сутнасць, той і сам не спасцігне яго сапраўднага прызначэння”.[127]

---

[123] Буслаев, Ф.И. О преподавании отечественного языка: учеб. пособие / Ф.И. Буслаев. – Изд. стереотип. – М.: ЛИБРОКОМ, 2016. – С. 27.

[124] Обучение отечественному языку / под ред. Льва Поливанова. – М.: Типография А.И. Мамонтова и К°, 1877–1878. – С. 2.

[125] Шереметевский, В.П. Сочинения В.П. Шереметевского / В.П. Шереметевский. – М.: Товарищество типографии А.И. Мамонтова, 1897. – С. 37.

[126] Балталон, Ц.П. Воспитательное чтение / Ц.П. Балталон. – 3-е изд. – М.: Типография Вильде, 1913. – С. 56.

[127] Абакумов, С.И. Творческое чтение: опыт методики чтения художественных произведений в школах начального типа / С.И. Абакумов. – Ленинград: Изд-во Брокгауз – Ефрон, 1925. – С. 44.

На ўроках творчага чытання задача настаўніка, на думку метадыста, заключаецца ў тым, каб “даць вучням сродкі самастойна выявіць свае ўражанні ад чытання і тым удакладніць і паглыбіць яго” (с. 22). Абавязковым элементам працы з’яўляецца папярэдняя гутарка перад чытаннем, мэта якой, паводле пераканання педагога, “не азнаямленне вучняў з незразумелымі словамі, што сустракаюцца ў творы, як гэта рэкамендуецца многімі метадыстамі. Мэта павінна асэнсоўвацца больш складана: увесці навучэнцаў у круг настрою і вобразаў, што ўтрымліваюцца ў кнізе, узнавіць у памяці тыя веды (і часткова прыпомніць іх), без якіх чытанне можа застацца па-за ўвагай чытача, не захапіць і не закрануць, не абудзіць яго па прычыне адсутнасці свядомасці ўяўленняў, якія павінны праз асацыяцыі паяднацца з вобразамі твора” (с. 36). Запатрабаванымі з’яўляюцца метадычныя ідэі С.І. Абакумава:

– дыяпазон прыёмаў арганізацыі творчага чытання сугучны сённяшнім уяўленням: гутаркі па прачытаным, апавяданні па аналогіі з прачытаным, працяг апавядання, вопыты самастойнай творчасці, супастаўленне двух або некалькіх твораў паводле зместу і формы (гэты прыём каштоўны тым, что прывучае вучняў да літаратурных абагульненняў), славеснае маляванне на аснове прачытанага, выбар пэўнага матэрыялу з твора, што патрабуе новай камбінацыі зместу, рэфераты, якія суправаджаюцца *абавязковым абмеркаваннем* у класе, завучванне на памяць (пры гэтым даецца права завучваць па жаданні і на свой выбар). Педагог каменціруе гэты прыём так: “Не бяда, калі дзеці хутка забудуць завучанае, верш патрэбны менавіта ў дадзены момант, для эстэтычнага ўражання, ён павінен выклікаць карыснае і здаровае перажыванне” (с. 68); фармуляванне галоўнай думкі; складанне плана (пры гэтым С.І. Абакумаў зазначае: “Паслядоўнасць развіцця дзеяння ў мастацкіх творах вытлумачваецца не наяўнасцю ў аўтара строга прадуманага, лагічнага плана, а жыццём паэтычнага вобраза… З гэтай прычыны пры чытанні твораў мастацкага характару ад розных планаў, дарэчных толькі пры чытанні навукова-папулярных і “дзелавых” артыкулаў, трэба адмовіцца” (с. 72); пераказ прачытанага (“Просты, звычайны пераказ не можа садзейнічаць дасягненню задачы перадаць змест твора… Для творчага чытання істотна не простае запамінанне прачытанага і не ўменне яго правільна пераказаць. Важна свабоднае, творчае пранікненне ў вобразны і эмацыянальны змест, уменне зразумець, адчуць, “пражыць” настрой твора”) (с. 73). Як сцвярджае метадыст, “калі гаворка ідзе пра дзіцячы малюнак як ілюстрацыю да тэксту, важным з’яўляецца ўменне *прачытаць малюнак*. Дасканаласць тэхнікі малявання не мае вялікага значэння. Важна не *як,* а *што* намалявана” (с. 77).

Цікавыя ў метадычным арсенале сродкаў чытання ў працы С.І. Абакумава і наступныя прыёмы: разглядванне мастацкіх малюнкаў, падбор музычных ілюстрацый: “Каштоўнасць музычнай ілюстрацыі не выклікае сумнення: музыка, спевы найлягчэй ствараюць менавіта той настрой, які неабходны для пачуццёвага ўспрымання лірычнага твора” (с.100)[128]. Уваходзяць у метадычны

[128] Абакумов, С.И. Творческое чтение: опыт методики чтения художественных произведений в школах начального типа / С. И. Абакумов. – Л.: Изд-во Брокгауз – Ефрон, 1925. – 136 с.

актыў падрабязна распісаных прыёмаў і літаратурна-мастацкія экскурсіі, чытанне па ролях, шматгалосная дэкламацыя і інш. Заўважым, што паводле эфектыўнасці, арыгінальнасці прадстаўлення методыкі выкарыстання прапанаваных прыёмаў створанае С.І. Абакумавым у 1925 годзе складае дастойную канкурэнцыю сённяшнім стратэгіям чытацкай дзейнасці.

Ідэі, пытанні школьнага чытання атрымалі далейшае развіццё ў 1930-я гады, творчыя аспекты якога былі бліскуча распрацаваныя М.А. Рыбнікавай. Надаючы вялікае значэнне развіццю звязнай мовы вучняў, педагог не магла не ўдзяляць увагі чытанню. Галоўную мэту ўрокаў мовы і літаратуры педагог фармулявала так: “Навучыць чытаць, навучыць разважаць і разумець, цаніць слова, навучыць працаваць з тэкстам, перадаваць багацце мовы”.[129]

Асэнсоўваючы спосабы працы з тэкстам, М.А. Рыбнікава ўздымае шматлікія пытанні, якія пазней афармляюцца як асобныя самастойныя праблемы. Цікавым у гэтым плане бачацца ўстаноўкі педагога адносна “тэхніцызму”, залішняй алгарытмізацыі пры вывучэнні твора. Метадычныя прыёмы дыктуюцца прыродай тэксту, багацце прыёмаў, іх рацыянальнае перапляценне і чаргаванне павінны ісці ад галоўнай задачы – спасціжэнне зместу твора і задумы аўтара, уразуменне яго вобразаў і мовы: “Мастацтва метадыста заключаецца менавіта ў тым, каб умела падабраць ключ да таго ці іншага твора. Методыка працы з тэкстам павінна падказвацца аб’ёмам матэрыялу, жанрам, узроўнем цяжкасцей, адносінамі вучняў да твора. А від чытання, спосабы складання плана, цытавання, вывучэння ілюстрацый – гэта найлепшыя шляхі засваення, якія вынікаюць са спецыфікі тэксту”.[130]

Найкаштоўнейшы момант у працах М.А. Рыбнікавай, ідэальна дастасаваны да сучаснай методыкі, – гэта прызнанне вучня актыўнай, дзейснай асобай пазнавальнага працэсу. Мабыць, упершыню ў гісторыі педагогікі (працы М.А. Рыбнікавай датуюцца дарэвалюцыйнымі гадамі) вучань прызнаецца найважнейшым “фактарам”, раўнапраўным суб’ектам метадычнай сістэмы. Педагог не ідэалізуе вучня, бачыць і яго наіўны рэалізм, і недасканаласць маўлення. Аднак яна як сапраўдны настаўнік робіць усё магчымае для росту і развіцця асобы, паколькі ставіць за мэту зрабіць кожнага “добрым”, “вялікім” чытачом: “Спрыяць росту сваіх вучняў – гэта значыць расці самому. Рух і ўскладненне ўражанняў, развіццё маўлення, папаўненне слоўніка, разгортванне сінтаксісу – усё гэта і называецца развіццём свядомасці і моўным узбагачэннем.[131]

Прапанаваны экскурс у гісторыю станаўлення чытання як навукі і мастацтва дае магчымасць падкрэсліць грамадскую значнасць, перспектыўнасць таленавітых ідэй, акцэнтаваць павагу да метадычных традыцый. У кантэксце сучаснага лавінападобнага прымнажэння педагагічнай

[129] Рыбникова, М.А. Очерки по методике литературного чтения: пособие для учит. / М.А. Рыбникова. – 4-е изд. – Испр.. – М.: Просвещение, 1985. – С. 57.

[130] Рыбникова, М.А. Очерки по методике литературного чтения: пособие для учит. / М.А. Рыбнникова. – 4-е изд. – Испр. – М.: Просвещение, 1985. – С. 60.

[131] Рыбникова, М.А. Очерки по методике литературного чтения: пособие для учит. / М.А. Рыбнникова. – 4-е изд. – Испр. – М.: Просвещение, 1985. – С. 274.

інфармацыі не павінны загубіцца каштоўныя ідэі пакаленняў навукоўцаў XIX–XX стагоддзяў. Інакш “першаадкрыццё” педагагічных ісцін будзе ўяўляць сабой бясконцы працэс. Роля пазітыўнага асэнсавання метадычнай спадчыны выразна акрэслена А.В. Цекучовым больш за 40 гадоў таму, яго тэзісы ўспрымаюцца як працяг і развіццё лепшых традыцый папярэднікаў: “Веданне гісторыі метадычнай навукі дазваляе зразумець тэндэнцыі і перспектывы яе развіцця, асэнсаваць рэсурсы, што яшчэ застаюцца не ўсвядомленымі сучаснікамі”. [132] У агульнакультурным плане гэтая думка сфармулявана акадэмікам Д.С. Ліхачовым: ”Сапраўдная новая культурная каштоўнасць узнікае ў старым культурным асяроддзі … Творчае наследаванне традыцыі мае ў сваёй аснове пошук новага ў старым, яго працяг”.[133] Названыя працы вучоных аказалі вялікі ўплыў на станаўленне методыкі. Дзякуючы гэтым грамадска-педагагічным трактатам разуменне чытання пераадолела межы методыкі пачатковага навучання, дзе разглядалася на ўзроўні выпрацоўкі тэхнічных прыёмаў. У працяг ідэй сёння “ўменне чытаць ужо не можа лічыцца здольнасцю, якая набываецца ў раннім школьным узросце і абмяжоўваецца тэхнікай. Пісьменнае – у шырокім сэнсе слова – чытанне знаходзіцца ў аснове ўсёй дзейнасці чалавека як у перыяд навучання ў школе, так і ў будучым”.[134] Чытанне расцэньваецца як уменне, што ўдасканальваецца ў працэсе адукацыі праз усё жыццё. Адпаведна падрыхтоўка пакалення, што ўспрымае чытанне як духоўную практыку, як спосаб захавання маральна-этычных і культурных каштоўнасцей грамадства, павінна адбывацца з пазіцыі сённяшняга і заўтрашняга дня.

Праблема чытання перастала быць задачай практычнага характару і паступова набыла метадалагічны статус. З сучасных пазіцый чытанне асэнсоўваецца як адна з галоўных задач школьнай адукацыі (М.Г. Яленскі), дыялог двух суб’ектаў (В.Ф. Асмус), феномен культуры (М.С. Каган), пошук асобасных сэнсаў (М.М. Бахцін), паказчык разумовай працы (С.І. Паварнін), дыялог з аўтарам твора (М.А. Рубакін), спосаб засваення жыццёва значнай інфармацыі (Н.А. Стэфаноўская), найважнейшая тэхналогія спазнання (Ю.П. Мяленцьева), герменеўтычная практыка (Л.Ю. Фуксон), паказчык інтэлекту нацыі (Ю.П. Мяленцьева). Змены, што адбываюцца ў сучасным свеце, выступілі своеасаблівым штуршком у плане фарміравання новых спосабаў засваення і трансляцыі тэкставай прасторы. У сучасным грамадстве дынамічна змяняюцца інфармацыйныя патрэбнасці, прыярытэты, што прыводзіць да трансфармацыі чытання. Сучасная навука праецыруе новае разуменне культуры чытання, якая складае істотны кампанент інфармацыйнай культуры чалавека і грамадства. Культура чытання вызначаецца найперш не аперацыйна-тэхнічнай састаўной, а зместава-сэнсавай, усведамляецца як “аснова развіцця асобы, яе інтэлектуальна-эмацыянальны, эстэтычны і духоўны патэнцыял, як

[132] Текучев, А.В. Очерки по методике обучения русскому языку / А.В. Текучев. – М.: Педагогика, 1990. – С. 49.

[133] Лихачев, Д.С. Избранное: воспоминания / Д.С. Лихачев. – СПб.: Logos, 1994. – С. 66.

[134] Цукерман, Г.А. Судьба читательской грамотности 10–15-летних школьников / Г.А. Цукерман // Вопросы образования. – 2011. – № 2. – С. 126.

дасягненне асобы, узровень чытацкага развіцця, колькасны і якасны паказчыкі дзейнасці, зносін, адначасова і прадукт, і фактар развіцця ”.[135] У вызначаных каардынатах культуры чытання адбываецца канструяванне заданняў для ацэнкі чытацкай пісьменнасці па ўсіх вучэбных прадметах. Выкарыстанне падобных заданняў спрыяе фарміраванню чытацкіх уменняў як кампанента функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў.

Спецыялістамі навуковай установы “Федэральны інстытут педагагічных вымярэнняў” распрацаваны кадыфікатар чытацкіх кампетэнцый, якія праяўляюцца праз уменні: разумець змест і структурна-сэнсавыя сувязі тэкстаў; знаходзіць і адбіраць інфармацыю; інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю; ацэньваць змест і форму твора, выкарыстоўваць інфармацыю для рашэння практычных задач. Асновай для ацэнкі чытацкай пісьменнасці выступаюць тэксты і заданні да іх, якія фарміруюцца на аснове адпрацаваных мадэлей.[136]

Створаны банк заданняў заснаваны на прынцыпах, скіраваных на паслядоўнае асэнсаванне феномена чытацкай пісьменнасці:

– максімальная апора на змест школьных прадметаў у спалучэнні з метапрадметным характарам заданняў, у якіх прадметныя веды арганічна пераплятаюцца з жыццёвым кантэкстам, інтарэсамі і патрэбнасцямі навучэнцаў;

– адпаведнасць тэкстаў патрабаванням рознафарматнасці, запытам часу, інфармацыйнай прасторы;

– устаноўка на дыялог з тэкстам/кантэкстам/з іншымі тэкстамі;

– наяўнасць інструкцыі ўмоў да выканання заданняў і выразных крытэрыяў праверкі іх якасці;

– выкананне заданняў адбываецца на аснове сегментаванага састаўнога тэксту, заснаванага на сінтэзе вербальнай/невербальнай/суцэльнай/несуцэльнай інфармацыі.

У якасці прыкладу прадэманструем групу заданняў у стылістыцы PISA для фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў 10 класа па тэме “Мова як грамадская з’ява. Функцыі мовы”.[137] Як вядома, у кантэксце заданняў PISA выкарыстоўваюцца наступныя стратэгіі фарміравання чытацкай пісьменнасці:

– *разуменне і пошук інфармацыі,* што патрабуе ад вучняў аналізу прачытанага, фармулёўкі і пастаноўкі пытанняў, лагічнай сістэматызацыі інфармацыі, фарміравання чытацкай культуры, што мае на ўвазе засваенне вядучых паняццяў тэксту, вызначэнне неабходных крыніц інфармацыі;

---

[135] Бородина, В.А. Культура чтения – универсум развития личности и модернизации образования / В.А. Бородина // Культура чтения в контексте модернизации российской школы: материалы Второй науч. –практ. конф., Санкт-Петербург, 24 января 2003 г. / редкол.: Т.Г. Галактионова [и др.]. – СПб., 2003. – С. 8.

[136] Методические рекомендации по использованию в учебном процессе банка заданий для оценки читательской грамотности обучающихся [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://doc.fipi.ru/metodicheskaya-kopilka/metod_rek_chitat_gram.pdf. – Дата доступа: 22.08.2023.

[137] Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: НІА, 2020. – 230 с.

– *пераўтварэнне і інтэрпрэтацыя інфармацыі.* Вынікам інтэрпрэтацыйных працэдур выступае выпрацоўка ўменняў структураваць прачытанае, вызначаць асаблівасці зместу і структуры тэкстаў розных функцыянальна-стылістычных тыпаў, фармуляваць асноўныя тэзісы тэкстаў, падбіраць фактычны матэрыял для аргументацыі тэзісаў, дэманстраваць разуменне тэксту;

– *ацэньванне інфармацыі* падразумявае фарміраванне ўменняў разважаць, мысліць крытычна, аналізаваць і суадносіць уласныя дзеянні з вучэбна-пазнавальнымі мэтамі. Сфарміраванасць уменняў выяўляецца ў пазітыўным кантэксце ацэнкі ўласнага развіцця і самаўдасканалення, ва ўменні фармуляваць мэты сваёй дзейнасці, суадносіць атрыманыя вынікі з эталонам (ажыццяўляць самакантроль і ўзаемакантроль зробленага), адэкватна ацэньваць ход і вынікі пазнавальнай дзейнасці.

Пры падборы дыдактычнага матэрыялу ў іміджавай стылістыцы PISA выкарыстоўваецца множнатэкставы падыход як сукупнасць разнастайных тэкстаў. PISA-падобныя заданні складаюць комплекс, у які ўваходзяць славесны і невербальны тэксты, што дэталізуюць сэнс інфармацыі. Прапанаваныя заданні адлюстроўваюць усе этапы працы навучэнца, падчас якіх фарміруюцца ўменні аналізаваць, інтэграваць і ацэньваць інфармацыю. Сумарна заданні ахопліваюць наступныя аспекты тэкставай дзейнасці: пошук звестак у розных крыніцах, чытанне і разуменне інфармацыі, падбор назвы да тэкстаў з улікам іх зместава-стылістычных асаблівасцей, фармулёўка асноўных ідэй, пошук азначэнняў да ключавых слоў, тэрмінаў, інтэрпрэтацыя інфармацыі на аснове табліц, дыяграм, графікаў. Як правіла, у якасці самастойных працэдур фармулюецца прапанова адшукаць вэб-сайты, кантэнт якіх будзе карысны для выканання прапанаваных заданняў.

Пошук інфармацыі абумоўлены вызначэннем структурных частак тэксту, з якіх будзе выбірацца інфармацыя. Гэты этап дзейнасці можа заключаць складанасць у тым, што вучань працуе з некалькімі тэкстамі адразу, паколькі ў заданні не агаворваецца, у якой частцы знаходзяцца адказы на пытанні. Тым больш, што сучасныя школьнікі не прывучаныя неаднаразова звяртацца да тэксту, правяраючы сябе. Яны знаходзяцца пад “прэсінгам” агульнага разумення, “схоплівання” інфармацыі. Пазіцыя *я ўжо прачытаў* у гэтым выпадку не самая рацыянальная. Тыповыя заданні вымагаюць знаходжання інфармацыі, зададзенай у яўным выглядзе, пры гэтым адказы прысутнічаюць у тэксце на паверхневым зрэзе. Калі пытанні паступова ўскладняюцца, то пошукі інфармацыі патрабуюць інтэлектуальных намаганняў.

I. ***Заданні на пошук і разуменне інфармацыі***

Тэкст 1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры накіраваны на рэгуляванне грамадскіх адносін у сферы культуры, а таксама на ўстанаўленне прававых, арганізацыйных, эканамічных і сацыяльных асноў культурнай дзейнасці з мэтай захавання і выкарыстання культурных каштоўнасцей.

Арганізацыі культуры ў залежнасці ад напрамкаў дзейнасці падзяляюцца на асноўныя тыпы:

– бібліятэкі;

– музеі;

– тэатры;

– цыркі;

– філармоніі, ансамблі, хоры, аркестры, студыі, канцэртныя залы і іншыя канцэртныя арганізацыі;

– клубы, палацы (дамы, цэнтры) культуры (мастацтваў), цэнтры (дамы) народнай творчасці (народнага мастацтва), цэнтры (дамы) рамёстваў, маладзёжныя культурныя цэнтры, цэнтры нацыянальных культур і іншыя клубныя арганізацыі;

– карцінныя, мастацкія галерэі і галерэі мастацтваў, выставачныя залы, панарамы і іншыя выставачныя арганізацыі;

– паркі культуры і адпачынку, гарадскія сады, заапаркі, заасады;

– творчыя майстэрні;

– метадычныя цэнтры народнай творчасці (культурна-асветнай работы);

– іншыя тыпы ўстаноў культуры.[138]

Тэкст 2. Культура (лац. *cultura* – апрацоўка зямлі, выхаванне, развіццё) – гістарычна вызначаны ўзровень развіцця творчых сіл грамадства, чалавека, сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Слова з'явілася ў Старажытным Рыме і выкарыстоўвалася ў некалькіх значэннях. Адно з іх – "спосаб выхавання чалавека-грамадзяніна, дастойнага, паважанага члена грамадства". У Сярэднявеччы культура абазначала ўменне вытлумачваць і разумець тэксты Святога пісьма. Пры гэтым галоўнай задачай было спасціжэнне Бога і чалавечага лёсу, залежнага ад Бога.

Па меры назапашвання ведаў пра грамадскае жыццё ўзнікалі новыя азначэнні культуры. Адна з такіх спроб была зроблена ў эпоху Асветы. Прадстаўнікі Рэнесансу разумелі культуру як сродак узвышэння чалавека, удасканалення духоўнага жыцця і маралі.

Сёння пад гэтым словам у шырокім сэнсе разумеюць сінтэз назапашаных чалавекам каштоўнасцей і норм, а таксама прадметны свет і ўнутраную культуру асобы. Культура ўключае:

– культурную спадчыну як сукупнасць культурных каштоўнасцей;

– сацыяльныя інстытуты і культурную дзейнасць па стварэнні, захаванні і папулярызацыі духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей (навука, мараль, адукацыя, рэлігія, мастацтва і інш.), інфраструктуру культуры (бібліятэкі, музеі, тэатры, філармоніі, цэнтры нацыянальных культур і іншыя арганізацыі).

Сацыяльныя інстытуты ў грамадстве выконваюць наступныя функцыі культуры: пазнавальную, ацэначную, рэгулятыўную (нарматыўную), інфармацыйную, камунікатыўную і функцыю сацыялізацыі.

Найважнейшай функцыянальнай асаблівасцю культуры з'яўляецца яе здольнасць да самаабнаўлення, пастаяннага ўзнікнення новых форм і спосабаў задавальнення інтарэсаў і патрэбнасцей людзей.[139]

---

[138] Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры: па стане на 6 лютага 2023 г. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2023. – С. 35–36.

Заданне 1. Адкажыце на пытанні на аснове зместу тэкстаў:

1. Якія камунікатыўныя задачы маюць першы і другі тэксты? Якой тэмай яны аб'яднаны? Чым адрозніваюцца? Абгрунтуйце, да якога стылю адносяцца.

2. Прыдумайце загалоўкі да першага і другога тэксту. Чым вы кіраваліся пры падборы загалоўкаў?

3. Якімі агульнымі характарыстыкамі паняцця *культура* аб'ядноўваюцца тэксты?

4. Прывядзіце па тры факты, што адрозніваюць змест і форму абодвух тэкстаў.

5. Якая інфармацыя з другога тэксту атрымлівае пацвярджэнне ў першым? Абгрунтуйце свой пункт погляду.

6. У якім тэксце інфармацыя больш разгорнутая, поўная? Па якой прычыне?

7. Выкажыце меркаванне пра маўленчае афармленне тэкстаў, выкарыстанне моўных сродкаў, іх дарэчнасць для стварэння аб'ектыўнай характарыстыкі культуры.

8. Які тэкст, на вашу думку, больш карысны для падрыхтоўкі рэферата? Чаму?

Заданне 2. Пазнаёмцеся з нумарамі грамадска-асветніцкай газеты "Культура" за тры-чатыры апошнія месяцы гэтага года.[140] Раскажыце пра іх змест, характар, жанравыя асаблівасці матэрыялаў па наступным плане:

– Хто з'яўляецца заснавальнікам газеты "Культура"?

– З якога часу выдаецца газета? Якая мова выдання? Перыядычнасць выхаду нумароў. Якія ўзнагароды мае газета?

– Абагульніце напрамкі публікацый (напрыклад, інфармацыя аб актуальных пытаннях дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры; аб асноўных накірунках сучаснага мастацтва; захаванне нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны; эстэтычнае выхаванне чытачоў, айчынныя і міжнародныя праекты ў сферы культуры і інш.).

– Якія публікацыі, што асвятляюць грамадскае і культурнае жыццё краіны, вам спадабаліся?

– З якімі фактамі культуры краіны, устаноў культуры, жыццём вялікіх і малых гарадоў вы пазнаёміліся? Чым яны вам запомніліся?

– Якія рубрыкі асвятляюцца ў газеце? Якія рубрыкі вам найбольш спадабаліся? Чаму?

– Чые публікацыі звярнулі вашую ўвагу? Чым?

– Якое месца займаюць публікацыі, прысвечаныя творчай моладзі?

– Што вы параілі б рэдакцыі газеты для пашырэння круга чытачоў?

– У якой ступені вам імпануе афармленне газеты?

---

[139] Смолік, А.І. Культура / А.І. Смолік // Культура Беларусі: энцыклапедыя ў 6 т. – Т. 4 / рэдкал.: У.Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2013. – С. 164.

[140] Газета "Культура" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://kultura-info.by/. – Дата доступу: 22.08.2023.

Частка заданняў можа быць аформлена ў форме тэстаў. У пытаннях тэстаў утрымліваецца ўказанне, якую інфармацыю трэба адшукаць, выбраць.

Заданне 3. Выканайце тэставыя заданні.

А1. Слова *культура* ў перакладзе з лацінскай мовы азначае:

а) шанаванне;
б) асвета;
в) апрацоўка зямлі;
г) цывілізацыя.

А2. Слова *культура* як ‘апрацоўка зямлі, выхаванне, развіццё’ з’явілася:

а) у эпоху Антычнасці;
б) у Сярэднявечча;
в) у Новы час;
г) у XX стагоддзі.

А3. Аўтарам тэрміна *культура* можа з’яўляцца:

а) філосаф Платон;
б) мовавед Браніслаў Тарашкевіч;
в) філосаф Міхаіл Бахцін;
г) фізік Альберт Эйнштэйн

А4. Слова *культура* абазначала ўменне тлумачыць і разумець тэксты Святога Пісьма:

а) у эпоху Антычнасці;
б) у эпоху Асветы;
в) у эпоху Сярэднявечча;
г) у XX стагоддзі.

А5. У эпоху Сярэднявечча галоўнай задачай культуры было:

а) пошук сапраўдных ведаў;
б) пошук гармоніі паміж чалавекам і прыродай;
в) пазнанне Бога і чалавечага лёсу;
г) узвышэнне чалавека, удасканаленне яго духоўнага жыцця і маралі.

А6. У эпоху Асветы асноўнай задачай культуры было:

а) асэнсаванне чалавечай сутнасці;
б) пошукі ідэалу ўзаемаадносін чалавека і соцыуму;
в) спасціжэнне ідэі гармоніі чалавечага быцця;
г) узвышэнне чалавека, удасканаленне духоўнага жыцця і грамадства.

А7. У шырокім сэнсе культура – гэта:

а) сінтэз назапашаных чалавекам каштоўнасцей і норм, прадметнай і ўнутранай культуры;
б) свет духоўных каштоўнасцей асобы;
в) матэрыяльныя каштоўнасці, створаныя чалавекам;
г) ідэал фізічнага і маральнага чалавека.

А8. Якія аб’екты, што знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны, уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА:

а) нацыянальны парк “Белавежская пушча”;
б) замкавы комплекс “Мір”;
в) архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы;

г) пункты геадэзічнай дугі Струвэ.

А9. Якія элементы культуры ўключаны ў Спіс нематэрыяльнай культуры спадчыны ЮНЕСКА ад Беларусі:

а) Будслаўскі фэст – традыцыйнае шэсце ў гонар Будслаўскага абраза Маці Божай у аграгарадку Будслаў (Мядзельскі раён Мінскай вобласці);
б) Калядныя цары – традыцыйнае народнае свята ў вёсцы Семежава (Капыльскі раён Мінскай вобласці);
в) культура бортніцтва Беларусі і Польшчы – старажытны промысел, заснаваны на развядзенні і ўтрыманні лясных пчол у штучных дуплах у лесе;
г) Юр'еўскі карагод – традыцыйнае народнае свята ў вёсцы Пагост (Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці).

А10.Якія аб'екты культурнай спадчыны адлюстраваны на беларускіх банкнотах рознага наміналу?

а) Палац Румянцавых і Паскевічаў (горад Гомель);
б) Спаса-Прэабражэнская царква (г. Полацк Віцебскай вобласці);
в) Замак Радзівілаў (г. Нясвіж Мінскай вобласці);
г) Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В. Масленікава.

II. ***Заданні на інтэрпрэтацыю і абагульненне інфармацыі***

У заданнях на інтэрпрэтацыю вучні павінны здабыць інфармацыю, якая не паведамляецца ў яўным выглядзе. У некаторых выпадках узнікае патрэба звярнуцца да дадатковых крыніц інфармацыі або адшукаць яе ў падтэксце. Заданні гэтага тыпу фарміруюць уменні рабіць вывады па змесце тэксту; адрозніваць галоўнае і другаснае ў паведамленнях, сцісла фармуляваць асноўныя думкі тэксту; рабіць высновы; прадбачыць развіццё з'яў, падзей.

Пытанні, заданні гэтай групы скіраваныя на фарміраванне ў навучэнцаў цэласнага разумення тэксту. Інтэграцыя інфармацыі патрабуе выхаду за прапанаваны кантэкст, выяўлення агульнай і адрознай інфармацыі, яе супастаўлення, устанаўлення прычынна-выніковых адносін.

Пытанні, што ўдакладняюць глыбіню разумення, арыентаваны на вызначэнне логікі пабудовы тэксту, яго структуры, дэталізацыю камунікатыўных задач аўтара.

Заданне 1. Суаднясіце назву функцыі культуры і яе змест, ролю ў грамадстве.

Функцыя культуры	*Змест функцыі культуры*
Пазнавальная	Засваенне індывідам сістэмы ведаў, норм, каштоўнасцей, імкненне да агульнапрынятых паводзін у соцыуме
Ацэначная	Рэалізацыя цэласнага ўяўлення пра краіну, народ, эпоху
Рэгулятыўная	Абмен ведамі, каштоўнасцямі і вопытам папярэдніх пакаленняў
Нарматыўная	Здольнасць абменьвацца культурнымі здабыткамі, забеспячэнне культурнага ўзаемадзеяння паміж людзьмі

Функцыя культуры	*Змест функцыі культуры*
Інфармацыйная	Рэалізацыя сістэмы норм і патрабаванняў да ўсіх членаў грамадства
Камунікатыўная	Рэгуляванне грамадскага жыцця, рэалізацыя сістэмы норм і патрабаванняў да ўсіх членаў соцыуму
Сацыялізацыі	Захаванне каштоўнасцей, узбагачэнне культурных традыцый

Заданне 2. Пазнайце, з якіх лексікаграфічных выданняў прыведзены наступныя слоўнікавыя артыкулы:

Культура *(ад лац. апрацоўка, выхаванне, адукацыя) – духоўны змест чалавечай жыццядзейнасці, сацыяльнай арганізацыі пазнання, якія выяўляюцца ў нацыянальных самабытных тыпах эканомікі, правасвядомасці, рэлігіі, мастацтва, тэарэтычных і практычных ведаў, асвечаных традыцыяй, культам і маральнымі імперытывамі. Паводле эмпірычнага вызначэння, культура – сукупнасць рэальных і патэнцыяльных каштоўнасцей, якія ствараюцца ў працэсе эканамічнай, грамадска-палітычнай і творча-духоўнай дзейнасці* (Уладзімір Конан).

КУЛЬТУРА, -ы, *ж.* 1. *толькі адзін.* Сукупнасць дасягненняў у вытворчым, грамадскім і культурным жыцці. *Матэрыяльная культура. Духоўная культура. Агульначалавечая культура. Гісторыя культуры.*

2. Узровень дасягненняў у пэўную эпоху ў якога-небудзь народа або класа. *Культура Старажытнага Рыма.* // *Спец.* Агульнасць археалагічных помнікаў пэўнай эпохі ў развіцці першабытнага грамадства. *Культура штрыхаванай керамікі.*

3. *толькі адзін.* Ступень, узровень развіцця якой-небудзь асобнай галіны гаспадарчай, духоўнай або разумовай дзейнасці. *Культура маўлення. Культура земляробства. Культура вытворчасці.* // Сукупнасць умоў, неабходных для жыцця адукаванага чалавека. *Культура быту.*

4. *толькі адзін.* Адукаванасць, культурнасць, выхаванасць. *Чалавек высокай культуры.*

5. *толькі адзін.* Развядзенне, вырошчванне якой-небудзь расліны; культываванне. *Культура пшаніцы.* // Апрацоўка. *Культура глебы.*

6. Расліна, якая разводзіцца, вырошчваецца. *Кармавыя культуры. Тэхнічныя культуры.*

7. Мікраарганізмы (бактэрыі, дрожджы, некаторыя грыбы), вырашчаныя ў пажыўным асяроддзі. *Культура стрэптакокаў.*

○ **Фізічная культура –** усебаковае ўдасканаленне і ўмацаванне чалавечага цела шляхам фізічных практыкаванняў, захоўвання правільнага рэжыму.

[Лац. *cultura*] (Арцём Баханькоў).

III. ***Заданні на ацэньванне інфармацыі***

Заданні на асэнсаванне і ацэнку зместу тэксту падразумяваюць устанаўленне сувязі прачытанага з іншымі крыніцамі, апору на фонавыя веды, чытацкі і жыццёвы вопыт. Распаўсюджанымі разнавіднасцямі заданняў з'яўляюцца наступныя: *згодныя вы або не згодныя са сцвярджэннямі аўтара ў тэксце; прывядзіце аргументы, доказы, што пацвярджаюць вашу пазіцыю; падрыхтуйце рэзюмэ асноўнай думкі тэксту; распрацуйце карту паняццяў да тэксту; выберыце тры ідэі з тэксту, з якімі вы пагаджаецеся/не пагаджаецеся. Па якой прычыне? Якія пытанні вы задалі б аўтару тэксту? Перадайце тэкставую інфармацыю невербальнымі сродкамі* (*табліца, схема, слайд, калаж*) і інш.; *Сфармулюйце 3–4 пытанні для аднакласнікаў, адказы на якія сведчылі б пра грунтоўнае разуменне прачытанага*; *Якой інфармацыяй вы дапоўнілі б тэкст* (*з улікам назвы, жанру, зместу*)? і інш. Лагічныя ў сістэме такіх заданняў асэнсаванне і ацэнка зместу тэксту: *пацвердзіце пэўнае сцвярджэнне на аснове ўласнага чытацкага вопыту*; *ацаніце тэзісы тэксту з пункту погляду асабістых уяўленняў пра тэму*; *выкажыце сваё меркаванне пра якасць прыведзеных у тэксце доказаў*; *назавіце, дзе можа быць скарыстана прапанаваная інфармацыя.*

Пытанні на асэнсаванне і ацэнку формы тэксту могуць мець наступны характар: *вызначце каштоўнасць інфармацыі для рашэння пэўнай праблемы; выкажыце і абгрунтуйце ступень дасягнення аўтарам мэты тэксту; растлумачце менавіта такую пабудову, форму тэксту; ацаніце дарэчнасць ужывання тэрмінаў, граматычных форм, канструкцый у тэксце* і інш.

Заданне 1. Знайдзіце і параўнайце паралелі да слова *культура* ў іншых славянскіх/неславянскіх мовах. Выпішыце і растлумачце, як падаюцца значэнні слова ў розных даведніках, якімі каментарыямі яны забяспечаны. Вызначце агульнае і адметнае ў структуры падачы значэнняў слова, ілюстрацый, спасылак, каментарыяў.

Заданне 2. Растлумачце наяўнасць некалькіх азначэнняў да паняцця *культура* ў працах славутага беларускага мовазнаўца Арнольда Міхневіча. Чым адрозніваюцца і чым блізкія гэтыя азначэнні? Якое з іх, на вашу думку, выдзяляецца найбольшай дакладнасцю, выразнасцю? Якое з азначэнняў вы скарысталі б як эталон у школьным падручніку? Растлумачце ўласны выбар.

Культура ёсць працэс і вынікі дзейнасці чалавека, накіраваныя на вырашэнне дзвюх найгалоўнейшых задач – пераўтварэнне прыроды і пераўтварэнне самога чалавека. Культура ахоплівае ўсе аспекты жыцця асобы і грамадства. Яна замацоўваецца ў агульначалавечых "культурных універсаліях" і выяўляецца ў нацыянальных формах іх рэалізацыі.

Культура з'яўляецца падсістэмай грамадства, якая забяспечвае кіраванне сацыяльнымі працэсамі на нарматыўна-знакавым узроўні. Яна вызначае тэхналогію ўзнікнення самога грамадства.

Культура ў сацыяльным вымярэнні – гэта свет акаляючых чалавека рэчаў, створаных яго працай, свет шматмерных адносін, узаемадзеяння чалавека з прыродным асяроддзем.

Культура ёсць самаабнаўляльнае ў працэсе чалавечай дзейнасці сацыяльнае быццё індывіда, асвечанае традыцыяй, каштоўнаснымі ўстаноўкамі, нормамі маралі, узорамі працы і паводзін.

Культура як нацыянальны рэсурс – гэта сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, што ўтвараюць сістэму грамадскіх норм, правіл, якія рэгулююць пэўную сферу жыццядзейнасці (нацыянальная мова, гісторыка-культурная спадчына, фальклор, народныя промыслы і рамёствы, прафесійнае і самадзейнае мастацтва, мастацкая адукацыя, установы і кадры культуры, культуразнаўства, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя сувязі.[141]

Заданне 3. Параўнайце, як раскрываецца значэнне слова *культура* рознымі аўтарамі. Што агульнага і адрознага маюць гэтыя азначэнні? Якая новая інфармацыя ў азначэннях паняцця сведчыць пра індывідуальнае/калектыўнае разуменне сутнасці слова? У якіх тэкстах найбольш выразна выяўляюцца асоба аўтара, яго эмацыянальныя адносіны да вызначэння? Якія вобразныя параўнанні/эпітэты выкарыстоўваюцца ў тэкстах? З чым звязана адсутнасць вобразных сродкаў у некаторых азначэннях?

Культура – гэта не колькасць прачытаных кніг, а колькасць кніг, якія мы зразумелі (*Фазіль Іскандэр*, пісьменнік).

Сэрца, уяўленне і розум – тое асяроддзе, дзе зараджаецца тое, што мы называем *культурай* (Канстанцін Паўстоўскі, пісьменнік).

Культура – гэта цэласная з'ява, якая пераўтварае людзей, што насяляюць пэўную прастору, з простага насельніцтва ў народ, нацыю. У паняцце культуры павінна ўваходзіць і заўсёды ўваходзілі рэлігія, навука, адукацыя, маральныя і сацыяльныя нормы паводзін людзей і дзяржавы. Культура – гэта тое, што ў значнай меры апраўдвае перад Богам існаванне народа і нацыі (Філолаг, акадэмік Дзмітрый Ліхачоў).

Культура – гэта святыня народа, святыня нацыі, святыня нашай культуры: яе навука, яе тысячагадовыя культурныя каштоўнасці, музеі, што захоўваюць каштоўнасці ўсяго чалавецтва. Культура развіваецца шляхам назапашвання каштоўнасцей, пазбаўлення ўсяго непатрэбнага і замены яго тым, што застаецца на стагоддзі і тысячагоддзі. Класічнае мастацтва, класічная музыка, архітэктура, літаратура, навука – гэта тая культура, якая прайшла выпрабаванне часам. Выпрабаванне на праўдзівасць, дабро і прыгажосць (Філолаг, акадэмік Дзмітрый Ліхачоў).

Заданне 4. Прааналізуйце схему і запішыце назвы сацыяльных інстытутаў (мастацтва, адукацыя, мараль, рэлігія, навука) на аснове прыведзеных азначэнняў.

[141] Міхневіч, А.Я. Выбраныя працы. Мова – культура – камунікацыя /А.Я. Міхневіч; уступны артыкул С.А. Важніка. – Мінск: РІВШ, 2013. – С. 98–102.



Заданне 5. Перачытайце тэкст-вытрымку з Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Запішыце 1–2 прыклады на кожны тып арганізацыі культуры (музеі, бібліятэкі, аркестры, студыі, канцэртныя залы, палацы культуры, карцінныя галерэі, паркі культуры), што дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Карыстайцеся інтэрнэт-матэрыяламі і выданнем "Культура Беларусі: энцыклапедыя [у 6 т.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя (2010–2015).

Узор выканання: Музеі Беларусі: Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой"; Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь; Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь; Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж"; музей "Замкавы комплекс "Мір"; Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы; Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа; Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры; філіял "Літаратурны музей Максіма Багдановіча"; Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь і інш.

Заданне 6. У прыведзеных тэкстах ужываюцца словы, што выкарыстоўваюцца для характарыстыкі паняцця культура: *філармонія, аркестр, студыя, хор, ансамбль, галерэя.* Для кожнага слова з левага слупка падбярыце значэнне з правага слупка. Запішыце адказы як суадносіны літар А, Б, В, Г, Д, Дж, Дз з адпаведнымі лічбамі.

А. Ансамбль	1. Калектыў музыкантаў, якія сумесна выконваюць музычны твор; сукупнасць музычных інструментаў, што ўдзельнічаюць у выкананні музычнага твора
Б. Аркестр	2. Група артыстаў, якія выступаюць разам і складаюць адзіны мастацкі калектыў
В. Галерэя	3. Спецыяльна аформленае памяшканне для выстаўкі мастацкіх твораў; мастацкі музей

Г. Студыя	4. Установа, якая займаецца арганізацыяй канцэртаў і прапагандай музычнай культуры
Д. Філармонія	5. Установа для падрыхтоўкі мастакоў, скульптараў, артыстаў, дзе вучэбныя заняткі спалучаюцца з творчай практыкай
Дж. Спонсар	6. Багаты апякун навукі і мастацтва (ад імені рымскага багацея, які падтрымліваў паэтаў)
Дз. Мецэнат	7. Асоба (арганізацыя), якая аказвае фінансавую падтрымку ўстановам культуры

Заданне 7. Прачытайце азначэнне слова *музей*, пададзенае ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры. На аснове дэфініцыі распрацуйце артыкул для Тлумачальнага слоўніка, у якім павінны быць захаваны наступныя структурныя *кампаненты:* загаловачнае слова і яго граматычная характарыстыка; стылістычная характарыстыка; сэнсавая характарыстыка слова; пометы; ілюстрацыі да значэнняў слова.

Заданне 8. Паводле статыстычнага даведніка “Беларусь у лічбах” (Мінск, 2023 год) найбольш папулярнымі паводле колькасці наведвальнікаў у 2022 годзе былі музеі, фотаздымкі якіх адлюстраваны ніжэй. Запішыце дакладныя назвы гэтых музеяў. Раскажыце пра іх прызначэнне, характар дзейнасці. Карыстайцеся інтэрнэт-матэрыяламі і выданнем “Музеи Беларуси / ред. совет: В.В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2018. – 448 с.”. Падрыхтуйце прэзентацыю пра гісторыю, дзейнасць аднаго з музеяў.

Заданне 9. Разгледзьце табліцу, падрыхтаваную складальнікамі статыстычнага даведніка “Беларусь у лічбах” (Мінск, 2023 год). Складзіце тэкст на аснове табліцы. Прывядзіце прыклады прафесійных тэатраў Рэспублікі Беларусь. Выкажыце меркаванне, чаму колькасць наведванняў тэатраў зменшылася ў зафіксаваны перыяд. Аргументуйце сваю пазіцыю, прывёўшы не менш за тры аргументы. Якім чынам, на вашу думку, трэба прапагандаваць дзейнасць прафесійных тэатраў, каб колькасць гледачоў павялічвалася?

Прафесійныя тэатры Рэспублікі Беларусь

Усяго – 28

- Драматычных і музычных – 19
- Лялечных і юнага гледача – 8
- Оперы і балета –1

Наведванне тэатраў

Паказчыкі наведвання тэатраў	2019	2020	2021	2022
Колькасць наведванняў тэатраў (тыс.)	1755	693	851	1376
У сярэднім на адзін тэатр (тыс.)	61	25	30	49
На 1000 чалавек насельніцтва наведванняў	186	74	91	149

Паводле статыстычнага даведніка “Беларусь у лічбах” у 2022 годзе найбольш папулярнымі для гледачоў былі тэатры, адлюстраваныя на фотаздымках. Запішыце іх дакладныя назвы. Раскажыце пра адзін з тэатраў больш падрабязна (гісторыя, этапы развіцця, узнагароды, знакамітыя спектаклі, славутыя артысты і інш.).



Такім чынам, чытанне як індывідуальны/сацыяльны/культурны рэсурс у сучасных умовах атрымлівае дадатковыя характарыстыкі. Шматаспектны характар чытання мае на ўвазе інтэграцыю стратэгій, тэхналогій сацыяльна-педагагічнага ўзаемадзеяння ўсіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу. Чытанне ў каардынатах функцыянальнай пісьменнасці разглядаецца як спосаб павышэння ўзроўню культуры працы з інфармацыяй. З улікам навуковых напрацовак развіваецца паняцце *новая якасць чытання* ва ўмовах паглыблення паняцця тэксту як мноства фарматаў прадстаўлення інфармацыі.

2.2 Мадэлі далучэння навучэнцаў да чытання: вопыт айчыннай і замежнай школы

Праблема чытання і разумення тэксту застаецца адной з самых актуальных у школьным навучанні, што пацвярджаецца шматлікімі навукова-метадычнымі напрацоўкамі вучоных і педагогаў-практыкаў. Вывады адносна маніторынгу чытацкай пісьменнасці беларускіх навучэнцаў у міжнародных даследаваннях PISA характарызуюць узровень чытання як прымальны: "Большасць вучняў (76,6%) паказалі вынік чытацкай пісьменнасці, які перавышае парогавы ўзровень. Пры гэтым найбольш шматлікая група ўдзельнікаў тэсціравання (56,6%) прадэманстравала навыкі, адпаведныя другому і трэцяму ўзроўням чытацкай пісьменнасці. Гэта даказвае, што больш за палову вучняў здольны выявіць і абагульніць інфармацыю ў адпаведнасціі з шэрагам крытэрыяў, вызначыць асноўную ідэю тэксту, параўнаць інфармацыю з улікам аднаго або некалькіх паказчыкаў (у тым ліку і супярэчлівую інфармацыю), устанавіць сувязі ўнутры тэксту і з жыццёвымі ведамі". [142] Нягледзячы на суцяшальныя меркаванні, узровень падрыхтаванасці вучняў – аб'ект клопатаў метадыстаў, занепакоеных невысокім узроўнем чытання і разумення тэкстаў школьнікамі па розных вучэбных прадметах.

Так, сярод асноўных прычын цяжкасцей пры вывучэнні прадмета "Беларуская мова" 38,5% настаўнікаў называюць "недастаткова сфарміраванае ўменне выкарыстоўваць чытанне як сродак навучання". [143] Пра неабходнасць удасканальваць чытацкія ўменні сведчаць і вынікі маніторынгавага даследавання, праведзенага Нацыянальным інстытутам адукацыі, у рамках якога фіксавалася сфарміраванасць чытацкіх уменняў: фармуляваць вывады; інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю; аналізаваць і ацэньваць змест тэкстаў. Вынікі наступныя: "У больш за палову пяцікласнікаў чытацкія ўменні сфарміраваны на нізкім узроўні, у большасці васьмікласнікаў чытацкія ўменні знаходзяцца на сярэднім узроўні. Найбольшую цяжкасць як у пяцікласнікаў,

[142] Позняк, А.В. PISA – 2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А.В. Позняк; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. – Минск: Медиасонт, 2021. – 59 с.

[143] Рэкамендацыі па выніках рэспубліканскай кантрольнай работы па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" (X клас) // Веснік адукацыі – 2019. – № 7. – С. 38.

так і васьмікласнікаў выклікалі заданні на праверку ўмення аналізаваць і ацэньваць змест тэксту”.[144]

Зазначым, што развіццё культуры чытання знаходзіцца ў крузе прыярытэтных накірункаў, замацаваных у зацверджаных стандартах агульнай сярэдняй адукацыі. У дакуменце выразна прапісана, што пры вывучэнні ўсіх прадметаў школьнай праграмы арганізуецца праца па фарміраванні і развіцці чытацкай пісьменнасці. Агульная місія чытання акрэсліваецца як сродак дасягнення прадметных і метапрадметных кампетэнцый. [145] З улікам запатрабаванасці праблема чытання навучэнцаў знаходзіцца ў зоне павышанай увагі настаўнікаў, бібліятэкараў, грамадскасці. Дыяпазон пазіцый, ацэнак вар’іруецца ад дэпрэсіўнай канстатацыі глыбокага крызісу чытацкай культуры да неабходнасці сцвярджэння новай мадэлі чытання ва ўмовах інфармацыйнага грамадства. Адносна “новай” мадэлі чытання выкажам уласныя сумненні. Метадысты сцвярджаюць, што на сённяшні дзень прымяняецца больш за 100 тэхналогій чытання [146], кожная з якіх мае свае асаблівасці і скіравана на дасягненне эфектыўнага выніку. Наўрад ці апраўданыя пошукі 101 новай мадэлі, новых метадаў, стратэгій і методык чытання, спосабаў аналізу і інтэрпрэтацыі тэкстаў. Ёсць метадычны сэнс у тым, каб засяродзіцца на класічным вопыце, напрацаваным стагоддзямі прагрэсіўнымі метадыстамі. Напрыклад, яшчэ на пачатку станаўлення метадычнай навукі аўтар “Методыкі роднай мовы” Якуб Колас сцвярджае, што чытанне з’яўляецца “адзіным сродкам самаасветы, які падымае, узвышае і крышталізуе дух дзіцяці”.[147]

Любы вопыт, у рэчышчы якога чытанне становіцца сродкам уваходжання чалавека ў культуру, важкім фактарам яго асабістых поспехаў у разнастайных сферах жыццядзейнасці, варты пераймання. Трэба зазначыць, што праблема фарміравання свядомага чытача набыла міжнародны рэзананс. Падзенне прэстыжу чытання разглядаецца як глабальная тэндэнцыя, не абумоўленая этнічнымі асаблівасцямі развіцця. Як правіла, міжнародная супольнасць аднолькава зацікаўлена рэагуе на праблему, прымаючы нацыянальныя праграмы, скіраваныя на падтрымку і развіццё практык дзіцячага/моладзевага чытання, на пошукі рацыянальных падыходаў, метадаў і методык па выхаванні чытачоў “лічбавага пакалення”, іх камфортнага існавання ў кніжным свеце. Выхаванне свядомага чытача мае глабальны, цывілізацыйны характар, культура чытання не залежная ад расавых, нацыянальных, эканамічных, палітычных і іншых асаблівасцей развіцця краіны.

Звернемся да вопыту іншых краін у вырашэнні праблемы далучэння школьнікаў да чытання як феномена, што вызначае культурнае развіццё асобы

---

[144] Рекомендации по совершенствованию читательских умений учащихся учреждений общего среднего образования // Веснік адукацыі. – 2018. – № 10. – С.50–51.

[145] Образовательные стандарты общего среднего образования Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – Дата доступа: 17.08.2023.

[146] Васев, Д.В. Социально-педагогическая проблема освоения культуры чтения / Д.В. Васев // Национальная ассоциация ученых. – 2020. – № 52. – С. 20.

[147] Колас, Якуб. Методыка роднай мовы / Якуб Колас // Збор твораў: у 14 т. – Т. 12. – Мінск: Народная асвета, 1976. – С. 402.

і чалавецтва ў цэлым. Змяншэнне ролі чытання ў жыцці маладога пакалення сацыёлагі пачалі канстатаваць з 1990-х гадоў. З гэтага часу вяртанне чытанню класічных пазіцый стала ўсведамляцца не толькі як педагагічная, але і агульнадзяржаўная праблема. На сённяшні дзень Вялікабрытанія і Фінляндыя з'яўляюцца прызнанымі еўрапейскім лідарамі ў правядзенні палітыкі чытання. Францыя, Бельгія, Нарвегія, Германія, Італія, Аўстрыя рэйтынгуюцца як краіны з устойлівымі традыцыямі далучэння да чытання моладзі, ЗША – як узор шырокамаштабных сістэмных мерапрыемстваў у гэтай галіне. [148] Так, распрацаваная стратэгія чытацкай пісьменнасці ў Вялікабрытаніі яшчэ ў 1996 годзе ўяўляла сабой нацыянальны праект, які ахопліваў 250 школ і сотні настаўнікаў. [149] У рамках праекта прымаліся наступныя захады: далучэнне да чытання з малых гадоў; развіццё ў дзяцей любові да чытання і імкнення да ведаў; пазіцыянаванне чытання як захапляльнай і сучаснай формы правядзення вольнага часу. У многіх сярэдніх школах была ўведзена новая пасада – кансультанта чытання, што пасля эксперымента засталася ў штаце школы ў якасці настаўніка чытання.

Пісьменнасць і далучэнне да чытання з'яўляецца прыярытэтным накірункам адукацыі і ў ЗША. У 1985 годзе была прынята дзяржаўная праграма, у якой сцвярджалася: "Для захавання і развіцця амерыканскай дэмакратыі неабходна тэрмінова ператварыць Амерыку ў нацыю чытачоў". [150] З гэтага часу праводзіліся маштабныя нацыянальныя праекты, скіраваныя на папулярызацыю чытання ў ЗША: "Год чытача – на ўсё жыццё" (1991), "Пазнай новае – чытай" (1992), "Кнігі змяняюць жыццё" (1993–1994), "Пабудуй сваё будучае – чытай!" (1995–1996), "Чытай – пішы – сёння" (1996), "Створым нацыю чытачоў" (1997–2000), "Раскажам гісторыю Амерыкі" (2000–2003) і інш.

Паказальным з'яўляецца і вопыт ЗША ў плане падрыхтоўкі настаўнікаў чытання. Настаўнік чытання – гэта спецыяліст, які дапамагае дзецям пераадолець цяжкасці, звязаныя з працэсам чытання. Згодна з "Патрабаваннямі да настаўніка чытання"[151], гэты спецыяліст:

- павінен мець адпаведную адукацыю;
- валодаць фундаментальнымі ведамі па літаратуры, педагогіцы, псіхалогіі;
- умець ствараць і падтрымліваць матывацыю да чытання;
- ацэньваць індывідуальныя дасягненні кожнага вучня;
- прафесійна арыентавацца ў метадах навучання чытанню;
- выкарыстоўваць групавыя і індывідуальныя заняткі;
- верыць у тое, што кожнае дзіця здольнае навучыцца чытаць і пісаць.

[148] Галактионова, Т.Г. Приобщение школьников к чтению: феномен открытого образования: науч.-метод. материалы / Т.Г. Галактионова. – СПб.: Книжный Дом, 2018. – С. 45.

[149] Сметанникова, Н.Н. Стратегиальный подход к обучению чтению: междисциплинарные проблемы чтения и грамотности: монография / Н.Н. Сметанникова. – М.: Школьная библиотека, 2005. – С. 12–13.

[150] Галактионова, Т.Г. Приобщение школьников к чтению: феномен открытого образования: науч.-метод. материалы / Т.Г. Галактионова. – СПб.: Книжный Дом, 2018. – С. 46.

[151] Корякин, М.В. Чтение за рубежом: обзор переводной литературы // М.В. Корякин // Книжная культура: опыт прошлого и проблемы современности: материалы конф. – М.: Наука, 2010. – С. 170–173.

Зразумела, што прафесійная падрыхтоўка спецыялістаў дазваляе вырашаць праблему далучэння дзяцей да чытання на якасна новым узроўні.

Прыкладам клопату пра развіццё чытання прызнаецца і дзейнасць урада Фінляндыі. Згодна з міжнароднымі параўнальнымі даследаваннямі PISA, фінскія падлеткі з'яўляюцца лепшымі чытачамі ў краінах Еўропы. Тым не менш праца па далучэнні да чытання працягваецца на дзяржаўным узроўні. Адной з найбольш доўгатэрміновых і значных праграм, якая рэалізуецца як прыярытэтны праект Нацыянальнай фінскай калегіяй па адукацыі, з'яўляецца праграма "Читающая Финляндия".[152]

Прадстаўнікі педагагічнай грамадскасці тлумачаць належныя вынікі французскіх школьнікаў наступнымі фактарамі:

– высокі сацыяльны статус настаўніка;

– мадэрнізацыя падрыхтоўкі педагогаў;

– увага выкладчыкаў усіх прадметаў да фарміравання тэкставай дзейнасці;

– увядзенне ў школы пасады настаўніка чытання;

– павышэнне ўвагі да ўзросту дзяцей 10–12 год, які, на думку спецыялістаў, з'яўляецца сензітыўным, найбольш спрыяльным для выхавання цікавасці да чытання;

– далучэнне да чытання праз праграмы свабоднага чытання ў другую палову дня;

– пастаянны маніторынг падрыхтоўкі вучняў для выяўлення якасцей чытання.[153]

Агульнай тэндэнцыяй у дзейнасці школьных устаноў за мяжой па далучэнні да чытання з'яўляецца спалучэнне мэтанакіраванай працы ў развіцці навыкаў чытання (у рэчышчы прынятых нацыянальных праграм) з правядзеннем масавых мерапрыемстваў па стымуляванні жадання чытаць, атрымліваць задавальненне ад чытання. Актыўным рэсурсам выступаюць бібліятэкі, музеі літаратурных герояў (напрыклад, дом-музей на Бейкер-Стрыт, дзе жыў знакаміты сышчык Шэрлак Холмс, музей Дон Кіхота ў Іспаніі, музей Тома Сойера ў ЗША). Арыгінальнымі праектамі замежжа лічацца музей "Даліна Мумі-Тролей" (Фінляндыя), музей Робіна Гуда (Англія), Парк "Свет Астрыд Ліндгрэн" (Швецыя), Парк "Алісы з Краіны Цудаў", Парк персанажаў казак братоў Грым (Італія). Безумоўна, такія формы папулярызацыі кніг, творчасці пісьменікаў дазваляюць эфектыўна спалучаць адпачынак з захапляльным знаёмствам са светам кнігі і чытання.[154]

Цікавым у плане развіцця цікавасці да чытання можа быць вопыт Шведскай акадэміі дзіцячай літаратуры, якая сфармулявала 18 правіл-адказаў на пытанне: *Чаму трэба чытаць дзіцячыя кнігі?* Паважаныя людзі, "абцяжараныя" высокімі званнямі, знайшлі патрэбныя, зразумелыя, псіхалагічна вывераныя словы,

[152] Материалы семинара «Международные программы чтения» // Школьная библиотека. – 2004. – № 3. – С. 16.

[153] Гришина, С. О летних программах, центрах чтения и не только: из опыта работы зарубежных библиотек/С. Гришина // Школьная библиотека. – 2015. – № 1. – С. 27–34.

[154] Галактионова, Т.Г. Приобщение школьников к чтению: феномен открытого образования: научно-методические материалы / Т.Г. Галактионова. – СПб.: Книжный Дом, 2018. – С. 54.

звернутыя да маленькіх чытачоў з мэтай пераканаць іх, што добрая кніга ўзбагачае чалавека, вучыць дабру, інтэлігентнасці, добразычлівасці, памяркоўнасці ў адносінах да блізкіх і чужых людзей:

1. Кніга развівае нашу мову і павялічвае запас слоў. Яна вучыць нас выказваць нашы думкі і разумець, што гавораць і пішуць іншыя.
2. Кніга развівае наша мысленне. З кніг мы вучымся абстрактным паняццям, кнігі пашыраюць гарызонты нашага свету.
3. Кніга стымулюе фантазію і вучыць нас мысліць прыгожымі вобразамі.
4. З кніг мы даведваемся пра другія краіны і іншы лад жыцця, пра тэхніку, прыроду, гісторыю, пра ўсё, што нас цікавіць.
5. Кніга развівае нашы здольнасці да суперажывання. Мы вучымся разумець іншых людзей.
6. Кнігі надаюць нам сілы і натхненне. Яны забаўляюць і захапляюць. Яны прымушаюць нас смяяцца і плакаць. Яны прыносяць нам суцяшэнне і падказваюць выхад з цяжкога становішча.
7. Кнігі фармулююць важныя пытанні, над якімі варта задумвацца.
8. Кнігі вучаць нас этыцы. Яны прымушаюць нас разважаць пра дабро і зло.
9. Кнігі тлумачаць нам жыццё і дапамагаюць убачыць сувязі паміж з’явамі.
10. З кніг мы разумеем, што не на ўсе пытанні ёсць адназначныя адказы, што на любую праблему можна паглядзець з розных пазіцый. Кнігі пераконваюць, што канфлікты нельга вырашаць шляхам прымусу, насілля.
11. Кнігі дапамагаюць нам спазнаць саміх сябе. Для пачуцця ўласнай годнасці вельмі важна ведаць, што іншыя людзі думаюць, адчуваюць і рэагуюць гэтак жа, як мы.
12. Кнігі дапамагаюць нам зразумець людзей. Чытаючы кнігі, напісаныя пісьменнікамі розных культур і эпох, мы бачым, што іх думкі і пачуцці падобныя на нашы. У гэтым выпадку мы лепш разумеем іншыя культуры, пазбаўляемся ад перажыткаў.
13. Кнігі аблягчаюць адзіноту. Кнігу можна ўзяць з сабой заўсёды і ўсюды. Яе можна бясплатна ўзяць у бібліятэцы, ёй не патрэбна электрасетка.
14. Кнігі – гэта частка нашай культурнай спадчыны. Яны ствараюць агульныя ідэалы ў культуры.
15. Добрую дзіцячую кніжку можна чытаць услых на радасць дарослым і дзецям. Кнігі аб’ядноўваюць пакаленні.
16. Дзіцячая кніжка адкрывае нам шлях у вялікую літаратуру – агромністы свет на ўсё наша жыццё. Важна, каб першая сустрэча з кнігай стала запамінальнай.
17. Дзіцячая кніга ўзбагачае культуру краіны. Над кніжкай працуе мноства людзей: пісьменнікі, мастакі, выдаўцы, рэдактары, друкары, прадаўцы кніг, бібліятэкары.

18. Дзіцячая кніга – гэта важная частка культурнага экспарту, які прыносіць краіне даход і павышае яе прэстыж за мяжой.[155]

Мяркуем, што менавіта ў такім жанры даверлівай гутаркі павінны афармляцца нашы прадмовы да падручнікаў па літаратурным чытанні для школьнікаў малодшага і сярэдняга ўзросту.

Расійскі вопыт далучэння да чытання мае багатыя традыцыі і рэалізуецца ў разнастайных формах, якія ўключаюць ініцыятывы дзяржаўнага, прафесійнага і грамадскага ўзроўню. Пры ўсёй розніцы фармулёвак, канцэптуальных падыходаў да чытання інтэграваным момантам з'яўляецца новае бачанне шляхоў выхавання сучаснага чытача. Гэта выяўляецца ў агульных пазітыўных тэндэнцыях: арыентацыя на актыўныя формы навучання, увага да матывацыйна-каштоўнасных установак, змяненне стылю зваротаў складальнікаў падручнікаў да чытачоў – з аўтарытарна-павучальнага на сяброўска-добразычлівы, апора на калектыўнае абмеркаванне ідэй, думак, меркаванняў, абнаўленне круга чытання і інш.

Далучэнне да чытання на этапе пачатковай школы пазначана сучаснымі дамінантамі. Уменне чытаць, апроч традыцыйнага засваення тэхнічных момантаў, абавязкова ўключае прыярытэты – асэнсаванае ўспрыманне прачытанага, арыентацыю ў свеце дзіцячых кніжак, акцэнтаванне мастацкай формы тэкстаў. Вучэбны план асноўнай школы ўключае літаратуру як вучэбны прадмет, арыентаваны на развіццё чытацкай культуры і чытацкай пісьменнасці. Тэкст на гэтым этапе, выступаючы ключавым фактарам адукацыйнага працэсу, увасабляе сваю шматжанравасць і шматфункцыянальнасць, з'яўляецца прадметам дэталёвага чытання, уважлівага аналізу, узорам для прэзентацыі ўласных выказванняў, выступае разумным субяседнікам.

Ідэя далучэння школьнікаў да чытання знаходзіць увасабленне ў дзейнасці бібліятэк, музеяў, СМІ, у пошуках арыгінальных шляхоў прапаганды чытацкай цікавасці ў рэгіёнах. Новым крокам у гэтым напрамку з'яўляюцца рэкамендацыйныя спісы (і доступ да кніг), бібліяграфічныя электронныя фарматы інфармацыі пра літаратурныя выданні з паралельным відэарадам. Напрыклад, зайздроснай папулярнасцю карыстаецца сайт "БібліяГід", які штодзённа наведвае 500–600 карыстальнікаў. [156] Сайт "БібліяГід" як своеасаблівы экскурсавод па літаратуры для дзяцей і пра дзяцей створаны ў 2002 годзе. На сённяшні дзень – гэта захапляльнае падарожжа па кнігах, адрасаваных дзецям і падлеткам. На сайце штомесячна публікуецца анатаваны каталог, які ўключае не менш за 60 найменняў кніг, што суправаджаюцца бібліяграфічным апісаннем, анатацыяй і каляровым фотаздымкам вокладкі.

Сетка спецыялізаваных бібліятэк для дзяцей, паводле ацэнкі Т.Г. Галакціёнавай, – гэта "нацыянальнае багацце Расіі". Крыніцай адраджэння традыцый кніжнай культуры з'яўляецца панарама культурна-адукацыйных

[155] Восемнадцать «зачем» нужны детские книжки / Шведская академия детской литературы // Библиотека в школе. – 2014. – № 1. – С. 2–3.

[156] Библиогид. Рекомендательный ресурс для детей и взрослых [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://rgdb.ru/megaproekty/bibliogid-rekomendatel-nyj-resurs-dlya-detej-i-vzroslykh. – Дата доступа: 24.08.2023.

праектаў, прысвечаных чытанню, – неаспрэчны доказ, што ў Расіі жывое згуртаванне кніжнікаў, зачараваных словам, кнігай, культурай. Аўтары шматлікіх ініцыятыў – прадстаўнікі адукацыі, бібліятэчнай справы, выдавецкага, кніжна-гандлёвага бізнесу, школьнікі, студэнты. Выклікаюць захапленне як маштабы кніжнага руху, адлюстраванне ідэй праектаў у інтэрнэт-прасторы (напрыклад, Школа валанцёраў чытання[157], Маніфест кніжніка[158]), так і ўзровень літаратурнай актыўнасці рэгіёнаў Расіі, іх унёсак у развіццё нацыянальнай літаратуры і ўзбагачэнне культурнай прасторы краіны, актыўнасць моладзевых ініцыятыў у літаратурным жыцці.

Разнастайнасць адукацыйных праграм, прадстаўленых на штогадовыя конкурсы, уражваюць жаданнем падняць прэстыж, памножыць сілу і прыгажосць слова, радасць чытання, каштоўнасць кнігі. Хочацца раздзяліць пазіцыю А.І. Казаковай у вызначэнні місіі праекта: “Вярнуць дзецям захопленасць мовай, падтрымаць іх любоў і цікавасць да чытання. Мове належыць вызначальная роля ў фарміраванні светапогляду нацыі: тое, што сёння бытуе ў маўленчым асяроддзі, заўтра развіваецца ў свядомасці”.[159]

Нават павярхоўнае знаёмства з задумамі, зместам, фарматамі прэзентацый праектаў пераконвае ў актуальнасці ініцыятыў, творчасці аўтараў, сацыяльнай і культурнай значнасці зробленага, у канкурэнтаздольнасці расійскай кніжнай культуры: “Чытач года” (фармат – творчы конкурс), “Гарадскі кніжны фестываль” (сеткавы праект), “Бібліятэка ў парку” (фестываль чытання), “БукКіно” (блог), “Краіна Чыталія расказвае” (пазнавальны і забаўляльны часопіс), “Час чытаць” (конкурс буктрэйлераў), “Лета з кнігай” (краявая акцыя), “Мне праз кнігу бачны свет”, “Кот Бродскага” (гарадскі праект), “Родам з дзяцінства” (рэгіянальная бук-кампанія), “Чытанне – опцыя даступная” (сеткавы конкурс), “Чытай не толькі смс”, “Кніга года” (намінацыі “Лепшая кніга”, “Лепшае мастацкае афармленне”, “Знакамітыя землякі”), “Малая Радзіма – вялікая літаратура” (міжведамасны рэгіянальны праект) і інш.[160]

У рэчышчы сучасных падыходаў фарміруюцца класічна-традыцыйныя адносіны да чытання як спосабу духоўна-маральнага развіцця асобы, асэнсаванне чытацкай пісьменнасці як неабходнай умовы дасягнення адукацыйных і сацыяльных мэт. У агульным кантэксце вырашэння праблемы расце актуалізуецца ідэя кансалідацыі намаганняў настаўнікаў, бібліятэчных супрацоўнікаў, выкладчыкаў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, дзяржаўных органаў. Мажліва, на сённяшні дзень недаацэньваецца патэнцыял міжпрадметнай інтэграцыі, аб’яднання магчымасцей вучэбна-выхаваўчай дзейнасці школьных устаноў, дадатковай адукацыі. Надзвычай важна, каб

[157] Школа волонтеров чтения. – Режим доступа: https://sovobrazovanie.ru/index.php?option=com_content&view=article&id=1579:2018-07-24-11-45-06&catid=72:2011-07-06-05-36-19&Itemid=58 . – Дата доступа: 24.08.2023.

[158] Манифест книжника. – Режим доступа: https://bookunion.ru/projects/manifest/. – Дата доступа: 24.08.2023.

[159] Казакова, Е.И. Технологии успешного чтения: монография / Е.И. Казакова, Т.Г. Галактионова. – СПб.: ЛЕМА, 2015. – С. 118.

[160] 100 проектов про чтение: культурно-образовательный атлас / сост. Р.В. Раппопорт. – М.: РИПОЛ, 2016. – 144 с.

арыгінальныя, нестандартныя формы працы ў гэтым накірунку пазбаўляліся лакальнасці, эпізадычнасці і набывалі маштабны характар, аўтарытэт і прызнанне не толькі саміх устаноў адукацыі, культуры, але і валанцёраў чытання, дзіцячых і моладзевых ініцыятыў. Трэба, каб кожны свядомы грамадзянін пранікся пачуццём адказнасці перад сабой, уласнымі і чужымі дзецьмі за ўзровень чытання і развіццё кніжнай культуры сваёй краіны.

З мэтай акрэсліць навуковыя пазіцыі сучаснай стратэгіі і тактыкі ў далучэнні школьнікаў да чытання нагадаем пра рацыянальна распрацаваную канцэпцыю, паспяховасць якой пацверджана эксперыментальна, у межах якой чытанне разглядаецца як сацыяльна-педагагічны феномен [161]:

– чытанне школьнікаў уяўляе сабой сістэму, што ўключае ўсіх суб'ектаў педагагічнага працэсу; тэксты, розныя паводле способаў прэзентацыі інфармацыі і яе засваення; прадстаўнікоў соцыуму (школа, сям'я, грамадства), якія непасрэдна або апасродкавана ўплываюць на праблему *школьнік – тэкст.* Ключавым кампанентам сістэмы выступаюць асобасныя чытацкія патрэбнасці;

– вынікам жыццядзейнасці гэтай сістэмы з'яўляецца далучэнне школьнікаў да чытання як найважнейшага спосабу засваення значымай інфармацыі (вучэбнай, сацыяльнай, прафесійнай), сродку фарміравання ведаў з дапамогай пісьмовых друкаваных і электронных крыніц;

– мадэллю далучэння школьнікаў да чытання, адэкватнай асаблівасцям сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, выступае дыялог – з тэкстам, з аднакласнікамі, настаўнікамі, бацькамі, соцыумам пры захаванні прыярытэту патрэбнасцей, інтарэсаў навучэнцаў, што дапамагае засвоіць разнастайныя спосабы чытання, аналізаваць і разумець прачытанае, гарманічна развівацца.

Чытанне сучасных школьнікаў характарызуецца наступнымі асаблівасцямі, што прадвызначаюцца сённяшнімі адукацыйнымі рэаліямі:

– новы фармат і шматпланавы характар тэкстаў, пераход ад аўтарытарнасці вербальнай камунікацыі да сінтэзу з іншымі формамі;

– разнастайныя спосабы актуалізацыі сацыяльнай камунікацыі ў кантэксце чытання, узмацненне ролі асяроддзя, у якім чытанне ўспрымаецца як умова асабістых дасягненняў; адзнака гарманічнага развіцця асобы; культурны спосаб узаемадзеяння ў соцыуме;

– новы тып школьніка-чытача, для якога характэрная пэўная перавага прагматычных адносін да чытання на фоне выразна сфарміраваных патрэбнасцей у засваенні культурнага вопыту іншых чытачоў, прызнанне чытання як асабіста значымай каштоўнасці, сродку самарэалізацыі.[162]

Неабходная мэтанакіраваная праца ўсіх настаўнікаў-прадметнікаў у засваенні стратэгій эфектыўнага чытання ў адукацыйным працэсе, далучэнне школьнікаў да чытання праз удзел у творчых міждысцыплінарных праектах

---

[161] Галактионова, Т.Г. Чтение школьников как социально-педагогический феномен открытого образования: автореф. дис. … д-ра пед. наук: 13.00.01 / Т.Г. Галактионова; С.-Петерб. пед. ун-т имени А.И. Герцена. – СПб., 2008. – 32 с.

[162] Сметанникова, Н.Н. Стратегиальный подход к обучению чтению: междисциплинарные проблемы чтения и грамотности: монография / Н.Н. Сметанникова. – М.: Школьная библиотека, 2005. – С. 16.

(напрыклад, “Кніжнае дрэва маёй сям’і”, “Рэклама кнігі”, “Чытаць – не сорамна, сорамна – не чытаць”, “Чытаць – модна”, “Тыдзень чытацкіх эмоцый”, “Кніжны марафон – круглы год”, “Чытаем разам з татам”, “Кніга для ўсёй сям’і”, “Любімыя кнігі нашай сям’і” і інш.

Запатрабаванае выкарыстанне сучасных інфармацыйных рэсурсаў для фарміравання новага, прывабліваго іміджу Homo legens – чалавека, які чытае. Неабходна “галасаваць сэрцам” за чытанне кніг не толькі ўступнымі артыкуламі да падручніка на тэму “Любіце чытаць”, не толькі праз выказванні класікаў літаратуры, але і на прыкладзе сучаснікаў – маладых і паспяховых людзей, якія самі шукалі і знайшлі спосабы любові і пакланення Слову. Ствараючы ўласныя тэксты пра чытанне і чытачоў, яны бачаць у кнізе галоўнага героя, сябра, мудрага і аўтарытэтнага суразмоўцу:

Маё дзяцінства прайшло на народных казках – беларускіх і замежных, творах Купалы, Коласа, Пушкіна і Лермантава. Казкі з прыгожых зборнікаў чытала мама, а паэзію – рускую і беларускую XIX–XX стагоддзяў дэкламаваў на памяць бацька. Старэйшыя класы і каледж прайшлі ў паэзіі Янкі Купалы (*са мной у Мінск паехаў зборнік вершаў, напэўна, 1988 года, з залацістай аздобай на вокладцы, – там мой улюбёны верш ever – “І прыйдзе”*) *Максіма Багдановіча (“Вянок”) і паэтаў рускага Сярэбранага веку, проза Змітрака Бядулі* (*апавяданні і абразкі*)*, Васіля Быкава* (*асабліва ўразіла “Ваўчыная яма”*)*... Філфак адкрыў для мяне дзівосны новы свет беларускай і замежнай літаратуры* (Марына Верабей, літаратуразнаўца, паэтка).

У аснове падобных выказванняў – асабістыя эмацыйныя адносіны да твораў, пра якія расказваюць маладыя кніжнікі, бо менавіта ў гэтых кнігах яны знайшлі адказы на пытанні, што задае кожны на пачатку свайго станаўлення. У эсэістычных разважаннях – зварот да самакаштоўнага, уласнага чытацкага вопыту. Гэтыя апавяданні-адкрыцці матывуюць на своечасовае прачытанне кніг з “залатой паліцы”, паколькі, паводле пераканання М.А. Чудаковай, “ёсць кнігі, якія абавязкова трэба прачытаць своечасова… Потым іх можна перачытваць, але прачытаць трэба ў час, інакш штосьці незаменнае будзе страчана назаўсёды”.[163] Што да “залатой паліцы”, то на ёй павінны “жыць” кнігі, якія “з’яўляюцца для чалавека базавымі і вызначаюць яго адносіны да іншых тэкстаў”.[164]

Зазначым яшчэ адну праблему – патэнцыял школьных падручнікаў у фарміраванні ўменняў чытацкай пісьменнасці. Чытанне вучэбных тэкстаў было і застаецца галоўнай крыніцай інфармацыі, асноўным рэсурсам самаадукацыі. Сучасныя вучэбныя выданні па традыцыі, што доўжыцца дзесяцігоддзямі, практыкуюць выразна абязлічаную, не канкрэтызаваную ўмову да тэкстаў практыкаванняў (асабліва па моўных прадметах), што стандартна фармулюецца як *прачытайце тэкст.* Наспела патрэба дэферэнцыраваць гэтую ўмову на ўзроўні розных класаў, акцэнтаваць увагу на мэтавых арыенцірах і базавых уменнях чытання. Дэталізуем уменні ў адпаведнаці з логікай міжнародных даследаванняў PISA ў наступнай табліцы.

---

[163] Чудакова, М.О. Литература в школе: читаем или проходим: кн. для учителя / М.О. Чудакова. – М.: Время, 2013. – С. 88.

[164] Байяр, П. Искусство рассуждать о книгах, которые вы не читали / П. Байяр; перевод с франц. А. Поповой. – М.: Текст, 2012. – С. 81.

Табліца 2.2.1 – Параметры ацэнкі якасці чытання вучняў 5–11 класаў

Клас	Характарыстыка адукацыйных вынікаў чытання	Базавыя ўменні як мэтавыя арыенціры для фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў
5–6 класы	Пошук інфармацыі і разуменне прачытанага. *Вынік – фарміраванне аналітычных уменняў працы з тэкстам*	– знаходзіць інфармацыю, выкладзеную ў яўным выглядзе; – фармуляваць асноўную думку і ідэю тэксту; – выбіраць з тэксту або прапаноўваць загаловак, адпаведны зместу і агульнаму сэнсу твора; – структураваць інфармацыю, складаць план тэксту; – аналізаваць выкарыстаныя ў тэксце табліцы, схемы, ілюстрацыі; супастаўляць прыведзены ілюстрацыйны матэрыял з тэкставай інфармацыяй; – разумець душэўны стан галоўных герояў твора, суперажываць ім, узбагачаць уласны эмацыянальна-пачуццёвы вопыт; – прагназаваць паслядоўнасць падачы інфармацыі на аснове назвы, ключавых слоў тэксту; – выбіраць інфармацыю, суадносную са сфармуляванай задачай
7–8 класы	Трансфармацыя і інтэрпрэтацыя прачытанага. *Вынік – фарміраванне інтэрпрэтацыйных уменняў працы з тэкстам*	– тлумачыць тэрміны, ужытыя ў тэксце; – распазнаваць галоўную і другасную інфармацыю, вылучаць сродкі сувязі сказаў, частак тэксту; – інтэрпрэтаваць тэкст, супастаўляць асобныя фрагменты; – абагульняць інфармацыю, рабіць вывады на аснове прачытанага, суадносіць змест з уласным жыццёвым вопытам; – выказваць уласны пункт погляду на ўзнятую аўтарам праблему, абгрунтоўваць яе з апорай на тэкст; – супастаўляць інфармацыю на аснове некалькіх крытэрыяў; – даваць ацэнку асобным элементам зместу і форме тэксту;

Клас	Характарыстыка адукацыйных вынікаў чытання	Базавыя ўменні як мэтавыя арыенціры для фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў
		– працаваць з некалькімі крыніцамі інфармацыі, выяўляць агульнае і адрознае ў іх; – вызначаць камунікатыўную задачу, прызначэнне розных тыпаў тэксту; – інтэрпрэтаваць тэкст праз згортванне і разгортванне інфармацыі; – перабудоўваць тэкст, выкарыстоўваючы новыя формы прадстаўлення інфармацыі (графікі, табліцы, дыяграмы, схемы, калажы)
9–11 класы	Ацэнка інфармацыі. *Вынік – фарміраванне рэфлексійных, ацэначных уменняў, уменняў крытычнай ацэнкі прачытанага*	– вызначаць камунікатыўную задачу, прызначэнне розных тыпаў тэкстаў; – фармуляваць на аснове тэксту сістэму аргументаў для абгрунтавання пазіцыі аўтара; – фармуляваць уласную пазіцыю, падмацоўваць яе аргументамі; – знаходзіць і разгортваць інфармацыю, якая падаецца ў тэксце ў патэнцыяльным выглядзе; – выконваць комплексныя заданні на аснове тэксту; – ажыццяўляць крытычны аналіз тэксту, вылучаць дакладную/недакладную інфармацыю; – фармуляваць гіпотэзы адносна фактаў, ведаў, з’яў, пра якія паведамляецца ў тэксце; – ацэньваць не толькі змест, але і форму тэксту, маўленчае афармленне; – ацэньваць тэкст, улічваючы супрацьлеглыя погляды на праблему і розныя крыніцы інфармацыі па тэме

Вылучаныя базавыя ўменні – мэтавыя арыенціры, умоўна замацаваныя за класамі, дазваляюць асэнсавана фарміраваць асноватворныя чытацкія ўменні навучэнцаў. Безумоўна, прапанаваная класіфікацыя, дыферэнцыяцыя ўменняў дастаткова намінальныя. Аднак выдзяленне прыярытэтаў дазваляе засяродзіцца на канкрэтных паказчыках якасці чытання. Пры гэтым паслядоўна павінны вытрымлівацца тэндэнцыя непарыўнага фарміравання чытацкіх навыкаў,

“нарошчванне” аб’ёму і складанасці заданняў у адпаведнасці з характарам прадметных ведаў, характэрным для пэўнага класа, і логікай, стратэгіяй выпрацоўкі ўменняў: *аналітычныя → інтэрпрэтацыйныя ўменні працы з тэкстам → рэфлексійныя, ацэначныя ўменні, уменні крытычнай ацэнкі прачытанага.*

Магчыма, падобнае размеркаванне ўменняў такой складана арганізаванай дзейнасці дазволіць складальнікам падручнікаў дэталізаваць абагульненую задачу прачытання тэксту, паколькі ў рэальным жыцці чытанне адбываецца з пэўнай мэтай. Гэты працэс заўсёды суправаджаецца камунікатыўнай задачай: зразумець асноўны змест прачытанага/праслуханага, вылучыць ключавыя словы, думкі тэксту, знайсці патрэбную інфармацыю, структураваць змест, выкарыстоўваючы абзацны падзел тэксту, суаднесці маўленчае афармленне з арфаграфічнымі/пунктуацыйнымі/лексічнымі нормамі; вылучыць галоўную/збыткоўную інфармацыю, дапоўніць прапанаваную; увесці невербальныя кампаненты ў тэкст (ілюстрацыя, схема, табліца, калаж і г.д.); абагульніць інфармацыю, размешчаную ў розных частках тэксту. Адпаведна маўленчая формула *прачытайце тэкст* будзе арыентаваць навучэнцаў на канкрэтны від чытання, удакладняць стратэгію працы з інфармацыяй.

Сучасная школа заклікана фарміраваць устойлівы інтарэс да чытання, рыхтаваць кампетэнтнаснага чытача, які валодае наборам кагнітыўных, творчых, рэфлексійных, метадалагічных якасцей. Гэтыя “метакагнітыўныя якасці вызначаюць узровень сфарміраванасці чытацкай дзейнасці, закліканай забяспечыць пазнанне і творчасць”. [165] Чытанне як праца з інфармацыяй – прынцыпова новая місія школы. Ажыццяўленне гэтай місіі можа адбывацца ў кантэксце фарміравання навыкаў і кампетэнцый XXI стагоддзя, да якіх, апроч чытання, аднесены камунікацыя, супрацоўніцтва, крытычнае мысленне. Гэтая звышзадача можа быць выканана праз выпрацоўку комплексу ўменняў:

– вылучэнне неабходнай інфармацыі, засваенне метадаў інфармацыйнага пошуку;

– адэкватнае ўспрыманне і разуменне спецыфікі інфармацыі з тэкстаў навуковага, мастацкага, публіцыстычнага, афіцыйна-дзелавога стыляў;

– выбар неабходнай інфармацыі з рознафарматных, разнажанравых тэкстаў;

– адэкватная пабудова выказванняў у вуснай і пісьмовай формах на аснове прачытанага ў адпаведнасці з мэтай (падрабязна, сцісла, выбарачна) і нормамі пабудовы тэксту (захаванне тэмы, жанру, стылю, запланаванага фармату і інш.);

– фарміраванне і развіццё ўменняў інтэграваць, ацэньваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц;

– выпрацоўка ўменняў працаваць з тэкстам у камандзе і індывідуальна.

Зварот да сацыялагічных даследаванняў чытання як сацыяльна-культурнага феномена дае магчымасць глыбей разумець і тлумачыць працэсы, якія адбываюцца ў калектыўнай духоўнай сферы. Менавіта сацыялагічныя

[165] Сметанникова, Н.Н. Чтение и грамотность в современном мире / Н.Н. Сметанникова // Вестник Челябинской академии культуры и искусств. – 2019. – № 4. – С. 12.

даследаванні дазваляюць аб'ектыўна ўявіць маштабную зместавую карціну чытацкай дзейнасці, прадэманстраваць, як у публічным стаўленні да чытання адлюстроўваецца ўзровень інтэлектуальна-духоўнай культуры грамадства. Вучоныя, даследуючы чытанне, вылучаюць вядучыя тэндэнцыі ў соцыуме: устойлівасць масавай цікавасці да пэўных відаў і жанраў літаратуры; развіццё "чытацкай моды", фарміраванне чытацкай эліты, распаўсюджванне з'яў бібліяманіі і бібліяфобіі; рост станоўчай дынамікі інтарэсу да фарміравання асабістых бібліятэк, актыўнасці зваротаў да публічных бібліятэк; канкурыраванне традыцыйнага чытання з візуальнымі вобразамі, дзе існуе рызыка страты культурных кодаў, навыкаў, звязаных з асэнсаваннем прачытанага.[166]

Вынікі даследаванняў, праведзеных сацыёлагамі Расійскай дзяржаўнай дзіцячай бібліятэкі, дазваляюць абазначыць шэраг працэсаў у чытанні апошняга дзесяцігоддзя:

– чытанне падлеткаў трансфармуецца, перамяшчаецца з offline ў online, з кніжнага (фізічнага) асяроддзя ў электроннае;

– візуальная культура аказвае на дзіцячае чытанне вялікі ўплыў;

– змяняюцца спосабы чытання дзяцей і падлеткаў пры іх узаемадзеянні з інфармацыяй, у тым ліку з тэкстамі розных фарматаў. Чытанне становіцца павярхоўным, вучні чытаюць хутка, як правіла, няўважліва, не запамінаючы аўтара, прапускаючы дэталі, арыентуючыся толькі на назву серыі, жанр або тэматыку, трансфармуецца характар чытання, яно становіцца кліпавым, фрагментарным;

– узмацняюцца гендарныя адрозненні, павялічваецца розніца паміж чытаннем хлопчыкаў і дзяўчынак;

– бацькі, педагогі і бібліятэкары прытрымліваюцца пазіцыі, што для дзяцей аптымальнымі з'яўляюцца папяровыя кнігі, падлеткаў усё больш цікавіць электронны варыянт чытання, пераважна праз Інтэрнэт.[167]

Сучасная рэальнасць спараджае новую тэндэнцыю: для часткі вучняў ужо ў школе чытанне перастае быць культурнай патрэбнасцю, неабходнасцю і не ўспрымаецца як крыніца асобаснага росту, эстэтычнага і духоўнага развіцця. Чытанне выступае ў якасці дадатку да вучобы. Да ўспрымання сур'ёзнай (у тым ліку і вучэбнай) літаратуры, якая патрабуе інтэлектуальных і эмацыянальных намаганняў, падлеткі не падрыхтаваны. Як сцвярджаюць сацыёлагі, найбольш запатрабаванымі аказваюцца жанры фантастыкі і востраюжэтнай літаратуры (фэнтэзі, трылеры, дэтэктывы, коміксы і інш.). Чытанне сённяшніх маладых людзей часта мае выпадковы характар і нярэдка вызначаецца "модай" на тую або іншую кнігу сярод аднакласнікаў, бліжняга круга. Гэтыя факты варта ўспрымаць як сур'ёзную праблему страты ў традыцыях чытання ўзораў кніжнай культуры, літаратурнай класікі, што складала прадмет увагі некалькіх пакаленняў. Нівеліруецца само паняцце *якасць чытання* – такія яго

[166] Стефановская, Н.А. Социологические исследования чтения: теория, методика, практика: науч.-практ. пособие / Н.А. Стефановская. – М.: Литера, 2013. – С. 5.

[167] Детское чтение в России – 2013 / Российская государственная детская библиотека; сост. М.А. Ведепянина [и др.]. – М.: РГДБ, 2014. – С. 69.

характарыстыкі, як наяўнасць сфарміраванага інтарэсу да чытання як унутранай патрэбнасці, пашырэнне кругу чытання за кошт літаратуры розных відаў і жанраў, здольнасць да ўспрымання аб'ёмных тэкстаў і інш.

Што да методыкі, то варта сцвердзіцца ў немагчымасці зводзіць мнагастайнасць спосабаў спасціжэння тэксту (асабліва мастацкага) праз адназначныя, жорсткія алгарытмы чытання. Ёсць сэнс прыслухацца да прызнаных аўтарытэтаў: "Розныя кнігі трэба ўмець чытаць па-рознаму. З гэтай прычыны ўрокі чытання павінны адказваць на мноства неабходных жыццёвых пытанняў… Мастацкі твор – не задача па фізіцы або матэматыцы: у ім мноства "ўваходаў" і "выхадаў" для яго асэнсавання".[168] Безумоўна, выбар стратэгій – справа індывідуальная, але, як справядліва заўважае Н.Н. Смятаннікава, "каб зрабіць выбар, чытач павінен валодаць наборам стратэгій".[169]

Праблеме фарміравання навыкаў чытання прысвечана немалая колькасць метадычных і псіхалагічных прац, якія рознааспектна прадстаўляюць складаны прадмет даследавання. Нягледзячы на мноства распрацаваных канцэпцый, праграм, падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, дадатковых матэрыялаў, на сённяшні дзень школьная практыка дэманструе дастаткова сціплыя поспехі. *Прычыны гэтага бачацца наступныя*:

– фарміраванне навыку асэнсаванага чытання – працэс неаднародны, нелінейны, ён не павінен згортвацца;

– сучасныя падручнікі, маючы вялікую колькасць заданняў *прачытайце тэкст,* не вучаць чытанню як навыку здабываць і асэнсоўваць інфармацыю;

– механізм чытання не разгортваецца перад вучнямі, умовы заданняў не суправаджаюцца інструкцыямі, зводзяцца да шматпаўтаральных патрабаванняў: *прачытайце тэкст выразна, растлумачце назву тэксту, выпішыце ключавыя словы* і інш. Такія заданні разлічаны або на вусныя каментарыі настаўніка, або на моўную інтуіцыю навучэнца. Гэта азначае, што чытацкія ўменні з улікам вопыту складальнікаў падручнікаў згортваюцца, арыенціровачная аснова чытання як сістэма дзеянняў мінімізуецца, пераводзіцца ў аўтаматызаваны аспект;

– адсутнасць навыкаў працы з вучэбнай навуковай літаратурай па-за межамі школьнікаў дапаможнікаў;

– перабольшванне магчымасцей Інтэрнэту, адназначнай перакананасці вучняў у тым, што інфармацыя, змешчаная ў традыцыйных кніжных крыніцах, з'яўляецца незапатрабаванай;

– скарачэнне часу на чытанне, яго падмена спажываннем аблегчанай інфармацыі з сацыяльных сетак. Пры гэтым чытанне набывае прагматычны характар, не ўспрымаецца як духоўна-інтэлектуальная практыка;

– дастаткова фармалізаваная падача навуковых тэкстаў, якія не суправаджаюцца каментарыямі пра значэнне працы з імі: выкарыстанне

[168] Генис, А.А. Уроки чтения: камасутра книжника / А.А. Генис. – М.: АСТ, 2013. – С. 14.

[169] Сметанникова, Н.Н. Обучение чтению в контексте основных теорий образования XX и XXI веков / Н.Н. Сметанникова // Чтение в контексте традиционного и цифрового образования: материалы конф., Москва, 26 марта 2020 г. – М., 2020. – С. 98.

тэрмінаў, азначэнняў, спецыяльнай лексікі робіць чытанне складаным працэсам, аднак вучыць паглыбленаму разуменню, запамінанню і засваенню прачытанага, рыхтуе да працы з прафесійнай інфармацыяй;

– навучэнцы павінны зразумець: вучэбная, спецыяльная літаратура – істотны кампанент пазнавальнай дзейнасці. Адпаведна навуковыя тэксты павінны чытацца асэнсавана, няспешліва, паколькі тэарэтычныя веды як набытак навуковага стылю немагчыма перадаць мовай паўсядзённых зносін. З гэтай прычыны прысутнасць тэрмінаў у навуковых тэкстах не выпадковая: яны фіксуюць вынікі даследчых пошукаў, працы многіх пакаленняў вучоных;

– павелічэнне колькасці вучняў, якія хацелі б звесці да мінімуму інтэлектуальныя намаганні пры чытанні складаных тэкстаў;

– адназначнае запазычванне замежнага вопыту, ігнараванне айчынных напрацовак. Спецыяліст па развіцці навыкаў чытання І.І. Ціхаміра падкрэслівае: “Перасадзіць заходнюю мадэль з яе інфармацыйнай адназначнасцю і адналінейнасцю тэкставай дзейнасці азначала б спрасціць, прынізіць высокую духоўнасць традыцыйнага чытання”.[170]

Пры такім падыходзе трэба ісці не ад умовы да дзеяння, а ад зададзенага дзеяння да ўмовы. Як сцвярджае сучасная псіхалогія, “трэба не назіраць і канстатаваць фарміраванне дзеяння, а паўнацэнна разгортваць яго”.[171] Працэс чытання павінен суправаджацца рацыянальнымі метадычнымі парадамі, у гэтым плане варта пераймаць вопыт аўтараў навукова-папулярных выданняў, якія фармулююць парады па самастойнай арганізацыі тэкставай дзейнасці ў неназойлівай, без залішняга дыдактызму форме, напрыклад: *Нагадаем спосабы павышэння эфектыўнасці паўтарэння*:

1. Паўтарэнне павінна быць актыўным, бо гэта не пасіўная захаванасць інфармацыі ў памяці і яе ўзнаўленне ў выпадку забыцця. Што гэта азначае? Паўтарэнне не павінна быць механічным, гэта актыўная разумовая праца, якая развівае запамінанне матэрыялу, дапаўняе, узбагачае новай інфармацыяй. Пры кожным паўторным прачытанні, праглядзе тэксту трэба даваць актыўную ўстаноўку на перавод інфармацыі ў доўгатэрміновую “ячэйку памяці”.

2. Абавязкова трэба дзяліць, дазіраваць матэрыял. Варта прадумваць, чым кожная частка адрозніваецца ад папярэдняй і наступнай. Калі матэрыял аднародны, то адрозненне паміж часткамі выяўляецца праз фармуляванне асноўнай думкі кожнай з іх. Пры гэтым можна выдзеліць штосьці суб’ектыўнае, эмацыянальнае, што будзе напамінаць пра змест часткі.

3. Пры паўтарэнні эфектыўна выкарыстоўваць схемы, тэзісы, складзеныя на аснове славесных апор пры чытанні. У якасці апор могуць быць план, ключавыя словы і сказы. Паўтараючы славесныя апоры, вы запамінаеце “каркас” тэксту, які дапамагае “нарошчваць” інфармацыю. Напрыклад, для

[170] Тихомирова, И.И. Педагогическая деятельность школьного библиотекаря: учеб.-метод. пособие / И.И. Тихомирова. – М.: РШБА, 2014. – С. 6.

[171] Гальперин, П.Я. Психология как объективная наука: учебное пособие / П.Я. Гальперин; под ред. А.И. Подольского. – Воронеж: МОДЭК, 2003. – С. 287.

прыведзенага тэксту гэта можа быць ланцужок слоў: *актыўнае паўтарэнне – падзел на састаўныя часткі – схема/тэзісы.*

4. Перад пачаткам любога паўтарэння паспрабуйце прыпомніць тое, што вывучалі раней. Складзіце план паўтарэння.[172]

Пажадана, каб падручнікі ўключалі невялікія тэксты лінгвістаў, псіхолагаў, фізіёлагаў, сацыёлагаў, педагогаў, якія б раскрывалі “сакрэты” асэнсаванага, рацыянальнага чытання, напрыклад: “Неабходныя свядомыя адносіны да матэрыялу, які трэба запомніць. Эксперыменты вы яўляюць, што чалавек запамінае толькі 16% з таго, што яму абыякава і нецікава, 80% –эмацыянальна афарбаванай інфармацыі і 4% – інфармацыі, адносіны да якой нейтральныя. Безумоўна, патрэбна выразная структура матэрыялу. Спарадкаваны матэрыял запамінаецца намнога лягчэй, чым набор слоў, а матэрыял, пераказаны сваімі словамі, запамінаецца надзейна, трывала”. [173] Думаецца, што падобная інфармацыя будзе фарміраваць разумовую культуру вучняў, папаўняць скарбонку прыёмаў працы з тэкстамі. Варта ўключаць у падручнікі вопыт разумення тэксту, запамінання інфармацыі, сродкі развіцця свядомай увагі, спосабы, якія дапамагаюць абудзіць у вучняў любоў да чытання.

Адной з форм далучэння да чытання з улікам сённяшніх магчымасцей можна лічыць медыятэкі, што сістэматызуюць медыярэсурсы на лічбавых носьбітах. Першыя вопыты даказваюць: часта інфармацыя, атрыманая з Інтэрнэту, становіцца падставай для звароту да беларускамоўнай кнігі або да творчасці пісьменніка. Інтэрнэт-рэсурсы варта выкарыстоўваць у якасці ўнікальнай магчымасці для станаўлення і выхавання чытача: сетка інтэрнэт-магазінаў, чаты для абмеркавання класікі і кніжных навінак, бясплатныя электронныя бібліятэкі, інтэрнэт-апытванні – сучасны рэсурс у праектаванні беларускамоўнага адукацыйнага асяроддзя, матываваных патрэбнасцей у чытанні (праекты, дыскусіі, выставы, віртуальныя экскурсіі і г.д.). Так, цікавы вопыт працы з рознымі відамі і жанрамі медыятэкстаў прапанаваны пры навучанні гісторыі і грамадазнаўства.[174]

Немалаважную ролю, на нашу думку, адыгрываюць дэманстраванне педагогамі любімых кніг, асабістых густаў у чытанні, захопленасць словам, культурай. Павінна пазіцыянавацца чытанне як норма жыцця не толькі класікамі (гэтага ніхто не адмаўляе), але і паспяховымі маладымі людзьмі. Падобныя прызнанні, разважанні не з’яўляюцца прывілеяй выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін. Наадварот, тэксты-прысвячэнні кніжнай культуры з вуснаў прадстаўнікоў матэматычных, прыродазнаўчых дысцыплін дапамагаюць пашырыць чытацкае поле культуры, пабачыць праз слова розныя грані дзейнасці творчага чалавека. Камунікаванне, узаемаабмен інфармацыяй, каштоўнасцямі, эмоцыямі, грамадзянскімі пазіцыямі стварае жыццёвы дыялог у кантэксце павагі да слова, кнігі, культуры. Ганаровую місію свядомых чытачоў

[172] Зиганов, М.А. Скорочтение: науч.-попул. изд. / М.А. Зиганов. – М.: ЭКСМО, 2016. – С. 72–73.

[173] Андреев, О.А. Тренировка памяти: науч.-попул. изд. / О.А. Андреев, Л.Н. Хромов. – Минск: Універсітэцкае, 1999. – С. 64.

[174] Палейка, А.А. Медыятэксты ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / А.А. Палейка. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2018. – 96 с.

маглі б выконваць не толькі прадстаўнікі адукацыі, бібліятэчныя рупліўцы, але і прадстаўнікі выдавецкага, кніжна-гандлёвага бізнесу.

Такім чынам, стратэгіяй сучаснага навучання становіцца чытанне – вучэбнае, навуковае, агульнакультурнае, – што развівае навыкі самастойнай працы, выступае асновай пісьма, гаварэння, слухання, фарміруе светапоглядныя ўстаноўкі, устойлівую цікавасць да кнігі. Чытанне павінна праецыравацца як рэальны камунікатыўны працэс, апасродкаваны тэкстам. Пры чытанні атрыманая інфармацыя служыць камунікатыўным задачам – зразумець, прааналізаваць, абмеркаваць змест, афарміць уласнае меркаванне, выкарыстаць тэкст як аснову для пісьмовай камунікацыі – праз складанне анатацый, канспектаў, тэзісаў. Чытанне набудзе сваю духоўную сутнасць, калі ў ім будуць бачыць не толькі сродак інфармацыі, папаўнення ведаў, але і ўсведамляць яго як працэс выхавання і развіцця асобы, што фарміруе жыццёвыя каштоўнасці.

2.3 Фарміраванне навыкаў асэнсаванага чытання як фактар павышэння функцыянальнай пісьменнасці

Станаўленне кампетэнтнаснага чытача немагчыма па-за вывучэннем вучэбнай, спецыяльнай літаратуры, што патрабуе фарміравання культуры чытання не толькі мастацкіх, але і навуковых тэкстаў. Спынімся на алгарытмах працы з вучэбнымі тэкстамі ў рэчышчы тэхналогіі асэнсаванага чытання з арыентацыяй на тых, хто вучыцца ў старшых класах – “маладых дарослых”, – здольных да свядомай працы з інфармацыяй, хто падзяляе класічны тэзіс: “Без чытання няма адукацыі”. Падкрэслім, што станаўленне чытача адбываецца не толькі праз чытанне мастацкай літаратуры, духоўны патэнцыял якой несумненны. Культура чытання тэкстаў навуковага/навукова-папулярнага стылю дапамагае вызначыцца са сферай інтарэсаў, з будучай прафесіяй і прывучае да лагічнага, доказнага слова. Першасна адзначым, што сучасныя метадычныя працы стракацяць багатым, “модным” арсеналам прыёмаў чытання, што прымяняюцца для фарміравання тэкставай дзейнасці сённяшніх навучэнцаў: *табліцы “плюс – мінус – цікава”, “плюс – мінус – пытанне”, правільныя/няправільныя сцвярджэнні, мазгавы штурм, арыенціры прадбачання зместу, раздзяленне пытання, папярэднія пытанні, батарэя пытанняў, гласарый, алфавіт за круглым сталом, чытанне ў парах, чытанне з прыпынкамі, чытанне з паметамі, стратэгіі чытання, стратэгіі чытацкіх водзываў, чытанне ў крузе, прачытай і выкажыся, тэатр ля мікрафона (чытанне па ролях)* і шматлікія іншыя.[175]

Прызнаём права названых прыёмаў на існаванне, выкарыстанне, паколькі кожны з іх, відаць, даказаў сваю эфектыўнасць, дапамагае развіваць творчую дзейнасць навучэнцаў, мае рацыянальную аснову, прадыктаваны логікай адукацыйнай практыкі. Не ігнаруючы новых форм працы з тэкстам, хацелася б

[175] Заир-Бек, С.И. Развитие критического мышления на уроке / С.И. Заир-Бек, И.В. Муштавинская. – М.: Просвещение, 2014. – С. 116.

яшчэ раз засяродзіць увагу на класічным вопыце чытання, заснаваным на традыцыйнай працы з інфармацыяй. Вывераны шматлікімі пакаленнямі алгарытм разгорнем на матэрыяле навуковых тэкстаў, паколькі:

– стасункі з навуковай інфармацыяй складаюць, як правіла, базавую аснову дзейнасці сучаснага чалавека ў інфармацыйным асяроддзі;

– на аснове навуковых тэкстаў фарміруюцца кагнітыўныя прыёмы, скіраваныя на разуменне, перапрацоўку матэрыялу;

– засваенне навыкаў лагічнага структуравання інфармацыі забяспечвае "нарматыўны", першапачатковы ўзровень пазнавальна-інтэлектуальнай дзейнасці;

– значэнне навуковых тэкстаў узрастае, паколькі ў сучасным грамадстве запатрабаваныя навыкі трансфармацыі зыходных дадзеных;

– вынікі выканання заданняў PIRLS сведчаць: "Для сучасных школьнікаў праца з інфармацыйнымі тэкстамі ўяўляе сабой больш сур'ёзныя цяжкасці, чым чытанне мастацкіх твораў… Найбольшы дэфіцыт у разуменні інфармацыйных тэкстаў выяўляецца ў базісных уменнях здабываць інфармацыю, якая паведамляецца ў яўным выглядзе, і рабіць вывады на яе аснове"[176];

– майстэрства чытання мастацкай літаратуры ўяўляе сабой больш складаны працэс, "паколькі мастацкая літаратура прыносіць асалоду, а не вучыць. Атрымаць задавальненне лягчэй, чым вучыцца, аднак пры гэтым значна цяжэй зразумець, чым яно выклікана. Прыгажосць – больш няўлоўнае паняцце, чым ісціна".[177] У навуковым тэксце выразная дынаміка пераходу ад фактаў да абгрунтаваных вывадаў. З гэтай прычыны алгарытм чытання навуковых тэкстаў больш празрысты, лягчэй паддаецца сістэматызацыі;

– універсальныя вучэбныя дзеянні, скіраваныя на фарміраванне інфармацыйных запытаў (пошук, апрацоўка, аналіз, інтэрпрэтацыя звестак, засваенне навыкаў асэнсаванага чытання), уваходзяць у круг найважнейшых метапрадметных адукацыйных вынікаў школьнага навучання;

– новыя фарматы тэкстаў лагічныя ў сучасным кантэксце, аднак вопыт, назапашаны і вывераны стагоддзямі, пацверджаны дзясяткамі аўтарытэтных даследаванняў, з'яўляецца актуальным і запатрабаваным, вызначаецца логікай і рацыянальнасцю афармлення думкі.

Аналіз сучаснай метадычнай літаратуры, прысвечанай павышэнню якасці чытання, выяўляе панарамна-разнастайную тэрміналогію, якая падкрэслівае рознааспектны характар чытання, напрыклад: *дынамічнае чытанне* (В.А. Барадзіна, В.А. Кабін і інш.), *хуткае чытанне* (А.А. Андрэеў і інш.), *каментаванае чытанне* (М.А. Шнеерсон і інш.), *рацыянальнае чытанне* (М.А. Зіганаў і інш.), *эфектыўнае чытанне* (І.У. Усачова і інш.), *асэнсаванае чытанне* (Е.Дзево, Ю.А. Шулекіна, А.М. Плюсніна і інш.).

---

[176] Кузнецова, М.И. Сильные и слабые стороны читательской деятельности выпускников российской начальной школы по результатам PIRLS / М.И. Кузнецова // Вопросы образования. – 2009. – № 1. – С. 112.

[177] Адлер, М. Как читать книги: руководство по чтению великих произведений/М. Адлер. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2019. – С. 105.

Сутнасць *асэнсаванага чытання* заключаецца “ў мастацтве засвойваць, тлумачыць, ацэньваць тэкст”.[178] Навык асэнсаванага чытання падразумявае актыўнасць чытача, яго гатоўнасць да дыялогу з аўтарам на аснове адэкватнай інтэрпрэтацыі зместу. Спасціжэнне прачытанага тэксту, аўтарскай пазіцыі, канструктыўнае абмеркаванне з’яўляюцца асноўным паказчыкам асэнсаванага чытання. Такі від чытання выяўляе розніцу паміж чытаннем для атрымання інфармацыі і чытаннем для разумення. Атрымаць інфармацыю праз чытанне – значыць, папоўніць сваю памяць пэўнымі фактамі. Разуменне мае на ўвазе інтэрпрэтацыю прачытанага: уменні параўноўваць, класіфікаваць, абагульняць, выдзяляць прычыны тых або іншых з’яў, прасочваць паралелі, узаемасувязі, знаходзіць падабенства і адрозненне паміж фактамі і падзеямі.

У працэсе навучання *асэнсаванаму чытанню* вырашаюцца дзве задачы:

– развіццё чытацкай дзейнасці, яе ўдасканаленне;

– выхаванне цікавасці да кнігі як асалоды чытаць і разумець яе.

Сфарміраваны навык асэнсаванага чытання дазваляе арыентавацца ў аб’ёме інфармацыі, знаходзіць дамінантныя лініі ў разгортванні думкі, усведамляць логіку яе развіцця, адэкватна ўспрымаць, крытычна ацэньваць інфармацыю. Чалавек, які валодае навыкамі асэнсаванага чытання, здольны фармуляваць уласную пазіцыю, самастойна разважаць, адрозніваць аб’ектыўную, доказную інфармацыю ад суб’ектыўнага бачання праблемы. Падчас асэнсаванага чытання актывізуюцца ўзаемазвязаныя паміж сабой аперацыі аналізу і сінтэзу, якія патрабуюць інтэлектуальных намаганняў чытача. З гэтага вынікае, што кожны тэкст патрабуе ўважлівага, удумлівага, нетаропкага – *асэнсаванага* – чытання.

У якасці паказчыкаў асэнсаванага чытання М.А. Адлер вылучае:

– здольнасць успрымаць тэкст, ускладнены ўжываннем тэрміналогіі, сістэмай лагічных пераходаў, разнастайнасцю сінтаксічнай арганізацыі;

– актыўнасць, у працэсе якой чытач усведамляе дыялектыку развіцця аўтарскай думкі як ступенькі паслядоўных дзеянняў.[179]

Зазначым: новы вектар сучаснай адукацыі вызначаецца як далучэнне вучняў да чытання, фарміраванне культуры чытання. Адпаведна перад настаўнікамі-прадметнікамі фармулюецца найважнейшая задача – засваенне навучэнцамі тэкставых стратэгій чытання, што рэалізуюць дыяпазон розных прыёмаў здабывання інфармацыі. Н.Н. Смятаннікава сцвярджае: “Сістэма дзеянняў і аперацый чытача з тэкстам адлюстроўвае сфарміраванасць уменняў, разважанняў з нагоды прачытанага, разуменне інфармацыі, дыялог з тэкстам, здольнасць выкарыстоўваць асэнсаваную інфармацыю ў вучэбных і жыццёва значымых сітуацыях, што становяцца стратэгіяй чытання.”[180]

Істотны момант – матэрыяльна аформлены вынік інтэлектуальнай працы, зафіксаваны пісьмова, што пацвярджае актыўнасць чытача. Пра якасць чытання

[178] Дево, Е. Осмысленное чтение / Е. Дево. – Петроград: Школа и жизнь, 1914. – С. 64.

[179] Адлер, М. Как читать книги: руководство по чтению великих произведений / М. Адлер. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2019. – С. 114.

[180] Сметанникова, Н.Н. Стратегиальный подход к обучению чтению: междисциплинарные проблемы чтения и грамотности: монография / Н.Н. Сметанникова. – М.: Школьная библиотека, 2005. – С. 258.

сведчаць запісаныя цытаты, думкі аўтара, сфармуляваныя сваімі словамі або пададзеныя ў выглядзе схемы, табліцы, заўвагі, міні-каментарыя – своеасаблівыя паказчыкі разумення тэксту. Пры электронным чытанні гэта могуць быць колеравае выдзяленне асноўных тэзісаў, доказаў, апорных тэрмінаў, ключавых слоў, падкрэсліванні, клічныя і пытальныя сказы ў тэксце, заўвагі. Галоўнае: акцэнтаваныя словы, факты, вывады ствараюцца для сябе, яны выступаюць апорамі, з дапамогай якіх узнаўляецца змест прачытанага. Лагічны кампанент чытання – выдзяленне ключавых слоў і сказаў па меры іх з'яўлення ў тэксце. Зробленыя запісы павінны перадаваць сутнасць тэксту, сведчыць пра асэнсаванне, спасцiжэнне, адэкватнае разуменне прачытанага.

На пачатку чытання неабходна атрымаць *агульнае ўяўленне пра твор, сцiслы агляд яго зместу*. Для гэтага варта разгледзець тытульную старонку, прадмову/уводзіны, змест і заключэнне. Гэта дае магчымасць першасна акрэсліць тэму кнігі, задачы, структуру выдання, аўтарскую пазіцыю, якую можна сфармуляваць на аснове ўводзін і заключэння. Тэма звычайна вынікае з назвы кнігі. Абавязкова ўважліва вывучаецца *анатацыя*, якая сцісла раскрывае змест выдання і мэтавую аўдыторыю. З прадмовы "вычытваецца" інфармацыя пра задуму аўтара, запланаваныя вынікі. У прадмове, як правіла, аўтар сцісла перадае асноўныя навуковыя ідэі выдання.

Ва ўводзінах, як правіла, прыводзяцца звесткі, неабходныя для разумення кнігі. Звычайна ўказваецца *агульная структура, план выдання*, скарыстаныя метады. *Сістэматызаваны змест* дазваляе чытачу дэталёва пазнаёміцца са структурай, якая раскрывае праблемнае поле і задачы даследавання. Праз назвы раздзелаў, параграфаў можна ўявіць аспекты працы, якія дапаўняюць змест і загаловак выдання. Звычайна атрыбутам навуковай/навукова-папулярнай кнігі з'яўляецца яе несупярэчлівая структура. Разгалінаваная арганізацыя (раздзелы, параграфы, пункты, падпункты) навуковага тэксту падпарадкоўваецца плану і задуме аўтара. У *заключэнні* падводзяцца вынікі працы, прыводзяцца вывады, да якіх прыйшоў аўтар. Калі ў кнізе маюцца табліцы, дыяграмы, малюнкі, то папярэдняе азнаямленне з імі дапамагае зразумець змест.

Пасля *папярэдняга знаёмства з кнігай* можна прыступаць да чытання. Для глыбокага разумення аўтарскай задумы даследчыкі рэкамендуюць карыстацца трыма спосабамі чытання (М.Адлер, А.А. Андрэеў, А.М. Лявідаў, С.І. Паварнін і інш.):

– *аналітычны спосаб* дазваляе ўспрымаць інфармацыю ў логіцы ад цэлага да састаўных частак. Падчас такога чытання вылучаюцца (пісьмова фіксуюцца) аспекты, якія дэталізуюць тэму;

– *сінтэтычны спосаб* чытання мае на ўвазе ўспрыманне інфармацыі цэласна, ва ўзаемасувязі. Пры такім спосабе чытач запамінае вядучыя тэрміны, канкрэтызуе, удакладняе вывады аўтара;

– *ацэначны спосаб* завяршае чытанне, у выніку фарміруецца крытычная ацэнка аўтарскай пазіцыі. Гэты спосаб дазваляе сфармуляваць пытанні да аўтара/да тэксту і выказаць уласнае меркаванне адносна зместу, структуры, формы выдання.

Схематычна суадносіны спосабаў чытання кнігі прадставім з дапамогай малюнка 3.3.1.



Малюнак 3.3.1 – Спосабы чытання навуковага тэксту

Малюнак ілюструе: першы і другі спосабы чытання ўзаемазвязаныя, яны маюць на ўвазе аналітыка-сінтэтычны разбор тэксту. Пры *аналітычным спосабе* чытач вызначае, якую праблему імкнецца вырашыць аўтар. Пры *сінтэтычным спосабе* заключным этапам з'яўляецца разуменне таго, наколькі паспяхова вырашае аўтар пастаўленыя задачы, на якія пытанні яму ўдалося адказаць. Трэці спосаб чытання – *ацэначны* – адносна адасоблены, паколькі толькі разуменне аўтарскай пазіцыі дае падставу для ацэнкі кнігі. Аналітычны і сінтэтычны спосабы чытання скіраваны на разуменне тэксту, ацэнка інфармацыі фармулюецца пасля яе аналізу, прысваення. Канкрэтызуем спосабы чытання навуковага тэксту.

Аналітычны спосаб чытання

Як вядома, аналіз (грэч. *analysis* – падзел, раскладанне) – метад даследавання, які заключаецца ў падзеле цэлага на часткі. Пры чытанні кнігі аналітычным спосабам абавязкова вызначаецца яе структура. М. Адлер адзначае: любая добрая кніга мае выразную структуру. Важна зафіксаваць, якімі сродкамі аб'ядноўваюцца часткі тэксту, знайсці агульную дамінанту твора. Вырашыць гэтую задачу можна пры ўмове, калі чытач адэкватна спасцігае аўтарскую задуму, разумее логіку разважанняў аўтара.

Пры аналітычным спосабе чытання важна сфармуляваць сутнасць зместу кнігі (напрыклад, на аснове анатацыі). Агульная характарыстыка выдання павінна быць дакладнай і лаканічнай. Прывядзём у якасці *прыкладу-ўзору* прапанаваную М. Адлерам анатацыю да кнігі "Этыка" Арыстоцеля: "Гэта даследаванне прыроды чалавечага шчасця і аналіз умоў, пры якіх шчасце можна набыць або страціць, парады адносна таго, якімі павінны быць паводзіны чалавека, каб стаць шчаслівым або пазбегнуць няшчасця. Акцэнт зроблены на развіцці дабрачыннасцей – маральных і інтэлектуальных, хаця

аўтарам прызнаюцца і матэрыяльныя рэчы: багацце, здароўе, сябры і справядлівае грамадства”.[181]

Для асэнсавання галоўнага ў кнізе карысна разважаць у наступнай паслядоўнасці:

– вызначыць асноўныя часткі кнігі;
– зразумець логіку выдзялення кожнай часткі (раздзелаў, параграфаў);
– сфармуляваць асноўныя думкі кожнага значнага пункта.

Аналіз зместу можа праводзіцца з дапамогай наступных маўленчых формул:

– кніга прысвечана вывучэнню праблемы…
– аўтар раскрывае сваю задуму ў … частках
– у першай частцы гаворка ідзе пра…
– у другой частцы расказваецца…
– першая частка кнігі складаецца з… раздзелаў…
– у першым раздзеле разглядаюцца…
– у другім раздзеле паведамляецца пра…

Аналагічна аналізуюцца ўсе часткі кнігі. Варта выдзеліць/сфармуляваць (важна – запісаць) найбольш значныя думкі аўтара:

1. У першым раздзеле аўтар прыходзіць да наступных вывадаў…
   а) першы вывад заключаецца ў тым…
   б) другі вывад можна сфармуляваць так…
2. У другім раздзеле самыя важныя сцвярджэнні/ назіранні …

У такой логіцы пералічваюцца асноўныя ідэі кнігі. Гэта важны момант у працэсе чытання. *Па-першае*, ён сведчыць пра ўменне чытача “ўзняцца” над фактамі і сістэматызаваць іх. *Па-другое*, падобная праца дапамагае акрэсліць сэнсавыя дамінанты тэксту. *Па-трэцяе*, такія працэдуры адвучваюць чытаць бяздумна, фармальна, дысцыплінуюць чытача, прывучаюць да аналізу і спарадкавання чужых (значыць, і ўласных) думак.

Звернемся да вопыту М. Адлера як творчага чалавека, спецыяліста, які прафесійна дэманструе логіку аналізу, абагульнення, разуменне значнасці *паслядоўнасці разважанняў*: “Этыка” Арыстоцеля прадстаўлена ў дзесяці кнігах, уключае шэсць асноўных момантаў. *У першай частцы* шчасце *разглядаецца* як жыццёвая мэта адносна іншых матэрыяльных даброт. *У другой частцы вывучаецца* прырода дзеянняў чалавека пад уплывам свабоднага выбару. *Трэцяя частка прысвечана апісанню* маральных і інтэлектуальных дабрачыннасцей і звязаных з імі заганаў. *Чацвёртая частка раскрывае* нейтральны стан, які не разглядаецца ні як маральнае, ні як заганнае. *У наступных частках аўтар разважае* пра дружбу, астатнія часткі ўтрымліваюць апісанне феномена задавальнення. *Завяршаецца выданне даследаваннем* характару чалавечага шчасця”.[182]

[181] Адлер, М. Как читать книги: руководство по чтению великих произведений / М. Адлер. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2019. – С. 154.

[182] Адлер, М. Как читать книги: руководство по чтению великих произведений / М. Адлер. – М.: Манн, Иванов и Фербер, 2019. – С. 96.

З прыведзенага прыкладу вынікае: чытачу не абавязкова ісці ўслед за структурай кнігі. Аўтар прапануе план, выразныя сюжэтныя лініі, а свядомы чытач фармулюе сваю схему апісання з мэтай сістэматызаваць інфармацыю, выбудаваць уласную схему падачы матэрыялу.

Знаўца "тайн" чытання тэксту С.І. Паварнін рэкамендуе для развіцця пазнавальных здольнасцей спачатку не карыстацца прапанаваным у кнізе зместам, а складзі змест самастойна, па меры прачытання. Затым параўнаць пералік сэнсавых пунктаў-апор з аўтарскімі, убачыць падабенства, адрозненні, прааналізаваць разыходжанні з варыянтам аўтара. Як лічыць даследчык, падобная праца вучыць "бачыць сутнаснае ў прачытаным, адрозніваць істотнае ад неістотнага, галоўнае ад другараднага".[183] Для актыўнага чытання важна разгледзець "каркас" кнігі, падзяліць яе на часткі, зразумець паслядоўнасць выкладу матэрыялу. Аўтар імкнецца прытрымлівацца запланаванай схемы, прадставіць інфармацыю сістэмна, цэласна.

Такім чынам, пасля прачытання важна ўсвядоміць цэласнасць і структураванасць, пабудову тэксту. Варта выдзеліць састаўныя часткі ў паслядоўнасці, прапанаванай аўтарам, убачыць сістэму ў падачы зместу. Вылучэнне структуры дае аснову для фармулявання праблем твора, іх спасціжэння. Праца чытача завяршаецца абагульненнем асноўных думак аўтара. Для абазначэння праблем, што абмяркоўваюцца ў кнізе, вучоныя раяць выкарыстоўваць пытанні тэарэтычнага і практычнага характару.

Тэарэтычныя пытанні могуць быць такімі:

– Якія факты, з'явы, паняцці з'яўляюцца ключавымі ў кнізе?
– Якая сутнасць, паходжанне гэтых фактаў, з'яў?
– Як праяўляюцца гэтыя факты, з'явы?
– Якія характэрныя прыметы гэтых фактаў, з'яў?
– Якія іх спецыфічныя рысы?
– Якія прычыны ўзнікнення падобных фактаў, з'яў?
– Якія вынікі іх развіцця?
– Якім чынам выкарыстаныя факты, з'явы звязаны з іншымі фактамі? З'явамі?
– У чым заключаецца неабходнасць даследавання выдзеленых праблем?

Практычныя пытанні могуць мець наступны характар:

– Якую мэту ставіць перад сабой аўтар? Якім чынам яна дасягаецца?
– Якія задачы сфармуляваны аўтарам? Як яны вырашаюцца?
– Якія сродкі выкарыстоўвае аўтар для дасягнення сфармуляваных задач?
– Якая паслядоўнасць логікі аўтара ў вырашэнні праблемы?
– Пры якіх умовах дасягаюцца сфармуляваныя аўтарам мэты і задачы?

Такім чынам, пры чытанні кнігі *аналітычным спосабам* варта прытрымлівацца наступных правіл:

1) на першым этапе працы трэба ахарактарызаваць кнігу паводле тэматыкі, зместу, тэарэтычнай і практычнай значнасці;

2) зразумець аўтарскую задуму, ідэю і максімальна дакладна, сцісла сфармуляваць яе;

[183] Поварнин, С.И. Как читать книги / С.И. Поварнин. – М.: Семигор, 1994. – С. 31.

3) выдзеліць асноўныя часткі кнігі, іх паслядоўнасць і ўзаемасувязь, апорныя тэзісы аўтара;

4) выявіць праблему/праблемы, якія вырашае аўтар.

Сінтэтычны спосаб чытання

Як вядома, сінтэз (грэч. *synthesis* – аб'яднанне, спалучэнне) – метад навуковага даследавання прадмета, з'явы, які заключаецца ў спазнанні цэласнасці, у адзінстве ўзаемасувязі частак. Сінтэтычны спосаб дапамагае правільна ўспрымаць напісанае, дакладна разумець і адэкватна інтэрпрэтаваць думкі аўтара. Сінтэтычны спосаб падразумявае выдзяленне *ключавых слоў* і сказаў у прачытаным. Тэрмін *ключавыя словы* мае метафарычную аснову: вобраз ключа ўсведамляецца як сродак для разумення прачытанага. Ключавыя словы выступаюць маркерамі, сігналамі тэксту. З гэтай прычыны важна разумець, які сэнс надае аўтар таму ці іншаму ключавому слову.

Ключавымі словамі тэксту можна назваць толькі тыя словы, якія аўтар свядома адбірае, акцэнтуе, якія маюць асаблівыя значэнні ў тэксце. Так, у прыведзеным вышэй тэксце ключавым выступае слова *чытанне,* якое ў кантэксце рэалізуе адно са значэнняў:

– чытанне як сродак атрымаць інфармацыю;

– чытанне як сродак атрымаць эстэтычнае задавальненне;

– чытанне як сродак дасягнуць разумення.

У некаторых выпадках аўтар графічна выдзяляе ключавыя словы, што становяцца эпіцэнтрам тэксту, утвараюць яго сэнсавае ядро. Гэта можна зрабіць праз выкарыстанне тыпаграфскіх сродкаў – *двукоссе, курсіў, разрадка*, якія канцэнтруюць увагу чытача. Рацыянальна скласці слоўнік ключавых адзінак, слоў-тэрмінаў як своеасаблівы тлумачальны даведнік да тэксту. У слоўнік варта ўключаць не толькі тэрміны, але і словы, што выклікаюць цяжкасці пры ўспрыманні тэксту. У любым выпадку трэба вылучаць ключавыя словы, удакладняць значэнне частотных тэрмінаў. Такая актыўная пазіцыя чытача забяспечвае адэкватнае разуменне вядучых тэзісаў, ідэй, аўтарскіх думак.

У навуковым тэксце для дакладнага афармлення думак аўтар выкарыстоўвае тэрміны, якім, як правіла, дае неабходныя каментарыі. Разуменне сутнасці тэрмінаў – умова паўнацэннага камунікавання. Калі чытач не знойдзе "агульнай мовы" з аўтарам, то спасціжэнне прачытанага стане немагчымым, паміж аўтарам і чытачом ўзнікне непаразуменне, двухсэнсоўнасць.

Тлумачэнне незразумелых слоў, тэрмінаў, папярэдняя праца з імі – умова для разумення прачытанага. Паводле Д.С. Ліхачова, самая небяспечная сітуацыя тая, "калі людзі чытаюць і незнаёмыя словы іх не цікавяць, яны прапускаюць іх, сочаць толькі за сюжэтам. Трэба вучыцца не хуткаму, а павольнаму чытанню… Тады кожнае слова ўяўляецца нам востравам, які трэба яшчэ адкрыць і апісаць ва ўсіх аспектах".[184] Змест мнагазначных слоў трэба акрэсліваць праз кантэксты – тэкставыя фрагменты, у якіх словы ўжываюцца.

[184] Лихачев, Д.С. Избранное: мысли о жизни, истории, культуре / Д.С. Лихачев. – М.: Российский фонд культуры, 2006. – С. 38.

Напрыклад, тэрмін *чытанне,* які часта сустракаецца ў прыведзеным тэксце, выкарыстоўваецца ў кантэкстах: *чытанне кнігі, чытанне для задавальнення, чытанне для разумення, чытанне з мэтай атрымаць інфармацыю, чытанне для навучання, спосабы чытання*.

У першым кантэксце тэрмін *чытанне* разглядаецца абагульнена, як сукупнасць усіх названых значэнняў: як чытанне любой кнігі, як чытанне для асалоды, для навучання, для разумення і інш. У словазлучэнні *чытанне для навучання* пад чытаннем разумеецца праца з вучэбнымі тэкстамі. Наступныя значэнні тэрміна абумоўліваюцца канкрэтным кантэкстам. Гэта азначае, што слова з'яўляецца ключавым, апорным.

Рацыянальна вылучаць *ланцужок словазлучэнняў* з вядучымі тэрмінамі, што стварае дадатковае поле для разумення. Сэнсавае поле фарміруецца праз спалучальнасць слова з рознымі часцінамі мовы: з прыметнікам (*асэнсаванае, актыўнае, крытычнае, дынамічнае, рацыянальнае, эфектыўнае чытанне*); з назоўнікам як галоўным словам словазлучэння (*чытанне кніг, тэксту, думак, газет, вершаў, лекцый, Бібліі, дакумента, артыкула, часопіса*); з назоўнікам як залежным словам (*працэс, круг, навык, хуткасць, урокі, мастацтва, вынік, тэхніка, культура чытання*); з дзеясловам (*прадоўжыць, адарвацца ад, прыступіць да, закончыць, пачаць, перарваць, перапыніць чытанне*). Вылучаныя словазлучэнні канкрэтызуюць працэс пераходу ад павярхоўнага да асэнсаванага ўспрымання фактаў і з'яў пры чытанні тэксту. Па сутнасці, гаворка вядзецца ў кантэксце фарміравання навыкаў асэнсаванага чытання або чытання для разумення. Названыя словазлучэнні канцэнтруюцца вакол тэрміна – *спосаб чытання*.

Такім чынам, вылучэнне і інтэрпрэтацыя ключавых слоў – неабходны этап разумення тэксту. Пасля гэтага можна пераходзіць да наступнага этапу – *інтэрпрэтацыя аўтарскіх ідэй, думак*. Асэнсаванае чытанне абавязвае да поўнага разумення аўтарскіх палажэнняў, стратэгій. Неабходная ступенька працы з тэкстам – матываванае абгрунтаванне пазіцыі аўтара, аргументацыя яго ідэй.

Як вядома, любы аргумент складаецца з шэрагу сцвярджэнняў, доказаў, звязаных адзін з адным. Гэта могуць быць прычынна-выніковыя сувязі, наяўнасць якіх падказваюць спецыфічныя канструкцыі і злучнікі: *калі тое…, то; паколькі…; з гэтага вынікае…; значыць…; гэта даказвае, што…; так як…; у сувязі з тым, што…; з гэтага вынікае, што…? Такім чынам… і інш.*

Пры чытанні неабходна звяртаць увагу на *абзацы як часткі цэлага*. Гэта дапамагае адэкватнаму разуменню інфармацыі. Увага да зместу абзацаў выяўляе ключавыя палажэнні тэксту, адпаведныя аргументы. Пры гэтым аўтар можа дастаткова падрабязна тлумачыць, якім чынам ён прыйшоў да вывадаў, супастаўляць розныя погляды на праблему, аналізаваць працы іншых навукоўцаў, каменціраваць іх пазіцыі. Сутнасць супастаўлення, параўнання чужых ідэй заключаецца ў фармулёўцы ўласных тэзісаў.

Надзейным паказчыкам разумення чужых ідэй з'яўляецца выкарыстанне прыёму перафразіравання, перадачы думак аўтара іншымі словамі. Можна праілюстраваць палажэнні аўтара праз падбор прыкладаў да іх – з жыцця, з уласнага вопыту, прывесці паралелі, аналагічныя сітуацыі і г.д. Гэта важныя

моманты ў працэсе разумення прачытанага. У такім выпадку “чужыя веды і думкі могуць увайсці ў актыў нашага мыслення як яго неад’емная частка. Яны прыходзяць да нас ад іншых людзей, але яны становяцца і нашымі ў сапраўдным значэнні слова, таму што выступаюць часткай нашага “Я”, вызначаюць нашы вывады, наша светаўспрыманне, нашы ўчынкі”.[185]

Такім чынам, сінтэтычны спосаб чытання кнігі рэалізуецца праз наступны алгарытм дзейнасці чытача:

– выдзяленне ключавых слоў, што ўтвараюць сэнсавае поле прачытанага;

– пошук галоўных сказаў, сцвярджэнняў у змесце кожнага абзаца;

– трансфармацыя асноўных палажэнняў з дапамогай аўтарскіх і ўласных фармулёвак;

– каментарыі да праблем, вылучаных аўтарам.

Трэба падкрэсліць узаемасувязь аналітычнага і сінтэтычнага спосабаў чытання, якія маюць інтэграваную аснову – змест кнігі. Прадэманструем гэты працэс праз наступны малюнак.



Малюнак 3.3.2 – Узаемасувязь аналітычнага і сінтэтычнага спосабаў чытання

[185] Поварнин, С.И. Как читать книги / С.И. Поварнин. – М.: Семигор, 1994. – С. 7.

Малюнак дэманструе інтэграванасць спосабаў чытання. Пры *аналітычным спосабе* чытач асэнсоўвае тэкст як цэлае, затым пераходзіць да састаўных частак кнігі. Пры *сінтэтычным спосабе* чытач выдзяляе ключавыя словы і словазлучэнні, сказы, тэрміны, сцвярджэнні, аргументы, што дае магчымасць успрыняць тэкст цэласна. Паслядоўнасць дзеянняў чытача прадвызначае адэкватнае разуменне аўтарскай пазіцыі.

Ацэначны спосаб чытання

Аналітычны і сінтэтычны спосабы чытання дазваляюць ісці ўслед за логікай аўтара. Ацэначны спосаб дапамагае чытачу ўступаць у дыялог з аўтарам і выказваць уласныя меркаванні. У чытача ёсць магчымасць згадзіцца або не згадзіцца з прапанаванымі поглядамі, стаць на пазіцыю аўтара або застацца пры сваёй.

Працэс асэнсаванага чытання ў ідэале не заканчваецца прачытаннем, ён завяршаецца фармулёўкай крытычнай ацэнкі. Аднак "крытыкаваць – не значыць толькі знаходзіць памылкі і недахопы, але і адзначаць станоўчыя моманты тэксту. Навучыцца адрозніваць вялікае ад сярэдняга і нават ад малога яшчэ цяжэй, чым знаходзіць памылкі".[186]

Для фарміравання навыку асэнсаванага чытання важна фармуляваць уласную пазіцыю па тых пытаннях, якія разглядае аўтар. Адпаведна трэба не толькі разумець прачытанае, але і ведаць, як правільна аформіць меркаванне. Для рашэння гэтай задачы і выкарыстоўваецца трэці спосаб чытання – *ацэначны.* У аснове спосабу – жаданне аргументаваць, давесці субяседніку (аўтару) сваю пазіцыю. На першы план выходзіць уменне пераконваць – даступна і доказна.

Ацэначны спосаб чытання як крытычны аналіз кнігі ўключае: разуменне думак аўтара, ацэнка несупадзенняў поглядаў аўтара і чытача, фармуляванне пытанняў да аўтара і тэксту. Ацэньванне як інтэграваны вынік дзейнасці ў разуменні тэксту падразумявае канструктыўны дыялог з аўтарам, паколькі "тое, што не адказвае ні на адно пытанне, пазбаўлена для нас сэнсу".[187]

Логіка разважанняў патрабуе выкарыстання абстрактнай лексікі, базавых тэрмінаў, пабочных слоў (*па-першае, па-другое, такім чынам, значыць, нарэшце, падагульнім* і інш.), злучнікаў і прыназоўнікаў (*таму што, паколькі, бо, з гэтай прычыны, на працягу, таму* і інш.), акалічнасці мэты, прычыны, уступкі і выніку, складаназалежных сказаў, што дапамагаюць аформіць прычынна-выніковыя адносіны, лагічныя вывады, абагульненні. Гэтыя сродкі надаюць маўленню аргументаваны характар, перадаюць логіку разважанняў з дапамогай лексіка-граматычных сродкаў прычынна-выніковай семантыкі.

На этапе ацэньвання лагічныя заданні, скіраваныя на паглыбленне ведаў пра алгарытмы чытання, на развіццё творчасці, напрыклад:

---

[186] Поварнин, С.И. Как читать книги / С.И. Поварнин. – М.: Семигор, 1994. – С. 28.

[187] Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – 2-е изд. – М.: Искусство, 1986. – С. 350.

Заданне 1. *Прачытайце тэкст, які называецца "Мастацтва чытаць няправільна". Тэкст пабудаваны ў стылістыцы шкодных парад Грыгорыя Остэра* [188] : *Ці згодныя вы з гэтымі парадамі? Складзіце свае парады на тэму "Мастацтва чытаць правільна".*

1. Калі чытаеш кнігу, абавязкова ўключы камп'ютар і рок-музыку.

2. Калі чытаеш, рабі фламастарам тлустыя пометкі на старонках – гэта абавязкова дапаможа.

3. Калі табе лянотна пісаць канспект тэксту, проста вырві ліст з кнігі. Але каб ніхто не бачыў!

4. Старайся як мага радзей чытаць кнігі – усё можна знайсці ў Інтэрнэце.

5. Калі сустракаеш незнаёмыя словы – проста прапусці іх, не траць свой час на слоўнікі і даведнікі. Гэта забірае час.

6. Заўсёды чытай толькі пачатак і канец кнігі – сярэдзіна, асноўная частка не адыгрываюць ніякай ролі.

7. Зусім не абавязкова траціць свой час на прачытанне тэкстаў дома, ты можаш зрабіць гэта ў маршрутцы па дарозе ў школу.

Заданне 2. *Прачытайце і прадоўжыце разважанні.*

З лінгвістычных пазіцый разуменне тэксту – розных відаў інфармацыі – *аналітычнай, сінтэтычнай і ацэначнай.* Першаснае ўспрыманне тэксту – прадметна-лагічнае (пра што гаворыцца?). Гэта *аналітычная інфармацыя.*

Пад *сінтэтычнай інфармацыяй* разумеецца сістэма поглядаў аўтара, якую ён адлюстроўвае ў тэксце. Гэта тое, што выяўляецца праз аўтарскую пазіцыю, яго ідэі. Зразумець сінтэтычную інфармацыю, "ухапіць" яе не зусім проста, бо яна патрабуе абагульнення, сістэматызацыі, розных тлумачэнняў.

Ацэначная інфармацыя – гэта тая, якая …

Заданне 3. Распрацуйце правы чытачоў па аналогіі з ідэямі Даніэля Пенака. Правы чытача: *права не чытаць; права пераскокваць; права не дачытваць; права перачытваць; права чытаць, што трапіла пад рукі; права чытаць дзе папала; права чытаць услых; права пачынаць чытаць з любой старонкі кнігі; права маўчаць аб прачытаным*.[189]

Заданне 4. Уявіце, што Міністэрства адукацыі праводзіць апытванне на прадмет таго, што думаюць грамадзяне з нагоды якасці сістэмы адукацыі ў краіне. Сфармулюйце сваю пазіцыю, выкарыстоўваючы канструкцыі: *Я (не) думаю, што/Я (не) лічу, што/Я (не) упэўнены, што/Я (не) згодны з тым, што/ На маю думку/на мой погляд* і інш.

Якой вам уяўляецца ідэальная/аптымальная сістэма адукацыі? Якой павінна быць сучасная школа? Якімі павінны быць падручнікі? Якім вам уяўляецца ідэальны настаўнік? Ідэальны вучань той, які … Што трэба зрабіць, каб сучасная школа была любімай устанавай, дзе вучыліся б матываваныя, арыентаваныя на будучыню навучэнцы?

Ацэначны спосаб чытання актуалізуе працу па стварэнні тэкстаў-разважанняў на аснове прачытанага:

---

[188] Остер, Г.Б. Вредные советы и другие истории: изд. для детей / Г.Б. Остер. – М.: АСТ, 2004. – С. 62.

[189] Пеннак, Д. Как роман / Д. Пеннак. – М.: Самокат, 2016. – 176 с.

– перакажыце тэкст, уключыце фрагменты ўласных каментарыяў да асноўных думак аўтара;

– сфармулюйце аргументы для доказу сваіх думак, падмацуйце іх прыкладамі з тэксту;

– пацвердзіце тэзісы аўтара прыкладамі;

– падрыхтуйце сціслы пераказ прачытанага, прапануйце аднакласнікам ацаніць узровень адпаведнасці аўтарскаму тэксту (гэта могуць быць фактычныя памылкі ў змесце: недакладнасці ў назвах кніг, ва ўказаных прозвішчах, ініцыялах, няправільна названыя даты, геаграфічныя назвы, жанр твора, паслядоўнасць падзей, памылкі ў выкарыстанні тэрмінаў, цытат і інш.).

Праца над кампазіцыяй і логікай свайго тэксту можа праходзіць з дапамогай наступных заданняў:

– запішыце тэзісы асноўнай часткі прачытанага тэксту, да кожнага з іх падбярыце прыклады, адпаведныя даследаванай праблеме;

– адзначце лагічныя пераходы паміж фрагментамі асноўнай часткі;

– супастаўце ўступ і заключэнне, вызначце іх сэнсавую адпаведнасць/неадпаведнасць;

– ацаніце суразмернасць усіх частак тэксту.

Такім чынам, *ацэначны спосаб* – неабходны этап у прачытанні тэксту, паколькі ацэнка мае вялікае значэнне ў камунікацыі. Без ацэнкі не можа быць паўнацэннага бачання аўтарскай і сваёй пазіцыі. Чытанне павінна завяршацца фарміраваннем крытычных ацэнак, што не азначае нязгоды з аўтарам. Гэта падразумявае ўласныя адносіны да зместу тэксту, якія могуць як супадаць, так і не супадаць з аўтарскімі. Абавязковай умовай крытычных адносін павінна быць адэкватнае асэнсаванне тэкставай інфармацыі.

Фарміраванне ўласнай пазіцыі прадугледжвае наступныя ўменні:

– ацэньваць ідэі тэксту з улікам сваіх уяўленняў пра тэму, праблему; знаходзіць доказы ў абарону прапанаваных поглядаў;

– даказваць/абвяргаць дакладнасць інфармацыі, пацвярджаць/аспрэчваць яе верагоднасць, выяўляць супярэчлівыя факты, тэзісы;

– вызначаць асаблівасці зместу і формы тэксту;

– узбагачаць маўленчы вопыт, фармуляваць ацэначныя меркаванні аб прачытаным тэксце на аснове пытанняў: *Ці пагаджаецеся вы з меркаваннямі аўтара? Абгрунтуйце свой адказ. У якой ступені вы падзяляеце/не падзяляеце тэзісы адносна … Аргументуйце ўласную пазіцыю…* і г.д.

2.4 Фарміраванне чытацкай пісьменнасці сродкамі беларускамоўнай адукацыйнай прасторы

Айчынны вопыт далучэння навучэнцаў да чытання на сучасным этапе пазначаны наступнымі тэндэнцыямі:

– стварэнне пазітыўнага іміджу чытача;

– фарміраванне каштоўнасных адносін да чытання;

– актуалізацыя чытацкага вопыту для рашэння вучэбна-пазнавальных і жыццёвых кампетэнцый.

На ўсіх этапах развіцця школьнай адукацыі праблема фарміравання культуры чытання разглядалася ў якасці ключавой пры вызначэнні зместу і прынцыпаў пабудовы працэсу навучання. Пачынаючы з першай ступені адукацыі, фарміруюцца тэхніка чытання і здольнасці да разумення тэксту, якія ўдасканальваюцца праз вучэбныя праграмы і падручнікі для агульнай сярэдняй школы. Сфера адказнасці за навучанне чытанню ў пачатковай школе пашыраецца за кошт сацыяльна-педагагічнага ўзаемадзеяння настаўнікаў, бібліятэкараў, устаноў дадатковай адукацыі.

Ідэя далучэння школьнікаў да чытання знаходзіць развіццё ў сацыяльнай практыцы – у дзейнасці бібліятэк, выдавецтваў, сродкаў масавай інфармацыі. Істотнай бачыцца дзейнасць грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, арыентаваных на падтрымку чытання і пісьменнасці. Так, грамадскае аб'яднанне *"Беларуская бібліятэчная асацыяцыя"* разглядае падтрымку чытання як прыярытэтную ў сваёй дзейнасці. Толькі ў 2023 годзе асацыяцыя правяла шэраг найцікавейшых мерапрыемстваў: паэтычны тэлемост "Літаратура без межаў", "Online-марафон", "Чытаем разам. Чытаем услых", "Тата, пачытай мне", скіраваных на развіццё цікавасці дзяцей, падлеткаў, а таксама бацькоў да чытання ўслых твораў беларускай дзіцячай літаратуры, прыняла ўдзел у міжнароднай акцыі флэшмоб да Сусветнага дня паэзіі "Вазьміце ў спадарожнікі паэзію", арганізавала семінар-практыкум "Выбар на карысць бібліятэкі: як стаць для дзяцей і моладзі запатрабаванай формай вольнага часу", акцыю "Чытаем беларускія кнігі", тэлемост "Маладзежныя культурныя практыкі ў бібліятэках Беларусі і Расіі", пасяджэнні дыялогавай пляцоўкі "Кніжныя блогеры", "Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні" і інш.[190]

Каштоўную дапамогу ў плане выхавання свядомых чытачоў аказваюць педагогам "Пачатковая школа" (часопіс мае мультымедыйны дадатак) і "Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа". Выданні змяшчаюць своеасаблівыя навуковыя парталы, на старонках якіх айчынныя і замежныя навукоўцы дзеляцца тэарэтычнымі напрацоўкамі, прысвечанымі праблеме выхавання любові і павагі да кнігі, а таксама артыкулы настаўнікаў-практыкаў, што ўтрымліваюць цікавыя знаходкі, арыгінальныя метадычныя распрацоўкі заняткаў.

Актыўна абмяркоўваецца праблема чытання на старонках часопісаў "Народная асвета", "Веснік адукацыі". Назвы публікацый часопісаў сведчаць пра ўдалыя пошукі "контрапунктаў" чытацкай дзейнасці вучняў, шляхі паспяховага вырашэння актуальнай праблемы, напрыклад: "Фарміраванне навыкаў працы на ўроках літаратурнага чытання", "Функцыянальная пісьменнасць малодшых школьнікаў", "Фарміраванне навыку асэнсаванага чытання ў малодшых школьнікаў на аснове выкарыстання міжпрадметных сувязей", "Прыёмы па фарміраванні чытацкай пісьменнасці", "Кніга ў жыцці

[190] Беларуская бібліятэчная асацыяцыя // Бібліятэчны свет. – 2023. – № 1. – С. 3 –5.

школьніка”, “Тэхналогія прадуктыўнага чытання – шлях да фарміравання пісьменнага чытача” і інш.

На старонках часопісаў асвятляюцца новыя аспекты ў змесце пачатковай адукацыі, арыентаваныя на засваенне міжнародных стандартаў у галіне чытацкай пісьменнасці, выхаванне рэфлексійнага чытача, які спасцігае прачытанае, асэнсоўвае цяжкасці, што сустракаюцца ў тэксце, і вучыцца іх пераадольваць. Публікацыі асвятляюць аспекты метадычнага характару, якія выяўляюць гатоўнасць настаўніка да фарміравання чытацкай пісьменнасці малодшых школьнікаў.[191]

У кантэксце вырашэння праблемы найпершае значэнне мае дзяржаўны характар падтрымкі чытання і кніжнай культуры. Грамадская зацікаўленасць праблемай выразна праяўляецца ў правядзенні мерапрыемстваў на рэспубліканскім узроўні: Нацыянальны конкурс “Золотая Литера”, Міжнародная спецыялізаваная выстаўка “СМІ ў Беларусі” (праводзіцца з 1997 года), фестываль рэгіянальных тэлекампаній Беларусі і Расіі “Вобраз часу”, Нацыянальны конкурс “Мастацтва кнігі” (праводзіцца з 1960 года), “Мінская міжнародная кніжная выстава-ярмарка” (у 2023 годзе праходзіла ў трыццаты раз і мела назву “Свет кнігі без межаў”), Рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”, штогадовае святкаванне “Дзён пісьменнасці”, правядзенне “Бібліяночы”, святкаванні Дня друку, Тыдня дзіцячай літаратуры, Дня бібліятэк, шматлікіх мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілеяў знакамітых беларускіх пісьменнікаў. Знакавы характар у кантэксце развіцця цікавасці да чытання маюць сацыяльна-творчыя праекты (напрыклад, праект “Сямейнае чытанне”, які рэалізуецца сумесна з грамадскім аб’яднаннем “Беларускі саюз жанчын” пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь).

Установы культуры праводзяць вялікую працу, што характарызуецца каштоўнаснымі набыткамі, папулярызацыяй прафесійнага вопыту ў адраджэнні нацыянальнай культуры, мовы, традыцый чытання. Грамадскае прызнанне набыў Рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” (у 2023 годзе праводзіўся 31-шы раз). Прыемна, што сярод узнагарод удзельнікаў конкурсу ёсць намінацыя “За падтрымку і развіццё чытання”. У 2023 годзе прымалі ўдзел 39 публічных бібліятэк краіны: 17 – цэнтральных і 22 – філіялы. Лідарам па колькасці прадстаўленых работ стала намінацыя “За падтрымку і развіццё чытання”. Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла ДУК “Астравецкая раённая бібліятэка” Гродзенскай вобласці за рэкламаванне кнігі і чытання сярод гараджан рознага ўзросту. Супрацоўнікі бібліятэкі вызначыліся актыўнасцю ў рэкламаванні творчасці беларускіх аўтараў. Так, для чытачоў былі арганізаваны “Майстэрня паэтычнага чытання”, творчыя сустрэчы з пісьменнікамі-землякамі “Натхненне”, акцыя “Аўтобус-чытач”, ай-стопер-рэклама “Вершы крочаць па планеце”, краязнаўчая квэст-

[191] Гулецкая, Е.А. Использование инструмента PIRLS в республиканском мониторинге изучения читательской грамотности учащихся. IV класс / Е.А. Гулецкая // Пачатковая школа. – 2022. – № 11. – С. 7–9.

гульня “Пазнай Астравеччыну праз кнігу”, літаратурныя падарожжы, турніры эрудытаў, цыкл літаратурна-краязнаўчых мерапрыемстваў “У культуры краю – душа народа”.

Сярод бібліятэк, размешчаных у сельскай мясцовасці, лепшай стала Елкаўская сельская бібліятэка ДУК “Зэльвенская раённая бібліятэка” Гродзенскай вобласці за распрацоўку і рэалізацыю літаратурна-адукацыйнага праекта “Я гэты край Радзімаю заву”. Праект складаецца з некалькіх блокаў, самыя папулярныя з іх – “ЧЫТАЙпраспект”, “Літаратурная палітра” з шэрагам сацыякультурных мерапрыемстваў: літаратурны марафон “Чараўнік беларускага слова”, паэтычны калейдаскоп “Зямля мая, нябёсаў родных сінь”, цыкл заняткаў “Адкуль кніга на Беларусь прыйшла”, Дзень чытача беларускай кнігі, чытанні “Чытаем разам, чытаем услых!”, літаратурнае караоке “Край радзімы, навекі любімы” і інш.[192]

Сучасныя бібліятэкі пашыраюць свае фізічныя межы і дадаюць да рэальнай прасторы віртуальную. Ідзе актыўная прадстаўленасць бібліятэк у Instagram, прапануецца шэраг online- і offline-мерапрыемстваў. Так, моладзевая аўдыторыя бібліятэк Свіслаччыны актыўна далучылася да інтэрнэт-акцыі #”Моладзь Свіслаччаны чытае беларускую кнігу” і літаратурнага марафона “Book-сімпатыя”, у якім гучалі радкі з любімых твораў, раіліся равеснікам кнігі, якія найбольш спадабаліся. Маладыя людзі ахвотна прынялі ўдзел у крэатыўным конкурсе “Фатаграфія з любімай кнігай беларускага аўтара” і прапанавалі зрабіць цікавую версію фотапартрэта – сэлфі з беларускамоўнай кнігай. Такім чынам моладзь рэкламавала любімыя кнігі айчынных аўтараў.[193]

Уласную нішу ў папулярызацыі чытання, кніжнай культуры заняў штомесячны папулярна-адукацыйны часопіс “Бібліятэка прапануе”. На старонках выдання – цікавыя арыгінальныя матэрыялы пра беларускія выданні, майстроў роднага слова. Калейдаскоп сцэнарыяў мерапрыемстваў для ўстаноў адукацыі – самы багаты: класныя гадзіны памяці, кніжны куфар, літаратурны турнір, тэатралізаваныя заняткі ў музеі, сустрэчы вясёлых кніжных герояў, настольная гульня “Фабрыка слоў”, квэст-гульня, экскурсіі, экалекцыі, падарожжы, пастаноўкі, трэнінгі, літаратурная гасцёўня, краязнаўчая гасцёўня, віктарыны, літаратурныя турніры, музейна-выставачныя экспазіцыі, акадэмія кніжных эксперыментаў “Юнае пакаленне выбірае чытанне”, літаратурныя імпрэзы, арт-кафэ, паштоўка любімаму пісьменніку, рэтрападарожжа, інтэлектуальная гульня, паэтычна-пазнавальная вандроўка, бібліяграфічны ўрок, паэтычная экспедыцыя, партрэт чытача, літаратурны SOS для моладзі “Кнігі па душы”, літаратурная мазаіка, інтэрактыўны праект “Беларуская чытанка”, конкурс чытальнікаў, крэатыў-конкурс, інтэрнэт-акцыі і інш.

Вялікі інтарэс уяўляюць рэгіянальныя праекты, мясцовыя ініцыятывы, што рэалізуюцца пры падтрымцы дзяржаўных органаў улады. Значная заслуга ў гэтым плане абласных бібліятэк. Са звычайных тэрытарыяльных устаноў,

[192] Карнейчук, Н. Лепшыя з лепшых. XXXI Рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” / Н. Карнейчук, В. Какшынская // Бібліятэчны свет. – 2023. – № 3. – С. 9–11.

[193] Рабчанка, А. Будзь у фармаце – чытай беларускае! / А. Рабчанка // Бібліятэчны свет. – 2022. – № 2. – С. 19–20.

арыентаваных на збор, захаванне і папулярызацыю друкаваных дакументаў, яны трансфармаваліся ў шматфункцыянальныя асяродкі айчыннай культуры (найперш кніжнай). Сінтэз традыцыйных і новых фарматаў культурнай дзейнасці, эфектыўныя камунікацыі з карыстальнікамі ствараюць камфортнае бібліятэчнае асяроддзе, раскрываюць унікальнасць рэгіянальнай культурнай прасторы. Так, Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага для гараджан і гасцей горада прапануе своеасаблівыя "вандроўкі па горадзе з бібліятэкай" – правядзенне пешых аглядавых лекцый па гістарычнай частцы абласнога цэнтра. Карыстаюцца папулярнасццю тэматычныя экскурсіі – "Старонкі гісторыі Гродна", "Літаратурнымі сцежкамі Гародні". Бібліятэкамі горада паспяхова рэалізуецца экскурсійны краязнаўчы праект "Гістарычныя падзеі ў мемарыяльных дошках Гродна". Бібліятэкарамі падрыхтаваны інклюзіўныя гістарычныя вандроўкі, краязнаўчыя экскурсіі для дзяцей, падлеткаў і моладзі. Установамі культуры Гродзенскай вобласці наладжана творчае супрацоўніцтва з арганізацыямі дашкольнай, агульнай сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па папулярызацыі кнігі і чытання. Сярод знакамітых мерапрыемстваў – адукацыйныя праекты "Кніжны дэсант" (Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага), "Кніга збірае сяброў" (Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы), штомесячная PR-акцыя "Да вас у госці кніга ідзе" (Ашмянская раённая бібліятэка) і іншыя арыгінальныя напрацоўкі. Навагрудская раённая бібліятэка сумесна з рэдакцыяй праграмы "Навагрудскія навіны" знаёміць гледачоў з беларускай мовай і беларускамоўнымі кнігамі. Прыемна выдзяляецца абласны чэлендж "Класічна… Патрыятычна: Гродзеншчына чытае Янку Купалу і Якуба Коласа", прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння знакамітых песняроў краіны. Падчас яго правядзення прадстаўнікі розных узроставых катэгорый чыталі творы славутых паэтаў. На сайтах бібліятэчных устаноў вобласці, у сацыяльных сетках і тэлеграм-канале "Культура Гродзеншчыны" былі размешчаны амаль 100 фотаздымкаў.[194] У чарадзе мерапрыемстваў па чытанні школьнікаў кніжная пісьменнасць усведамляецца як знакавая састаўная культуры краіны. Адбываецца грамадскае прызнанне значнасці праблемы, асэнсаванне таго, што тэрыторыя школы, бібліятэкі, іншых асяродкаў бытавання кнігі выступае тэрыторыяй культуры.

Місія літаратурна-мастацкіх часопісаў Беларусі ў папулярызацыі слогана *Чытаць – модна* дэталізуецца ад характару мэтавай аўдыторыі. Так, *часопіс "Вясёлка"* фарміруе новы тып камунікацыі з дзецьмі, у аснове якой – творчая дзейнасць маленькіх чытачоў. У працы рэдакцыі – тры задачы-накірункі: навучыць дзяцей любіць сваю радзіму; прывіць любоў да роднай мовы, спадчыны, гісторыі, культуры; спрыяць, каб дзеці ўмелі шанаваць людзей, якія цярпліва выводзяць іх на жыццёвыя пуцявіны.[195] З першага нумара "Вясёлкі" (1957 год) на старонках часопіса размяшчаюцца цікавыя матэрыялы пра новыя

[194] Сцяпанава, Г. Бібліятэкі Гродзеншчыны: рэгіянальныя адметнасці і цікавосткі ў дзейнасці / Г. Сцяпанава // Бібліятэчны свет. – 2023. – № 1. – С. 6–9.

[195] Ліпскі, У. Наш часопіс / У. Ліпскі // Часопіс "Вясёлка" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.veselka.by/. – Дата доступу: 26.08.2023.

беларускамоўныя кнігі для дзяцей і падлеткаў, прысвечаныя выхаванню дасведчанага маленькага чытача. Неназойлівая рэклама новых выданняў афармляецца ў каляровым фармаце, без залішняга дыдактызму, напрыклад: *Буся чытае – пачытаць запрашае; Родны край – вандруй і паважай; Вершы на памяць; У свеце казкі; Вершы юных талентаў; Пра звяроў для самых маленькіх; Бусева кнігарня; Цікавыя літары; Што пачытаць?* і інш.

Рэдакцыя *часопіса "Пралеска"* арыентавана на "дашкольны перыяд як ступень літаратурнага развіцця будучага самастойнага чытача".[196] Адна з задач дашкольнай адукацыі – выхаванне ў дзяцей цікавасці і любві да кнігі і чытання, шляхі паяднання традыцыйнай культуры зносін з кнігай і інфармацыйных тэхналогій. На думку аўтараў праекта, ідэальна, калі ўжо ў дзіцячых садках наладжваюцца цэнтры так званага камфортнага чытання, у якіх выдзяляюцца спецыяльныя месцы, дзе сабраны мастацкія творы розных жанраў з улікам узроставых індывідуальных магчымасцей маленькіх чытачоў. Дзіця можа самастойна або разам з дарослымі выбраць кнігу, узяць яе дамоў для чытання ў сям'і або проста пагартаць старонкі з ілюстрацыямі, разгледзець карцінкі з малюнкамі любімых казачных герояў. Навукова-метадычнае выданне ставіць за мэту павысіць узровень прафесійнай кампетэнцыі супрацоўнікаў дзіцячых садоў праз падбор літаратуры па выхаванні і праблеме фарміравання свядомых адносін да чытання. Метадычная скарбонка (так называецца рубрыка ў часопісе) для выхавальнікаў прапануе розныя формы працы з дзецьмі: *гутаркі "Што ты ведаеш пра кнігі?", "Як трэба абыходзіцца з кнігай?", абмеркаванне сітуацый "Калі б не было кніг", стварэнне лэпбукаў, арганізацыя выстаў для дзіцячай аўдыторыі з мэтай знаёмства з мастацкімі творамі, арганізацыя "Кніжчынай бальніцы", выраб закладак для кніг, правядзенне заняткаў "Адкуль да нас прыйшлі кнігі", "Мой любімы казачны персанаж", інтэрв'ю "Навошта чалавеку кнігі?", "Дзе жывуць кнігі?" (аповед аб прафесіі бібліятэкара, правілах паводзін у бібліятэцы), "Якія кнігі жывуць у нашым доме?", дыдактычныя гульні "Пазнай героя па апісанні", "Адгадай загадку", сюжэтна-ролевая гульня "Бібліятэка", "Кнігарня", "Тыпаграфія", аплікацыя "Герой любімай казкі", драматызацыя па матывах літаратурных казак, "Любімая кніга маіх мамы і таты".* У метадычным актыве выхавальнікаў дзіцячых садкоў – складанне інтэлект-карт як прыём сітуацыі ўяўлення пра поры года, пакаёвыя расліны, што развіваюць уменні вызначаць формы прадметаў, абазначаць іх з дапамогай геаметрычных фігур, дапамагаюць выдзеліць найбольш яркія моманты кнігі, герояў мастацкіх твораў. Так, на інтэлект-карце можа быць размешчаны цэнтральны малюнак, які прадстаўляе сімвал твора, вакол яго – вобразы ўсіх персанажаў казкі. З апорай на ілюстрацыі малым чытачам лягчэй расказваць пра галоўных герояў, іх учынкі, перадаваць сюжэт і самыя цікавыя эпізоды, якія запомніліся і палюбіліся.[197] Выкарыстанне сучасных формаў заняткаў, гульняў, разнастайнасць творчых

[196] Шакель, О. Проект «Современная многофункциональная библиотека «БУКиБИТ» в условиях детского сада / О. Шакель, Ю. Лавникович // Пралеска. – 2023. – № 2. – С. 28–32.

[197] Емельянович, Е. Интеллект-карта как метод систематизации представлений воспитанников / Е. Емельянович // Пралеска. – 2022. – № 11. – С. 19–21.

заданняў, аб’яднанне намаганняў устаноў дашкольнай адукацыі і сям’і дазваляюць закласці першыя цаглінкі ў фундамент асэнсаваных адносін да кнігі, любві да чытання.

Многія ўстановы дашкольнай адукацыі ідуць у нагу з часам, ствараюць лічбавыя рэсурсы адкрытага доступу як сучасны інструмент аператыўнай інфармацыі, арыентаванай на выкарыстанне выхавальнікамі, бацькамі, з мэтай далучыць дзяцей да беларускамоўных твораў: народныя песенькі і калыханкі, беларускія казкі, казкі народаў светаў, творы пісьменнікаў для дзяцей. Так, электронны каталог названых жанраў размешчаны на афіцыйным сайце ДУА “Яроміцкі дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці (рубрыка “Інавацыйная дзейнасць”)”.[198]

Творчым характарам вызначаюцца пастаянныя рубрыкі часопіса “Чытанка Пралескі”, “Літаратурная гасцёўня Пралескі”, “Па старонках роднай мовы”, якія прапагандуюць чытанне як кампанент вольнага часу. Эфектыўнымі формамі далучэння дзяцей да беларускамоўных твораў з’яўляюцца тэматычныя тыдні (“Тыдзень беларускай мовы”, “Тыдзень беларускіх традыцый”), народныя святы (Калядкі, Купалле, Нараджэнне Хрыстова), гутаркі (“Мае сябры – кніжкі”, “Мая Матуля”), наведванне міні-музеяў беларускага побыту, тэатральна-гульнёвая дзейнасць па матывах беларускіх народных казак і вершаў айчынных паэтаў. Выкарыстанне меладычных песень (“А ты, коценька-каток”, “Кую, кую ножку”, “Чыкі-чыкі, сарока”, “Сядзіць мядзведзь на калодзе” і інш.), лічылак, скорагаворак садзейнічае развіццю беларускага маўлення.[199]

Ствараюцца комплексы сродкаў візуалізацыі для заняткаў з выхаванцамі. Напрыклад, раіцца выкарыстанне такіх сродкаў, як інтэрактыўны плакат, таймлайн, віртуальная экскурсія, скрайбінг, кластар, кросенс, воблака слоў і інш. Наўрад ці варта прымяняць падобныя формы працы з дашкольнікамі ў поўным аб’ёме, аднак метадычны ўзровень прафесійнай кампетэнцыі, інфармаванасць педагагічных супрацоўнікаў выклікае павагу.[200]

Метадычным трэндам у кантэксце заахвочвання да чытання, на наш погляд, з’яўляюцца рубрыкі літаратурна-мастацкага *часопіса “Маладосць”* “Любімыя кнігі майго юнацтва”, “Кніга, якая сфарміравала маю асобу”. Станоўчай рысай рубрыкі з’яўляецца спавядальны характар прызнання маладых літаратараў пра ролю кнігі ў іх жыцці. Не менш значная акалічнасць – малады ўзрост герояў рубрыкі ў кантэксце выказвання Э. Эрыксана пра тое, што ў юным узросце відавочнае “захапленне равеснікамі, аднагодкамі, паколькі істотным механізмам ідэнтыфікацыі асобы з’яўляецца супастаўленне сябе з іншымі – “значымымі другімі”.[201]

Падобныя знаходкі рэдакцыі кранаюць разважаннямі нашых сучаснікаў пра месца кнігі ў іх жыцці, творчасці. Надзвычай істотна, што аўтары падобных

[198] Бич, Т. Электронно-образовательный ресурс в помощь педагогическим работникам / Т. Бич // Пралеска. – 2022. – № 10. – С. 5–6.

[199] Быкава, І. Гучы, наша мова! / І. Быкава // Пралеска. – 2022. – № 4. – С.50–53.

[200] Ходаренок, Т. Использование средств и методов визуализации в образовательном процессе с воспитанниками / Т. Ходаренок // Пралеска. – 2022. – № 3. – С. 16–18.

[201] Эриксон, Э. Идентичность: юность и кризис / Э. Эриксон. – М.: Прогресс, 1996. – С. 259.

прызнанняў – маладыя паэты і празаікі, якія, паводле меркавання рэдакцыі часопіса, ужо “сталі на літаратурнае крыло, лаўрэаты і дыпламанты літаратурных конкурсаў; навучэнцы літгурткоў і літстудый; старшакласнікі, а таксама сталыя літаратары, вядомыя гісторыкі, даследчыкі, журналісты”. [202] Гэта не проста біяграфічны штрых да партрэта асобы. Такія споведзі асабліва важныя для тых, хто знаходзіцца ў працэсе самавызначэння (сацыяльнага, прафесійнага, асобаснага). Менавіта ў юнацтве чалавек робіць адзін з прынцыпаў значымым для свайго выбару: асэнсаванне сябе, выяўленне “самасці”, унікальнасці. Знаёмства з падобнымі маналогамі маладых паспяховых людзей дапамагае вызначыцца з выбарам і чытаннем кніг як спосабам пошуку каштоўнасных арыенціраў у жыцці. Працытуем некалькі прызнанняў са старонак часопіса “Маладосць”:

– *У дзяцінстве я зачытвалася “Хронікамі Нарніі” – фэнтэзійным цыклам Клайва Стэйплза Льюіса. Пранікаючы ў цудоўны свет стваральніка Аслана, я не заўважала, як паглынала адну кнігу за другой. І не спынілася, пакуль не адолела ўсе сем кніг. Менавіта пасля прачытання гэтых гісторый я вырашыла пайсці ў пісьменнікі. Сталеючы, знаёмілася з новымі літаратурнымі шэдэўрамі і геніямі. Але “Хронікі Нарніі” назаўжды занялі ганаровае месца ў маім сэрцы* (Ангеліна Ганчарова, аспірант Інстытута літаратуразнаўства НАН Беларусі).

– *Маім бацькам практычна не прыйшлося весці са мной гутаркі пра тое, што такое добра і што такое дрэнна з пункту гледжання маралі. Яны проста параілі мне чытаць Драйзера. І я прачытала і “Амерыканскую трагедыю”, і “Фінансіста”, і “Сястру Керы”. Увогуле, усё ў Тэадора Драйзера. І гэта сфарміравала мяне як дзяўчыну і як асобу. У дзяцінстве вельмі любіла “Дзінку” Валянціны Асеевай, гэтая кніга грэе маё сэрца і сёння. Нельга забыць Скарлет О’Хара, якая навучыла таму, хто такая моцная жанчына.*

Рэкамендавала б таксама перачытаць Івана Шамякіна, Івана Чыгрынава і, вядома, Алеся Адамовіча. Думаю: той, хто прачытаў “Хатынскую аповесць”, паглядзеў “Ідзі і глядзі” Элема Клімава, проста не можа быць дрэнным чалавекам (Таццяна Рудакоўская, вядучая праграмы “Наша раніца”).

– *Так сталася, што мне ўсё жыццё спадарожнічалі кнігі. Першымі маімі чытанкамі былі казкі “Канёк-гарбунок” Пятра Яршова, “Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна” Аляксея Талстога, “Чыпаліна” і “Джэльсаміна ў Краіне хлусаў” Джані Радары. Таксама спадабалася аповесць Марка Твэна “Прыгоды Тома Сойера”. Моцна паўплывала на мяне знаёмства ў школьныя гады з цудоўным ды неабсяжным светам расійскай класікі.*

З беларускай літаратуры найперш уразілі “На ростанях” Якуба Коласа, апавяданні Васіля Быкава ды Кузьмы Чорнага, у якіх раскрываецца багаты духоўны свет беларускага народа, яго працавітасць, мужнасць, гатоўнасць прымаць рашэнні ды несці за іх адказнасць. Надзвычай важна, каб будучае пакаленне беларусаў вучылася на творчасці гэтых ды іншых выбітных майстроў беларускага слова (Дзмітрый Аўчыннікаў, пісьменнік).

[202] Ад рэдакцыі // Маладосць. – 2023. – № 4. – С. 3.

– Найбольш паўплывалі на маё станаўленне класікі беларускай літаратуры: Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і Францішак Багушэвіч, Янка Купала і Якуб Колас, Максім Гарэцкі і Вацлаў Ластоўскі, Кузьма Чорны і Іван Чыгрынаў. Менавіта яны з'яўляюцца для мяне ўзорам самаадданага служэння літаратуры і роднаму слову. Паколькі мае захапленні гісторыяй выліліся ў напісанне гістарычных аповесцей, хронік і эсэ, то хачу назваць некалькі постацей мінулага, асоб, якія заслугоўваюць агульнанацыянальнага ўшанавання, – гэта полацкія валадары Рагвалод і Усяслаў Чарадзей, вялікія князі Міндоўг і Трайдзень, Вітаўт Вялікі і Казімір Ягайлавіч, беларускія магнаты Астафій Валовіч і Леў Сапега (Іван Саверчанка, доктар філалагічных навук, прафесар).

Часопіс "Беларуская мова і літаратура", апроч шматлікіх метадычных прац па айчыннай гісторыі, культуры, разгарнуў папулярызатарскую дзейнасць па рэкламе беларускамоўных кніг (як правіла, змяшчаецца на апошняй старонцы выдання). У рэкламе ўдала спалучаюцца фатаграфія вокладкі кнігі і сціслая анатацыя.

Часопіс сістэматычна змяшчае метадычныя парады да ўрокаў і алімпіяд, займальныя матэрыялы да пазакласных заняткаў. Прычым, рэклама кнігі падаецца ў розным фармаце – ад традыцыйнага апісання зместу да канкрэтызаванага займальнага апісання, напрыклад:

Дзмітрый Кашавар. Беларускія жанчыны, якія апярэдзілі час (серыя "Гісторыя ў асобах"). Добра ілюстраванае навукова-папулярнае выданне знаёміць з біяграфіямі выбітных беларускіх жанчын.

Саламея Рэгіна Русецкая – першая ў гісторыі Беларусі жанчына-лекар, асветніца, вандроўніца, пісьменніца. Была прыдворным доктарам у султанаў Асманскай імперыі, расійскай імператрыцы, лекарам у рэзідэнцыі Гетмана Вялікага Княства Літоўскага Міхаіла Радзівіла Рыбанькі.

Францішка Уршуля Радзівіл – першая ў Рэчы Паспалітай жанчына-драматург, заснавальніца беларускага тэатра. Асветніца, паэтэса, пісьменніца і мастачка. Малявала эскізы сцэнічных дэкарацый.

Эмілія Плятар – беларуская рэвалюцыянерка. Нацыянальная гераіня Беларусі, Польшчы і Літвы. Актыўная ўдзельніца паўстання 1830–1831 гадоў. У 24 гады сабрала і ўзначаліла атрад паўстанцаў. Атрымала чын капітана.[203]

Уладзімір Ліпскі. Цар: Раман.

У гэтым сенсацыйным творы пісьменнік Уладзімір Ліпскі імкнецца разгадаць гістарычную таямніцу. Хто папраўдзе Марына Мнішак: царыца ці авантурыстка? Хто пакарыў трон Масковіі: сапраўдны сын Івана Грознага Дзімітрый ці самазванец Ілжэдзімітрый? Чым ён дамогся ўлады: розумам, прыроднай мудрасцю, воляй ці нечай магутнай падтрымкай? Чаму Леў Сапега і Радзівілы дапамагалі Дзімітрыю?

Аўтар раскрывае беларускі след царавання Дзімітрыя і прапануе чытачам паглядзець на гісторыю вачыма нашага сучасніка – жыхара палескай вёскі Змітры Кажухоўскага па мянушцы Цар, які шукае свае карані.

[203] Беларуская мова і літаратура. – 2020. – № 3.

Кнігу аздобілі вядомыя беларускія мастакі Леанід Данелія і Георгій Лойка.

Пяць прычын набыць гэтую кнігу:

1. Займальны сюжэт, у якім перакрыжоўваюцца далёкае мінулае і сучаснасць.

2. Цэнтральная тэма рамана аб'ядноўвае некаторыя таямнічыя моманты гісторыі Расіі і Вялікага Княства Літоўскага (сучаснай Беларусі).

3. Інтэлігентны, разумны, дапытлівы герой.

4. Неймаверная колькасць цікавых фактаў, сабраных аўтарам у працэсе даследавання тэмы.

5. Сакавітая, жывая мова.[204]

Літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны *часопіс "Полымя"* – згодна з заслужаным аўтарытэтам і салідным іміджам – з'яўляецца надзейным арыенцірам у свеце кніг. Агляд літаратурных навінак, грунтоўныя артыкулы, прафесіянальныя рэцэнзіі ў рубрыках "Навуковыя публікацыі", "Кнігарня" фарміруюць свядомага і сталага чытача Беларусі.

Айчыннымі навукоўцамі распрацаваны тэарэтычныя падыходы, прынцыпы, змест, сістэма, метады і прыёмы навучання чытанню на аснове далучэння дзяцей да нацыянальнай культуры ў кантэксце беларуска-рускага двухмоўя. Значнасцю метадалагічных і практычных напрацовак вылучаецца сучасная методыка чытання на ўзроўні дашкольнай (Д.М. Дубініна, Т.У. Паліева, В.Л. Пашко, Н.С. Старжынская і інш.) і пачатковай (Н.М. Антановіч, Н.У. Антонава, І.А. Буторына, В.І. Свірыдзенка, М.Г. Яленскі і інш.) адукацыі.

Тэарэтычныя падыходы рэалізаваны ў разнажанравых выданнях (лекцыйныя курсы, выяўленчы матэрыял, наглядныя дапаможнікі, карткі, сшыткі па развіцці маўлення, лінгвістычныя гульні, дапаможнікі для выхаванцаў, выхавальнікаў, навучэнцаў, педагогаў, студэнтаў, выкладчыкаў, матэрыялы для факультатыўных заняткаў і інш.). Фарміраванне навыкаў чытання ў рэчышчы развіцця беларускага маўлення, "азнаямлення дзяцей з духоўнымі і матэрыяльнымі каштоўнасцямі нацыянальнай культуры … ажыццяўляецца па формуле *мова праз культуру – культура праз мову*". [205]

Дапаможнікі для маленькіх чытачоў выкананыя, як правіла, у каляровым фармаце. [206] Дапаўняюць выданні малюнкавыя слоўнікі, разнастайныя займальныя заданні, якія, безумоўна, зацікавяць вучняў і будуць спрыяць трываламу засваенню беларускамоўнай тэматычнай лексікі. Распрацаваны серыі "Хуткае чытанне", "Пазакласнае чытанне", "У татавай бібліятэцы", "Чытай па-беларуску", "Чытаем разам з Буслікам", "Разумеем і чытаем па-беларуску", "Школьная праграма", "Беглае чытанне", "Выразнае чытанне", "Беларускія пісьменнікі – дзецям", цыкл "Асалода чытання", рознаўзроўневы дыдактычны матэрыял, даведнікі, алімпіядныя заданні і інш.

---

[204] Беларуская мова і літаратура. – 2020. – № 9.

[205] Старжынская, Н.С. Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту: вучэбны дапаможнік / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск: РІВШ, 2022. – 396 с.

[206] Гарбацэвіч, Л.М. Да роднай мовы разам з Бульбашыкам. 1 клас / Л.М. Гарбацэвіч. – Мазыр: Содействие, 2021. – 88 с.

Асобную нішу ў забеспячэнні працэсу фарміравання чытацкіх уменняў займаюць наглядныя дапаможнікі, у якіх прадстаўлены арыгінальны матэрыял для канструявання сітуацый маўлення з дзецьмі 4–5 гадоў (адукацыйная галіна “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”). [207] Навізной і арыгінальнасцю вызначаюцца матэрыялы да ўрокаў чытацкай пісьменнасці, распрацаваныя Г.М. Федаровіч. У рабочых сшытках – рэестр цікавых заданняў, якія дапамагаюць вучням 1–4 класаў навучыцца разумець тэксты, знаходзіць у іх патрэбную інфармацыю і выкарыстоўваць яе.

Сярод найноўшых навуковых даследаванняў цэласнасцю вылучаецца дысертацыя Г.М. Юстынскай, выкананая ў каардынатах трансфармацыі зместу паняцця *чытацкая кампетэнцыя* і *гарманізацыі метадаў фарміравання чытацкіх уменняў*. Распрацаваная аўтарам тыпалогія літаратурных заданняў, што забяспечваюць паэтапнае фарміраванне кампетэнцый чытацкай пісьменнасці, вызначаецца спалучэннем традыцыйных формаў і шматфункцыянальнымі магчымасцямі электроннага навучання. Гэта, на думку аўтара, патрабуе “перагляду метадычнай інфраструктуры, тэарэтычных пытанняў фарміравання аналітычных і інтэрпрэтацыйных здольнасцей у працы з тэкстам, рэфлексійных уменняў, крытычнага і творчага мыслення, актуалізацыі чытацкай кампетэнцыі як надзейнага сродку медыябяспекі вучняў”.[208]

Уражвае таксама багацце навукова-дыдактычнага забеспячэння працэсу чытання ў сучаснай школе. Метадычны аптымізм выклікае шматаспектнасць дапаможнікаў для вучняў, настаўнікаў, матэрыялаў для праверкі сфарміраванасці чытацкіх уменняў, хрэстаматый для пазакласнага чытання, рабочых сшыткаў па літаратурным чытанні, дадатковых матэрыялаў, зборнікаў твораў для дадатковага чытання, заданняў для фарміравання чытацкай пісьменнасці, планаў-канспектаў урокаў, што ўключаюць казкі, загадкі, крыжаванкі і інш.

Пераважная большасць метадычных дапаможнікаў для агульнай сярэдняй адукацыі характарызуецца разнажанравасцю. У якасці прыкладу можна прывесці метадычныя распрацоўкі па грамадазнаўстве для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у круг якіх уваходзяць: зборнікі заданняў, трэнажоры, апорныя канспекты, схемы і табліцы, даведнікі тэрмінаў і персаналій, зборнікі трэніровачных і кантрольных тэстаў, лагічныя схемы, каментарыі да заданняў ЦТ, заданні для ўступных экзаменаў у Ліцэй БДУ і інш.

Не засталася па-за ўвагай і праблема дзіцячай літаратурнай творчасці на ўроках чытання. Так, “творчы” дапаможнік для настаўнікаў раскрывае тэарэтычныя асновы развіцця літаратурных здольнасцей малодшых школьнікаў. Неабходнасць такой працы аўтар выдання – знакаміты метадыст М.І. Сянкевіч, папярэджваючы пытанне *Які сэнс у ранняй літаратурнай творчасці?*, вытлумачвае так: “Па-першае, літаратурная творчасць паглыбляе і

[207] Старжынская, Н.С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў : вучэбны дапаможнік / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск: НІА, 2020. – 28 с.

[208] Юстинская, Г.М. Формирование читательской компетенции учащихся при изучении учебного предмета «Русская литература» в условиях смешанного обучения: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02/Г.М. Юстинская; Нац. ин-т образования. – Минск, 2021. – С. 1–2.

пашырае каналы спасціжэння свету, напаўняе эмоцыямі жыццё, узбагачае пачуцці дзяцей. Па-другое, каб навучыць дзіця заўважаць вобразны лад мовы, варта акцэнтаваць эмацыянальна-выяўленчую ёмістасць роднай мовы, эстэтычную прывабнасць і выразнасць мастацкага слова. Па-трэцяе, дзіцячая творчасць дапамагае рыхтаваць чытача, фарміраваць яго ўменні”.[209]

Культуратворчым аспектам дзейнасці калектыву часопіса “Роднае слова” выступаюць арыгінальныя праекты, прысвечаныя гістарычным і сучасным фактам, падзеям як унікальным знакам айчыннай культуры, што канцэнтруюць, аб’ядноўваюць аднадумцаў, дзеячаў навукова-асветніцкай сферы. Так, у 2022 годзе праект прысвячаўся 100-годдзю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Яго прызначэнне вызначалася высокай місіяй бібліятэкі – “сімвала беларускай кніжнасці і культавага месца, асяродка захавання кніжнай спадчыны сучаснай Беларусі”. [210] Цікавая задума рэдакцыі “Роднага слова” – змяшчаць на вокладках часопіса рэпрадукцыі карцін са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, прысвечаных партрэтам кніжніка – Homo legens – прыгожы штрых да папулярызацыі ў грамадстве традыцый чытання. Гэта своеасаблівая культурная альтэрнатыва ўсеагульнаму пакланенню сэлфі, “часам павярхоўнаму, а то і бездухоўнаму абмену думкамі ў небездакорнай сферы чатаў і блогаў, якія ў пэўнай ступені абмяжоўваюць маўленчае развіццё”[211]

Калектывы часопісаў “Беларуская мова і літаратура”, “Беларусь”, “Беларускі музей”, “Бібліятэка прапануе”, “Народная асвета”, “Родная прырода”, “Мастацтва і школа”, газет “Культура”, “ЛіМ” ды іншых выданняў як духоўнае брацтва кніжнікаў, шчырых служак роднага слова пазіцыянуюцца ў калектыўнай свядомасці ўстановамі, без якіх немагчыма ўявіць культурную прастору сённяшняй Беларусі. Іх творчая супольнасць мае вялікую збіральную і захавальную сілу нацыянальных традыцый і культурных практык, актуалізуе агульны эмацыйны інтэлект, што вяртае ў нашу паўсядзённасць культуру слова, класічныя традыцыі чытання, стварае адухоўлены вобраз Беларусі-кніжніцы.

Такім чынам, чытанне – выпрацаваны стагоддзямі вопыт духоўнага жыцця чалавецтва, механізм станаўлення асобы шляхам узбагачэння праз культурна арыентаваныя тэксты. У кантэксце багата распрацаванай вучэбнай, навуковай, метадычнай літаратуры хочацца выказаць недавер да тых, хто гучнагалосна разважае пра звужэнне беларускамоўнай прасторы, змяншэнне колькасці тых, хто гаворыць па-беларуску, невысокі прэстыж беларускай мовы ў сучасным грамадстве, змяншэнне фінансавання на адукацыю і г.д. Усё ж такі гэта знешні фармат праблемы, абумоўлены часам і бачаннем праблемы праз прызму прафесійных задач. Галоўная фігура ў сучаснай шматаблічнай камунікатыўнай прасторы – *Настаўнік,* яго *Вера* ў сілу слова, прыярытэт культуры, *Надзея* на засваенне пачуццёва-эмацыянальнай асновы беларускага слова як умовы

[209] Сянкевіч, М.І. Углядацца, здзіўляцца, тварыць. Развіццё творчых літаратурных здольнасцей малодшых школьнікаў: метад. дапаможнік / М.І. Сянкевіч. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2018. – С. 67.

[210] Шапран, Н. Пад знакам кніжнай айкумены / Н. Шапран // Роднае слова. – 2022. – № 1. – С. 3.

[211] Рачэўскі, С.Р. Тэкст – стратэгічна важны сродак моўнай адукацыі ў сучаснай школе / С.Р. Рачэўскі // Роднае слова. – 2023. – № 9. – С. 58–62.

паўнавартаснага засваення мовы, на вечныя каштоўнасці, на ісціны, сфармуляваныя стагоддзі таму, *Любоў* да сваіх выхаванцаў, да дзяцей – сваіх і чужых – да свайго народа, на зямлі якога жывём.

Аб'яднанне намаганняў усіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу павінна праходзіць у кантэксце маральна-патрыятычнага выхавання праз вызначальныя канцэпты беларускай культуры – "Радзіма", "Маці", "Сям'я", "Родная зямля", "Школа", "Настаўнік", "Мая вёска/Мой горад", "Наша мова". Інтэграванасць культурна-адукацыйных практык дапаможа вырашыць галоўную задачу – выгадаваць пакаленне, годнае сваёй краіны, школы, сям'і, выхаванае ў кантэксце павагі да чалавека, слова, мовы, кнігі. Неабходныя сумесныя намаганні ў сферы праектавання адукацыйнага асяроддзя, якое фарміруе патрэбнасць у кнігах, актуалізуюць прывабнасць і перспектыўнасць чытання для "лічбавага" пакалення.

Надзвычай важна, што сучасны фармат кніжнай культуры арыентаваны на моладзь, падлеткаў. Як вядома, любая традыцыя можа сцвердзіцца, замацавацца, мець пазітыўны ўплыў, калі яна "прарастае" ў свядомасці з малалецтва. Менавіта каштоўнасныя арыентацыі сённяшніх маладых людзей вызначаць канцэпцыю будучай культурнай прасторы грамадства.

III. ТЭКСТ У РЭЧЫШЧЫ ФАРМІРАВАННЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ: НОВЫ ФАРМАТ

Асаблівасці сучаснага адукацыйнага асяроддзя патрабуюць абнаўлення лінгваметадычных падыходаў ва ўмовах тэкстаарыентаваных тэхналогій. Практыка сённяшніх адукацыйных рэалій найперш звязана з новымі фарматамі тэкстаў, што прымяняюцца для фарміравання сацыяльна-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў. Так, сучасныя кантрольна-вымяральныя матэрыялы ўключаюць не толькі тэксты сферы мастацтва, афіцыйна-дзелавых і бытавых зносін. Паўсядзённыя зносіны рэпрэзентуюць рознафарматныя тэксты: шыльды-назвы, рэжым працы магазінаў, кафэ, пошты, паліклінік, кінатэатраў, розных афіцыйных устаноў, паказальнікі геаграфічных назваў, імён, інфармацыйных крыніц, інфармацыйныя табло, таблічкі з назвамі вуліц, плошчаў, знакі, што дазваляюць/забараняюць пэўныя дзеяннні, пісьмовыя аб'явы, рэклама і іншыя.

Пад *тэкстамі новай прыроды* разумеюцца адзінкі, здольныя ўтвараць "групу тэкставых структур, адрозных ад традыцыйных… Пад тэкстам новай прыроды маецца на ўвазе думка, зафіксаваная на любым носьбіце, для перадачы якой выкарыстоўваецца паслядоўнасць разнародных сімвалаў, знакаў вербальнага і невербальнага паходжання".[212] "Новыя" тэксты ўяўляюць сабой сінтэз мультымедыйных і вербальных кампанентаў, актыўна выкарыстоўваюць інфаграфіку, дапоўненую рэальнасць і іншыя магчымасці камунікацыі. Падобныя тэксты разгортваюць карціну свету, адпаведную запытам новых субкультур. Зварот да тэкстаў новай прыроды ў адукацыйным асяроддзі выклікаў да бытавання мультытэксты, народжаныя асаблівасцямі сучаснай кагнітыўнай сферы. Шырокай распаўсюджанасці новых фарматаў тэкстаў спрыяюць наступныя фактары:

– актуалізацыя ролі Інтэрнэту ў кантэксце культурных запатрабаванняў;
– стандартызацыя і паскарэнне стандартаў зносін;
– шматпланавасць і шматзначнасць форм сучаснай камунікацыі;
– арыентацыя сучасных школьнікаў на прадукты экраннай культуры;
– спроба выйсці за межы традыцыйна-вербальнага канона прадстаўлення інфармацыі.

Развіццё тэкстаў новай прыроды – спроба адшукаць альтэрнатыву славеснаму навучанню. На думку вучоных, тэксты новай прыроды дэманструюць "замену ўлады тэксту на ўладу вобраза, што ўяўляе сабой адну з ліній эвалюцыйнага развіцця, абумоўленага будовай чалавечага мозга".[213]

---

[212] Казакова, Е.И. Тексты новой природы: закономерности и технологии развития современной грамотности в условиях качественной модернизации современного текста / Е.И. Казакова // На путях к новой школе. – 2014. – № 1. – С. 9.

[213] Быстрицкая, М.А. Интернет-жанры как сетевой инструментарий учителя-словесника / М.А. Быстрицкая // Тексты новой природы в образовательном пространстве современной школы:

У раздзеле разгледзім новы фармат тэкстаў – *фотаздымак, рэклама, аўтограф,* – іх статус і ролю ў фарміраванні функцыянальнай пісьменнасці вучняў.

3.1 Фотаздымак як тэкст у сучаснай культурнай прасторы

Жанр фотаздымка, які доўгі час быў прадметам увагі прафесіяналаў-фатографаў, перажывае своеасаблівы "рэнесанс" у плане цікавасці прадстаўнікоў розных галін навукі. Так, псіхолагі даследуюць механізмы ўспрымання партрэтнай фатаграфіі, якая выступае своеасаблівым каналам невербальнай інфармацыі. "Расчытаная" на фатаграфіях інфармацыя суадносіцца з асобаснымі характарыстыкамі і эмацыянальным станам чалавека, перададзеным на здымку. Распазнаванне эмоцый па міміцы, рэканструкцыя пачуццяў, класіфікацыя базавых экспрэсій становяцца прадметам увагі сучасных вучоных (Т.Ф. Базылевіч, У.А. Барабаншчыкаў, А.У. Жагала, І.М. Майніна і інш.).

У працах філосафаў (Р. Барт, С. Зонтаг, Э. Кранк, А. Пятроўская, В. Саўчук, В. Сцігнееў, У. Эко і інш.) фотаздымак аналізуецца як мадэль аб'ектыўнага свету, сканструяванага сродкамі фатаграфічнага кода ў часе і прасторы. На думку Р. Барта, фатаграфія – культурны знак, "нішто іншае, як след, пакінуты рытуалам сацыяльнай інтэграцыі". [214] Паводле меркавання С. Зонтаг, "калекцыянаваць фотаздымкі – значыць калекцыянаваць свет. Сфатаграфаваць – значыць прысвоіць тое, што сфатаграфавана, уключыць сябе ў такія адносіны з сусветам, якія ўспрымаюцца як веданне, а значыць, як сіла… Фатаграфічны вобраз – не столькі выказванне пра свет, колькі яго частка, мініяцюра рэальнасці". [215] У працах філосафаў фотаздымак вылучаецца як культурны феномен, унікальны сродак адлюстравання свету і чалавека, які стварае своеасаблівую "ідэалогію" працэсу фатаграфавання. Філасофскія ідэі "следу рэчаіснасці" ўзыходзяць да праблемы бытавання фотаздымка ў культуры. Пры гэтым тэорыя "спыненага імгнення" на фотаздымку мае разнастайны культурны характар: ад "смерці" імгнення да апафеозу "бяссмерця" ў плане супрацьстаяння часу.[216]

Інтарэсы юрыстаў, крыміналістаў пралягаюць у больш рэальнай сферы – роля фотаздымкаў у працэсе крыміналістычнай экспертызы, устанаўленне дакументаў на прадмет сапраўднасці, аўтэнтычнасці. Вынікі даследаванняў праецыруюцца на ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы, што рэгулюе выкарыстанне фотадакументаў у крымінальна-працэсуальным судаводстве пры расследаванні злачынстваў, прымяняюцца ў юрыдычнай практыцы,

---

материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф. «Педагогика текста», Санкт-Петербург, 21 октября 2016 г. / под ред. Т.Г. Галактионовой, Е.И. Казаковой. – СПб.: ЛЕМА, 2016. – С. 36.

[214] Барт, Р. Camera lucida. Комментарий к фотографии / Р. Барт. – М.: Ад Маргинем Пресс, 2013. – С. 16.

[215] Зонтаг, С. О фотографии / С. Зонтаг. – М.: Ад Маргинем Пресс, 2015. – С. 12–13.

[216] Барт, Р. Избранные работы: перевод с франц. / Р.Барт. – М.: Прогресс, 1999. – С.114.

у вучэбным працэсе для падрыхтоўкі экспертаў-крыміналістаў (І.А. Сафонаў, І.У. Трашчанкоў, Р.Р. Шарыпаў і інш.).

У галіне гістарычных навук фатаграфія разглядаецца як крыніца вывучэння культуры паўсядзённасці, спіс крыніц пры гэтым папаўняецца за кошт фотадакументаў. Увядзенне фотадакументаў у навуковы зварот адбылося дзякуючы "візуальнаму павароту" ў гістарычнай навуцы, што звязана з фарміраваннем уяўленняў пра візуальнасць сучаснай гуманітарыстыкі (Р.А. Абілава, А.М. Ларына, Л.М. Мазур, В.М. Магідаў, Н.М. Сосна і інш.).

У вывучэнні фотаздымкаў у сучаснай гістарычнай навуцы адбыўся "мемарыяльны паварот". Фотаздымак, выконваючы разнастайныя функцыі, з'яўляецца дакументальным сведчаннем, кампанентам гістарычнага кантэксту, культуры, цывілізацыі, жыццядзейнасці асобы. Фатаграфіі, суправаджаючы прыватнае жыццё чалавека, яго біяграфічныя "контрапункты", праз пэўны час выходзяць з індывідуальнай сферы бытавання і становяцца прадстаўніком свайго часу, мастацкім вобразам, люструючы "момант ісціны", гістарычную праўду эпохі. Найбольш цікавымі даследаваннямі фатаграфіі ў беларускай культуры з'яўляюцца працы С.У. Грунтова, у якіх фотаздымкі сталі аб'ектам навуковай увагі. Работы вучонага дэманструюць фатаграфію як складаную і шматмерны з'яву, якая можа паўнацэнна вывучацца толькі ў кантэксце бытавання, камунікацыі.

Даследаванне фотаздымкаў у сялянскай народнай культуры інтэр'ераў дало магчымасць С.У. Грунтову вылучыць "інтэрпрэтацыйныя перспектывы, якія дазваляюць зразумець выявы ў кантэксце культуры памяці беларуса: збіранне вялікай сям'і, стварэнне эфекту прысутнасці акцэнтуюць галоўны фокус камунікацыі, рэпрэзентуюць, падтрымліваюць і візуалізуюць прастору памяці, дзе на роўных суіснуюць людзі і падзеі розных часоў".[217]

Значныя набыткі ў вывучэнні фотаздымкаў маюць сацыёлагі, культуролагі, журналісты, гісторыкі моды. У беларускамоўнай прасторы даследаванняў вылучаюцца грунтоўнасцю працы В.А. Лабачэўскай, Н.І. Саўчанкі, А.М. Вялічкі і інш. Так, дзейнасць Аляксандра Міхайлавіча Вялічкі вяртае з небыцця шматлікія імёны майстроў фатаграфічнай справы на працягу 1850–1918 гадоў. Напрыклад, толькі пералік прозвішчаў у выданні "Фатографы зямлі беларускай" займае пятнаццаць старонак. На фоне страты фатаграфіі як культурнай з'явы абвастраецца цікавасць да выявы як сведкі гістарычнага мінулага. У кантэксце сэлфі, якія запаўняюць сучасны Інтэрнэт, узрастае цяга да "старой" фатаграфіі, якая становіцца гістарычным шэдэўрам "светапіснага класічнага мастацтва і антыкварным прадметам калекцыянавання".[218]

Цікава, што ў рэчышчы ўвагі да фатаграфічнай культуры беларусаў асобныя падручнікі змяшчаюць (хай сабе і адзінкавыя) творчыя заданні з выкарыстаннем сямейнага альбома. Так, складальнікі вучэбнага дапаможніка

[217] Грунтоў, С. Партрэты блізкіх. Фотаздымкі ў беларускіх вясковых інтэр'ерах / С. Грунтоў // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні: зборнік навуковых прац. – Вып. 9. – Мінск: Беларуская навука, 2022. – С. 52–78.

[218] Величко, А.М. Фотографы земли белорусской. 1850–1918 / А.М. Величко. – Минск: З.Колас, 2018. – 352 с.

для 11 класа па “Гісторыі Беларусі” прыводзяць такое заданне: “Для ўрока па тэме “Наш край” зрабіце падборку фотаздымкаў і іншых магчымых матэрыялаў, якія раскрываюць працоўную дзейнасць членаў вашай сям’і, сваякоў на працягу XX стагоддзя. Складзіце да іх адпаведныя каментарыі. На аснове сабраных матэрыялаў зрабіце вывад пра ўнёсак вашай сям’і ў сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны”.[219]

Як вядома, асноўную частку інфармацыі пра сучасны сусвет чалавек атрымлівае праз зрок, таму візуальнае ўспрыманне рэчаіснасці адыгрывае вялікую ролю пры асэнсаванні наглядных вобразаў. На сённяшні дзень некаторыя вучоныя прапануюць наогул разглядаць візуальнасць (як і віртуальнасць) стрыжнем сучаснай культуры (Н. Крывашэін, С. Няхаеў, Я. Яскевіч і інш.). На думку даследчыкаў, візуальны вобраз больш выйгрышны, чым слова, паколькі ён інфармацыйна насычаны. Апроч гэтага, вобраз з’яўляецца эфектыўным інструментам уздзеяння. Лічыцца, што візуальныя вобразы эмацыянальна адлюстроўваюць рэчаіснасць. Візуальны вобраз пераважае над вербальным і па той прычыне, што для яго не існуе моўных бар’ераў, уласцівых маўленню. Тэхналогіі XXI стагоддзя, заснаваныя на візуальных формах перадачы ведаў, ствараюць інфармацыйную прастору, у якой вобразна-візуальнае мысленне прэтэндуе на прыярытэтную ролю ў кантэксце сучаснай культуры (С.В. Іванова, А.А. Рэан, С.Ю. Сцяпанаў і інш.) .

Як вядома, слова *фатаграфія* найперш азначае вынік прымянення тэхналогіі, што адлюстроўвае рэальнасць. Фотаздымак выступае візуальным сродкам, здольным перадаваць паведамленне, удзельнічаць у камунікацыі (як і малюнак, дыяграма, відэаролік). На семантычным узроўні фотаздымак суадносіцца са словам апасродкавана. Як сцвярджаюць даследчыкі, у працэсе фатаграфавання, як і ў тэксце, адбываецца “дваістае дэкадзіраванне інфармацыі. Канцэпт адлюстравання накладаецца на прагназаваны канцэпт вербальнага”.[220]

Доўгі час фатаграфія заставалася па-за ўвагай лінгвістаў. Прычыну гэтаму Эко Умберта тлумачыць так: “Фотаздымак знаходзіцца ў межах семіётыкі, аднак па-за сферай лінгвістыкі, паколькі выява на фатаграфіі ўспрымаецца як цэласнасць, а не як паслядоўнасць дыскрэтных элементаў”. [221] Фотаздымак выступае камунікатыўным феноменам, бо змест адлюстраванага фармулюецца словамі, а значыць фотаздымак (падпісаны або непадпісаны) становіцца патэнцыяльным выказваннем. Безумоўна, фотаздымак не ёсць гатовае разгорнутае паведамленне, ён служыць асновай для яго, агучваецца ў працэсе дэманстрацыі, паказу. Малакамунікатыўная фатаграфія – гэта найперш партрэты (напрыклад, фотаздымак на дакуменце), якія прапануюць гледачу

[219] Гісторыя Беларусі. XIX–пач. XXI ст.: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А.В. Касовіч [і інш.].; пад рэд. А.В. Касовіча, А.П. Салаўянава. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2021. – С. 99.

[220] Тельминов, Г.Н. Интернет-реклама как вид креолизованного текста / Г.Н. Тельминов // Вестник Нижнегородского ун-та им. Н.И. Лобачевского. Филология. Искусствоведение. – 2019. – № 5. – С. 303.

[221] Эко, У. Отсутствующая структура. Введение в семиологию / У. Эко. – СПб.: Петрополис, 1998. – С. 241.

адназначнасць прачытання, паколькі дадатковы сэнсавы фон адсутнічае. На думку В.Ю. Байцовай, на фотаздымку “мадэль” прымае стандартны, нейтральны выгляд твару. У такім выпадку вусны каментарый да фотапартрэта зводзіцца да ўласна каментарыяў, уся інфармацыя засяроджваецца на адным плане, без дадатковых акцэнтаў.”[222]

Больш інфарматыўныя фотаздымкі, якія люструюць пераход ад адной сацыяльнай ролі да другой. Фатаграфіі сацыяльнага сталення фіксуюць самыя важныя біяграфічныя моманты жыцця: дзіця вучыцца хадзіць, становіцца першакласнікам, заканчвае школу, паступае ва ўніверсітэт, выходзіць замуж і г.д. Пераход на новую ступеньку сацыялізацыі суправаджаецца абавязковым фатаграфаваннем. І.А. Разумава сцвярджае: фатаграфаванне – неад’емная частка рытуалаў: “першага званка, выпускнога вечара, свята паўналецця і г.д.”.[223] Падобныя фотаздымкі з’яўляюцца пацвярджэннем новага сацыяльнага статусу. Абавязковы атрыбут сямейных альбомаў – “турысцкія” фатаграфіі на фоне знакамітых аб’ектаў як праяўленне сацыяльных стэрэатыпаў.

Такім чынам, фотаздымак уяўляе сабой не гатовае паведамленне, а толькі аснову для яго, што патрабуе славеснага суправаджэння. Вербальны каментарый да фотаздымкаў дапаўняе камунікацыю, робіць яе лагічнай у пэўнай сітуацыі. Пры гэтым у апавяданнях па фатаграфіі могуць “характарызавацца людзі, умовы іх жыцця, пераказвацца падзеі, што папярэднічалі здымку, або звязаны з ім толькі ўскосна. Фота становіцца нагодай для разважанняў, ацэнак, інтэрпрэтацый, успамінаў”.[224] Пры гэтым, на думку А.В. Падучавай, “паказ фатаграфій замяняе паўнацэнную маўленчую сітуацыю. Той, хто гаворыць, і хто слухае, “паралеляць” у кантэксце паведамлення, момант агучвання выказвання супадае з фактам яго ўспрымання; субяседнікі маюць агульнае камунікатыўнае поле”.[225]

Вучоныя падкрэсліваюць шматфункцыянальнасць фотаздымкаў. Яны могуць перадаваць розны статус выявы: фотаздымак як памяць, фотаздымак як форма мастацтва, фотаздымак як успамін, эмоцыі, спосаб самавыяўлення, фотаздымак як хобі. Невыпадкова даследчыкі прызнаюць сацыялізацыю асобы асноўнай тэмай аматарскай фатаграфіі. Знакаміты сацыёлаг XX стагоддзя П. Бурдзье свой навуковы інтарэс скіраваў на аналіз фатаграфіі і сфармуляваў яе тры ключавыя характарыстыкі:

- фотаздымак – сацыяльны факт;
- фотаздымак – форма прадстаўлення групавой ідэнтычнасці;

[222] Бойцова, О.Ю. Подписи под фотографиями в альбомах / О.Ю. Бойцова // Визуальные аспекты культуры: сборник научных статей. – Ижевск: Удмуртский гос. ун-т, 2007. – С. 108–119.

[223] Разумова, И.А. Потаенное знание современной русской семьи / И.А. Разумова. – М.: Индрик, 2001. – С. 78.

[224] Разумова, И.А. Потаенное знание современной русской семьи / И.А. Разумова. – М.: Индрик, 2001. – С. 181.

[225] Падучева, Е.В. Семантические исследования / Е.В. Падучева. – М.: Языки русской культуры, 1996. – С. 261.

– фотаздымак – маркер, які выяўляе межы паміж рознымі сацыяльнымі групамі і дазваляе бачыць сацыяльную стратыфікацыю.[226]

У плынным, хуткабежным часе змяняецца і роля фотаздымкаў. Па сведчанні С.У. Грунтова, “фотаздымкі не так даўно былі часткай матэрыяльнага свету кожнай сям’і, дапамагалі захаваць памяць пра вялікую сям’ю, пра сумеснасць пражывання ў адным доме; пра святы і ўрачыстасці, якія раз за разам аб’ядноўвалі блізкіх, давалі ім нагоду сабрацца разам, каб абмеркаваць навіны, узнавіць падзеі мінулага, наноў паўтараючы і пераказваючы іх”.[227]

Вялікая заслуга ў развіцці фатаграфіі тых, хто прафесійна ўспрымае фотаздымак як факт мастацтва. Так, дзякуючы намаганням прафесіяналаў у айчынную фатаграфіку вярнулася спадчына беларускага этнографа Ісаака Абрамавіча Сербава (1871–1943), якая захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта і складаецца з 442 арыгінальных фотаздымкаў з подпісамі аўтара. На думку навукоўцаў, “цяжка пераацаніць зробленыя І. Сербавым фотаздымкі. Гэта тытанічная праца, якую можна без перабольшання назваць навуковым і грамадзянскім подзвігам… Усе фотаздымкі – найкаштоўны і найцікавы іканаграфічны матэрыял аб жыцці і побыце беларускіх сялян у першым дзесяцігоддзі XX стагоддзя”.[228]

Выявы беларускай мінуўшчыны, якія І. Сербаў здолеў увасобіць на фотаздымках у пачатку XX стагоддзя, вярнуліся на Радзіму больш чым праз сто гадоў як найкаштоўнейшыя візуальныя дакументы. Як падкрэслівае Вольга Лабачэўская, “гісторыя этнаграфічнай фатаграфіі Беларусі, у тым ліку Палесся, чакае свайго грунтоўнага даследавання. Безумоўна, імя Ісаака Абрамавіча Сербава будзе запісана ў шэраг яе пачынальнікаў… Выданне альбома фотаздымкаў Віленскай калекцыі – даніна светлай памяці І.А. Сербава, яго патрыятызму і прафесіяналізму як навукоўца і фатографа”.[229]

Узнаўляе гісторыю беларускай фатаграфіі грунтоўнае выданне Надзеі Іванаўны Саўчанкі, якое прадстаўляе творчую спадчыну знакамітага фатографа Савы Уладзіміравіча Сіўко (1888–1978). Н.І. Саўчанка адшукала ўцалелы архіў фотанегатываў, які захоўваецца сёння ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Альбом-каталог з’яўляецца скарбніцай візуальнай інфармацыі пра паўсядзённае жыццё беларусаў-“заходнікаў” у складаную эпоху перамен – 20–60-ыя гады XX стагоддзя.[230] Сава Уладзіміравіч Сіўко з 1930 па 1960 год працаваў фатографам, з любоўю здымаў жыхароў мястэчка Любча і вёсак на Навагрудчыне.

---

[226] Бурдье, П. Социология социального пространства/ П. Бурдье; перевод с франц. Н.А. Шматко. – СПб.: Алетея, 2015. – 288 с.

[227] Грунтоў, С.У. Фатаграфія і культура памяці ў беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя: манаграфія / С.У. Грунтоў. – Мінск: Беларуская навука, 2023. – 189 с.

[228] Цішчанка, І.К. З творчай спадчыны І.А. Сербава / І.К. Цішчанка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1974. – № 1. – С. 47–51.

[229] Беларусы ў фотаздымках Ісаака Сербава. 1911–1912 / склад., аўтар уступ. артыкула В.А. Лабачэўская; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2012. – С. 37.

[230] Саўчанка, Н. Сава Сіўко (1888–1978 гг.). Фатограф Любчанскага краю / Н. Саўчанка. – Мінск: Альтиора Форте, 2019. – 312 с.

Як зазначае аўтарка выдання, “фатаграфічная спадчына Савы Сіўко – перш за ўсё збор каштоўных візуальных фактаў, якія праз адлюстраванне асноўных этапаў чалавечага жыцця даюць магчымасць прасачыць змену цэлых эпох. На яго фотаздымках прадстаўлены ўсе характэрныя моманты паўсядзённага жыцця беларускага мястэчка, унікальнай і цікавай з’явы нашага мінулага, якое арганічна злучае рысы вясковага і гарадскога жыцця”. [231] Істотна, што па сабраных матэрыялах праводзіліся выставы, якія адбыліся ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, прымеркаваныя да 130-годдзя з дня нараджэння фатографа “Сава Сіўко. Фатограф Любчанскага краю (07.12.2018–03.02.2019). Куратар праекта Надзея Саўчанка і “Любчанскі край. Людзі і час” (14.01.2019–03.02.2019), куратар праекта Альберт Цэхановіч.

Культурнай падзеяй у кантэксце ўвагі да фотаздымкаў трэба лічыць праект VEHA, які зафіксаваў калекцыі здымкаў у выглядзе фотаальбомаў. Адзін з іх – “Найлепшы бок” – прадставіў архіўныя фотаздымкі жыхароў з розных куткоў Беларусі, якія сукупна ствараюць візуальны вобраз людзей і рэчаў пасляваеннай беларускай вёскі.[232]

Сучасныя лічбавыя камеры, безумоўна, даюць магчымасць задакументаваць штодзённае жыццё. Больш таго, зрабіць яго публічным, адсочваць колькасць лайкаў як рэакцыю на “спыненыя імгненні”. У гэтым кантэксце яшчэ больш пачынае цаніцца той узровень фатаграфічнай культуры, што даносяць “старыя” здымкі, пазначаныя часам, які ажывае дзякуючы фатографу. Фотаздымкі ўзнаўляюць сямейныя гісторыі, разгортваюць мінулае ў каардынатах памяці, паколькі яны першасна адлюстравалі свет як рэальны аб’ект, зафіксавалі гісторыю – сям’і, роду, калектыву.

Варта зазначыць, што так званую аматарскую (любіцельскую) фатаграфію вучоныя трактуюць як культурны знак, гістарычную крыніцу, якая захоўвае памяць пра мінулае сям’і, пра тых, хто дачыніўся да яе традыцый. Асаблівую ролю маюць подпісы да фотаздымкаў, што дазваляе параўнаць некалькі тэкстаў: візуальны і вербальны, супаставіць усіх суб’ектаў працэсу фатаграфавання (аб’ект здымкаў, аўтар подпісаў, сам майстра). Паводле прызнання даследчыкаў, гэтыя фотаздымкі рэпрэзентуюць калектыўны вобраз сям’і – чысты, светлы, узнёслы, для якой вяселле, дзеці, жыццё падпарадкаваны адной мэце – стварыць трывалую “ячэйку дзяржавы”, быць адданымі адзін аднаму, захаваць сямейныя сувязі на ўсё жыццё. Нездарма Я. Панакова сцвярджае: “На фоне калектыўнага вобраза кожная фатаграфія – унікальная, паколькі не існуе агульнай фатаграфічнай мовы, няма ўніверсальнага значэння фатаграфічных фактаў, адзінай методыкі выяўлення свету… Кожная фатаграфія валодае мноствам кодаў, праз якія яна можа “загаварыць”. Кожная фатаграфія валодае мностваў кодаў, тыпы якіх вар’іруюцца ад аднаго здымка да другога”.[233]

---

[231] Саўчанка, Н. Сава Сіўко (1888-1978 гг.). Фатограф Любчанскага краю / Н. Саўчанка. – Мінск: Альтиора Форте, 2019. – С. 15.

[232] Найлепшы бок: фотаальбом. – Мінск: Альтиора Форте, 2018. – 152 с.

[233] Панакова, Я. Визуальные методы / Я. Панакова // Журнал социологии и социальной антропологии. – 2017. – Том X. – № 4. – С. 168.

Калекцыя VEHA “Найлепшы бок” дэманструе прыклад вывучэння і захавання вобраза пакалення нашых дзядоў і прадзедаў. На думку складальнікаў гэтага прыгожага выдання, менавіта “беражлівае і паважлівае стаўленне да кожнага старога здымка падаўжае жыццё не толькі сямейных фотаархіваў, але і выхоўвае ў нас павагу да культуры памяці”.[234]

Нельга не адзначыць ролю ў захаванні фатаграфічнай культуры беларусаў такіх выданняў, як “Дзявочы вечар” (Мінск, 2021), што распавядае пра вясельны абрад, і “Апошні фотаздымак”, прысвечаны жалобным дням развітання з родным чалавекам. Фотаальбомы змяшчаюць багаты ілюстраваны матэрыял двух рытуалаў – вясёлага і сумнага ў жыцці чалавека. Рэалізацыя праекта “суправаджалася выставамі і медыйнай кампаніяй, дапамагла звярнуць увагу людзей на каштоўнасць вернакулярнай фатаграфіі як ілюстрацыі паўсядзённага жыцця, неабходнасць яе збірання і захавання – не толькі на ўзроўні даследчыкаў і інстытуцый, але і кожнай беларускай сям’ёй”. [235] Падобныя выданні могуць паслужыць крыніцай для кожнага, каму цікавая беларуская фатаграфія як сведка нашай гісторыі і агульнай памяці.ч

Безумоўна, фатаграфія не застаецца нязменнай на працягу стагоддзяў. Першапачаткова яна ўзнікла як факт мастацкага бачання жыцця, даступнага не кожнаму. Што да сучаснага этапу развіцця фатаграфічнага майстэрства, то ў ім, на думку спецыялістаў (В. Ю. Байцова, С.У. Грунтоў, В.А. Лабачэўская і інш.), аб’ядноўваюцца дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі. Адна з іх скіравана на фотаздымак як тэкст культуры, што выяўляе нацыянальны культурны код (найперш праз “старыя” фатаграфіі). Другая тэндэнцыя адлюстроўвае тэмпы і рытмы асваення паўсядзённага жыцця. Даследчыкі падкрэсліваюць: “Сучасная “масавая віртуалізацыя” пакідае адбітак і на фотаздымках сённяшняга дня”[236].

Адзначым: новая форма сучаснай візуальнасці – сэлфі – не з’яўляецца мастацкім партрэтам або фотаздымкам-шэдэўрам. Гэта імгненна створаная карцінка, імгненны “зрэз жыцця”. Можна з лёгкасцю адмахнуцца ад яе, назваўшы гэта модным захапленнем сучаснай моладзі. Аднак, на думку аўтарытэтных вучоных, “культура ёсць тэкст з многімі пластамі значэнняў”[237], што азначае: сэлфі патрабуе свайго прачытання, разумення, а не строгіх дэфініцый, іерархіі, класіфікацый і ацэнак у культуры кіч. Паводле пазіцыі даследчыкаў, сэлфі як кампанент масавай культуры, форма візуальнай самапрэзентацыі – абсалютна новы напрамак у фатаграфіі, гэта своеасаблівы спосаб самавыяўлення (О. Гант, Р. Данілаў, В.М. Ярская-Смірнова і інш.). Гэта частка сучаснага мыслення моладзі, праяўленне візуальнасці, выражэнне свайго “Я”. Зразумела, гэта не ёсць культура ў высокім сэнсе слова, аднак, улічваючы

[234] Найлепшы бок: фотаальбом. – Мінск: Альтиора Форте, 2018. – С. 7.

[235] Грунтоў, С.У. Фатаграфія і культура памяці ў беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя: манаграфія / С.У. Грунтоў. – Мінск: Беларуская навука, 2023. – С. 11.

[236] Бойцова, О.Ю. Подписи под фотографиями в альбомах / О.Ю. Бойцова // Визуальные аспекты культуры: сборник научных статей. – Ижевск: Удмуртский гос. ун-т, 2007. – С. 108-119.

[237] Ярская, В. Инверсия времени как механизм памяти в контексте культуры / В. Ярская // Власть времени: социальные границы памяти /под ред. В.Н. Ярской и Е.Р. Ярской-Смирновой. – М.: Вариант, 2011. – С. 11 – 24.

масавы характар з’явы, яе нельга ігнараваць, трэба лічыцца з ёй як індыкатарам сучаснага жыцця. На фоне імкнення аўтараў сэлфі самавыяўляцца, самасцвярджацца за кошт статусных атрыбутаў, модных аксесуараў – варта прызнаць, што сучаснай моладзі (пэўнай яе частцы) не хапае кантэксту рэалізацыі, асэнсаванасці свайго прызначэння, уласнай чалавечай місіі.

Татальнае захапленне сэлфі – магчыма, гэта калектыўны адказ настаўнікам, бацькам, якім у пэўны момант дзяцінства ўласных і чужых дзяцей не хапіла часу на іх. Дзеці, застаючыся сам-насам з камп’ютарам, планшэтам, тэлефонам, засвоілі: давяраць сабе – гэта самы правільны шлях, бо яны і так доўга былі паслухмяныя, кіраваліся ацэнкамі асяроддзя. Можа, здаровая, хай сабе і перабольшаная самаацэнка, смелае самапазіцыянаванне – гэта шчырая вера ў сваю паспяховасць, станоўчасць, пошукі грамадскага прызнання?

Мабыць, масавасць сэлфі як кампанента жыцця падлеткаў азначае: яны такія як ёсць, гэта іх узровень мыслення, незалежнасць ад чужых каментарыяў, негатыўных ацэнак. Як сцвярджаюць даследчыкі, гэтая з’ява “часта выклікаецца незадавальненнем сучаснасці, часам прыхарошанай, але заўсёды індывідуалізаванай праз адлюстраванне падзей” .[238]

Можна не прызнаваць за сэлфі праяўленне культуры паўсядзённасці, аднак адмаўляць прысутнасць гэтай з’явы ў моладзевым асяроддзі не выпадае. Немагчыма праігнараваць, закрэсліць гэтую з’яву, апрыёры наклеіць на яе ярлык няправільнасці. Кожны мае права на сваю пазіцыю, нават калі яе не падзяляюць/не хочуць падзяляць іншыя.

3.2 Сістэма заданняў на аснове фотаздымкаў

Прапанаваны вышэй матэрыял паслужыць тэарэтычнай базай для сістэмы заданняў, арыентаваных на асэнсаванне фотаздымкаў як тыпу тэксту.

1. Пазнаёмцеся з навукова-папулярным выданнем Аляксандра Міхайлавіча Вялічкі “Фатографы зямлі беларускай” (1850–1918 гады. Мінск, 2018). Знайдзіце з дапамогай алфавітных паказальнікаў прозвішчы і працы майстроў, якія займаліся фатаграфічным мастацтвам у вашым рэгіёне (адшукаць матэрыялы пра мясцовых фатографаў можна і ў краязнаўчых музеях, што знаходзяцца на тэрыторыі вашага раёна/горада). Угледзьцеся ў партрэты, створаныя больш за 200 гадоў таму. Ці пагаджаецеся вы, што аўтараў здымкаў таго часу можна назваць не толькі прафесійнымі рамеснікамі, але і майстрамі, рамантыкамі ад фатаграфіі. Пагадзіцеся/абвергніце гэтую думку, аргументуйце ўласную пазіцыю. Раскажыце/апішыце, якія асацыяцыі выклікае ў вас словазлучэнне *старая фатаграфія.*

2. Пазнаёмцеся з выданнем “Беларусы ў фотаздымках” Ісаака Сербава. 1911–1912 / складальнік, аўтар уступнага артыкула Вольга Лабачэўская (Мінск,

[238] Ярская, В. Инверсия времени как механизм памяти в контексте культуры / В. Ярская // Власть времени: социальные границы памяти/под ред. В.Н. Ярской и Е.Р. Ярской-Смирновой. – М.: Вариант, 2011. – С. 11–24.

2012).[239] Ацаніце культурную каштоўнасць кнігі ў кантэксце прадмовы да яе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



Шаноўныя сябры!

Імклівы час змяніў аблічча беларускіх гарадоў і вёсак, уклад жыцця іх жыхароў, таму фатаграфічная спадчына, якая змешчана ў гэтай кнізе, з'яўляецца сёння надзвычай каштоўнай. Праз яе мы маем магчымасць пазнаёміцца з асаблівасцямі побыту, адзення, народнага дойлідства і прылад працы беларусаў пачатку мінулага стагоддзя.

Гартаючы старонку за старонкай, міжволі нагадваеш, якія істотныя выпрабаванні вызначыў лёс нашым дзядам і прадзедам.

Угледзімся ў твары на фотаздымках – такія знаёмыя, блізкія, родныя, і ў той жа час такія далёкія. Цягавітыя мужчыны, сціплыя прыгожыя жанчыны і, канешне, дзеці, якіх у кожнай сям'і было шмат. Гэтыя людзі выклікаюць павагу сваёй працавітасцю, памяркоўнасцю, гасціннасцю і шчодрасцю – рысамі, што заўсёды былі ўласцівы беларусам.

Ні адзін народ, ні адна краіна не могуць існаваць без жывой сувязі пакаленняў. І нашым сучаснікам надзвычай важна ўсвядоміць уласныя карані, каб рухацца наперад і несці ў свет вечныя ідэалы сардэчнасці, шчырасці і спагады.

Ведаць і памятаць гісторыю сваёй Радзімы, шанаваць сваіх продкаў і спадчыну, якую яны нам пакінулі, – гэта значыць быць духоўным чалавекам у самым высокім сэнсе, гэта значыць быць *беларусам!*

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка

[239] Беларусы ў фотаздымках [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://history-belarus.com/pages/download/blr_types.php. - Дата доступу: 27.08.2023.

Dear friends!

Rapid flow of time has changed the appearance of Belarusian cities and villages as well as their inhabitants' way of life. That is why the photographic heritage that you can find in this book is of extremely high value today. It gives us a possibility to experience peculiarities of mode of life, clothing, architecture and implements of the Belarusians of the past century.

Leafing through the pages of the book, you inadvertently recall what kind of severe ordeals our ancestors had to endure.

Let us have a closer look at the faces on the photos – so familiar, so dear, so near but at the same time so remote. Tough men, beautiful modest women and, of course, multiple children in every family. These people inspire respect with their workability, temperance, hospitality and generosity, traits that have always been typical for the Belarusian people.

No nation, no state can exist without a strong bond of generations. So it is extremely important for our contemporaries to learn their own roots in order to move ahead and carry forward the eternal ideals of cordiality, sincerity and sympathy.

To know and to remember the history of your Homeland, to hold dear your ancestors and their heritage means to be a spiritual man in the very high sense, means to be *a Belarusian*!

President
of the Republic of Belarus Alexander Lukashenko

3. Пагадзіцеся/абвергніце (у абодвух выпадках прывядзіце не менш за тры аргументы) ацэнку зробленага І. Сербавым, якая належыць даследчыцы Вользе Лабачэўскай: "Фотаздымкі і запісы Ісаака Сербава сведчаць, што ў тыя гады да фатаграфавання ён ставіўся як да вельмі важнай, бадай, галоўнай, састаўной часткі сваёй этнаграфічнай працы. Вучоны добра разумеў, што мае дачыненне да натуры, якая знікае. Фотаапарат дазваляў захаваць для нашчадкаў антрапалагічнае аблічча тутэйшых людзей, іх строі, асаблівасці вясковай забудовы, традыцыйныя сялянскія заняткі. У выніку самаахвярнай працы

даследчык здолеў стварыць ілюстраваную энцыклапедыю па этнаграфіі Беларусі і беларусаў”.[240]

4. Прачытайце выказванні сучаснага фатографа Дзіны Даніловіч, фіналіста шматлікіх міжнародных конкурсаў, уладальніцы намінацый, прэмій, куратара і ўдзельніка выставак, прысвечаных сучаснай беларускай фатаграфіі “Анатомія. Мужчынскае цела” (2015), “Non-fashion” (2016), “Ураўненне стану” (2020), “Анатомія. Ідэальнае цела” (2015), “Спорт – гэта высокае мастацтва” (2019), “Чарнобыль. Эфект заснуўшага” (2021). Ацаніце меркаванні фатографа ў кантэксце сучасных сэлфі.

...Як глядач можа супераджываць ці быць датычным, калі ён разумее, што сам мастак не супераджывае, не датычны? Што гэта чыстая фармальнасць. Для мяне вялікая праблема ў гэтай фармальнасці. Гэтыя прыёмы вабныя, ты так зняў – і ўжо сучасны мастак. Выглядаеш сучасна. Але гэта форма... Форма без зместу – бессэнсоўны шлях у невядомасць.

...Праблема не ў адсутнасці майстэрства. Трэба вучыць і вучыцца, трэба яшчэ і думаць, разважаць, крытычна ацэньваць сябе і іншых. Прачытаць чужы верш, вызубіць яго на памяць і скласці свой – гэта дзве вялікія розніцы.[241]

Прааналізуйце фотаматэрыялы праекта “Бачу Беларусь такой” (“Зачараваны Беларуссю” / фота У.С. Цыдзік, уклад. А.А. Стэльмах (Мінск, 2017); “Зачараваны Беларуссю” / фота У.С. Цыдзік, уклад. А.А. Стэльмах (Мінск, 2018); “Мая Радзіма” / фота Я.В. Пясецкі, У.С. Цыдзік, уклад. А.А. Стэльмах (Мінск, 2019). Заўважым: фотаальбом “Бачу Беларусь такой” адзначаны прэміяй на 57-м Нацыянальным конкурсе “Мастацтва кнігі” (2018).

Мэтай фотапраекта, прысвечанага ўмацаванню іміджу Беларусі, з’яўляецца арганізацыя фотавыстаў, выданне фотаальбомаў, правядзенне конкурсаў. На думку арганізатараў праекта, “важна, якой бачыцца, як успрымаецца сучасная Беларусь. Важна, каб паміж старэйшым пакаленнем і моладдзю, якой будаваць будучыню, была пераемнасць у гістарычнай памяці, жыццёвай мудрасці, традыцыях”.[242]

Як фотаматэрыялы зборніка фарміруюць імідж Беларусі ў свеце, прываблівaюць турыстаў (сваіх і замежных), дапамагаюць спазнаваць сапраўдную Беларусь, выклікаць пачуццё гонару за родную зямлю? Як гармонія двух відаў мастацтва – фатаграфічнага і паэтычнага – узмацняе псіхалагічнае ўспрыманне фатаграфій?

Арганізуйце ў межах школы фотавыставу “Бачу сваю школу/малую Радзіму такой”. Улічыце вопыт правядзення названых фотаконкурсаў,

---

[240] Беларусы ў фотаздымках Ісаака Сербава. 1911–1912 / склад., аўтар уступнага артыкула В.А. Лабачэўская; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуск. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2012. – С. 37.

[241] Даніловіч, Д. Паказаць гледачу іншы досвед / Д. Даніловіч // Мастацтва. – 2022. – №5. – С. 16.

[242] Цыдзік, У.С. Фотапраект “Бачу Беларусь такой” як складнік краязнаўчай работы / У.С. Цыдзік // Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой Радзімы: зборнік матэрыялаў: у 2 т. – Т. 1. /рэдкал.: А.М. Карлюковіч (старшыня) [і інш.], Мінск, 12-13 сакавіка 2020 г. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2020. – С. 332.

наладжаных Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі. Ацаніце якасць і арыгінальнасць лепшых фотаздымкаў.

«Радзіма – гэта шчодрыя рукі бабулі». Аўтар фота Кулініч Святлана.



«Дорога ў родную вёску». Аўтар фота Барсукоў Дзмітрый.

«Смак сырадою, смак дзяцінства». Аўтар фота Дрыга Зоя.

«Мая радзіма – Беларусь». Аўтар фота Шахловіч Вераніка.

Ці згодны вы з арганізатарамі конкурсу, што гэтыя фотаздымкі – “своеасаблівы напамін пра гарады, вуліцы, невялікія дворыкі, вёскі, пра тую малую Радзіму, той кавалачак зямлі, адкуль мы родам, з сукупнасці якіх і складаецца самабытнасць беларускага народа”?[243]

5. Выберыце з сямейнага альбома некалькі фотаздымкаў з подпісамі. Прааналізуйце гэтыя фатаграфіі як вербальны/невербальны цэласны тэкст. Прасачыце, як подпіс адпавядае характару ўспрымання, раскрывае яго гісторыю, канкрэтызуе ўзрост, прафесійную прыналежнасць героя здымка. Разгледзьце адзенне сфатаграфаваных людзей. Якія дэталі вопраткі, прадметы асяроддзя, абстаноўкі выяўляюць час здымка? Якія невербальныя знакі (упрыгожанні, дзіцячыя цацкі, прастора, на фоне якой пазіруюць, і г.д.) суправаджаюць фотаздымкі? Якую ролю яны выконваюць, якія дадатковыя сэнсавыя моманты дадаюць да агульнага кантэксту? Якія подпісы да фотаздымкаў дапамагаюць акцэнтаваць увагу, да якіх дэталяў у першую чаргу трэба прыгледзецца, каб скласці ўяўленне пра характар героя? Як подпіс да

[243] Радзіма: выяўленчы матэрыял. – Мінск: Прав-Прэс, 2019. – С. 1.

фотаздымка дапамагае глыбей зразумець эмоцыі, унутранае жаданне асобы на фотаздымку?

Прааналізуйце подпісы да фотаздымкаў. Што яны выяўляюць: час, сезон года, месца, дзе была зроблена фатаграфія, індывідуальныя рысы асобы, яе ўзрост, геаграфічныя і культурна значымыя аб'екты на здымку, імёны, прозвішчы, сямейныя "псеўданімы", сваяцкія/таварыскія сувязі. Ці ўласцівы подпісам *на памяць (доўгую/цёплую/вечную памяць)* элементы, што адлюстроўваюць эмоцыі аўтара тэксту, яго ўражанні, выпадак, з якім звязаны гісторыі, што адбываліся ў пэўны жыццёвы перыяд (школа, студэнцтва, служба ў арміі, вяселле і іншыя памятныя падзеі)?

Як вы думаеце, чаму існуе мноства варыянтаў "прачытання" той або іншай фатаграфіі?

6. "*Замяніць сэлфі*". Папрасіце чалавека, якога вы любіце, каму давяраеце, хто ведае вас даўно, пабыць вашым добрым люстэркам і напісаць вам (не сказаць, а зафіксаваць на прыгожай паштоўцы – можна такое пасланне адаслаць з камп'ютара, каб быў час падумаць, асэнсаваць), што яго ў вас захапляе. У чым, на яго погляд, заключаецца ваша індывідуальнасць, прызначэнне, ваша духоўная сіла, ваш дар?

Потым абавязкова самі падпішыце такую паштоўку для лепшых сяброў. Галоўнае, каб гэта былі словы падтрымкі і любові.

Сэнс задання: адчуць сабе чалавекам, якога любяць, паважаюць, падтрымліваюць. Зразумець, што ў вашых сябрах-люстэрках адбіваецца ваша сапраўднае "Я" – чалавека, вартага павагі і любові.

7. Разгледзьце фотаздымкі І.А. Сербава, раскажыце, якім паўстае беларус як прадстаўнік розных саслоўяў – сялянства, шляхты, мяшчан, інтэлігенцыі (асаблівасці выгляду, адзенне, галаўныя ўборы, выраз твару). Як раскрываюцца мастацкія здольнасці І.А. Сербава ў кампаноўцы фігур у прасторы фотаздымкаў? Апішыце фотаздымак маладых жанчын з сям'і Герменчукоў (вёска Дражын, 1911 год), з маленькімі дзецьмі на руках і двума хлопчыкамі побач са сваімі маці. Адкажыце, з улікам якіх крытэрыяў спецыялісты сцвярджаюць, што "кампазіцыя і рытмічная арганізацыя гэтага здымка па-мастацку бездакорная" (В. Лабачэўская)?

8. Пазнаёмцеся з альбомам Надзеі Саўчанкі "Сава Сіўко. Фатограф Любчанскага краю" (Мінск, 2019). Раскажыце, як праз адлюстраванне асноўных этапаў чалавечага жыцця, праз твары і вобразы людзей, якія жылі ў далёкія часы, майстру ўдалося зафіксаваць змену эпох, свой час. Як вы думаеце, чаму "героі" фатаграфій прадстаўлены або на фоне спецыяльнага экрана, або сярод жывой прыроды, з жывёламі, часта – з кветкамі?

9. Разважайце, чаму аўтар выдання "Сава Сіўко. Фатограф Любчанскага краю" спарадкавала фотаздымкі альбома-каталога па наступных раздзелах: "Нёман", "Сям'я", "Вяселле", "Дзяцінства", "Школа", "Паўсядзённае жыццё", "Царква", "Партрэт", "Ваенны час", "Партрэт на дакументы", "Пахаванне". Фотаздымкі з якога раздзела вам падаюцца асабліва кранальнымі, шчымлівымі? Чаму? Вызначце топ-10 фотаздымкаў таленавітага майстра. Прыдумайце подпісы да іх. З якім часам (прыкладна) суадносяцца, на вашу

думку, выбраныя фотаздымкі. Праверце свае здагадкі па каталогу, змешчаным у канцы кнігі.

10. Знайдзіце на www.youtub.com кароткаметражную відэаінсталяцыю “Сава Сіўко. Фатограф Любчанскага краю” [244] (ідэя і сцэнарый – Альберт Цэхановіч, рэжысёр, аператар – Андрэй Васкрасенскі, кампазітар – Данііл Міхалка). У чым вам бачыцца культурная значнасць падобных праектаў?

11. Пагартайце ваш сямейны альбом. Выберыце фатаграфіі бабулі/дзядулі, калі яны былі яшчэ зусім маладымі (можа, захавалася вясельнае фота?). Даведайцеся, калі была зроблена фатаграфія, з якой нагоды. Калі няма магчымасці распытаць бабулю/дзядулю, пагаварыце на гэтую тэму з бацькамі. Які характар блізкіх людзей выяўляецца праз здымак? У чым падобны вы з найбліжэйшымі сваякамі? Знешнасцю? Характарам? Жыццёвай філасофіяй? Падрыхтуйце прэзентацыю “Гісторыя маёй сям’і ў фотаздымках”/”Сямейны альбом як гісторыя майго роду”.

12. Напішыце апавяданне з элементамі разважання на тэму “Гісторыя аднаго фотаздымка”. Выберыце з сямейнага альбома фатаграфію сваяка незвычайнага ці, наадварот, самага звычайнага лёсу. Таго, кім ганарыцца ваша сям’я, на кім трымаецца ваш радавод, памяць пра каго перадаецца ў вашай сям’і з пакалення ў пакаленне. Ці згодны вы з высновай “Карані нашага сямейнага дрэва глыбокія, вытрымліваюць любы вецер. Калі ёсць памяць, павага да іх – не страшна прадаўжаць род”? У якасці прыкладу для вашага апавядання можна скарыстаць матэрыялы наступнага артыкула.[245]

13. Разгледзьце фотапартрэты незнаёмых вам сваякоў, што захоўваюцца ў вашым сямейным альбоме. Іх візуальныя выявы даюць нам аснову дамалёўваць, праектаваць жыццёвыя вобразы гэтых людзей, напаўняць іх уласным сэнсам. Падрыхтуйце славеснае выказванне – уяўленне пра герояў фотаздымкаў, потым распытайце ў бацькоў, каб супаставіць рэальны і прыдуманы вамі вобраз, што дэманструе характар героя.

14. Выберыце адну з фатаграфій з фотаальбома “Найлепшы бок” (Мінск, 2018). Узіраючыся ў фотаздымкі, пастарайцеся патлумачыць: чым прыцягваюць увагу гэтыя фатаграфіі сённяшніх людзей? Што прымушае разглядаць кожны здымак уважліва? Аб чым яны могуць расказаць, гэтыя старыя здымкі? Чаму могуць навучыць іх чыстыя, прыгожыя, разумныя вочы? Якую гісторыю яны зберагаюць? Можа, яны падказваюць нам: не жывіце адным днём… Думайце пра свой радавод, пра дзень учарашні і заўтрашні. Выхоўвайце павагу да культуры памяці!

Гартаючы альбом, вы не можаце не заўважыць, што пераважная большасць фатаграфій зроблена на

[244] Сава Сіўко. Фатограф Любчанскага краю [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=8Zqro2CdFgs. – Дата доступу: 27.08.2023.

[245] Сурмачэўскі, І. Мой дзед Пётр / І. Сурмачэўскі // Роднае слова. – 2014. – № 7. – С. 91–95.

фоне посцілак, тканых дываноў або беларускіх ручнікоў, вышыванак. Каб правільна зразумець гэты элемент аздобы, дэкору, прачытайце тэкст доктара мастацтвазнаўства, прафесара Вольгі Аляксандраўны Лабачэўскай:

Назва саматканай тканіны з двух ці трох столак, вытканых на вузкіх вясковых кроснах, у беларускіх гаворках – по′сцілка, про′сцілка, пасці′лка, по′сцялка. Галоўная ўтылітарная функцыя гэтай рэчы – засцілаць ці пакрываць нешта, быць распасцёртым, разасланым. Слова посцілка вызначае завершаную рэч, якая прызначалася ў першую чаргу для пакрыцця паверхні – ложка, стала, куфра. У Беларускім Палессі можна пачытаць варыянтную назву за′сцілка. Сугучнае польскае слова prześcieradło – прасціна мае той самы корань, што і беларуская назва роднаснай па функцыі тэкстыльнай рэчы.

Размова пра фотаздымкі на фоне тканых дываноў, посцілак не можа весціся толькі ў адной плоскасці. Сацыяльныя, эканамічныя і нават палітычныя фактары – кожны з іх паўплываў на з'яўленне гэтай унікальнай беларускай фатаграфічнай практыкі, якую мы не сустрэнем у Расіі, Украіне, Літве ці Польшчы. Асаблівасці можна патлумачыць як у адносінах людзей таго часу да здымкаў, для якіх яны імкнуліся ўпрыгожыць сябе і ўсё навокал, так і значна глыбей – у папулярнасці ў беларускай вёсцы традыцыйнага ткацтва.

Посцілкі – фон, які часта сустракаецца на тагачасных фотаздымках, канцэнтруе нашу ўвагу на тварах і постацях людзей, бо яны абмяжоўваюць прастору іх фатаграфічнага існавання, перакрываюць другасныя, лішнія дэталі. Твары людзей выяўляюцца на фоне калейдаскопаў посцілачных узораў больш выразна, ва ўсіх дэталях. Чым больш углядаешся на людзей на фотаздымках, тым больш відавочна, што фон – узорчатая сцяна за іх спінамі – набывае характар магічнай заслоны часу. Што хаваецца за ёй? Як штодня жылі гэтыя людзі? Фотаздымак не дае адказу на гэтае пытанне. Людзі знаходзяцца перад намі адначасова ў сваім гістарычным часе і быццам бы па-за яго кантэкстам. Дэталі адзення, адметнасць касцюмаў, прычоскі, па якіх распазнаём прыкметы даваеннага або пасляваеннага часу, – гэта сціплыя рысы адпаведнай эпохі. Наша ўяўленне імкнецца праз фонавую заслону ўбачыць абставіны жыцця гэтых людзей, аднак позірк нязменна спыняецца на ўзоры посцілкі. Немагчымасць зазірнуць за спіны людзей уключае механізм унутранага бачання, запускае яго ўласнае ўяўленне і выклікае з памяці патрэбныя асацыяцыі. Сам працэс успрымання такіх фотаздымкаў можна назваць "эфектам посцілкі".

Людзі на фотаздымках застылі ў нерухомасці, быццам бы адчулі, што надышоў момант ісціны – магчымасць зазірнуць праз аб'ектыў фотакамеры ў будучыню. Таму нельга пазбавіцца адчування, што людзі на фотаздымках разглядваюць нас, калі мы глядзім на іх.[246]

15. Пазнаёмцеся з мастацкімі праектамі ў творчым асяроддзі сэтаўскай моладзі, у якім традыцыйныя беларускія дываны, посцілкі і чалавек сцвярджаюць сваю прыналежнасць да Беларусі і яе народнай культуры,

[246] Лабачэўская, В.А. Беларускія посцілкі і дываны: антрапалогія і мастацтва традыцыйнай рэчы / В.А. Лабачэўская. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2022. – С. 19–20.

прадстаўлены як раўназначныя састаўныя часткі. [247] Асноўнай дзейнасцю студэнцкага этнаграфічнага таварыства (СЭТ) з'яўляецца пераемнасць, захаванне і аднаўленне беларускай народнай культуры. Студэнты, як правіла, робяць фотаздымкі ў строях, створаных на ўзор народнага адзення на фоне посцілак з прыгожымі арнаментамі. Гэта прадстаўнікі маладога пакалення беларусаў, якія намагаюцца даць традыцыям новае сучаснае жыццё. Найбольшую цікавасць выклікаюць праекты "Нашы людзі", "Людзі адной зямлі" і інш.

16. Пазнаёмцеся з фотаздымкамі сэтаўцаў Настассі і Васіля Прымакаў. Прачытайце гісторыю іх кахання.[248] Наколькі тыповая гэтая гісторыя для сённяшніх маладых беларусаў?

Пазнаёмцеся з фотапраектамі СЭТ. Ці згодныя вы, што сучаснае асэнсаванне беларускай культуры набывае новыя візуальна-выяўленчыя формы? Якое месца займае духоўны вопыт мінулых пакаленняў у асяроддзі маладых беларусаў? Ці магчыма існаванне традыцый культуры сёння ў нязменнай форме? Якія спосабы трансляцыі народнай культуры вы лічыце прывабнымі і прымальнымі на сённяшні дзень?

17.Разгледзьце фотаздымкі Янкі Купалы, датаваныя рознымі гадамі.







[247] Студэнцкае этнаграфічнае таварыства [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://set.ethno.by/. – Дата доступу: 27.08.2023.

[248] Настасся і Васіль Прымакі. Беларусы мы заўсёды [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https:// https://www.gorka.by//настасся-і-васіль-прымакі-беларусы-мы/. – Дата доступу: 27.08.2023.

Якім паўстае Купала? Уявім: вы – складальнік падручніка па беларускай літаратуры. Які фотаздымак паэта вы змясцілі б у школьнай хрэстаматыі? Чаму? Растлумачце свой выбар. Стварыце апісанне абагульненага партрэта Янкі Купалы на аснове фотаздымкаў і апісання знешнасці паэта ва ўспамінах яго знаёмых.[249]

Пагартайце альбом, пазнаёмцеся з унікальнымі фатаграфіямі паэта, якія ўваходзяць у калекцыю "Фотаздымкі Янкі Купалы". Ацаніце культуралагічную вартасць падобных выданняў.

Асэнсуйце ў кантэксце культуры памяці пра паэта словы Алены Ляшковіч, дырэктара Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы: "Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы не толькі збірае і захоўвае спадчыну першага народнага паэта Беларусі, але і спрыяе выхаду ў свет унікальных выданняў, прысвечаных жыццю і творчасці Янкі Купалы. Усе выданні маюць адну мэту – папулярызаваць купалаўскую спадчыну ў нацыянальным, еўрапейскім і сусветным кантэксце, ролю пісьменніка ў гісторыі літаратуры, культуры.

Навукова-даследчая і выдавецкая дзейнасць – толькі адзін з аспектаў ушанавання памяці класіка беларускай літаратуры. Ёсць мноства праектаў, акцый, але вельмі важна зразумець, што ўсё гэта мы робім не толькі для Янкі Купалы, колькі для нас саміх. Узгадаем словы выдатнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча: "Зрабіце гэта не для яго, бо лепшы помнік яму – нашы сэрцы і яго песні, што жывуць у іх. Зрабіце гэта не для яго, бо яго славу не ўзвялічаць помнікі. Зрабіце гэта для сябе, каб нас не вінавацілі ў няўдзячнасці, у дрэннай памяці, у адсутнасці вялікай павагі да лепшага свайго паэта, без якой не жыве кожны народ".[250]

...Ды вось які ён, чарадзей слова, аўтар "Жалейкі", "Паўлінкі", "Бандароўны", "Кургана" і многіх, многіх вершаў. Звычайны чалавек, светлы шатэн, з праборам, з светлым пушком вусаў, з тварам, як тады казалі, шляхетным, а прасцей, з тварам інтэлігентным, простым, але тонкім, звычайным, але ў той жа час інтэлектуальным… Адно вочы свяціліся нейкай цеплынёй, добразычлівасцю. Вылучаўся ён, апрача сваёй сталасці ў параўнанні з маладзейшымі пісьменнікамі, яшчэ нейкаю падцягнутасцю, зграбнасцю, нават вопраткаю. Шэры касцюм, гальштук, белы каўнерык – усё ляжала на ім натуральна, не вылучалася ніякай знарочыстай франтаватасцю.[251]

Па суботах вечарамі беларуская моладзь збіралася на кватэры прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы… Заўсёды з нецярплівасцю чакалі прыходу Янкі Купалы… Не вельмі гаваркі ў час шумных спрэчак, заўсёды сур'ёзны, Янка

[249] "Ты гэтых вачэй не забудзь… Фатаграфіі Янкі Купалы. Каталог. Да 70-годдзя стварэння Дзярж. літ. музея Янкі Купалы / уклад. Н.В. Саевіч; рэд.: Н.Ю. Зайцава. – Мінск: Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, 2014. – 266 с.

[250] "Ты гэтых вачэй не забудзь… Фатаграфіі Янкі Купалы. Каталог. Да 70-годдзя стварэння Дзярж. літ. музея Янкі Купалы / уклад. Н.В. Саевіч; рэд.: Н.Ю. Зайцава. – Мінск: Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, 2014. – С. 6–7.

[251] Звонак, А. Жыве Купала ў маім сэрцы / А. Звонак // Успаміны пра Янку Купалу / склад. А. Кулакоўскі, К. Цвірка. – Мінск: Маст. літ-ра, 1982. – С. 67–83.

Купала ўважліва прыслухоўваўся да выказаных думак, час ад часу падаючы кароткія і трапныя заўвагі. У часе бяседы станавіўся вясёлы, гарэзлівы…[252]

Яго зварот, яго адно слова, можа, і нязначнае, ці то запытанне, ці ківок галавой – "добры дзень", а тым больш працягнутая ім рука – здаваліся вялікай падзеяй. Гэта надоўга заставалася ў памяці, акрыляла юнацкія мары… Ён, Янка Купала, быў ва ўсім чалавек своеасаблівы. Ён хадзіў прыгожа апрануты, у капелюшы, з гальштукам, з адмысловай кавенькай-крывулькай, хадзіў у тады модных туфлях павольна і здаваўся збоку надта важны. Нават недаступны.[253]

Купалаву ўсмешку не злавіла ні адно фота. Ёсць шмат купалавых здымкаў. Найлепшыя з іх: Купала задумлівы, зрокам углыбіўшыся ў сябе; добрае фота – Купала задумлівы, угледжаны ўдаль; добра схоплены – Купала суровы, пахмурны; Купала пагодны; нават ветліва-афіцыйная ўсмешка ёсць, але гэта не Купалаўская ўсмешка. Купала ўсміхаўся па-дзіцячаму шырокай, адкрытай усмешкай, пры гэтым не толькі вуснамі, а галоўнае – яснымі блакітнымі вачыма і ямінкай на барадзе.[254]

Восенню 1936 года давялося пабываць у Мінску. Тут і сустрэліся з Янкам Купалам. Пастава яго была высакародная, выклікала захапленне. Аблічча поўнае мужнай прыгажосці. Тонка акрэсленыя рысы твару – выразныя і строгія. Русая па'сма валасоў над ілбом. Строга сціснутыя вусны, вострая лінія якіх сведчыла аб удумлівым і моцным характары… У ім заўсёды адчувалася ўпэўненасць, лагодны спакой і нейкі асаблівы чалавечы такт. Усё гэта прыхавана недзе там, за суровымі брывамі і крыху сумнымі вачыма. Але ўсмешка не хмурная, а цёплая, яна вабіла да сябе людзей… Усё падабалася ў ім. Яго любілі, як любяць бацьку… Просты і шчыры. Ён быў такім, як яго песня, як сам народ. Гэта гаварыла аб вялікім чалавечым сэрцы.[255]

Вобліку Янкі Купалы нязменна спадарожнічала цудоўная купалаўская ўсмешка. Яна заўсёды суправаджала яго ў гутарцы, у сустрэчах з людзьмі, у паэтычных выступленнях, у афіцыйных прамовах, у сяброўскіх рэпліках. Рэдка можна было ўбачыць Купалу панурым, рэзкім у паводзінах з людзьмі, раздражнёным, гнеўным, сярдзітым. Гэта зусім не адпавядала яго вобліку, поўнаму якойсьці купалаўскай чароўнасці… У многіх мясцінах давялося мне пабываць з Янкам Купалам, бачыць яго сярод розных людзей, у самых розных умовах і абставінах. Сцёрліся за даўнасцю год дэталі, падрабязнасці, даты… Але ніякія гады не сатруць з памяці яго цудоўную ўсмешку, купалаўскую ўсмешку.[256]

---

[252] Мядзёлка, П. Сцежкамі жыцця / П. Мядзёлка. – Мінск: Маст. літ-ра, 1974. – С. 54–55.

[253] Грамовіч, І. У сховах памяці і сэрца / І. Грамовіч. – Мінск: Маст. літ-ра, 1983. – С. 3.

[254] А.С. На Лысай гары / А.С. // Янка Купала і Якуб Колас. Вянок успамінаў. – Мінск, 1982. – С. 3–6.

[255] Масэнка, Т. Слова пра Янку Купалу / Т. Масэнка // Такі ён быў: успаміны пра Янку Купалу / склад. І.К. Жыдовіч. – Мінск: Маст. літ-ра, 1975. – С. 199–213.

[256] Лынькоў, М. Памяць захоўвае дарагое аблічча / М. Лынькоў // Такі ён быў: успаміны пра Янку Купалу / склад. І.К. Жыдовіч. – Мінск: Маст. літ-ра, 1975. – С. 91–95.

18. Разгледзьце фотаздымкі Уладзіміра Караткевіча, што люструюць розныя перыяды ў жыцці паэта. Якія рысы характару, нягледзячы на ўзрост, раскрываюць гэтыя “імгненні” гісторыі? [257]





Дапоўніце першаснае ўражанне ад фотаздымкаў Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча ўспамінамі тых, хто добра ведаў самога пісьменніка і яго творчасць. Стварыце славесны партрэт “няўрымслівага творцы на ніве нацыянальнай культуры” (Васіль Быкаў). Ці ёсць у вас любімыя творы пісьменніка? Якія?

Запомніліся “мілыя чары” яго абаяльнай асобы, святло якой праз гады прадаўжае гарэць у сэрцы кожнага, хто яго ведаў.

Ён быў з пароды тых жыццялюбаў, якія ўсё радзей сустракаюцца ў нашым жыцці, тым больш нячаста надараюцца ў мастацтве. Можна сказаць, што ён быў чалавек рэдкі, бо нават у сталыя гады шчасліва спалучаў у сабе чалавечую мудрасць з непасрэднасцю дзіцяці, любімага гадаванца прыроды. Гэтая рыса яго натуры, аднак, ніколі не прыніжаючы яго, давала падставу хіба што па-добраму дзівіцца, а то і захапляцца яго неардынарнасцю. Так, ён любіў усё натуральнае, лёгкае і радаснае, як у паўсядзённых праявах побыту, так і ў бясхітраснасці чалавечых адносін, але з абавязковымі для іх шчырасцю і дабрынёй, якія ён ставіў на першае месца добразычлівых адносін.

Яго пры жыцці любілі людзі розных характараў і нават светапоглядаў. Ён умеў аб’яднаць, памірыць, пакарыць глыбінёй свайго розуму і дабрынёй свайго сэрца. Ён любіў людзей і ненавідзеў усё дробязнае, фальшывае.

Творы Уладзіміра Караткевіча з захапленнем чытаюць розныя людзі, рознага веку і густаў, але, мне думаецца, большасць яго кніг знойдзе самы ўдзячны водгук у маладых сэрцах. Ён сам быў да скону сваіх дзён малады па

[257] Уладзімір Караткевіч – пісьменнік, грамадзянін, чалавек. Выяўленчы матэрыял: набор паштовак / аўтары тэксту, уклад.: Т.Л. Груца, В.М. Пашковіч, Г.А. Юрковіч; Аршанскі музей Уладзіміра Караткевіча. – Орша: Аршанская друкарня, 2010.

натуры і ведаў, чым крануць маладыя душы. Сапраўды, высокае пробы рамантызм яго апавяданняў і вершаў, непадробны драматызм яго гістарычных твораў, шчыры і сумленны роздум эсэ – вось той дабрадзейны падмурак, на якім грунтуецца чытацкая прыхільнасць да яго.

У яго ёсць чаму павучыцца. Можа, найперш стаўленню да жыцця і мастацтва. Поглядам на гісторыю і нацыянальную культуру. Адносінамі да чалавечай асобы.

Ён быў вельмі шчодры ў жыцці і мудры ў літаратуры.

Такім і застанецца назаўжды.[258]

19. *Пазнаёмцеся з фатаграфічным матэрыялам альбома "Дзявочы вечар" (Мінск: Галіяфы, 2021. – 304 с.).* Выберыце адзін з фотаздымкаў, што люструе вясельны абрад. Чым прывабіў вас менавіта гэты фотаздымак? Ці згодныя вы з тым, што вясельныя фатаграфіі адлюстроўваюць правобраз будучай сям'і? Ці можна па фотаздымку меркаваць пра мадэль шлюбу, сямейных, міжпакаленных адносін? Ці счытваюцца па старых фотаздымках гэтага альбома не толькі знешнія характарыстыкі вобраза сям'і (асабліва на здымках, дзе маладыя – у акружэнні шматлікіх сваякоў), узоры паводзін, ідэалы сямейных адносін – адзінства, дабрыня, вернасць, адданасць? У чым падобнасць і непадобнасць кампазіцыйнага рашэння пры фатаграфаванні маладой пары як "параднага" партрэта сям'і? Як праяўляецца гэта праз погляды, манеры, стрыманасць маладых, праз агульную атмасферу свята і адказнасці моманту перад фотакамерай?

20. *Падрыхтуйце водгук на кнігу Таццяны Міхайлаўны Мушынскай "Сямейны партрэт на фоне эпохі" (Мінск: Беларусь, 2020. – 271 с.).*

Мастацка-дакументальная аповесць, што дала назву кнізе, адлюстроўвае творчае і паўсядзённае жыццё некалькіх пакаленняў адной сям'і, у якой сабралася шмат асоб, вядомых у беларускай культурнай прасторы. Аўтар імкнецца намаляваць характары сваіх родных на фоне тых змен, што адбываліся ў нашым грамадстве з 1960-х гадоў да цяперашняга часу.

Ці згодныя вы з тым, што з дапамогай фотаздымкаў сям'я стварае сваю гісторыю? Паразважайце, калі з часам, як і аўтарка гэтага выдання, вы напішыце кнігу пра сваю сям'ю, то якой будзе гэтая кніга? Ці будзеце вы ўключаць фотаздымкі з сямейнага альбома? Якія?

21. *Ці любіце вы рабіць сэлфі? Выкажыце свае адносіны да гэтага масавага захаплення моладзі. Што гэта, на вашу думку: вясёлая гульня-забаўка, форма пазіцыянавання сябе або даніна модзе? Прыдумайце ідэю для сэлфі з беларускамоўным слоганам, прысвечаным беларускай культуры. Рэалізуйце ідэю на класнай гадзіне ў школе.*

22. *Стварыце фотарад сваёй любімай бібліятэкі.* Пры мажлівасці прадстаўце, апроч сучасных фатаграфій, здымкі, якія згадваюць гісторыю ўстановы, яе супрацоўнікаў і чытачоў. Разгарніце з дапамогай фота гісторыю, сучаснасць і будучыню бібліятэкі праз прызму ўласнага бачання. Адлюструйце на здымках кніжны фонд бібліятэкі, любімыя кнігі і часопісы, тыя

[258] Быкаў, В. Ад роднай зямлі / В. Быкаў // Караткевіч У. Збор твораў: у 8 т. – Т. 1. – Вершы. Паэмы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – С. 5–11.

мерапрыемствы, што праводзіліся на базе бібліятэкі. Пры магчымасці прадэманструйце ў фотаработах кнігі бібліятэкі з дарчымі подпісамі ўдзячных чытачоў. Правядзіце конкурс на лепшую назву фотаработ удзельнікаў. Пазнаёмцеся з наступнай публікацыяй, на аснове якой можна распрацаваць уласны праект.[259]

23. *Ці згодныя вы з тым, што "сапраўдная фатаграфія – тая, якая на паперы"?* Прывядзіце мінімум тры аргументы *за* і тры аргументы *супраць* гэтага тэзіса. Пазнаёмцеся з ацэнкамі сучаснага фотамастацтва майстра Аляксандра Лапіна, аўтара шматлікіх кніг, які на пачатку свайго творчага шляху працаваў фатографам у розных арганізацыях (на заводзе, у Доме настаўніка, у гандлёвай рэкламе). З 1999 года выкладае на факультэце МДУ імя М.В. Ламаносава, чытае курсы: "Фотакампазіцыя", "Фотамайстэрства" і інш.

…Навучыць фатаграфаванню цяжка. Што самае важнае ў гэтым працэсе?

Па-першае, уменне бачыць. Фатографу, як і рэжысёру, важна выхаваць вобразнае мысленне. Навучыцца мысліць зрокавымі вобразамі. Заплюшчыць вочы і ўбачыць, як перадаць пэўны стан, сваё адчуванне. Напрыклад, дзіцячая адзінота. Вось вам пакажуць здымак, дзе дзяўчынка адна гуляе ў пясочніцы. А ідэя дзе? Ці прадумана сітуацыя, у якой адэкватна распрацоўваецца вобраз?

Хтосьці скажа, што фатограф павінен не прыдумваць, а здымаць. Як бы не так! Калі доўгі час гуляць у такія гульні, трэніраваць вобразнае мысленне, інтуіцыю, фатограф навучыцца пераводзіць на плоскасць чалавечыя эмоцыі, дзеянні. Я нават выкажу такую крамольную думку: фатографа трэба вучыць маляванню. Кадр, які ён хоча зняць, ён найперш павінен намаляваць. Сваю ідэю, схему, кампазіцыю. Важна ведаць мову стварэння вобраза, і тады вы зможаце пару тых, хто цалуецца, зняць так, што ўсім стане зразумела: ён яе ненавідзіць, хоць і цалуе.

Па-другое, фатограф абавязкова павінен умець ацаніць кадр, выбраць адзін з соцень фотаздымкаў. Сёння не праблема сфатаграфаваць. Гэта ў мінулым стагоддзі былі сярэбраныя пласцінкі, доўгая наводка, выбар экспазіцыі і т.п. Зараз кожная секунда – кадр, за хвіліну іх шэсцьдзясят, за гадзіну – сотні… Нашчоўкаў, а што далей? Ці здольны ты зразумець, што ты наздымаў? Як аказваецца, лічбавыя здымкі не менш складаныя. Толькі складанасць ужо не ў тэхналогіях, а ва ўменні адабраць матэрыял. Хто будзе вучыць гэтаму, не ведаю, але менавіта ў гэтым – будучае фатаграфіі.

– Ці стала фатаграфія, на ваш погляд, часткай мастацтва?

– Фатаграфія памяняла свет. Фатаграфія змяніла жывапіс, ён перастаў займацца ілюзорнасцю і адмовіўся ад лінейнай перспектывы. Фатаграфія з лёгкасцю адлюстроўвала рэальнасць. І тады з'явіўся Пікасо. Дзякуючы фатаграфіі з'явіўся Дэгор. Жывапіс сёння пераймае фатаграфію.

[259] Харытонава, В. Фотапартрэт бібліятэкі / В. Харытонава // Мастацтва. – 2022. – № 9. – С. 14–17.

Фатаграфія – гэта не копія рэальнасці, а квінтэсенцыя, у якой прысутнічаюць і выдумка, і фантазія, і філасофія, і эмоцыі. Жыццё, адлюстраванае на фотаздымку, больш цяжка спасцігаецца, чым рэальнасць.[260]

24. *Падрыхтуйце апісанне фотаздымка народнага пісьменніка Івана Паўлавіча Мележа.* Адлюструйце ў ім як знешнія рысы, так і якасці чалавечай натуры. Якім паўстае Іван Паўлавіч Мележ паводле ўспамінаў тых, хто яго добра ведаў?



…Успамінаюцца рысы, аблічча простага хлопца з палескай вёскі Глінішча, высокага, моцнага, з вачыма, якія на пазнейшых фатаграфіях здаюцца цёмнымі, бо заценены прыжмуранымі павекамі хворага чалавека, а ў жыцці – светлымі, з блакітам, са схаванай сумнаватай усмешкай, якая прасвятляецца, калі сустракаецца прыемны чалавек ці размова чакаецца цікавая. Усмешка амаль заўсёды асвятляе ўвесь твар, гуляе на кончыках выразна акрэсленых губ, гучыць у голасе, ціхім, трохі хрыплаватым.

…У вачах, у якіх праз паляшуцкую, вясковую стрыманасць і схаваную ўсмешку раптам прагляне востры бляск цвёрдага салдацкага характару. У знешнім аблічы – заўсёды апушчанае, "збітае набок" плячо: пастаянны напамінак аб фронце, шпіталях…

Іван Паўлавіч цярпець не мог і ў жыцці і ў літаратуры грубасць, пошласць, кар'ерызм, мяшчанства, імкненне нават у літаратуры акружыць сябе

[260] Лапин, А. Настоящая фотография – та, которая на бумаге / А. Лапин // Фотомагия. – 2007. – № 4. – С. 9–11.

падхалімамі… Як чалавек, цалкам захоплены работай, вельмі заняты, Іван Паўлавіч многія бытавыя рэчы ацэньваў з пункту гледжання зручнасці і неабходнасці. Дачная цішыня – для працы, самалёты – эканомяць час для работы.

Захопленасць літаратурай не зрабіла Івана Паўлавіча чалавекам аднабаковым. Яго цікавіла ўсё: палітыка, навіны, навука, пытанні выхавання, кіно, медыцына. Цяжка сказаць, што пакідала яго абыякавым (Лідзія Якаўлеўна Пятрова-Мележ, жонка пісьменніка).

Мне больш за ўсё запомніўся малады Мележ як прыкладны бацька. Я ні разу не пачула, каб ён узвысіў на дзіця голас ці каб нешта загадаў, а дзіця адмовілася. Яго слова было законам, але не цяжарам для дзіцяці… Гледзячы на іх дваіх, нельга было не захапляцца і не зайздросціць (Алена Васілевіч, пісьменніца).

Іван Мележ… Ён быццам пасланы быў у жыццё, у свет той зямлёй, дзе нарадзіўся, каб расказаць людзям, што гэта за край такі – паляшуцкі (шырэй – беларускі) і што за людзі яны, тыя палешукі, тыя беларусы. Пасля Янкі Купалы і Якуба Коласа, пасля Максіма Гарэцкага і Кузьмы Чорнага і многіх іншых – расказаць усяму свету, хто мы, беларусы, адкуль і куды ідзём, што нясём чалавецтву. Паведаць па-свойму, па-мележаўску… (Алесь Адамовіч, пісьменнік).[261]

25. Падрыхтуйце выказванне (прэзентацыю) на тэму “Фотапартрэт маладога пакалення ў сучасных СМІ” (напрыклад, на матэрыяле газеты “Літаратура і мастацтва”).[262] Прааналізуйце фатаграфічнае афармленне газеты за апошнія тры-чатыры месяцы. Выпішыце назвы публікацый, якія суправаджаюцца фотаздымкамі. Якая тэматыка публікацый? Якія напрамкі жыццядзейнасці зафіксаваныя ў фотадакументах? Якая сэнсавая сувязь прасочваецца паміж загалоўкам, тэмай і фотаздымкам? Якія спосабы ўключэння подпісу да фотаздымкаў выкарыстоўваюцца (у нізе, у версе фотаздымка, у тэксце і інш.)? Якую ролю сярод фатаграфій займае партрэтны/сюжэтны жанр? Якія фатаграфіі пераважаюць – індывідуальныя/групавыя? У якіх абставінах найчасцей дэманструюцца героі фотаздымкаў (на рабочым месцы, у прафесійным акружэнні, у сямейным асяроддзі, у вольны час і інш.)? Прадстаўнікі якой прафесіі адлюстроўваюцца на фотаздымках? З чым гэта, на вашу думку, звязана? Прадстаўнікі якой прафесіі, па вашым меркаванні, абдзелены ўвагай журналістаў? Як вы ацэньваеце якасць фатаграфічнага афармлення? Якія парады вы сфармулюеце калектыву рэдакцыі з мэтай пашырыць аўдыторыю маладых чытачоў?

Такім чынам, фотаздымак уяўляе сабой гамагенны тэкст, стварае адзінае сэнсава-функцыянальнае цэлае ў камунікатыўным полі. Нягледзячы на тое, што фатаграфія толькі аснова для камунікатыўных зносін, яна неабходны складнік гэтага працэсу. Фота – шматфункцыянальны кампанент камунікатыўнай прасторы, які шматаспектна раскрывае адлюстраваную падзею, з’яву, факт. Фотаздымак выступае і як памяць пра мінулае, як факт мастацкай версіі рэальнага жыцця, як фотаўспамін, што суправаджаецца станоўчымі ці

[261] Сказ пра Івана Мележа / складальнік А.М. Адамовіч. – Мінск: Беларусь, 1984. – 63 с.

[262] Газета “Літаратура і мастацтва” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/edition/litaratura-i-mastactva. – Дата доступу: 27.08.2023.

адмоўнымі эмоцыямі, з’яўляецца спосабам самавыяўлення, характарыстыкай асобы, фотаздымак яшчэ – і хобі сучаснага чалавека. Фотаздымак як сродак камунікатыўнага акта “прымушае” трымаць у памяці і прыгадваць у адпаведны момант жыццёвыя абставіны, шчаслівыя моманты або праблемы ва ўзаемаадносінах з іншымі членамі найбліжэйшага сямейнага круга.

Аналіз фотараду айчынных падручнікаў часам сведчыць пра выпадковы характар яго напаўнення. У ідэале невербальны кампанент школьных дапаможнікаў павінен выконваць сэнсавую, культуралагічную нагрузку. Набор візуальных вобразаў не павінен запаўняцца, зыходзячы з густаў складальнікаў. Візуальны імідж выдання выступае свайго роду візітоўкай для сучаснага чытача. Тым больш, што сучасныя школьнікі ў працэсе пошуку інфармацыі найперш “сканіруюць” невербальныя звесткі. На думку навукоўцаў, менавіта “ўзаемадзеянне вобразнага і верабальнага кодаў нават у выпадку адноснай паўнаты інфармацыі з’яўляецца паказчыкам надзейнасці разумення”.[263]

Прачытанне свету праз падручнік мае на ўвазе размяшчэнне на яго старонках вобразаў, ключавых для разумення культуры грамадства. Цэласна распрацаваная і прадстаўленая ў падручніках мадэль візуалізацыі як сістэма сацыяльна-гуманітарных ведаў пра свет можа трактавацца як выяўленне ідэі калектыўнай памяці, ідэнтычнасці беларусаў.

3.3 Праца з рэкламным тэкстам на ўроках мовы

У сістэме школьнай адукацыі беларуская мова з’яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам навучання, які вызначае паспяховасць і якасць адукацыі ў цэлым. Урокі мовы павінны забяспечваць дзейнасны кантэкст для развіцця творчых здольнасцей вучняў, іх інтэлектуальнай і эмацыянальнай актыўнасці, фарміраваць гатоўнасць і навыкі да камунікавання, узаемаразумення, патрэбнасць у маўленчым самаўдасканаленні.

Сучасны ўрок мовы арыентаваны на засваенне агульнапрадметных уменняў і ўніверсальных спосабаў дзейнасці, на павышэнне якасці лінгвістычнай і агульнакультурнай падрыхтоўкі вучняў. Ажыццяўленне гэтай задачы рэальнае пры ўмове вырашэння адукацыйных патрэбнасцей школьнікаў у кантэксце праблем жыццёвых маўленчых сітуацый і паўсядзённых зносін.

У сённяшнім інфармацыйным грамадстве існуе неабходнасць набыты лінгвістычны вопыт, сфарміраваныя навыкі пераносіць з адной прадметнай сферы ў іншыя, прымяняць мовазнаўчыя веды ў працэсе самастойнай пошукава-даследчай дзейнасці. Дыдактычным сродкам прадуктыўнай арганізацыі навучання мове можа стаць праца з тэкстам рэкламы. У сучасным жыцці рэклама – дынамічны, запатрабаваны сродак інфармацыйнага абмену, форма аператыўнага ўзаемадзеяння членаў соцыуму. У педагагічнай практыцы рэкламны тэкст – самакаштоўны матэрыял, які развівае матываванасць

[263] Малахова, А.Д. Взаимодействие образных и вербальных компонентов в процессах понимания / А.Д. Малахова // Вопросы психологии. – 1991. – № 5. – С. 73.

пазнавальнай дзейнасці, крэатыўнае мысленне, моўную інтуіцыю, фарміруе актыўную жыццёвую пазіцыю навучэнцаў.

Рэкламны тэкст можа выступаць своеасаблівай крыніцай звестак пра культуру, гісторыю, вобраз жыцця нашых суайчыннікаў. Такія якасці надаюць гэтым тэкстам прывабныя рысы, сённяшнія каардынаты быцця, дапамагаюць арганізаваць пазнавальны працэс у кантэксце фарміравання функцыянальнай пісьменнасці. Лінгвістычная падрыхтоўка навучэнцаў у сучаснай моўнай сітуацыі скіравана на разуменне і ацэнку паўсядзённых тэкстаў, у тым ліку і рэкламных. Мэтанакіраваная праца з імі спрыяе павышэнню якасці моўнай адукацыі, вучыць жыць і развівацца ва ўмовах зменлівага інфармацыйнага асяроддзя. Прапанаваныя матэрыялы настаўнік можа эфектыўна рэалізаваць для выпрацоўкі прадметных, метапрадметных уменняў праз калектыўную і індывідуальную працу, дыферэнцыяцыю дамашняга задання, матэрыялаў для правядзення тыдня беларускай мовы, алімпіядных заданняў, курсаў на выбар, арганізацыі вучэбна-даследчай, праектнай дзейнасці.

Спынімся напачатку на тэарэтычным блоку, які забяспечвае камунікатыўны кантэкст у працы з рэкламным тэкстам. Трэба пагадзіцца з Л.Г. Шасцярнёвай: на сённяшні дзень “шырокае распаўсюджванне рэкламы зрабіла яе запатрабаванай крыніцай пісьмовай і вуснай інфармацыі, рэклама стала элементам культуры”[264]. Як вядома, рэклама ўяўляе сабой працэс камунікацыі, скіраваны на павышэнне ўздзеяння на спажыўца. Менавіта гэтым тлумачацца дыялагічнасць рэкламы, прыярытэтнасць ролі адрасата, эфектыўнасць кантактнай функцыі, ілюзія зваротнай сувязі. На дыялагічнасці як лінгвістычным праяўленні камунікатыўнай функцыі мовы ў тэксце акцэнтуе ўвагу М.М. Кожына: “Калі камунікатыўная функцыя мовы як сістэмы – прызначэнне мовы ў грамадстве, то дыялагічнасць у шырокім сэнсе – гэта эксплікацыя камунікатыўнай функцыі ў маўленні, выяўленне ў тэксце камунікатыўнай функцыі мовы як сацыяльнай з’явы”.[265]

У рэкламе, у анатацыях да кніжных выданняў (мы разглядаем іх як рэкламныя тэксты) дыялагічнасць ажыццяўляецца праз формы мадэлявання рэальных дыялогаў у вытворчай або бытавой сітуацыях, што ілюструюцца рэплікамі – імітацыямі нефармальных зносін. У якасці прыкладаў выкарыстоўваюцца пераважна тэксты з рэкламнай прадукцыі айчыннага тэлебачання, сталічнага метро, рэкламных установак гарадоў Мінска і Віцебска:

– *Які круты код піша гэты кот!*

– *Я проста вучыўся ў Мая-ІТ-школа* (рэклама ў метро).

У кніжных анатацыях як рэкламных тэкстах дыялагічнасць разгортваецца праз наступныя прыёмы:

– *пытальныя сказы і пытальна-адказальныя канструкцыі.* Дыялагічнасць рэкламнага тэксту найчасцей ствараецца шляхам уключэння ў яго структуру

[264] Шестернёва, Л.Г. Русский язык для профессиональной коммуникации: поликодовый текст в практике обучения русск. языку как иностранному: учеб.-методич. пособие /Л.Г. Шестернёва. – Минск: БГУ, 2022. – С. 33.

[265] Кожина, М.Н. Теория функциональной стилистики: избр. труды / М.Н. Кожина. – М.: Флинта, 2010. – С. 138.

пытанняў, што выяўляюць характэрныя для гэтага віду рэкламы інтэнцыі – зацікавіць зместам, стымуляваць, скарыстаць паслугу/прадукт. Пры гэтым рэклама не толькі актывізуе ўяўленне адрасата з дапамогай рознага тыпу пытанняў, але і прапануе "гатовыя" рашэнні:

Якім тэмам прысвечана гэта кніга? Кніга ў цікавай форме знаёміць з дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь і значэннем іх у жыцці грамадства. Садзейнічае фарміраванню паважлівых адносін да дзяржаўнай сімволікі, дапамагае выхоўваць патрыятызм, гонар за родную краіну.

А яшчэ, дарагі чытач, вельмі важна любіць месца, дзе ты нарадзіўся, свой родны край, сваю Радзіму – Беларусь. Неабходна вывучаць яе гісторыю і сучаснасць, ведаць дзяржаўныя сімвалы. Пабывай ва ўсіх кутках Беларусі, каб на свае вочы пабачыць усе цуды прыроды і архітэктуры! Жадаем табе зрабіць мноства цікавых адкрыццяў на гэтым шляху (Ваніна, В.У. Герб, сцяг, гімн. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2020).

Аб чым гэта кніга? Безумоўна, пра слова, яго таямніцы і загадкі, яго гісторыю. Пра паходжанне крылатых слоў і выразаў, пра "біяграфіі" стараславянскіх і запазычаных слоў, якія часта сустракаюцца ў беларускай мове.

Спадзяёмся, што гэта невялікая кніжка дапаможа вам пазбегнуць памылак ва ўжыванні слоў і выразаў у вашым маўленні, у авалоданні культурай роднай мовы (Шпадарук, І.П. Рудакоўскі, В.В. Чаму мы так гаворым. – Мінск, 1985).

У некаторых выпадках у аналітычных анатацыях да кнігі пытанне непасрэдна звернута да чытача, а ў адказе прыводзяцца патэнцыяльныя галоўныя аргументы на карысць выдання і пакупкі гэтай кнігі. Пералік мэтавай аўдыторыі – чытачоў, будучых пакупнікоў пры адказе сведчыць пра своечасовасць і актуальнасць выдання:

Энцыклапедычны даведнік "Беларуская мова" ўключае больш за дзвесце дзевяноста артыкулаў, якія прысвечаны беларускай мове, яе гісторыі і сучаснаму стану, гукавому і лексічнаму складу, фраземнаму фонду, графіцы і арфаграфіі, марфалогіі і сінтаксісу, дыялектнаму падзелу, слоўнікам і інш. Пры падрыхтоўцы энцыклапедычнага даведніка калектыў навукоўцаў ставіў перад сабой асноўныя задачы:

1) у лагічнай і даступнай форме апісаць структуру беларускай мовы ў яе сучасным выглядзе;

2) ахарактарызаваць найважнейшыя асаблівасці функцыянавання беларускай мовы;

3) абагульніць асноўныя звесткі пра гісторыю станаўлення і развіцця беларускай мовы;

4) паслядоўна расказаць пра сістэму раздзелаў беларускай лінгвістыкі.

Падрыхтаванае вядучымі беларускімі мовазнаўцамі выданне будзе карысна ўсім, каго цікавіць вывучэнне беларускай мовы, удасканаленне сваіх ведаў. Можа быць выкарыстана студэнтамі, вучнямі старэйшых класаў сярэдніх школ, гімназій, каледжаў і ліцэяў пры падрыхтоўцы да экзаменаў і паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы філалагічнага профілю (Беларуская мова: энцыклапедычны даведнік / пад агульнай рэдакцыяй Д.В. Дзятко. – Мінск, 2022).

Асабліва эфектыўным гэты прыём становіцца ў тых выпадках, калі пытанне выносіцца ў пачатак асноўнага тэксту. Тады пытанне звяртае ўвагу аўдыторыі і выклікае цікавасць будучых чытачоў:

Што такое лінгвагеаграфія?

Дыялекталогія – адносна маладая галіна мовазнаўства. Ёй, па сутнасці, якая-небудзь сотня гадоў. А лінгвістычная геаграфія яшчэ маладзейшая. Яна – дзіця дыялекталогіі. Але карыстаецца дыялекталогія, асабліва лінгвістычная геаграфія, значнай папулярнасцю ў мовазнаўцаў, у даследчыкаў іншых грамадскіх здабыткаў людзей. І не толькі таму, што яны могуць прывесці да каштоўных навуковых знаходак і раскрыць таямніцы мовы і яе жыцця ў грамадстве. Навуковыя здабыткі дыялектолагаў і лінгвагеографаў, іх творы – дыялектныя слоўнікі, лінгвістычныя атласы, шматтомныя калекцыі звестак аб мясцовай мове соцень і тысяч паселішчаў, даследаванні, якія адлюстроўваюць мясцовую мову народа, – гэта найкаштоўнейшыя скарбніцы моўнай народнай спадчыны. Такія ж, як помнікі старога пісьменства і мовазнаўчай навукі мінулага (Крывіцкі, А.А. Што такое лінгвагеаграфія. – Мінск, 1996).

Як сцвярджае А.М. Назайкін, “сфармуляванае пытанне праграмуе патэнцыяльны ўдзел чытачоў у падрыхтоўцы адказу. Чалавек мімаволі настройваецца на падтрымку рэкламаванага тавара”.[266] Пытальныя канструкцыі павышаюць інтэлектуальную актыўнасць чытача. Прыём выступае разнавіднасцю эфектыўнага ўздзеяння, здольны зацікавіць чытацкую аўдыторыю. Часам пытальна-адказальныя адзінствы пабудаваны як пералік разнавіднасцей рэкламаванага прадукту:

– *Якія найбольш папулярныя найменні беларускага хлеба* (паводле дыялогаў з пакупнікамі)?

“Нарачанскі”, яго лічыць смачным большасць пакупнікоў. Дарэчы, гэты гатунак – доўгажыхар: яму ўжо больш за 30 год. Рэцэптуру распрацавалі мінчане, яго ўпершыню пачалі выпякаць у Мінску ў 1986 годзе. Брэндам, апроч “Нарачанскага”, лічыцца і “Барадзінскі”.

“Браслаўскі край”. Цеста для яго замешваюць у некалькі этапаў, што займае каля 14 гадзін. Многія разнавіднасці гэтага хлеба выпякаюць на кляновых лістах.

“Альгерд”. Хлеб названы ў гонар вялікага князя літоўскага, у прадукце – сумесь аржаной і пшанічнай мукі. Дадаюць яшчэ кунжут, семкі сланечніка, мёд. Пякуць яго ў Віцебску, а любяць па ўсёй краіне.

“Старая Вільня”. Заварны хлеб па старажытных літоўскіх рэцэптах: у ім аржаная і пшанічная мука першага гатунку, аржаны солад, крухмальная патака, кмен, вада і бульбяное пюрэ. Гэты хлеб можна есці “без нічога” – і будзе смачна.[267]

---

[266] Назайкин, А.Н. Рекламный текст в современных СМИ: практическое пособие /А.Н. Назайкин. – М.: Эксмо, 2007. – С. 169.

[267] Які хлеб любяць у Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/news/20210303/1614789109-yaki-hleb-lyubyac-u-belarusi. – Дата доступу: 28.08.2023.

У гэтай рэкламе маецца прамое пытанне, звернутае да чытача: *Які хлеб вам больш падабаецца?* Непасрэдны адказ адсутнічае: даць яго можа толькі сам адрасат. Замест гэтага са смакам пералічваюцца магчымыя вытанчаныя (невядомыя простаму спажыўцу) варыянты рэцэптаў хлеба (з сырам і маслінамі, з часнаком і грэцкімі арэхамі, з памідорамі і беларускай бульбай), каб выклікаць апетыт і жаданне паспрабаваць гэтыя незвычайныя гатункі.

Частка анатацый-рэкламных тэкстаў утрымлівае пытанні, якія служаць формай прэзентацыі зместу кнігі:

Якія словы адносяцца да запазычаных?

Пад запазычаным трэба разумець слова, якое прыйшло ў нашу мову звонку, нават калі яно знешне нічым не адрозніваецца ад родных слоў. Няма на зямлі мовы, якая была б зусім вольная ад іншамоўных уплываў, бо ніводзін народ не жыве ізаляваным жыццём. Не быў ніколі адасоблены і беларускі народ. Меў ён у сваёй шматвяковай гісторыі і добразычлівых суседзяў, якіх прыемна было паклікаць за гасцінны стол, і ворагаў, з якімі прыходзілася скрыжоўваць мячы. Разнастайныя кантакты з іншымі народамі пакінулі прыкметны адбітак на беларускую мову.

Аўтар расказвае пра тое, якімі шляхамі пранікала ў беларускую мову іншамоўная лексіка, пра словаўтваральную здольнасць запазычанняў, пра іх далейшы лёс (Булыка, А.М. З моў блізкіх і далёкіх. – Мінск, 1986).

Некаторыя анатацыі дэманструюць трансфармацыю фарматаў пытальных сказаў у клічныя, з дапамогай якіх чытач ператвараецца з пасіўнага сведкі ў актыўнага ўдзельніка размовы. Пры гэтым тэксту надаюцца эмацыянальнасць, дынамізм, што спрыяе кантактаванню адрасата і адрасанта:

У якой прыгожай і дзіўнай краіне мы жывём! Колькі ў ёй цікавага, што заслугоўвае ўвагі і блізкага спазнання!

Выданне знаёміць з прыродай Беларусі, распавядае пра гісторыю, славутыя мясціны і гербы сталіцы, абласных цэнтраў, запрашае задумацца над важнасцю штодзённай працы і захавання беларускіх народных традыцый. Кніга выхоўвае патрыятызм, гонар за родную краіну, паважлівыя адносіны да яе жыхароў.

Прызначана для малодшых школьнікаў, утрымлівае маляўнічыя ілюстрацыі, развіццёвыя заданні (Ваніна, В.У. Краіна, у якой я жыву. – Мінск, 2023).

Рытарычныя пытанні надаюць анатацыі эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні. Мэта дадзенага прыёму, з аднаго боку, заключаецца ў тым, каб сфарміраваць у адрасата станоўча-ацэначныя адносіны да інфармацыі (адпаведна і да рэкламаванай кнігі), з другога – наладзіць цесны кантакт паміж аўтарам і чытачом, што спрыяе ўнутранай дыялагізацыі маналагічнага звароту. Рытарычная структура, лічбавая інфармацыя выкарыстоўваюцца для таго, каб зрабіць думку пераканаўчай, доказнай, эмацыянальна-ўплывовай:

Хто не ведае дасягненняў беларускага спорту?

Беларусь уваходзіць у дваццатку наймацнейшых спартыўных дзяржаў свету. З 1994 па 2022 год беларускія спартсмены заваявалі 105 алімпійскіх медалёў: 21 – залаты, 37 – сярэбраных і 47 – бронзавых. У нашай краіне

паспяхова развіваюцца 132 віды спорту, сярод якіх самыя папулярныя – футбол, лёгкая атлетыка, гімнастыка, хакей, біятлон і інш.

На старонках гэтай кнігі ты прачытаеш пра тое, у якіх відах спорту беларусы маюць самыя высокія дасягненні. Даведаешся пра слаўныя перамогі спартсменаў, якімі ганарыцца Беларусь, – Дар'я Домрачава, Аляксей Грышын, Ганна Гуськова, Іван Ціхан, Юлія Несцярэнка, Максім Мірны, Вікторыя Азаранка і інш. (Кашавар, Д.В. Дасягненні беларускага спорту. – Мінск, 2023).

Частотнымі для рэкламных тэкстаў з'яўляюцца дзеяслоўныя і займеннікавыя формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку, характэрныя як для таварнай рэкламы, так і для кніжных анатацый. З іх дапамогай аўтар непасрэдна вядзе гутарку з адрасатам, падкрэсліваючы, што зварот адносіцца да ўсіх патэнцыяльных пакупнікоў/чытачоў, да кожнага персанальна:

Выбіраючы прэпарат УМКУ – вы выбіраеце лепшае; Заслужы павагу: утылізуй старыя рэчы правільна; Будзьце прыкладам для свайго дзіцяці.

Змест анатацый з выкарыстаннем формаў 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку звернуты да мэтавай аўдыторыі праз апісанне тых каштоўнасцей, пра якія можна даведацца дзякуючы гэтым кнігам:

...з яе дапамогай – вы атрымаеце, знойдзеце, трапіце, зробіце, ператворыцеся; ты зразумееш, адчуеш, дакранешся, раскрыеш, адважышся. Напрыклад: *стань часткай крутой каманды; памажыце мне жыць (звыштэрміновы збор на медыцынскія прэпараты); інвестуй у сталіцу! Інвестуй граматна! Раздзяляйце адходы! Памятайце: чысты горад пачынаецца з нас і інш.*

Дарагі чытач! Прычытаўшы гэтую кнігу, ты даведаешся, што ў Беларусі мноства цікавых мясцін, якія варта наведаць. Крэпасці і замкі, палацы і храмы захоўваюць сляды мінулых стагоддзяў, з'яўляюцца іх маўклівымі сведкамі. Многія з гэтых аб'ектаў знаходзяцца пад абаронай дзяржавы, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Гэтыя збудаванні звязаны з імёнамі людзей, якія жылі на нашай зямлі, і з падзеямі, якія тут адбываліся. Знаёмства з імі дапаможа табе лепш спазнаць слаўную гісторыю нашай культуры, любіць і ганарыцца ёю (Кашавар, Д.В. Маўклівыя сведкі гісторыі. – Мінск, 2023).

Дарагі чытач! Няхай прыгажосць беларускай прыроды глыбока закране тваё сэрца! Гэта твая Радзіма – самае лепшае месца на зямлі. Прырода – багацце ўсіх жыхароў нашай краіны. Ад нас залежыць, у якім стане мы пакінем яе сваім нашчадкам.

Беларуская дзяржава шмат робіць, каб захаваць прыгажосць і разнастайнасць нашай прыроды. Ты таксама можаш удзельнічаць у гэтым. Не ламай дрэў, не распальвай вогнішча ў лесе ў сухую і гарачую пару года, пасля пікніка на лясной паляне ці ля ракі абавязкова прыбірай за сабой смецце. Дапамагай садзіць дрэвы, удзельнічай у зборы макулатуры (гэта таксама захавае шмат дрэў, зэканоміць электрычнасць).

Ахоўваць і берагчы прыроду можа кожны. І калі нас будзе шмат, то малыя справы стануць вялікімі вынікамі (Сапожнікава, Э.У. Нацыянальныя паркі і запаведнікі Беларусі. – Мінск, 2023).

Сродкам дыялагізацыі ў таварнай рэкламе і ў кніжных анатацыях актыўна выступае *мы – форма*, семантыка якой аб'ядноўвае дзеясловы з асабовымі займеннікамі множнага ліку. Яе змест заключаецца ў суаднесенасці дзеяння, прыметы, стану да групы асоб, у якую ўваходзіць і той, хто гаворыць/піша/чытае. Гэтая форма яднае аўтара са слухачамі/гледачамі праз разумовае або фізічнае дзеянне, мэта якога – узмацніць уплыў на аўдыторыю. Гэта стварае даверлівую інтанацыю: пабуджэнне да дзеяння не навязваецца адрасату назойліва, з ім проста дзеляцца інфармацыяй.

У таварнай рэкламе такія формы выкарыстоўваюцца ў дзвюх функцыях. Па-першае, для абагульненага найменавання адрасата маўлення (адрасант пры гэтым не ўдакладняецца): *мы робім рэкламу ў метрапалітэне; Дзеці – наш клопат. Паможам дзецям разам; Змяншаем вашы плацяжы па крэдыце; Запрашаем на працу; Чакаем у кампаніі; Робім хутчэй, чым абяцаем; Прадаём танна, бо працуем без пасрэднікаў* і інш. У другім выпадку *мы-форма* ўжываецца для абазначэння сумеснага дзеяння, што падкрэслівае роўнасць пазіцый суб'екта і адрасата маўлення: *Служым закону, народу, Айчыне. Лічбавая фотакамера – гэта здорава. Мы зможам здымаць усё, што пажадаем, аднак самага каштоўнага не хапае. Новыя лічбавыя фотакамеры Kodak: проста націскаем кнопку і атрымліваем выдатныя здымкі.*

Мы-форма ў рэпертуары кніжных анатацый абазначае сукупнасць людзей, якія маюць магчымасць прачытаць рэкламаваную кнігу (гэтую сукупнасць складаюць і адрасат, і адрасант, і іншыя людзі). Ужываецца для абазначэння мэтавай аўдыторыі, усіх патэнцыяльных чытачоў: *Кніга пазнаёміць вас з найважнейшымі мемарыяльнымі комплексамі і помнікамі, якія адлюстроўваюць мужнасць жыхароў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Наведваючы гэтыя мясціны, вы аддаяце даніну памяці гераічным пакаленням нашых продкаў, якія падарылі нам мірнае неба над галавой (мемарыяльны комплекс "Хатынь", мемарыял "Буйніцкае поле", "Курган Бессмяротнасці" ў Полацку, комплекс "Разгром" у Смалявіцкім раёне, комплекс "Кацюша" і інш.).*

Адрасавана малодшым школьнікам. (Кашавар, Д.В. Вечная памяць героям. Мемарыялы Беларусі. – Мінск, 2023).

Характэрнай рысай рэкламных тэкстаў выступае станоўчая ацэначнасць рэкламаванага тавара. Даследчыкі (Н.Д. Аруцюнава, А.М. Вольф, Р.І. Макшанцаў і інш.) вызначаюць ацэнку як сацыяльна-ўстаноўленыя і замацаваныя ў семантыцы моўных адзінак адносіны суб'екта да рэчаіснасці.[268] Ацэначнасць – атрыбут працэсу спазнання і разумення. М.М. Бахцін сцвярджаў: "Безацэначнае разуменне немагчымае. Нельга раздзяліць разуменне і ацэнку. Яны адначасовыя і складаюць адзіны каштоўнасны акт".[269]

Рэклама, будучы мадэллю рэальнага свету, фарміруе кантэкст беспраблемнага, эмацыянальнага, паспяховага жыцця, адсейвае ўсё негатыўнае і змрочнае. Як вядома, станоўчыя эмоцыі стымулююць дасягненне мэты, настойліва засланяюць адмоўныя, непрыемныя сітуацыі. Адпаведна

[268] Арутюнова, Н.Д. Язык и мир / Н.Д. Арутюнова. – М.: Языки русской культуры, 1984. – С. 5.

[269] Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М.: Искусство, 1979. – С. 327.

стваральнікі рэкламы запрашаюць у сферу бязвоблачнага жыцця, не ўскладненага клопатамі. Рэклама “стварае свет, у якім утульна жыць; стварае настрой, які хочацца раздзяліць; выклікае прыемныя асацыяцыі; весяліць і далікатна супакойвае”.[270] Па гэтай прычыне семантыка абсалютнай большасці слоў рэкламнага тэксту – выключна станоўчая. Разнастайнасць варыянтаў зводзіцца да выбару слоў у рэчышчы пазітыву: *новы, добры, станоўчы, эфектыўны; вялізасны выбар; безлімітнае лета, лепшы варыянт, самы сціслы тэрмін* і інш.

Рэклама кнігі характарызуецца ўжываннем станоўча-ацэначных слоў, аднак на фоне рэкламнай прадукцыі заўважаецца разнастайнасць формы ацэнак (нават пры ўсёй стрыманасці, класічнасці манеры). Сучасныя варыянты ацэнак у кніжнай рэкламе больш разняволеныя ў лексіцы, прычым прадметам ацэнкі выступае і кніга ў цэлым (*кніга стане цудоўным падарункам, аўтар гэтай прыгожай кнігі…*), і яе асобныя элементы (*выданне ўключае арыгінальныя матэрыялы, рэдкую інфармацыю, прафесійна выкананыя ілюстрацыі* і інш.), і майстэрства пісьменніка (*пададзена ў захапляльнай манеры, напісана жывой/сакавітай/даступнай мовай*).

Папулярнасць класічных выданняў падкрэсліваецца іх міжнародным прызнаннем (*стала бестселерам, адна з культавых кніг, інтэлектуальныя чытачы не маглі не заўважыць* і інш.). Анатацыі да мастацкіх тэкстаў, як правіла, ацэньваюць перавагі сюжэта (*займальны, цікавы, арыгінальны, палемічны, павучальны, правакацыйны, дынамічны* і інш.). У некаторых выпадках аб’ектам ацэнкі выступае заслужаны аўтарытэт асобы пісьменніка:

Прапанаваны зборнік уяўляе сабой унікальнае выданне, якое ўпершыню сабрала ў межах адной кнігі актуальныя і сёння думкі Д.С. Ліхачова пра гісторыю і культуру, пра найважнейшыя духоўныя якасці чалавека, пра інтэлігентнасць сапраўдную і фальшывую, пра экалогію культуры і захаванне навакольнага асяроддзя на планеце Зямля. Адзін з самых таленавітых вучоных-гуманітарыяў XX стагоддзя, філолаг, прызнаны грамадскі дзеяч Дзмітрый Сяргеевіч Ліхачоў (1906–1999) увасобіў вобраз патрыёта, тып сапраўднага інтэлігента, якому быў непрыемлемы нацыяналізм ва ўсіх праяўленнях.

Прызначаны для шырокага круга чытачоў, якія цікавяцца мінулым, сённяшнім днём айчыннай культуры, гісторыі, філасофіі.[271]

Такім чынам, названыя спецыфічныя рысы рэкламнага тэксту (станоўчасць зместу, дыялагічнасць, дзеяслоўныя і займеннікавыя формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку, мы-формы і інш.) ствараюць навуковы базіс для працы з тэкстам рэкламы. Тэарэтычны матэрыял дапамагае асэнсаваць рэкламны тэкст як комплексны сродак камунікацыі, усвядоміць яго спецыфіку, задачы: *зацікавіць* (затрымаць увагу), *пераканаць* (праз інфармацыю аб прадмеце рэкламы), *заахвоціць купіць, спажываць* пэўныя рэчы.

[270] Мокшанцев, Р.И. Психология рекламы: учебное пособие / Р.И. Мокшанцев. – М.: Инфра-М, 2005. – С. 35.

[271] Лихачев, Д.С. Избранное / Д.С. Лихачев. – М.: Рос. фонд культуры, 2006. – С. 4.

Мэтазгодна паведаміць вучням асобныя цікавыя факты з гісторыі ўзнікнення, развіцця рэкламы. Рацыянальна нагадаць, што тэрмін *рэклама* паходзіць з лацінскага слова *‘гучна, гучна крычаць, апавяшчаць’*. Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі і Рыме аб’явы для насельніцтва гучна зачытваліся/выкрыквaліся на плошчах. Бойкія гандляры голасна распавядалі пра свой тавар, фактычна стваралі першыя рэкламныя тэксты.

Філолагі лічаць, што лац. дзеяслоў *reclamare* – крычаць, выкрыкваць – выразна адлюстроўвае стадыю бытавання вуснай славеснай рэкламы. Пашырэнне рэкламных працэсаў у культуры розных рэгіёнаў спарадзіла і іншыя абазначэнні гэтага паняцця. У сучаснай нямецкай лексіцы выкарыстоўваецца слова Werbung, якое акцэнтуе ўздзеянне рэкламы, што, на думку лінгвістаў, паводле роднаснага кораня атаясамліваецца з дзеясловам *вербаваць*. Французская, італьянская, іспанская мовы дадалі ў скарбонку да reclaim словы publicite (франц.), publicitad (ісп.), якія падкрэсліваюць масавасць рэкламнага адрасата.

Этымалогія паняцця ў розных мовах зафіксавала параметры вядучай дзейнасці: інфармацыйнасць, масавая адрасаванасць і эмацыянальная афарбоўка. На думку даследчыкаў, першымі прафесійнымі прадстаўнікамі рэкламнага слова былі гарадскія вяшчальнікі, актыўная роля якіх у антычным грамадстве зафіксавана ў шматлікіх мастацка-літаратурных творах. Па меркаванні В.В. Вучонавай, Н.У. Старых, “рэдкая з камедый Арыстафана абыходзіцца без такой дзейнай асобы, як вяшчальнік. Неаднаразова згадваюць пра гэтую пасаду і знакамітыя гісторыкі Герадот, Палібій, Тацыт, Плутарх”.[272]

Далейшая гісторыя рэкламы абумоўлена працэсамі ўрбанізацыі. Пасада вяшчальніка бытавала ў еўрапейскіх гарадах, якія дасягалі насельніцтва ў некалькі тысяч чалавек. Вынаходніцтва пісьма, друкаванага станка, праца тыпаграфій сталі новым этапам у развіцці рэкламнай дзейнасці. Так, В.С. Люблінскі сведчыць, што паступова выдаўцы пачалі суправаджаць кнігі рэкламнымі аб’явамі, звесткамі пра цэны і тыражы. Напрыклад, венецыянскі выдавец і вучоны Альд Мануцый, “надрукаваўшы свае першыя кнігі на грэчаскай мове, у 1498 годзе выдаў іх каталог з указаннем цаны”,[273] тым самым увёў у шырокае ўжыванне жанр прэйскуранта. З часам нараджаюцца новыя рэкламныя жанры – каталог, друкаваныя афішы, эмблемы, экслібрысы, шыльды. Цікава, што каралеўскім указам у Англіі ў 1563 годзе тэатрам было прадпісана: “Акцёры павінны павесіць play-bills (афішы) каля пошты за некалькі дзён да прадстаўлення з паведамленнем аб тэатральным дзеянні”.[274]

У Расіі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя жанр афішы (падпісныя, тэатральныя, балаганныя), гарадской шыльды эвалюцыянуе ад самадзейнага да прафесійнага. З’яўляюцца нават першыя вучэбныя дапаможнікі, што

[272] Ученова, В.В. История рекламы: учебное пособие / В.В. Ученова, В.В. Старых. – М.: Юнити-ДАНО, 2008. – С. 37.

[273] Люблинский, В.С. Книга в истории человеческого общества: учебное пособие / В.С. Люблинский. – М.: Книга, 1972. – С. 118.

[274] Ученова, В.В. История рекламы: учебное пособие / В.В. Ученова, В.В. Старых. – М.: Юнити-ДАНО, 2008. – С. 116.

раскрываюць майстэрства афармлення афіш і шыльдаў. Так, у кнізе “Живописец вывесок” падрабязна разглядаюцца прыёмы стварэння афіш, раскрываецца дарэчнасць выкарыстання і спалучэння розных колераў. Аўтар прынцыпова заяўляе: “Напісанне шыльдаў складае асобны раздзел малярнай справы”.[275] Шыльда пачынае разглядацца як частка народнага мастацтва.

Асобная старонка ў гісторыі рэкламы – развіццё рэкламнага плаката ў Расіі. Міжнародная выстаўка мастацкай афішы (196 мастацкіх ілюстрацый) у 1897 годзе ў Санкт-Пецярбургу і Маскве прадэманстравала плакат як арыгінальную галіну творчасці. Дзякуючы намаганням шматлікіх удзельнікаў рэкламны плакат дасягнуў мастацкага ўзроўню. Як сведчаць мастацтвазнаўцы, рускі рэкламны плакат “не быў назойлівым. У плакатах пераважалі спакойныя інтанацыі. Тым не менш яго вобразная мова, заклікі і тэксты былі пераканаўчымі і красамоўнымі, багатыя на метафары і гіпербалы”.[276] Цікава, што першыя плакаты, уключаныя ў першы мастацкі каталог, датаваныя 1897 годам.

Неабходнай асновай для творчых даследаванняў навучэнцаў паслужаць выданні, прысвечаныя гісторыі беларускага рэкламнага тэксту.[277] На этапе знаёмства з рэкламай варта нагадаць спецыфічныя асаблівасці жанру: сцісласць, даступнасць інфармацыі, камбінаванне вербальнай і невербальнай састаўных тэксту, асноўныя функцыі рэкламы:

– *інфармацыйную* (паведамляе пра пэўную паслугу або тавар);

– *пабуджальную* (заклікае скарыстацца пэўнай паслугай або набыць тавар).

На аснове літаратуры можна прапанаваць скласці табліцу для ўразумення асаблівасцей рэкламы і яе функцыянальнага прызначэння (табл. 3.1.1).

Табліца 3.3.1 – Асаблівасці рэкламнага тэксту

Лінгвістычныя асаблівасці рэкламнага тэксту	*Функцыянальныя задачы рэкламнага тэксту*
Лаканічнасць	Павысіць ролю моўных сродкаў, узмацніць іх інфармацыйны змест
Арыгінальнасць, нестандартнасць маўленчага афармлення	Садзейнічаць запамінанню інфармацыі, выкарыстоўваць разнастайныя вербальныя/невербальныя сродкі
Прагматычны характар рэкламнага тэксту	Стварыць пераканаўчы, запамінальны рэкламны вобраз

[275] Семенюк, А.И. Живописец вывесок: практическое руководство / А.И. Семенюк. – Петроград: М.П. Петров, 1916. – С. 43.

[276] Русский рекламный плакат. – М.: Контакт. Культура, 2001. – 224 с.

[277] Дурович, А.П. Реклама в туризме: учебное пособие / А.П. Дурович. – Минск: БГЭУ, 2000. – 191 с. Демешко, Л.А. Библиотечная реклама: учебное пособие / Л.А. Демешко. – Минск: БГУКиИ, 2011. – 184 с.; Калачева, И.И. Социальная реклама (с электронным приложением): учебное пособие / И.И. Калачева. – Минск: БГУ, 2017. – 135 с. ; Мицкевич, Ю.В. Реклама в сфере культуры: учебное пособие / Ю.В. Мицкевич. – Минск: РИВШ, 2022. – 172 с.

Лінгвістычныя асаблівасці рэкламнага тэксту	*Функцыянальныя задачы рэкламнага тэксту*
Камунікатыўна-мэтазгодны падбор маўленчых сродкаў	Раскрыць асноўнае прызначэнне рэкламы, яе змест, ідэю
Функцыянальна-стылістычнае адзінства ў афармленні тэксту	Захаваць дакладнасць інфармацыі, пазбегнуць алагізмаў, памылак
Экспрэсіўнасць рэкламнага паведамлення	Зацікавіць гледача
Пабуджальны характар рэкламнага тэксту	Пераканаць набыць тавар, стымуляваць да пэўных дзеянняў

З дапамогай інфармацыі, прыведзенай у табліцы, вучні аналізуюць прыклады рэкламных тэкстаў, акрэсліваюць неабходныя і дадатковыя кампаненты, іх маўленчае афармленне і функцыянальнае прызначэнне. Веданне асноўных параметраў тэкстаў стварае аснову для разумення “эталонных” узораў у сферы рэкламы.

Варта пазнаёміць вучняў са структурай рэкламнага тэксту, для гэтага можна размясціць адпаведны матэрыял у табліцы (табл. 3.3.2).

Табліца 3.3.2 – Структура рэкламнага тэксту

№	*Кампаненты рэкламнага тэксту*	*Змест кампазіцыйнай часткі рэкламнага тэксту*	*Мэтавае прызначэнне кампанента*
1.	Загаловак як самастойны тэкставы кампанент, які перадае пэўную думку	Інфармацыя пра тавар, падзею, новую паслугу	Звярнуць увагу на інфармацыю, зацікавіць чытача/слухача/гледача, даць пэўныя абяцанні/прагнозы
2.	Слоган № 1	Сцісла выраз, які лёгка запамінаецца	Сфармуляваць думку, сэнс рэкламы ў форме навіны, пытання, паведамлення, парады
3.	Інфармацыйны блок	Агульнае ўяўленне пра змест і спецыфіку рэкламнага аб’екта	Раскрыць ідэю, асноўную задуму рэкламы
4.	Даведачная інфармацыя	Рэквізіты аўтараў рэкламы (тэлефоны, адрас)	Матываваць патэнцыяльнага пакупніка/спажыўца да кантактаў, супрацоўніцтва
5.	Слоган № 2	Трапны, скандэнсаваны выраз, што змяшчае дадатковую інфармацыю	Лагічна, пераканаўча завяршыць рэкламны тэкст

З мэтай асэнсаваць асаблівасці структуры рэкламы можна прапанаваць заданне: *Падбярыце тэкст рэкламы з дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў, выдзеліце ў ім загаловак, слоган № 1, інфармацыйны, даведачны блокі, слоган № 2.*

Сучасная рэклама найчасцей звяртаецца да традыцыйных сацыяльных каштоўнасцей: здароўя, камфорту, прыгажосці, задавальнення патрэбнасцей, аўтарытэту, клопату і дапамогі, бяспекі, выключнасці, навізны, прагрэсіўных рашэнняў, індывідуальнасці, арыгінальнасці, надзейнасці, лідарства, прафесіяналізму, самаўдасканалення, якасці тавараў і паслуг. Да найбольш папулярных пабуджальных матываў як зместавых кампанентаў рэкламы, прадстаўленых у слоганах, адносяцца: клопат пра здароўе, гу′сты, жаданне мець і карыстацца навінкамі прагрэсу, станоўчыя эмоцыі, імкненне да прыгажосці, эканомія часу, сіл, грошай, камфорт, надзейнасць паслуг, прэстыж, пашырэнне магчымасцей, самасцвярджэнне, атрыбуты кар'ернага росту і інш. Такая інфармацыя можа стаць для вучняў старшых класаў асновай для даследавання на тэму *"Прыярытэты сучаснай айчыннай рэкламы"*.

Абавязковым кампанентам працы з рэкламным тэкстам выступаюць назіранні над спецыфікай адбору маўленчых сродкаў. Моўны аспект рэкламы ўяўляе сабой сферу практычнай дзейнасці, прадуктам якой з'яўляецца тэкст. Агульны фон рэкламы, яе кантэкст ствараюць ідэальную карціну свету, у якой жывуць выключна прыгожыя людзі, што карыстаюцца паслугамі і набываюць прадметы самай высокай якасці. Гэтая прыгожая карціна ствараецца пераважна з дапамогай моўных сродкаў. Адпаведна аналіз моўных сродкаў выяўляе патэнцыял, задзейнічаны для характарыстыкі паслугі. З гэтай прычыны найважнейшай умовай эфектыўнасці жанру з'яўляецца нестандартнасць, арыгінальнасць маўленчага афармлення, паколькі шаблоны – ворагі рэкламы.

Для найбольшага ўздзеяння на чытача кампазіцыя рэкламы абавязкова ўключае слоган, які добра запамінаецца, міжволі застаецца ў памяці. З гэтай мэтай у інфармацыйна-вобразных рэкламных тэкстах выкарыстоўваюцца:

– дзеяслоўныя формы загаднага ладу, якія служаць для актывізацыі чытача, закліку дзейнічаць: *Мама і тата! Выбірайце жыццё! Выбірайце каханне! Выбірайце мяне! Не дапусці аборту. Пазвані – дапаможам* (Міністэрства аховы здароўя)*; Не зразай! Не купляй! Не прадавай! За зніштажэнне першацветаў пагражае штраф* (Minsk.priroda.gov.by); *Зачыняй кран, пакуль чысціш зубы* (Экалогіка); *Жывіце з Халвой*;

– канкрэтныя назоўнікі, што прадстаўляюць прадмет рэкламы: *Бюро ювелірных капрызаў; Conte, серыя Femina*;

– спецыяльная тэрміналогія, для якой не характэрна экспрэсія: *Сем карат. Ювелірная сетка*; *Голд Амега-3, Дастаўка пасылак у Расійскую Федэрацыю*;

– канструкцыі з бяззлучнікавым аб'яднаннем аднародных членаў сказа, што надаюць паведамленню кампактнасць: *Посуд – шкляны, фарфоравы, фаянсавы, алюмініевы*;

– рытарычныя сказы як сродак зацікавіць чытача/гледача, звярнуць іх увагу: *Хочаце паспрабаваць райскую асалоду? Хочаце пераможыць дзіва? Хочаце адчуць раскошу?*

– інверсія як прыём канцэнтрацыі інфармацыі, паўторы: *Сталы камп'ютарныя, тавары канцылярскія. Самы шырокі выбар. Самыя нізкія цэны. Самыя новыя мадэлі*;

– аднасастаўныя намінатыўныя сказы, двухсастаўныя сказы: *Расці хутчэй (УМКА); Моцны характар – яркая гульня; Мы адчыніліся!*

– індывідуальныя словаўтварэнні: *Не тармазі! Снікерсні*;

– персаніфікацыя адрасанта: *ТЭФАЛЬ клапоціцца пра вас*;

– спалучэнне кірыліцы і лацініцы ў мове рэкламнага тэксту: *Vulitsa Ezha (гастрафэст); Olimp-store.by (паліграфічныя паслугі); asaloda (вітаміны круглы год. Электрасокавыціскалкі); крэм для рук MARTYSYA; ZOOshans.by (знайдзі сябра. Ад адзіноты ніхто не застрахаваны); SOKOLOV (продаж ювелірных вырабаў)*;

– фанетычныя паўторы, рыфмаваныя рэкламныя слоганы: *Ваша кіска купіла б віскас; Залятай у лета; Яркае марожанае для яркіх людзей; Толькі ў нас, у нас і больш нідзе; Падарыце сабе, падарыце часцінку французскага шарму і інш.*

Прыведзеныя прыклады выяўляюць спецыфіку мовы рэкламы, якая заклікае да аптымальнага выбару. Даследчыкі падкрэсліваюць, што мове рэкламы ўласцівыя павышаная метафарычнасць, моўная гульня, дзе асацыятыўнае і асноўнае значэнні пераклікаюцца, напластоўваюцца. Прыярытэт слоў з семантычным "зрухам над адзінкамі, што ўжываюцца ў іх асноўным значэнні, дае права назваць мову рэкламы самабытным, самадастатковым утварэннем, дыстанцыянаваць яе ад іншых стыляў".[278]

Такім чынам, стылістыка рэкламных твораў рэалізуе патэнцыяльныя магчымасці мовы і ўплывае на маўленчыя характарыстыкі тэксту. З улікам маўленчай арганізацыі рэкламных тэкстаў могуць выконвацца *заданні:*

– прачытайце/падбярыце рэкламныя слоганы, назвы рэкламных аб'ектаў, арганізатараў рэкламы. Вызначце, якія моўныя асаблівасці характэрныя для іх;

– прачытайце/падбярыце рэкламныя слоганы, вызначце, якой аўдыторыі адрасавана пэўная рэклама (падлеткам, моладзі, дарослым людзям, старэйшаму пакаленню);

– ахарактарызуйце маўленчыя сродкі, якія ўказваюць на мэтавую аўдыторыю;

– прачытайце/падбярыце слоганы. Назавіце маўленчыя сродкі, што ствараюць станоўчыя асацыяцыі, пазітыўны фон рэкламнага тэксту;

– знайдзіце ў СМІ прыклады найбольш удалых, на ваш погляд, рэкламных аб'яў і слоганаў. Матывуйце, якімі крытэрыямі вы карысталіся пры выбары аптымальных, на вашу думку, варыянтаў;

– прачытайце рэкламныя тэксты. Якія дзеяслоўныя канструкцыі ў іх скарыстаны? Прааналізуйце ўжытыя граматычныя формы. Растлумачце, як канкрэтная форма "ўпісваецца" ў рэкламны твор і дапамагае вызначыць аўдыторыю чытачоў/гледачоў;

[278] Резенков, А.В. Функционально-стилевой статус рекламных текстов малых форм: монография / А.В. Резенков. – СПб.: СПб. гос. ун-т, 2010. – 114 с.

– акрэсліце асаблівасці ўжывання марфалагічных і сінтаксічных сродкаў у мове рэкламных тэкстаў;

– даследуйце рэкламныя паведамленні. Ці можна, на вашу думку, лічыць гэтыя тэксты эфектыўнымі ў зместавым і маўленчым афармленні? Пры неабходнасці дапоўніце (замяніце) інфармацыю, матывуючы трансфармацыі;

– параўнайце рэкламныя тэксты блізкай тэматыкі. Які з тэкстаў больш выйгрышны? Якой інфармацыі нестае ў тэкстах? Разгарніце варыянты рэкламных паведамленняў з мэтай узмацніць пераканаўчасць, доказнасць інфармацыі: *Свет Вашаму дому! (магазін асвятляльных прыбораў); Мы ў адказе за тых, каго падключаем (інтэрнэт-правайдар); Хай будзе свет! (паслугі майстра па рамонце асвятляльных прыбораў)*;

– прааналізуйце газету з рэкламнымі аб’явамі. Выпішыце з тэкстаў сінтаксічныя канструкцыі, карэктныя/некарэктныя пры рэкламаванні тавараў;

– прачытайце слоганы, што раскрываюць розныя аспекты сацыяльнага жыцця. Прааналізуйце мову тэкстаў. Знайдзіце вобразныя сродкі, стылістычныя фігуры, звярніце ўвагу на сінтаксічную будову выказвання. Ацаніце агульны кантэкст маўленчага афармлення:

Разам мы – Беларусь. За Беларусь! Жывіце мудра, працуйце сумленна. Модна быць здаровым. Пазваніце бацькам. Пагаварыце са сваім дзіцём. Ваша дзіця мае патрэбу ў клопаце. Падарыце цеплыню.

Якія з тэкстаў выклікалі ў вас станоўчыя эмоцыі, якія – непрыемныя? Пры другім адказе прапануйце ваш варыянт гучання слогана.

Асобным аб’ектам увагі вучняў можа стаць праца з сацыяльнай рэкламай. Як вядома, *сацыяльная рэклама* – гэта разнавіднасць камунікацыі, арыентаванай на акцэнтаванне ўвагі да самых актуальных праблем грамадства і яго маральных каштоўнасцей. У артыкуле 2 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб рэкламе” прыводзіцца наступная дэфініцыя: “*Сацыяльная рэклама* – гэта рэклама, якая ўтрымлівае інфармацыю дзяржаўных органаў па пытаннях правоў, якія ахоўваюцца законам, інтарэсаў або абавязкаў арганізацый або грамадзян, здаровага ладу жыцця, мер па ахове здароўя, бяспекі насельніцтва, сацыяльнай абароне, прафілактыцы правапарушэнняў, ахове навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, развіцці беларускай культуры і мастацтва, міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, дзяржаўных праграм у сферах аховы здароўя, адукацыі, культуры і спорту, іншых з’яў сацыяльнага характару”.[279]

Задачы сацыяльнай рэкламы згодна з Законам наступныя:

– фарміраванне грамадскай пазіцыі;
– акцэнтаванне ўвагі да актуальных праблем грамадскага жыцця;
– стымуляванне станоўчых дзеянняў, скіраваных на вырашэнне праблем;
– фарміраванне пазітыўных адносін да дзяржаўных структур;
– дэманстрацыя сацыяльнай адказнасці бізнесу.

[279] Закон Рэспублікі Беларусь “Аб рэкламе” ад 04.01.2021 № 225-З [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://pravo.by/. – Дата доступу: 10.01.2021.

На думку прафесара І.І. Калачовай, “сацыяльная рэклама як разнавіднасць масавай камунікацыі ўяўляе сабой уплывовы інструмент уздзеяння на сацыяльныя групы… Задачай дадзенай разнавіднасці рэкламы з’яўляецца фарміраванне новых мадэлей паводзін і дзейнасці”.[280]

Аналіз тэкстаў сацыяльнай рэкламы дапамагае не толькі зразумець, актуалізаваць значныя для ўсяго грамадства праблемы, але і прымусіць задумацца над імі, выпрацаваць уласныя адносіны да складаных жыццёвых пытанняў, маральна-этычныя імператывы адказных паводзін.

Акрэсліць спецыфіку сацыяльнай рэкламы можна праз выяўленне яе асаблівасцей у параўнанні з рэкламай камерцыйнай.[281]

Табліца 3.3.3 – Камерцыйная і сацыяльная рэклама: параўнальны аналіз

Крытэрый	*Камерцыйная рэклама*	*Сацыяльная рэклама*
Паняцце	Форма камунікацыі, што ажыццяўляецца праз платныя сродкі распаўсюджвання інфармацыі з указаннем крыніц фінансавання	Разнавіднасць камунікацыі, арыентаванай на вырашэнне надзённых грамадскіх праблем, засваенне духоўных каштоўнасцей
Прызначэнне	Актуалізацыя брэнда, тавара, паслугі на рынку	Гуманізацыя грамадства праз фарміраванне базавых каштоўнасцей
Місія	Змяненне мадэлей паводзін у грамадстве з эканамічных пазіцый	Змяненне мадэлей паводзін у грамадстве з сацыяльна адказных пазіцый
Роля	– маркетынгавая; – эканамічная; – сацыяльная; – камунікатыўная; – інфармацыйная	– адукацыйная; – выхаваўчая; – агітацыйная; – камунікатыўная; – інфармацыйная
Прадмет рэкламы	– тавар; – паслуга; – аб’ект (кампанія, брэнд)	Ідэя, што мае сацыяльную каштоўнасць
Тыпы/разнавіднасці	– спыжывецкая; – палітычная; – іміджавая; – адрасная;	– некамерцыйная; – грамадская; – дзяржаўная; – уласна сацыяльная

[280] Калачева, И.И. Социальная реклама (с электронным приложением): учебное пособие / И.И. Калачева. – Минск: БГУ, 2017. – С. 13.

[281] Николайшвили, Г.Г. Социальная реклама. Теория и практика: учебное пособие / Г.Г. Николайшвили. – М.: АспектПресс, 2018. – С. 13–14.

Крытэрый	*Камерцыйная рэклама*	*Сацыяльная рэклама*
	– карпаратыўная; – сацыяльная (грамадская)	
Мэта	– прадставіць, разгарнуць інфармацыю; – пераканаць; – напомніць; – заахвоціць да пакупкі, да пэўнага выбару	– акцэнтаваць увагу да актуальных сацыяльных праблем; – змяніць адносіны да пэўнай сацыяльнай праблемы
Форма размяшчэння	Платная	Пераважна бясплатная
Спосабы ацэнкі эфектыўнасці	Эфектыўнасць вызначаецца з дапамогай анкетавання, змяненняў у продажы, выбары пэўнай гандлёвай маркі	Эфектыўнасць складана вызначыць: цяжка зафіксаваць дынаміку пэўнай духоўнай каштоўнасці, убачыць змены ў паводзінах, адносінах у грамадстве

Табліца адлюстроўвае базавыя крытэрыі, што адрозніваюць камерцыйную і сацыяльную рэкламу, падкрэслівае духоўны змест сацыяльнай рэкламы. Яе вынікі праяўляюцца толькі ў перспектыве.

Такім чынам, сацыяльная рэклама даводзіць да масавага карыстальніка найбольш значныя факты, праблемы, якія маюць значэнне для жыццядзейнасці не аднаго чалавека, а ўсяго грамадства. Даследчыкі вылучаюць асноўныя вектары сённяшніх рэкламных кампаній на беларускай мове:[282]

– папулярызацыя роднай мовы, заахвочванне гаварыць па-беларуску. У гэтым кантэксце прафесійна распрацаванымі варта назваць наступныя рэкламныя тэксты:[283] *Маё першае слова – дзякуй. Маё першае слова – сябар. Маё першае слова – каханне. Прыгожа маўчыш па-беларуску? Якім будзе тваё першае слова на роднай мове? Калі ты гаворыш на чужой мове – ты гаворыш чужым ротам* (апошняя рэклама самая няўдалая, паколькі выраз *гаварыць чужым ротам* не ўласцівы беларускай мове, сканструяваны не ў стылі беларускіх сінтаксічных формул). Рэплікі ў форме пытальных і клічных сказаў адпавядаюць энергетычнаму патэнцыялу, стылю, духу, правілам беларускай мовы: *Беларусам быць модна! Беларускае – самае маё! Ма-ма = мо-ва. Любіш маму? Калі ласка, размаўляй са мной па-беларуску!*;

[282] Шасцярнёва, Л. Праблематыка беларускамоўнай рэкламы / Л. Шасцярнёва // Журналістыка-2017: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы XXI Міжнар. навук. практ. канф., Мінск, 16–17 лістапада 2017 г. / рэдкал.: С.В. Дубовік [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2017. – С. 295–299.

[283] Ненавязчивая социальная реклама, вызывающая у белорусов патриотические чувства // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://marketing.by/novosti-rynka/nenavyazchivaya-sotsialnaya-reklamavyzyvayushchaya-u-belorusov-patrioticheskie-chuvstva/. – Дата доступу: 02.09.2023.

– станоўчы вопыт вырашэння праблемы выхавання павагі да беларускай мовы, акцэнтаванне яе годнасці, высокага статусу (рэкламная кампанія “Будзьма беларусамі”). Набылі папулярнасць праекты: “Не маўчы па-беларуску” (выданне беларускамоўных календароў, распаўсюджванне sms, камплектаў паштовак, анімацыйных фільмаў і інш.);

– папулярызацыя мілагучнасці беларускай мовы, выхаванне патрыятычных пачуццяў уласцівы праекту “Адчуй смак беларускай мовы”;

– павышэнне папулярнасці беларускамоўных праектаў, напрыклад, ”Смак беларускіх здымкаў”;

– вырашэнне экалагічных праблем сучаснасці, павышэнне клопату аб прыродзе, флоры і фаўне Беларусі і інш.

Такім чынам, праца з тэкстам рэкламы – адзін з перспектыўных накірункаў фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, што дазваляе рэалізаваць узаемасувязь прадметных ведаў з патрэбнасцямі соцыуму, павысіць патэнцыял сучаснай адукацыі на аснове сінтэзу ведаў, уменняў арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў.

У маўленчых адносінах рэклама тавараў і кніжная рэклама адрозніваюцца. У таварнай рэкламе моўныя асаблівасці (гульня слоў, рытарычныя пытанні і інш.) разглядаюцца як сродкі адрасацыі, скіраваныя на масавую аўдыторыю. Кніжная рэклама, у параўнанні з таварнай, разлічаная на чытачоў, таму інтэлектуальныя патрэбнасці афармляюцца больш вытанчана, дыферэнцыравана, індывідуалізавана.

Праца з рэкламнымі тэкстамі можа адбывацца праз уласныя праекты вучняў. У гэтым аспекце тэксты рэкламы могуць разглядацца як актыўны сродак маўленчага развіцця, узбагачэння пазнавальнага вопыту ў міждысцыплінарных даследаваннях. Напрыклад, каб стварыць невялікі рэкламны тэкст, неабходныя не толькі веданне маўленчых сродкаў, якія эфектыўна ўздзейнічаюць на адрасата, але і звесткі пра псіхалогію спажыўцоў, асаблівасці развіцця сучаснага рынку, спецыфіку ўплыву на суб’ектаў рэкламнай дзейнасці, навыкі пошуку і аналізу гатовых рэкламных тэкстаў, прынцыпы самастойнай распрацоўкі слоганаў, іх практычнае асэнсаванне, першасны вопыт у стварэнні сацыяльнай рэкламы. Задачамі індывідуальных праектаў могуць быць засваенне спецыфікі рэкламных тэкстаў, аналіз іх маўленчых сродкаў (стылістычныя, марфалагічныя асаблівасці, лексіка, сінтаксічныя канструкцыі), спасціжэнне прыёмаў уздзеяння на чытачоў (слоган як маўленчая ідэя, тактыка, загаловак, змест і структура рэкламных тэкстаў).

Можна прапанаваць наступныя тэмы вучэбна-даследчых праектаў:

– Камунікатыўная эфектыўнасць рэкламнага тэксту.
– Графічныя сродкі ў тэксце рэкламы.
– Жанры рэкламы і іх асаблівасці.
– Лінгвістычныя асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне рэкламы.
– Лінгвістычны аналіз тэкстаў беларускамоўнай рэкламы.

– Прынцыпы адлюстравання жыцця ў мове рэкламы.
– Роля рэкламы ў жыцці беларускага грамадства.
– Рэклама – сучасны маўленчы жанр.
– Рэклама як сацыяльная з’ява.
– Роля, аб’ём рэкламы і культура маўлення.
– Рэклама як лінгвістычны феномен.
– Рэклама як цэласны тэкст.
– Рэклама як сродак пазнання і зносін.
– Рэклама як тып камунікацыі.
– Рэклама: максімум інфармацыі і мінімум слоў.
– Рэкламная камунікацыя.
– Сацыяльны эфект сучаснай беларускамоўнай рэкламы.
– Слова і графіка ў рэкламе.
– Рэклама як мастацтва слова.
– Стылістыка рэкламы: прыёмы стварэння рэкламных тэкстаў.
– Рэклама – тэкст масавай камунікацыі.
– Тэхналогія распрацоўкі вуснага рэкламнага тэксту.
– Вулічная рэклама: спецыфіка і стылістыка сённяшняга дня.
– Рэклама на вуліцах нашага горада.
– Эвалюцыя айчыннай рэкламы.
– Сучасныя набыткі беларускамоўнай рэкламы.
– Экскурсія ў мінулы/заўтрашні дзень рэкламы.
– Гісторыя беларускамоўнай рэкламы.
– Эфектыўнасць маўленчых сродкаў рэкламных тэкстаў.
– Прыёмы стварэння гумару ў рэкламным тэксце.
– Маўленчая спецыфіка рэкламнага тэксту-паведамлення.
– Рэклама ў розных сферах жыцця грамадства.
– Нацыянальныя каштоўнасці беларусаў у сучаснай рэкламе.
– Адлюстраванне ментальнасці беларусаў у сучаснай рэкламе.
– Беларускамоўны рэкламны тэкст як культурная з’ява.
– Беларускамоўны рэкламны тэкст як крыніца культурнага вопыту народа.
– Мадэлі грамадскіх паводзін у сацыяльнай рэкламе.
– Вербальныя і невербальныя кампаненты сучаснай рэкламы.
– Рэкламны тэкст як сродак фарміравання масавай свядомасці адрасата.
– Беларускамоўная рэклама як сродак папулярызацыі роднай мовы.
– Адлюстраванне сацыяльных праблем у сучаснай рэкламе.
– Дамінаваныя ідэі сучаснай беларускамоўнай рэкламы.

3.4 Сістэма заданняў на аснове рэкламнага тэксту

1. Распрацуйце рэкламны тэкст з улікам чалавечых патрэбнасцей. Як вядома, патрэбнасці складаюць іерархічную залежнасць ад найбольш да найменш значных, развіваюцца ад фізіялагічных, што забяспечваюць жыццядзейнасць чалавека, да высокамаральных, уласцівых духоўнаму развіццю асобы. Карыстайцеся пірамідай патрэбнасцей, распрацаванай А. Маслоу.



Малюнак 3.2.1 – Піраміда патрэбнасцей (паводле А. Маслоу)

2. Прадумайце рэкламу-выстаўку беларускамоўнага часопіса/газеты.

Мэта такога мерапрыемства – зацікавіць чытачоў/слухачоў, заахвоціць іх да чытання. Гэта можа быць новы часопіс (газета), які толькі пачаў выдавацца або незаслужана забыты чытачамі. Вылучаюцца публікацыі, што раскрываюць актуальныя, жыццёва важныя праблемы, якія ўяўляюць грамадскі інтарэс. Як правіла, дэманструюцца водгукі на публікацыі ў СМІ, матэрыялы іншых выдавецтваў, што адлюстроўваюць праблему з розных пунктаў погляду. Загалоўкам выстаўкі часта з'яўляецца назва часопіса/газеты, афармленая тым жа шрыфтам і колерам, што і само выданне. Лагічныя назвы раздзелаў выстаўкі дубліруюць асноўныя рубрыкі часопіса/газеты.

3. Распрацуйце рэкламны праспект выстаўкі-дасье (выстаўкі-знаёмства).

Такія мерапрыемствы могуць быць арганізаваны як "Літаратурнае дасье чытача нашай бібліятэкі", "З чытацкага фармуляра", "Свет маіх любімых

кніг/старонак” і г.д. Як правіла, дэманструюцца любімая кніга чытача (рэальнага або віртуальнага), яго партрэт, аўтабіяграфія, адказы на пытанні анкеты, выказванні аб ролі кнігі/бібліятэкі ў яго жыцці, а таксама водзывы, меркаванні, уражанні аб прачытаных кнігах, парады і рэкамендацыі іншым чытачам, разважанні пра кнігі, чытацкія інтарэсы. Лагічнай часткай працы па арганізацыі такой выстаўкі можа стаць падрыхтоўка флаера – прыгожа ілюстраванага запрашальнага білета.

4. Выберыце лінейку рэкламы і рэкламных слоганаў адной прадукцыі (напрыклад, рэклама малочных прадуктаў рознымі малочнымі прадпрыемствамі). Знайдзіце станоўчыя і адмоўныя стэрэатыпы ў афармленні рэкламы. Выкарыстоўваючы матэрыял, паспрабуйце самастойна распрацаваць рэкламу і антырэкламу для любой вядомай маркі.

5. Падрыхтуйце слоган з мэтай стварэння прывабнага вобраза вашай школьнай/раённай/абласной бібліятэкі. Папярэдне азнаёмцеся з афармленнем сайта ўстановы, вядучымі слоганамі айчынных бібліятэк (Нацыянальная бібліятэка Беларусі, бібліятэка Акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка, дзіцячыя бібліятэкі г. Мінска і абласных устаноў культуры). Памятайце: слоган – найважнейшы кампанент рэкламнага паведамлення, асноўны дэвіз, які сцісла, вобразна адлюстроўвае сутнасць інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці. Паводле меркаванняў спецыялістаў, слоган чытаецца ў 5 разоў часцей, чым сам тэкст рэкламнага звароту. З гэтай прычыны ён павінен утрымліваць асноўную інфармацыю пра перавагі бібліятэчных паслуг.

Слоган (як правіла, утрымлівае не больш за 8–10 слоў) можа пазіцыянавацца як фірменны знак, што прадстаўляе ўстанову культуры. Так, расійскі бібліятэказнаўца В.А. Барысава сярод удалых слоганаў выдзяляе наступныя: *Інфармацыя без межаў; Банк інфармацыі заўсёды надзейны; У Вас праблема – у нас інфармацыя; Старыя традыцыі + новыя паслугі; Сустрэнемся ў бібліятэцы* і інш.

Пры распрацоўцы слогана ўлічыце наступныя патрабаванні:

– фраза, што складае слоган, павінна быць дынамічнай, сцісłай, правільнай, дагледжанай у фанетычных адносінах;

– слоган улічвае псіхалагічныя асаблівасці мэтавай аўдыторыі рэкламы;

– непажадана, каб слоган быў шматслоўным, складаным, аб’ёмным, звышарыгінальным;

– слоган не дапускае двухсэнсоўнасці, дваякага тлумачэння: напрыклад, “З вашай крышай усё ў парадку? Фірма “АРСИАН” выканае рамонт вашай крышы”. [284]

Рэкламазнаўцы (В.А. Барысава, Л.А. Дзямешка, С.І. Матліна і інш.) вылучаюць наступныя групы слоганаў паводле зместу:

– дружалюбнасць, абяцанні розных даброт (*Хочаце атрымаць райскую асалоду?*);

– указанне на час (*Час праходзіць – бібліятэкі застаюцца*);

[284] Борисова, О.О. Рекламно-информационные технологии библиотечной деятельности: учебное пособие / О.О. Борисова. – СПб.: Профессия, 2016. – С. 16–26.

– указанне на якасць, стыль жыцця (*Мы зменім ваша жыццё да лепшага*);

– указанне на людзей, асобу (*Чытач для нас – на першым месцы*);

– указанне на прыязнасць да чытача, да карыстальніка (*Свет без межаў у рамках нашай бібліятэкі*);

– пачуццё прыналежнасці, гарантаванасці (*З намі – у новае стагоддзе*).

6. Цікавым можа быць падрыхтоўка вучэбнага праекта. Напрыклад, часопіс "Беларускі музей" – мой, твой, наш". Гэты часопіс не так даўно з'явіўся ў беларускай медыясферы. Не ўсе нават зацікаўленыя ў развіцці беларускай культуры, беларускамоўнай рэкламнай дзейнасці ведаюць пра гэта выданне. Задача аўтараў праекта: распрацаваць рэкламны матэрыял (гэта можа быць буклет, флаер, афіцыйная інфармацыя для канкрэтных выданняў, прэзентацыя, якая пераканае кіраўнікоў арганізацый, кампаній у неабходнасці выпісваць новы часопіс, падтрымліваць выданне на інфармацыйным рынку.

Заданне можа быць сфармулявана так: *Распрацуйце асноўную ідэю часопіса, прадумайце нестандартныя спосабы размяшчэння інфармацыі. Асноўны пасыл рэкламы сфармулюйце самастойна.*

Сітуацыя. На сённяшні дзень музей не займае лідарскія пазіцыі як месца правядзення вольнага часу моладзі. Інфармацыйная сетка папулярызацыі сучасных накірункаў беларускай культуры і мастацтва мае разрознены характар. Такую функцыю бярэ на сябе новы часопіс. Структуру выдання складаюць рубрыкі, што рэкламуюць нацыянальныя археалагічныя помнікі, рарытэты, сучасныя праекты для моладзі: *"Музей у кожны двор", "18-ты квартал", "Арыгінальныя музейныя калекцыі", "Сакрэты музейных фондасховішчаў", "Рэстаўрацыя кніжнай даўніны"* і інш.

Мэта рэкламы: у сціслыя тэрміны сфарміраваць кола зацікаўленай аўдыторыі – маладых чытачоў часопіса.

Мэтавая аўдыторыя:

– маладыя, дынамічныя людзі, не абыякавыя да айчыннай культуры і мастацтва, да беларускамоўнасці;

– студэнты і выкладчыкі філалагічных, творчых спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі і сярэднеспецыяльных устаноў;

– навучэнцы сярэдніх і старшых класаў устаноў сярэдняй адукацыі.

У кантэксце прапанаванага задання могуць быць распрацаваны буклеты і праспекты бібліятэкі як найбольш мабільнай разнавіднасці распаўсюджвання рэкламы. Звычайна гэтыя віды рэкламнай прадукцыі змяшчаюць інфармацыю пра структуру і гісторыю бібліятэкі, накірункі яе дзейнасці, паслугі. Выкарыстоўвацца фотаздымкі фасада, інтэр'ера бібліятэкі, размяшчаюцца фотаздымкі калектыву, сціслыя звесткі пра гісторыю стварэння ўстановы. Тэкст суправаджаецца эпіграфам, зваротамі знакамітых чытачоў або кіраўніка бібліятэкі. У залежнасці ад мэтавай аўдыторыі тэкст афармляецца як акадэмічна-літаратурны або навукова-папулярны.

Пажадана падрыхтаваць запрашальны білет да культурнай падзеі: прэзентацыя бібліятэкі з нагоды юбілею, адкрыццё бібліятэкі пасля рамонту і інш. Арганізацыя рэкламнага прадукту можа быць прымеркавана да выхаду

новай кнігі пісьменніка-земляка, да вернісажу карцін мясцовага мастака, да сустрэчы з цікавым госцем. Задача запрашэння, як і іншага рэкламнага выдання, – акцэнтаваць увагу на высокай місіі бібліятэкі, прадэманстраваць сучасныя магчымасці ўстановы культуры, расказаць пра самыя цікавыя мерапрыемствы. Дзіцячыя бібліятэкі часта дадаюць да рэкламнай прадукцыі малюнак у форме акенцаў, упрыгожаных нацыянальна-культурным каларытам, кругамі з промнямі сонейка, сімваламі аб'яднання кніжнікаў, чытачоў (ліра, падсвечнік, фотаздымкі дзяцей з кніжкамі, гусінае пяро і інш.).

7. Прааналізуйце эфектыўнасць рэкламнага праекта з улікам крытэрыяў камунікатыўнай эфектыўнасці сацыяльнай рэкламы [285]:

– *распазнавальнасць* як уласцівасць рэкламнага паведамлення, што дазваляе хутка суаднесці яго з пэўнай тэмай (праблемай) і ўспрыманнем асноўнай інфармацыі пры беглым знаёмстве/праглядзе. Распазнавальнасць уплывае на ступень актуалізацыі праблемы (тэмы, ідэі) у свядомасці мэтавай аўдыторыі. Для ацэнкі створанага рэкламнага прадукту рацыянальна задзейнічаць наступныя пытанні: *Ці зразумела пры першым знаёмстве з рэкламай, пра якую праблему ідзе гаворка? Ці зразумелая асноўная думка, камунікатыўная задача рэкламы? У якой ступені выразна "прачытваюцца" дзеянні, да якіх заклікае рэклама? Ці зразумелыя вынікі праблемы? Ці зразумелая скіраванасць рэкламнай прадукцыі?*;

– *запамінальнасць* як уласцівасць рэкламы, задача якой – застацца ў памяці спажыўцоў. Спецыялісты лічаць запамінальнасць адным з асноўных крытэрыяў камунікатыўнай эфектыўнасці. На павышэнне запамінальнасці рэкламы працуюць, на думку Л.Д. Дзмітрыевай, тры асноўныя прыёмы: *інфармацыйныя паўторы* (мэтазгодна паўтараць асноўныя думкі ў розных варыянтах). Каб інфармацыя запаміналася трывала, чалавек павінен прачытаць яе не менш за тры разы; *нязвыкласць інфармацыі* (усё цікавае прыцягвае ўвагу і працуе на запамінанне, аднак неабходны акцэнт на незвычайнасці інфармацыі); *цэласнасць рэкламы* (падпарадкаванне паведамлення галоўнай думцы). Гэта адносіцца і да кампанентаў тэкст – малюнак. Зрокавы вобраз, не сугучны тэксту, рассейвае і адцягвае ўвагу ад сутнасці рэкламы.

Для аналізу запамінальнасці мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя пытанні: *Ці запомнілі вы рэкламу? Ці зможаце ўзнавіць слоган? Ці можаце апісаць выяву галоўных персанажаў? Што канкрэтна вы запомнілі з рэкламы? Да якога дзеяння заклікае рэклама? Які вобраз вам запомніўся?*;

– *прывабнасць* рэкламы, абумоўленая арыгінальнасцю і творчым падыходам да праблемы. Спецыялісты вылучаюць тры характарыстыкі паспяховага творчага рашэння: рэклама адпавядае задуме аўтараў, выклікае адчуванне навізны, здзіўленне або мае эмацыянальна насычаную форму. Менавіта эмоцыі базавай групы маюць вырашальнае значэнне, паколькі "эмацыянальная памяць у разы больш моцная, чым іншыя разнавіднасці памяці для прыняцця рашэння, значымага ў сітуацыі выбару. Пры ўплыве на

[285] Социальная реклама: учебное пособие / Л.М. Дмитриева [и др.]; под ред. Л.М. Дмитриевой. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2012. – С. 193–197.

эмацыянальную сферу рэклама дзейнічае ў абыход лагічных разважанняў, змест і вынікі ўспрымаюцца менш крытычна”.[286]

8. Прачытайце беларускія народныя прыказкі. На аснове адной з іх складзіце слоган пра культурныя каштоўнасці сучаснай беларускай сям’і.

Ад добрага кораня – добры і адростак.

Ад добрага таты – добрыя парады.

Адзін рукаў – і той аддам для сваіх дзяцей.

Адзін сын – не сын, два сыны – паўсына, а толькі трэці сын – сын.

Адзін сынок Юзік і той – як гарбузік.

Ажаніся – кепска, не жаніся – яшчэ горш.

Багаты Аўдзей – поўна хата дзяцей.

Багацце нявесты на шчасце не пераробіш.

Бацька і маці ад Бога ў хаце, хто іх зневажае, дабра не знае.

Будзе раток, будзе і кусок.

Гадуй, маці, дзеці, будзе шчасце меці.

Гаспадар і жонка – найлепшая суполка.

Да мілай сцежка лёгкая.

Дзе сыноў лава – там бацьку слава, дзе дачок лава – там маці слава.

Дзяцей пагадаваць – не грыбкоў назбіраць.

Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае.

Добра сына мець, але лепей – каб сем і доля ўсем.

З мілым па душы – рай і ў шалашы.

І сава сваё дзіця хваліць.

Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі.

Пчолка адзін вулей знае і толькі з адной сямейкаю дажывае.

Пяць пальцаў на руцэ – і ўсіх шкода.

Самая балючая рана – ад свайго дзіцяці.

Сілаю не будзеш мілаю.

Які дуб, такі клін, які бацька, такі сын.

Якая маці, такое і дзіця.[287]

9. Азнаёмцеся з фестывалем сацыяльнай рэкламы ў абарону жыцця і сям’і “Далонька/ладошка”, ініцыяваны Цэнтрам асветы і сацыяльнага служэння Беларускага Экзархата “Всех скорбящих Радость”, які праводзіцца з 2013 года. Прачытаць пра ўмовы ўдзелу ў фестывалі сацыяльнай рэкламы па абароне жыцця і сям’і можна на сайце.[288] Фестываль скіраваны на ўсталяванне, умацаванне асноўных традыцыйных сямейных каштоўнасцей – любові і адданасці, нявіннасці, прыярытэту бацькі ў сям’і, святасці мацярынства,

[286] Социальная реклама: учебное пособие / Л.М. Дмитриева [и др.]; под ред. Л.М. Дмитриевой. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2012. – С. 195.

[287] Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы /запісаў Фёдар Янкоўскі. – 3-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

[288] Фестываль сацыяльнай рэкламы “Далонька” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ladoshka.by/. – Датад доступу: 02.09.2023.

прызнанне каштоўнасці чалавечага жыцця з моманту яго зараджэння, шматдзетнасці, шанавання і павагі бацькоў, клопату пра дзяцей-сірот.[289]

10. Прааналізуйце праблематыку беларускамоўнай рэкламы “Асалода чытання” – чатыры разнавіднасці білбордаў з выявай чытачоў розных узроставых груп (дзеці, моладзь, людзі старэйшага ўзросту, білборд з сімвалічнай выявай кнігі ў выглядзе торта).

Як вядома, мэтай праекта “Асалода чытання” (ініцыятар – Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь) выступала падтрымка чытання як найважнейшага элемента культуры. Фармуляваліся наступныя задачы: павысіць цікавасць беларусаў да чытання, вярнуць у круг актыўных чытачоў розныя ўзроставыя катэгорыі грамадзян, выхоўваць культуру чытання. Сацыяльная значнасць праекта абумоўліваецца прапагандай чытання як найважнейшага аспекту развіцця беларусаў як інтэлектуальнай нацыі.

Для ацэнкі прывабнасці рэкламы можна скарыстаць наступныя пытанні: *Ці прыцягвае ўвагу гэтая рэклама? Ці падабаецца яна вам? Ці ўспрымаецца рэклама з цікавасцю? Ці падаецца рэклама арыгінальнай, свежай, адрознай ад іншых? Ці задавальняе рэклама з эстэтычных пазіцый? Ці выклікае станоўчыя эмоцыі, сугучныя з узнятай праблемай?*

Агітацыйная сіла як здольнасць рэкламы можа прымусіць адрасата змяніць паводзіны, каштоўнасныя нормы. Лічыцца, што ступень уздзеяння залежыць ад наступных паказчыкаў: суб’екта, значнасці тэмы, эмоцый прадстаўнікоў мэтавай аўдыторыі, адпаведнасці іх інтарэсам, жаданням, матывам, праўдападобнасці рэкламы, яе лагічнасці, аргументаванасці. Для аналізу агітацыйнай сілы рэкламы могуць скарыстоўвацца наступныя пытанні: *Ці адчуваеце вы арыгінальнасць паведамлення, сілу ўражання ад яго? Ці прапануе рэклама новы аспект бачання праблемы і спосабы яе рашэння? Ці змянілася*

[289] Земцова, Е.А. Занятия по воспитанию учащихся на духовно-нравственных ценностях традиционной семьи: метод. рекомендации / Е.А. Земцова, И.Е. Климова. – Минск: ИВЦ Минфина, 2015. – С. 3.

ваша думка, успрыманне праблемы? Ці заслугоўвае інфармацыя рэкламы давер? Наколькі пераканаўчы характар мае рэклама? Ці паўплывае рэклама на вашы далейшыя дзеянні, ваша разуменне ўзнятай праблемы?

11. Даследуйце сучасны вобраз жанчыны ў беларускай рэкламнай сферы. Аналіз можна зрабіць на аснове прадукцыі фірмы "Мілавіца", рэкламаванні парфюмерна-касметычнай прадукцыі, бытавой тэхнікі (напрыклад, кампаній Gefest, Conte, Belita, Ziko). Наколькі ідэалізаваны, эталонны вобраз – прыгажуня, маці, клапатлівая жонка – адпавядае ідэалу "берагіні і дарадчыцы для мужа, ахоўніцы сямейнага ачага, дамашняй утульнасці і цяпла" (І.І. Калачова)? Узгадайце традыцыйныя вобразы жанчыны ў беларускім мастацтве (мадонны Міхаіла Савіцкага, вобраз Маці ў вершах Максіма Танка, рамантычны вобраз Бандароўны, створаны Янкам Купалам, вобраз Паўлінкі, вобраз Ганны Чарнушкі з рамана Івана Мележа "Людзі на балоце" (*цёмныя, як спелыя вішні, вочы, шаўкавіста-чорныя бровы, доўгія смаляністыя косы, гнуткі стан*). Які ідэал беларускай жанчыны вам імпануе – традыцыйны, народны або сучасны, што прэзентуе вобраз моцнай, незалежнай, самадастатковай гераіні? З мэтай змястоўнага адказу на пытанне можна скарыстаць матэрыялы наступных выданняў.[290]

12. Падрыхтуйце сацыяльную рэкламу для папулярызацыі "Тэлеканала сапраўдных каштоўнасцей". [291] Прагледзьце рубрыкі перадачы, прысвечаныя беларускай культуры. Адкажыце на наступныя пытанні:

– Як канал выконвае сваю місію – пазіцыянаванне культуры як сукупнасці матэрыяльных і інтэлектуальных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у сучасным медыяасяроддзі?

– Ці згодныя вы з тым, што "канал – іміджавы, бо праз сваё нацыянальнае і культурнае багацце мы інтэгруемся ў сусветны культуралагічны кантэкст…, таму ўвесь уласны кантэнт тэлеканала павінен ствараццa на беларускай мове"?[292]

– Якія праграмы/перадачы, што прапануе канал, вам спадабаліся?

– Хто з вядучых тэлеканала запомніўся? Чым? (грунтоўнае веданне тэмы, далікатны характар размовы з гасцямі, знешні выгляд, абаяльнасць, уменне знайсці даверлівую інтанацыю, стварыць добразычлівую атмасферу, уменне "разгаварыць" герояў перадачы, наладзіць душэўны, адкрыты дыялог з імі, якасць маўлення, узровень валодання роднай мовы, мяккасць, інтэлігентнасць вядучых)?

– Што вы параіце рэдакцыі канала з мэтай прывабіць маладога гледача?

---

[290] Калачова, І.І. Мужчынскае і жаночае ў традыцыйнай культуры беларусаў / І.І. Калачова. – Мінск: Беларуская навука, 2019. – 166 с.

Солодовникова, Т.В. Рекламная коммуникация Беларуси и Франции / Т.В. Солодовникова. – Минск: БГУ, 2019. – 166 с.

[291] "Тэлеканал сапраўдных каштоўнасцей"/Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.tvr.by/televidenie/belarus-3/. – Дата доступу: 02.09.2023.

[292] Сцяжко, Н. Тэлеканалу "Беларусь 3" – 5 гадоў / Н. Сцяжко // Журналістыка-2017: зборнік матэрыялаў Міжнар. канф. – Мінск: БДУ, 2012. – С. 129–131.

– Прапануйце іміджавы слоган для тэлеканала “Беларусь-3” з улікам задачы, сфармуляванай перад калектывам, – асвятленне дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў галіне культурнага жыцця краіны. Пры выяўленні ідэі ўлічыце этапы працы над слоганам, што прапануюць спецыялісты:

– вызначыць ключавыя словы рэкламнага слогана. Набор ключавых слоў павінен абапірацца на сутнасць сфармуляванай сацыяльнай праблемы;

– акрэсліць задачу рэкламнай акцыі як асноўны матыў слогана. Так, прагназаванне канкрэтных рашэнняў спажыўцоў рэкламы патрабуе найперш ужывання слоў, што суадносяцца з дзеяннем. Для актуальнасці слогана, актыўнасці гледачоў/слухачоў павінны выкарыстоўвацца дзеясловы загаднага ладу;

– выбраць аптымальны аб’ём рэкламнага слогана: колькасць слоў, сімвалаў, характар націску, складоў, што залежаць ад фармату рэкламы;

– адаптаваць слоган да агульнай канцэпцыі рэкламы (адзіная форма падачы матэрыялу, шрыфт, колер, матыў);

– апрабаваць камунікатыўную эфектыўнасць слогана ў найбліжэйшым сацыяльным крузе.[293]

13. Як вядома, у кожнай культуры сфарміравалася сваё паняцце Радзімы. Адзін з найважнейшых накірункаў беларускай сацыяльнай рэкламы – фарміраванне нацыянальна-каштоўнага станоўчага іміджу Беларусі, падтрымка ідэі нацыянальнай ідэнтычнасці і дзяржаўнага суверэнітэта. Прааналізуйце прыклады праектаў, скіраваных на захаванне традыцый краіны, шанаванне заслуг пакалення – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Якой паўстае Беларусь у рэкламных кампаніях “За незалежную Беларусь”, “За самабытную Беларусь”, “Мы – беларусы” і інш.? Стварыце слоган, які перадаваў бы вобраз сучаснай Беларусі з дапамогай наступных выказванняў:

Пранікніцеся любоўю да маёй роднай Беларусі, людзі. Велічная і гордая, яна таго вартая (Уладзімір Караткевіч).

Малюнкі мілай, роднай Беларусі (А. Пальчэўскі).

Я ўпершыню так далёка ад родных мясцін. І ты мне прабачыш, Аміка, калі я раптам заплачу… Гэта – ад радасці, што ёсць на свеце мая пяшчотная, працавітая, мужная Беларусь (Янка Брыль).

Неба чыстае і глыбокае, і бярозавы ціхі гай… Беларусь мая сінявокая, Беларусь мая, родны край (Уладзімір Карызна).

Гордай, баявой і працавітаю, ганарымся мы табою ўсе (Пімен Панчанка).

Ты [Беларусь] песні мае разбудзіла, чую я на сабе цеплыню тваёй матчынай ласкі. Мая родная, добрая, сон мой з дзіцячае казкі (Канстанцыя Буйло).

Мне здаецца, з першым промнем сонечным я цябе пазнаў і палюбіў – гэткай маладой, прыгожай, сённяшняй – у разліве неабдымных ніў (Пімен Панчанка).

Пазнаю цябе [Беларусь] юнаю і старажытнаю, у сузор’ях агнёў і ў паводках бяроз (Генадзь Бураўкін).

---

[293] Социальная реклама: учебное пособие / Л.М. Дмитриева [и др.]; под ред. Л.М. Дмитриевой. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2012. – С. 113.

14. Пазнаёмцеся з фестывалем беларускамоўнай рэкламы, мэтай якога з'яўляецца выпрацоўка нацыянальных прыярытэтаў, пошукі новых формаў камунікацыі, пазіцыянаванне беларускай мовы як камунікатыўнага якаснага інструмента, сцвярджэнне эфектыўнасці нацыянальна арыентаванай рэкламы. На першы фестываль (праходзіў у 2010 годзе) было пададзена 105 работ ад 59 удзельнікаў, у конкурсе маладых рэкламістаў удзельнічала 15 работ. Цікавасць выклікаў экспертны конкурс на найлепшы пераклад сусветных брэндаў беларускай мовы.[294]

Удзельнікі фестывалю сцвердзіліся ў галоўным: нацыянальная беларускамоўная ніша – перспектыўны кірунак рэкламнага рынку: "*Упэўнены, што гэты фестываль здольны змяніць пункт гледжання грамадства ў адносінах да беларускамоўнай рэкламы. Мне гэта вельмі цікава. Здзіўлены, чаму беларускія рэкламісты не разумеюць, што беларуская рэклама вельмі вылучаецца. Якая б яна ні была, яна адразу запамінаецца"* (Пётр Марцаў).

Беларускамоўная рэклама знаходзіцца ў больш выгадным канкурэнтным становішчы ўжо хаця б таму, што яна выбіваецца з агульнага рускамоўнага масіву (Ілля Прохараў).

Фестываль мне падабаецца таму, што ён дапамагае пазбавіцца ад непаразумення: маўляў, беларуская мова не мае шанцу ператварыцца ў сродак рэкламных камунікацый (Аляксандр Стэльмах).

Мяне цяжка назваць абсалютна беларускамоўным, ды і сам рэкламны бізнес – справа досыць касмапалітычная, прафесіяналы рэдка замыкаюцца ў нацыянальных межах. Але я ўпэўнены, што, напрыклад, рэкламная кампанія квасу "Хатні" прагучыць толькі па-беларуску і ні на якай іншай мове. Унікальныя лексіка, семантыка, фанетычныя сродкі мовы ў гэтым і шэрагу іншых выпадкаў проста не маюць альтэрнатывы. Хаця яшчэ некалькі гадоў таму пераканаць у гэтым кліента было нялёгка. Павольная эвалюцыя ў настроі адбываецца ў першую чаргу дзякуючы намаганням энтузіястаў. Тое, што яны робяць, робяць добра. Менавіта высокая якасць беларускамоўнай рэкламы абумовіла рост попыту на яе (Ігар Корзун, праект "Квас "Хатні").

Калі рэкламны прадукт выкананы непрафесійна, мова яго не ратуе. Мабыць, нават узмацняе негатыўны эфект. Наіўна думаць, што толькі прысутнасць беларускай мовы забяспечыць поспех. Калі рэклама якасная, таленавіта зробленая, беларуская мова можа стаць прычынай поспеху, любові. Стаўцеся да выкарыстання роднай мовы адказна, з павагай. Веру ў развіццё беларускамоўнай рэкламы (Вольга Алей).

Пазнаёмцеся з працамі пераможцаў фестывалю беларускамоўнай рэкламы. Ці згодныя вы з рашэннем журы? Якім работам, апроч тых, што атрымалі ўзнагароды, вы прысудзілі б яшчэ ганаровыя месцы з улікам асноўнага крытэрыю: дапамагаць усведамляць і папулярызаваць нацыянальныя каштоўнасці, культурныя, асветніцкія адукацыйныя ініцыятывы высокай якасці, ствараць культурныя трэнды, скіраваныя на развіццё нацыянальнай ідэнтыфікацыі, пашыраць уплыў, ролю беларускай культуры. Як вы ставіцеся

[294] AD.NAK! Першы фестываль беларускамоўнай рэкламы. – Мінск: Медысонт, 2010. – 58 с.

да наступнага меркавання: “Рэклама павінна быць найперш беларускаментальнай, а пасля ўжо – беларускамоўнай”? Што першаснае, на вашу думку, у гэтым выпадку – беларуская ментальнасць або беларускамоўнасць?

15. Прыдумайце ідэю рэкламы праекта “Правілы дарожнага руху”, галоўная задача якога – скарачэнне дарожна-транспартных здарэнняў на дарогах Беларусі. Прадумайце серыю разнапланавых сюжэтаў, аб’яднаных камунікатыўнай ідэяй. Асноўны пасыл рэкламы – слоган/дэвіз сфармулюйце самастойна.

Сітуацыя. Паводле дадзеных, колькасць загінуўшых і пацярпелых па выніках дарожна-транспартных здарэнняў не змяняецца. Прычына гэтаму – элементарнае незахаванне правіл дарожнага руху.

Мэта рэкламы: звярнуць увагу грамадства да праблемы паводзін аўтааматараў і пешаходаў на дарогах; прымусіць кожнага задумацца, да якіх наступстваў можа прывесці безадказнасць, амбіцыйнасць на дарозе.

Мэтавая аўдыторыя: пешаходы і вадзіцелі.

Магчымыя рэакцыі мэтавай аўдыторыі:

– грамадскае асуджэнне тых, хто не захоўвае правілы дарожнага руху (як пешаходаў, так і вадзіцеляў);

– змяненне ўласных адносін да парушэння правіл дарожнага руху;

– пошук рашэнняў названай праблемы.

Рэкамендацыі:

– прыдуманыя ідэі павінны знайсці графічнае ўвасабленне ў рэкламе;

– прапанаваныя ідэі могуць адносіцца як да асобных пунктаў правіл дарожнага руху (напрыклад, перавышэнне хуткасці; асцярожна – дзеці), так і зводу правіл;

– ідэя можа быць пабудавана як на пазітыўных, так і негатыўных эмоцыях.

16. Пазнаёмцеся з рэкламай кніг у інтэрнэт-краме www.aiv.by. Якая рэклама кнігі вам спадабалася? Якую кнігу на беларускай мове вы захацелі набыць? Што паслужыла асновай для вашага выбару?

17. Формай прапаганды беларускага мастацтва сталі святы, якія ўжо даўно з’яўляюцца візітоўкай культуры нашай дзяржавы: “*Славянскі базар у Віцебску”, “Залаты шлягер” (Магілёў), “Званы Сафіі” (Полацк), “Белая Вежа” (Брэст), “Мінская вясна”, “Беларуская музычная восень”, “Лістапад” (Мінск)* і інш. Апроч гэтага, штогод у рэгіёнах Беларусі праводзіцца каля 50 фестываляў і свят. Пазнаёмцеся з імі.[295] Сярод прапанаваных прыгожых урачыстасцей выберыце адно са святаў. Распрацуйце ўласную рэкламу нацыянальна-культурнага зместу для абранага мерапрыемства з мэтай прывабіць шырокую аўдыторыю гледачоў і слухачоў.

Калі вы станеце заможным бізнесменам, спонсарам якога фестывалю вы хацелі б выступіць? Матывуйце свой выбар.

[295] Фестывалі ад А да Я: фестывальны рух Беларусі / Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур; склад. Т.М. Яскевіч, Р.І. Вайцяхоўская. – Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2020. – 388 с.

3.5 Аўтограф як спецыфічны тып тэксту

Аўтограф як памятны надпіс, уласнаручна зроблены аўтарам, толькі ў апошнія гады становіцца прадметам увагі навукоўцаў (Э.М. Берагоўская, Н.Б. Лебедзева, І.У. Яўсеева і інш.). У беларускамоўнай літаратуры цікавасць да гэтага тыпу тэксту разгарнулася дзякуючы нястомным збіральнікам, захавальнікам аўтографаў дзеячаў айчыннай культуры. Часопіс “Роднае слова” змясціў шэраг артыкулаў, прысвечаных аўтографу як унікальнай дакументальнай крыніцы і самастойнаму жанру літаратурнай творчасці (артыкулы Алены Дзенісенкі, Алы Дражынай, Алены Ляшковіч, Таццяны Макаранкі, Сяргея Шапрана і інш.). На сённяшні дзень выдадзены захаваныя зборы аўтографаў, напісаных рукою знакамітых класікаў, – Янкі Купалы, Максіма Багдановіча. Абудзілася разуменне грамадска-культурнага значэння аўтографаў, сабраных ва ўласных калекцыях самаадданых рупліўцаў. Апублікаваны аўтографы з кніжніц Сяргея Панізніка, Соф’і Жыбулеўскай, Уладзіміра Крука. Выданні патрабуюць асэнсавання літаратараў, культуролагаў і лінгвістаў. Вывучэнне, сістэматызацыя гэтага пласта айчыннай культуры мае выхаваўчы і дыдактычны патэнцыял. Аўтографы з’яўляюцца часткай духоўных набыткаў, якія ствараюць вектар засваення агульначалавечых каштоўнасцей, увасобленых у дароўчых тэкстах. Дзякуючы працам, што высвечваюць моўны эстэтычны ідэал чалавека-творцы, адбываецца пераход ад аналізу прыватных фактаў да абагульненых сітуацый, ад індывідуальнага бачання да светапоглядных пазіцый. На змену апісальным характарыстыкам прыходзяць ацэначна-філасофскія разважанні, назіраюцца спробы вызначыцца ў складаных этычных паняццях – сумленне, дабрыня, спагада, міласэрнасць. Паступова афармляецца, вымалёўваецца высокая місія Слова, прыстасаванага да мілагучнасці, да спасціжэння сэнсу, грамадска-культурнага прызначэння, адбываецца разуменне таго, што мова – гэта не гук, не сістэма марфалагічных формаў і сінтаксічных канструкцый, а думка, памяць, індывідуальнасць, мудрасць, спроба ўзвысіцца над бытавым вопытам.

Тэксты-аўтографы маюць пісьмовае ўвасабленне, адпаведна рэалізуюцца асаблівасці жанраў пісьмовага маўлення:

– *неафіцыйнасць выказвання*. Нават пры ўмове, што прэзентацыя кнігі мае характар афіцыйнага мерапрыемства, даверлівы, добразычлівы характар камунікацыі, межы афіцыйнага/неафіцыйнага сціраюцца. У любым выпадку памятны надпіс вызначаецца камунікатыўным намерам аўтара, яго жаданнем падарыць кнігу з аўтографам на добры ўспамін. Факт, што кніга прыносіцца ў дар, вымушае станоўчай ацэначнай лексікі. Неафіцыйныя адносіны падмацоўваюцца шчырасцю прызнання, пачуццямі аўтара:

Мы ўсе ўдзячныя Круку.
Мы хвалім вока і руку.
І гэта праўда, гэта – так:

Ён слынны майстар і мастак.
Але мне шэпча сціплы верш:
“Душа найперш, душа найперш!”
(*Алесь Пісьмянкоў – фотакарэспандэнту Уладзіміру Круку*);[296]

– *падкрэсленая адрасаванасць*, што збліжае тэксты-аўтографы з пісьмом, запіскай, віншаваннем:

Шматпаважанаму Вячаславу Целешу на добры ўспамін – на жаль, не па-беларуску – ад аўтара (*Уладзімір Караткевіч,* 1977); Паважанаму сябру Вячаславу Целешу ад ягонага земляка (*Уладзімір Караткевіч,* 1977); Дарагому Вячку Целешу, каб у спічастай каменнай Рызе не забываў спічастых лясоў далёкай роднай Беларусі (*Уладзімір Караткевіч,* 1981); Князю Вячка ад проста Уладзіміра Караткевіча (1980); Дарагому Вячаславу Целешу – з братняй любоўю і пажаданнем дасягнуць вяршынь на славу сваю і зямлі нашай (*Уладзімір Караткевіч,* 1981);[297]

– *эмацыянальнасць аўтарскага тэксту.* Тэкст выступае як носьбіт эмоцый, перажыванняў аўтара, выразна праяўляецца жаданне дарыцеля стварыць кантэкст нязмушанасці, непасрэднасці, “увайсці” ў псіхалагічную прастору, паўсядзённае быццё адрасанта:

Пакуль яшчэ ты не сагнуўся ў крук,
Пакліч Валодзю з мудрым аб’ектывам.
Ён гляне, шчоўкне – і аддасць у друк
Цябе разумным, маладым, шчаслівым…
(*Генадзь Бураўкін – Уладзіміру Круку*).
Гляджу на гэтую персону,
Адлітую з жалезабетону.
А ўсё ж прызнацца не брыдка,
Што гэта я, Васіль Вітка.
(*Васіль Вітка – Уладзіміру Круку*)
Дождж абмывае брук,
Ці кудаса шуміць – не суняць!
Уладзімір Андрэевіч Крук
Пры любым надвор’і вас зможа зняць
(*Раіса Баравікова – Уладзіміру Круку*).[298]

Праз стандартныя кампаненты аўтографаў выяўляецца жыццёвая гама пачуццяў, якія перажывае дарыцель у сітуацыі дарэння. Так, аўтографы Якубу Коласу, што належаць Максіму Танку і Петрусю Броўку, пазначаны найвялікшай павагай, пашанай, беларускай шчырасцю і цеплынёю да славутага сына беларускай зямлі:

[296] Крук, У. На фотахвалях памяці: фотаальбом / У. Крук. – Мінск: Арт Груп, 2011. – 106 с.
[297] Шапран, С. “Каб у спічастай каменнай Рызе не забываў спічастых лясоў далёкай роднай Беларусі / С. Шапран // Роднае слова. – 2020. – № 10. – С. 24–28.
[298] Шапран, С. Наш Фотапімен. Да 85-годдзя фотамайстра Уладзіміра Крука / С. Шапран // Роднае слова. – 2012. – № 7. – С. 92–94.

Дарагому і любімаму настаўніку Канстанціну Міхайлавічу Коласу.

…Сягоння сонцам даль шляхоў азорана,
Але я заўжды помню голас Твой,
Што над далёкімі Вілейскімі азёрамі
Прыйшоў за хлопцам-пастухом, за мной
(*Максім Танк – Якубу Коласу,* 1952)

Майму хроснаму Бацьку,
Паважанаму і дарагому
Канстанціну Міхайлавічу Коласу.
З павагай – Максім Танк (1943).

Дарагому Канстанціну Міхайлавічу Коласу,
Вялікаму Песняру нашай роднай зямлі і Любімаму настаўніку.
З павагай – Максім Танк (1948).[299]

Дарагому дзядзьку Якубу Коласу У дзень нашае сустрэчы ў Маскве. *Шчыра. Пятрусь Броўка* (1945);

Дарагому дзядзьку Якубу Коласу ад шчырага сэрца і шчырага пажадання: доўга жыць і ніколі не хварэць. *Пятрусь Броўка* (1947);

Дарагому дзядзьку Якубу Коласу, якога вельмі люблю і якому ўсяго найлепшага ў жыцці жадаю. *Пятрусь Броўка* (1955).[300]

Выразнай адзнакай аўтографаў выступае зварот да філасофскіх, універсальных ісцін:

“Кнігі ёсць рэкі… Зычу вам шчодрай восені, моцных антонавак” (*Людка Сільнова – Соф’і Жыбулеўскай*, 2007);

“Кніжніку-падзвіжніку з удзячнасцю за вернасць і любоў да роднага слова” (*Зіновій Прыгодзіч – Соф’і Жыбулеўскай*);

“Мілай спадарыні Соф’і з нізкім паклонам за трапяткое стаўленне да кнігі і з пажаданнем крышталёвай – як крынічная вада – чысціні ў людзях, падзеях, жыцці” (*Алена Масла – Соф’і Жыбулеўскай*);

“Дарагая спадарыня Зосенька! Няхай нябёсы заўсёды спрыяюць Вам! Такіх людзей вельмі і вельмі мала! Вы – незвычайны, рэдкі, светла-сонечны Чалавек, які так умее дбаць пра другіх людзей, разумець іх душу, траціць сябе з зайздроснай адданасцю. Няхай Бог беражэ Вас і Вашых родных” (*Марыя Захарэвіч – Соф’і Жыбулеўскай*).[301]

Як правіла, у аўтографах-подпісах падкрэсліваюцца звесткі, падзеі, успаміны, жыццёвыя факты, з нагоды якіх адбываецца дарунак:

“Алёшу ў Дзень нараджэння ад групы” (БДУ, філфак, 1951) (*Аляксею Пяткевічу – аднагрупнікі*);

“Шчыра віншуем у дзень твайго дваццацічатырохгоддзя (*Аляксею Пяткевічу – сябры-аднакашнікі*, 1955);

---

[299] Макаранка, Т. Максім Танк – Якубу Коласу / Т. Макаранка // Роднае слова. – 2009. – № 12. – С. 87–89.

[300] Макаранка, Т. Пятрусь Броўка – Якубу Коласу. Аўтографы, дарчыя подпісы, прысвячэнні / Т. Макаранка // Роднае слова. – 2011. – № 6. – С. 94–95.

[301] Жыбулеўская, С. Дзякуй табе, Кніга / С. Жыбулеўская. – Мінск: Кнігазбор, 2014. – 164 с.

“Аляксею Міхайлавічу. Шчыра ад сэрца, на ўспамін аб V з’ездзе пісьменнікаў” (*Аляксею Пяткевічу – Мікола Арочка*, 1958);

“Дарагому Аляксею Міхайлавічу ў знак пашаны і ўдзячнасці за дапамогу ў напісанні гэтай кнігі” (*Аляксею Пяткевічу – У.А. Урбановіч*, 1964);

“Аляксею Пяткевічу на добры ўспамін аб сустрэчах у Гродні, *з найлепшымі пажаданнямі Артур Вольскі*” (1966);

“Мілым Пяткевічам – радасны ад сённяшняй сустрэчы ў гэтым гасцінным і сімпатычным доме” (*Адам Мальдзіс, Гародня*, 1973);

“Дарагім Марыі і Аляксею Пяткевічам у знак сардэчнай размовы на гродзенскай зямлі. *З падзякай за гасціннасць Мікалай Арочка*” (1969);

“Дарагому земляку Аляксею Пяткевічу з удзячнасцю, што напомніў мой дэбют у паэзіі. *Казімір Камейша*” (1985);

“Рад быў, Аляксей, яшчэ раз сустрэцца з Вамі, з Вашымі студэнтамі” (*Аляксею Пяткевічу – Анатоль Вярцінскі*, 1969);

“Пяткевічу Аляксею Міхайлавічу на ўспамін аб Навагрудчыне і зеленавокай Свіцязі. *Уладзімір Урбановіч*” (1970);

“Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу на добры ўспамін пра сустрэчу на ўніверсітэцкім вечары. *Удзячны – Міхась Стральцоў*” (1987).[302]

Тэкст-аўтограф частотна ўтрымлівае мэты і ўмовы камунікавання, прозвішча адрасанта/аўтара подпісу:

“Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу на суд аддае аўтар сваю кнігу. *Данута Бічэль-Загнетава*” (1964);

“Алёша, дружа! Буду рады, калі хоць раз усміхнешся і ўспомніш аўтара” (*Аляксею Пяткевічу – Павел Місько*, 1978);

“Дарагому Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу з зычэннем творчых поспехаў. Не даць пуставаць свайму чарназёму! *Аўтар Генадзь Каханоўскі*” (1971);

“Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу з чаканнем строгай крытыкі. *Данута Бічэль-Загнетава*” (1985);

“Паважанаму, шаноўнаму Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу на добрую Памяць з верай у Святло, Праўду, з надзеяй на будучыя сустрэчы. *Аўтар Мікалай Мішчанчук*” (1997).

Тэкст аўтографа можа разгортвацца праз характарыстыку адрасанта, якому прызначаны падарунак:

“Вельмі шаноўнай спадарыні Соф’і Жыбулеўскай, найлепшай чытачцы беларускіх кніг. Ад сціплай аўтаркі – з любоўю. *Валянціна Аксак*” (2008);

“Вельмі шаноўнай, дарагой Соф’і Антонаўне Жыбулеўскай – Вялікай Княгіні ў беларускай кніжнай дзяржаве. *Ад сэрца Ніл Гілевіч*” (2008);

“Паважанай Соф’і Антонаўне з глыбокай павагай да кніжнага міністра. *Міхась Міцкевіч*” (2012);

“Сафіі Антонаўне Жыбулеўскай, нястомнаму прапагандысту роднага слова, вернай дачцэ сваёй Бацькаўшчыны, чулай душы чалавеку. З павагай, дырэктар Музея Якуба Коласа, заслужаны дзеяч культуры Беларусі *Зінаіда Камароўская*” (2014);

[302] Пяткевіч, А.М. Аўтографы – разам / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – 292 с.

“Аляксею Пяткевічу – тонкаму крытыку, таленавітаму літаратуразнаўцу і педагогу-энтузіясту. *Віктар Каваленка*” (1967);

“Знаўцу беларускай літаратуры, чалавеку, які яе любіць, захоўвае, жыве ёю – Аляксею Пяткевічу. Шчыра, з вялікай павагай *Аркадзь Маўзон*” (1973).

Тыповая маўленчая сітуацыя ў аўтографе – характарыстыка кнігі, якая ўручаецца адрасанту, выступае маўклівым апанентам камунікатыўнай трыяды: *дарыцель – аўтограф-тэкст – аўтар*:

“Алёшу Пяткевічу ад Юркі Кавалеўскага, аўтара гэтага імунамарфалагічнага альфабэта” (*Ковалевский Г.В. Очерки иммуноморфологии*, 1996);

“Паважанаму Аляксею Пяткевічу з вялікай радасцю прыношу ў дар свой начны маналог. *Міхась Шаховіч, аўтар кнігі “Святая ноч*” (1980);

“Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу з вялікай удзячнасцю за дапамогу ў маёй – зусім не “жартоўнай” працы. З глыбокай павагай, *Уладзімір Васілевіч, аўтар манаграфіі “Восточнославянская юмористическая песня*” (1980);

“Шчырай патрыётцы беларускай кнігі, вельмі шаноўнай, дарагой Соф’і Жыбулеўскай – мой сатырычна-гратэскавы летапіс эпохі. *З вялікай павагай, Ніл Гілевіч*” (2007);

“Глыбокапаважанай Соф’і Антонаўне. Настолькі вялікі і высокі ў маіх вачах Ваш аўтарытэт, што я вырашыў падарыць Вам гэтую кніжачку з залатой кніжнай паліцы маёй бібліятэкі. З найлепшымі пажаданнямі, *Васіль Вільтоўскі*” (2002).

Сярод прыёмаў, што надаюць аўтографу непаўторнасць, арыгінальнасць, адзначым выразную тэндэнцыю ўключаць у надпіс або пэўным чынам абыгрываць назву кнігі:

“Дарагому А.М. Пяткевічу, у горадзе і ў кватэры якога прызямліўся на гэты вечар аўтар. І шчаслівы гэтым. Уладзімір Караткевіч” (*надпіс на кнізе “Хрыстос прызямліўся ў Гародні*”, 1973);

“Дарагому Аляксею Пяткевічу. Каб твой дух жывіўся духам Максіма. Аўтар Генадзь Каханоўскі” (*надпіс на кнізе “А сэрца ўсё імкне да бацькавага краю… З біяграфіі Максіма Багдановіча*”, 1991);

“Аляксею Міхайлавічу – земляку, вучонаму і літаратуразнаўцу – мой Камень, у якім я намагаўся трошкі рэабілітаваць наш край, селяніна, падкрэсліваючы не ўбоства, а духоўнасць, гаспадарлівасць, а заадно цягу яго лепшых сыноў да светлага… Цёпла – Генрых Далідовіч” (*надпіс на кнізе “Гаспадар-камень*”, 1987);

“Дарагому Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу. Няхай доўга гартаюцца новыя і новыя календары! Дзякую Вам. Уладзімір Васілевіч” (*надпіс на кнізе “Беларускі народны каляндар*”, 2000);

“Шаноўнай Соф’і Антонаўне Жыбулеўскай, якая і без гэтай кніжкі ведае, адкуль наш род. Уладзімір Арлоў” (*надпіс на кнізе “Адкуль наш род*”, 2001);

“Паважанай Соф’і Антонаўне – сапраўднай кніжніцы, чалавеку вядомаму. …Вы – асаблівая Асоба!!! Валянціна Стэльмах” (*надпіс на кнізе “Беларусь у асобах*”, 2003);

“Дарагі Аляксей Міхайлавіч, Вам ужо запозна варажыць. Дык, можа, унукам Вашым спатрэбіцца гэтая кніжачка? Хай жа добра наварожыцца ўсёй нашай зямлі! Уладзімір Васілевіч” (*надпіс на кнізе “Дай Божа, знаць, з кім век векаваць: беларуская народная варажба*”, 1995).

Зазначым, што кампазіцыйная рамка аўтарскіх тэкстаў разнастайная. Яна вагаецца ад стандартызаванага подпісу, ад самай простай схемы ад каго – каму да разгорнутага подпісу, да персаніфікаванай формулы, асвечанай шчырымі прызнаннямі ў інтымна-даверлівай манеры:

Паважанаму Аляксею Пяткевічу. *Ян Чыквін, Беласток* (1977);

Аляксею Міхайлавічу Пяткевічу *з пашанаю Іван Лепешаў* (1976);

Глыбокапаважанаму Аляксею Міхайлавічу ад аўтара. *Валянціна Смыкоўская* (1973);

Дарагі Аляксей Міхайлавіч! Праз доўгія гады нашага знаёмства прызнаюся: Ваша мужнасць і Служэнне беларускай літаратуры не раз натхнялі і мяне ў цяжкія хвіліны жыцця. *З удзячнасцю за гэта – Вольга Іпатава, Гродна* (1987);

Соф’і Антонаўне. У дзень знаёмства з такім чулым і мудрым чалавекам, як Вы, адчуваеш сябе не адзінокім у гэтым свеце. *Вадзім Грудзько* (2004);

Вернай руплівіцы Беларускага слова, шаноўнай Соф’і Антонаўне, ад аўтара. Вы верная ва ўсім – у сяброўстве, сумленні, шчырасці. І за гэта маё сэрца выстуквае Вам эсэмэску: “Хай беражэ Вас сам Бог!” *Уладзімір Ліпскі* (2007).

Заданні на аснове тэкстаў аўтографаў могуць быць рознааспектнымі:

Заданне 1. Адкажыце на пытанні, што суадносяцца не са зместам, а з формай аўтографаў:

– Чаму ў тэкстах аўтографаў выкарыстоўваюцца лексічныя паўторы?

– Чым можна растлумачыць адступленні ад літаратурнай нормы – лексічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя?

– Растлумачце спалучэнне ўзвышанай і прастамоўнай лексікі ў тэстах-аўтографах.

– Растлумачце ўжыванне эпітэтаў – ад стандартных, літаратурных да творчых, індывідуалізаваных – у адносінах да суб’екта дароўнага подпісу.

Заданне 2. Уявіце сябе ў будучым знакамітым пісьменнікам/навукоўцам/спеваком/музыкантам/настаўнікам. З часам у вас выйдзе першая кніга апавяданняў/вершаў/песень/артыкулаў. Вы захочаце падарыць кнігу блізкім людзям, якія заўсёды верылі ў ваш талент, падтрымлівалі, дапамагалі. Прыдумайце аўтограф да свайго выдання з улікам наступных крытэрыяў:

– глыбіня думкі, філасафічнасць;

– арыгінальнасць, нестандартнасць маўленчага афармлення;

– лаканізм, стылістычная адпаведнасць, адсутнасць двухсэнсоўнасці, інфармацыйна нязначных, лішніх слоў;

– эмацыянальнасць, шчырасць вашай удзячнасці.

Заданне 3. Прачытайце размешчаныя ў віртуальнай калекцыі ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка" аўтографы, дароўныя надпісы вядомых людзей – пісьменнікаў, паэтаў, вядомых дзеячаў, якія наведвалі цэнтральную бібліятэку ў розны час https://borlib.by/index.php/be/resurs-2/fondy-i-kalektsyi/kalektsyya-a-tografa-2.

Як тэксты-аўтографы адлюстроўваюць разнастайныя рысы характару чалавека? Якім паўстае дарыцель? Якую інфармацыю ўтрымліваюць аўтографы пра аўтара і дарыцеля, іх найбліжэйшае культурнае асяроддзе?

Заданне 4. Ахарактарызуйце кампазіцыю аўтографаў, іх прасторава-графічную арганізацыю на аснове тэкстаў з кнігазбору сям'і Гарэцкіх. Выкарыстоўвайце матэрыялы артыкула.[303]

Заданне 5. Пазнаёмцеся з кнігай "Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы" (Мінск, 2011). Сфармулюйце мэту падобных выданняў. Чаму апошнім часам абвастраецца цікавасць да падобных рукапісных фрагментаў жыцця вялікіх людзей, імкненне "па кавалачках" збіраць, скаладаць і скрупулёзна разглядаць імгненні іх лёсу? Як вы лічыце, дзе праходзяць этычныя межы ў адносінах да Асобы, якія не павінна перасякаць лінію асобасна-інтымнай прасторы чалавека?

Заданне 6. Пазнаёмцеся з выданнем "Аўтографы Максіма Багдановіча" (Мінск, 2020). Раскажыце пра значнасць зробленага для ўвядзення ў навуковы ўжытак, паўнацэннага выкарыстання крыніц: сістэматызацыя, апісанне, атрыбуцыя (выяўленне назвы, прызначэння, храналогіі, геаграфіі стварэння і бытавання дакумента), што, у першую чаргу, патрабуе вызначэння тэарэтычных асноў даследавання, асэнсавання методыкі работы.

Заданне 7. Пазнаёмцеся з артыкуламі, прысвечанымі тэарэтычным і практычным аспектам аўтографаў, змешчанымі ў часопісе "Роднае слова". На аснове прачытанага разважайце, у якой ступені аўтографы на кнігах набліжаюць нас да асобы аўтара і адрасанта, дазваляюць зразумець узаемаадносіны людзей мінулага часу, раскрыць рысы людзей, далучаных да мовы, культуры свайго краю?

Аўтографы Максіма Багдановіча / Ніна Гарэлік // Роднае слова. – 2011. – № 12. – С. 19–21.

З гісторыі музейнай калекцыі "Аўтографы Янкі Купалы" / Надзея Саевіч // Роднае слова. – 2012. – № 7. – С. 84–85.

Два невядомыя аўтографы Уладзіміра Караткевіча, або Як пісьменнік гасцей запрашаў / Г. Запартыка // Роднае слова. – 2010. – № 11. – С. 103–105.

Каталог "Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы" / Алена Ляшковіч, Ала Дражына // Роднае слова. – 2012. – № 6. – С. 74–75.

Пра што расказалі аўтографы...: да 70-годдзя заснавання Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы / Фаіна Ваданосава // Роднае слова. – 2014. – № 7. – С. 68–70.

[303] Дзенісенка, А.П. Дарчыя надпісы беларускіх літаратараў у кнігазборы Гарэцкіх / А.П. Дзенісенка // Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы: матэрыялы Міжнар. навук канф., Мінск, 22–23 сакавіка 2018 г. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 43–48.

Шаўчэнкаўскія рарытэты і невядомыя аўтографы Янкі Купалы / Мікола Трус // Роднае слова. – 2014. – № 2. – С. 12–14.

Якія функцыі аўтографаў здаюцца вам самымі важнымі ў адносінах паміж аўтарам (дарыцелем) і адрасантам як суб'ектамі камунікацыі: *фатычная* (устанаўленне і падтрымка кантактаў), *канатыўная* (здольнасць аўтографа уздзейнічаць на чытача), *эматыўная* (арыентацыя на выяўленне пачуццяў і эмоцый аўтара подпісу), *паэтычная* (уменне аўтара выказваць свае літаратурныя густы, імкненне суправаджаць напісанае дадатковай эстэтычнай афарбоўкай).

Такім чынам, малафарматны тэкст аўтографа, будучы, здавалася б, аўтаномным па сваім змесце, вылучаецца завершанасцю, цэласнасцю, інфармацыйнасцю, камунікатыўнай арыентаванасцю, уяўляе сабой паўнацэнны твор. Аўтографу як тэксту ўласцівыя наступныя жанрава-стылістычныя асаблівасці:

– глыбіня, абагульненасць думкі, фармуляванне якой выклікана канкрэтнай сітуацыяй – фактам дароўчага надпісу на кнізе;

– сцісласць (аўтограф можа ўтрымліваць 3–5 слоў, нават адно слова);

– творчае, арыгінальнае афармленне думкі з нагоды стандартызаванай сітуацыі – сітуацыі дарэння;

– самаіронія ў адносінах да самога факта ўручэння кнігі як падарунка;

– сэнсавая завершанасць напісанага, нават пры сцісласці тэкст не патрабуе каментарыяў;

– дакладнасць, выразнасць дароўчай ідэі-думкі;

– пераважна мастацкае, вобразнае, метафарычнае афармленне зместу аўтографа;

– выразнае маўленчае афармленне, частотная гульня слоў, абыгрыванне сітуацыі;

– празрыстая пабудова, кампазіцыйная сіметрыя, якая выяўляе, замацоўвае добразычлівы кантакт паміж адрасатам і адрасантам. Пры гэтым кампазіцыя аўтографа можа ўтрымліваць розныя кампаненты. Стандартна абавязковыя толькі дзве пазіцыі – суб'ект і аб'ект дарчага працэсу, якія ўтвараюць сэнсава-лагічнае поле аўтографа, падкрэсліваюць кампазіцыйную сіметрыю тэксту;

– лексічная і сінтаксічная спецыфіка сэнсавага напаўнення аўтографа, што выяўляе творчую індывідуальнасць дарыцеля.

Праз аўтографы адкрываецца магчымасць выявіць культуру зносін, характар адносін з адрасатам, канкрэтызаваць факты творчай і грамадскай дзейнасці, геаграфічны і сацыякультурны фон дарыцеля і аўтара.

З А К Л Ю Ч Э Н Н Е

Такім чынам, змест паняцця *функцыянальная пісьменнасць* змяняўся на розных этапах развіцця грамадства ў залежнасці ад запытаў да сістэмы адукацыі. Да 60–70-х гадоў XX стагоддзя паняцце суадносілася з элементарнай пісьменнасцю – валоданнем навыкамі чытання і пісьма. Паступова пісьменнасць набыла функцыянальны характар, выступаючы ўмовай паўнацэннай жыццядзейнасці ў грамадстве. Ва ўмовах сённяшняга соцыуму праблема ўтрымлівае новыя аспекты актуальнасці. Пісьменнасць разглядаецца як ступень адукаванасці, прафесійнай кампетэнтнасці, кампанент культуры сучаснага чалавека. Падставай для цэласнага, сістэмнага разгляду функцыянальнай пісьменнасці як складанага сацыяльна-педагагічнага феномена паслужылі наступныя фактары: навуковыя набыткі айчынных і замежных даследчыкаў, належны ўзровень дысертацыйных даследаванняў у педагагічнай сферы, прызнанне кампетэнтнаснага падыходу ў якасці вядучага, арыентаванага на новыя адукацыйныя вынікі вучняў. На трансфармацыю паняцця функцыянальнай пісьменнасці – з прыватнага на міждысцыплінарны аспект – аказалі ўплыў змены ў грамадстве, якія не толькі зафіксаваны, але і тэарэтычна асэнсаваны педагогамі, псіхолагамі, сацыёлагамі: глабалізацыйныя працэсы, полікультурнасць і шматпалярнасць пазіцый, дынаміка адукацыйнай парадыгмы, прызнанне пісьменнай асобу, што валодае не толькі ведамі, але і высокімі маральнымі каштоўнасцямі. Несумненным доказам стабільнасці паняцця *функцыянальная пісьменнасць* у навуковай літаратуры з'яўляецца наяўнасць адпаведных слоўнікавых артыкулаў як факта развіцця паняційна-тэрміналагічнага поля педагогікі і зафіксаванасць у сённяшніх лексікаграфічных даведніках і энцыклапедыях. Адпаведна функцыянальная пісьменнасць выступае шматмерным сацыяльна-педагагічным канструктам, які змяняецца разам з грамадствам і прыярытэтамі ў адукацыйнай палітыцы.

У сучасных стандартах патрабаванні да адукацыйных вынікаў сфармуляваны на аснове кампетэнтнаснага падыходу. З гэтай прычыны пры ацэнцы дасягненняў навучэнцаў пад увагу прымаецца не толькі ўзровень прадметных ведаў, але і такія паказчыкі, як сфарміраванасць асобасных якасцей, ключавых кампетэнцый, неабходных чалавеку XXI стагоддзя: уменне крытычна мысліць, здольнасць да камунікацыі, матываванасць да прадаўжэння адукацыі, што сукупна з'яўляюцца складнікамі функцыянальнай пісьменнасці.

Рэалізацыя асобасна-развіццёвага патэнцыялу школьнай адукацыі ў кантэксце супрацоўніцтва, дыялогу немагчыма без міждысцыплінарнага аб'яднання набыткаў тэарэтычнай навукі і прыватных методык выкладання. Інтэграванае паняцце функцыянальнай пісьменнасці варта разглядаць як асноватворны канструкт, здольны сінтэзаваць навуковую тэорыю і практычныя пошукі новых спосабаў перадаваць веды і ключавыя каштоўнасці.

Аналіз айчыннага і замежнага вопыту далучэння школьнікаў да кнігі выяўляе: праблема чытання на сённяшні дзень стала прадметам абмеркавання

не толькі педагогаў, але і набыла грамадскую значнасць, атрымала агульнанацыянальнае і міжнароднае гучанне. У гісторыі культуры чытання маюць месца розныя мадэлі, абумоўленыя асаблівасцямі сацыякультурных умоў, норм, адобраных грамадствам, маральна-каштоўнасных якасцей асобы, практыкай актуалізацыі чытання ў нацыянальных установах адукацыі. Для сучаснай айчыннай школы ўласціва мадэль, у кантэксце якой "навучанне чытанню, абуджэнне цікавасці да кнігі, патрэбнасці ў ёй становіцца адной з галоўных задач адукацыі". [304] Агульнапрызнаным у беларускай педагагічнай супольнасці з'яўляецца разуменне чытання як фактару фарміравання агульнакультурных каштоўнасцей асобы і грамадства. На ўзроўні дзяржаўных стандартаў засведчана, што чытанне непасрэдна ацэньваецца як рэсурс павышэння ўзроўню функцыянальнай пісьменнасці.

З мэтай дзейнаснага ўплыву на чытанне школьнікаў настаўнікам, бібліятэкарам варта актыўна асвойваць беларускамоўную інтэрнэт-прастору (медыятэксты, сайты бібліятэк, навігатары, праекты, конкурсы і г.д.). Каштоўнасць мае каманднае ўзаемадзеянне ўсіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу, педагагічнай грамадскасці ў вырашэнні агульнаграмадскай задачы – развіцця і засваення культуры чытання. Існуе неабходнасць пошукаў канструктыўных рашэнняў, што дазваляюць аб'яднаць намаганні настаўнікаў (не толькі філолагаў), бібліятэкараў, свядомых бацькоў з мэтай павышэння прэстыжу чытання, запатрабаванасці чытацкай дзейнасці, фарміравання навыкаў асэнсаванага, паспяховага чытання.

У XXI стагоддзі немагчыма адмежаваць, адлучыць дзяцей ад масмедыйнай культуры і віртуальнага асяроддзя, аднак можна і трэба імкнуцца рабіць рэальны свет іх існавання і па-за інтэрнэт-прасторай цікавым і значным. Для гэтага менавіта мы, педагогі, павінны дэманстраваць і навучыць адносіцца да чытання як да каштоўнасці – агульначалавечай, дзяржаўнай, уласнай, – разглядаць паўнацэнную чытацкую дзейнасць у культурным рэчышчы, бачыць у ёй не толькі дзелавы інструмент для дасягнення пазнавальных задач. Трэба вучыць чытаць асэнсавана, выяўляць духоўную сілу мастацкага і навуковага слова, дапамагаць спасцігнуць глыбіню класічных тэкстаў.

Як сведчаць назіранні, большасць вучняў маюць цяжкасці яшчэ падчас чытання ў пачатковай школе. Пасля пераходу ў сярэдняе звяно сітуацыя абвастраецца па меры ўскладнення вучэбных тэкстаў школьных падручнікаў. Праблема паглыбляецца тым, што сучасны навучэнец – актыўны карыстальнік сацыяльных сетак, засваенне тэкстаў якіх не выклікае складанасці: гэтыя тэксты пазбаўлены філасофскіх разважанняў, навуковай тэрміналогіі, мудрагелістых вывадаў, паралеляў. У іх, як правіла, адсутнічаюць вобразна-выяўленчыя сродкі, устойлівыя выразы, абцяжараныя сінтаксічныя канструкцыі. У такім кантэксце напрошваецца гатовы павярхоўны вывад: інтэрнэт-тэксты цікавыя, нескладаныя, зразумелыя, вучэбныя тэксты на іх фоне – незразумелыя, складаныя, нецікавыя. Выхад бачыцца ў разумнай

[304] Яленскі, М.Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе: манаграфія / М.Г. Яленскі. – Мінск: НІА, 2012. – С. 38.

гарманізацыі двух асяроддзяў – рэальнага і віртуальнага. Гаворка ідзе не пра спрашчэнства вучэбных тэкстаў, а пра наданне ім прыцягальнага, звыклага для інтэрнэт-прасторы фармату. І, безумоўна, пашырэнне – у параўнанні з масавымі інтэрнэт-тэкстамі – зместавага, стылістычнага і маўленчага дыяпазону вербальнай і невербальнай інфармацыі.

Уплыў працэсаў глабалізацыі, інфарматызацыі адукацыі выклікаў да жыцця новы фармат сродкаў навучання – тэкстаў новай прыроды. Трэба прызнаць, што сціслы аб'ём і высокая інфарматыўнасць, інтэлектуальны і эмацыянальны характар выказванняў, здольнасць абслугоўваць самыя розныя камунікатыўныя сферы, выкарыстанне разнастайных функцыянальна-стылістычных сродкаў робяць малафарматныя тэксты ўніверсальнымі, забяспечваюць ім перспектывы ўжывання ў працэсе вучэбнай камунікацыі.

На сённяшні дзень актыўна дыскутуюцца ўплыў інфармацыйных тэхналогій у адукацыйным працэсе і звязаныя з гэтым змены ў пазнавальных патрэбнасцях сучасных выпускнікоў і асаблівасцях стылю навучання лічбавага пакалення. Педагагічная грамадскасць зацікаўлена абмяркоўвае перспектывы лічбавай адукацыі, якія могуць развівацца ў дзвюх плоскасцях: або "лічба" паслужыць асновай кардынальных змен сучаснай школы, або лічбавыя тэхналогіі стануць толькі дадаткам да традыцыйных рэсурсаў, напрацаваных стагоддзямі класічнай школай. Варта задзейнічаць у арганізацыі адукацыйнага працэсу сродкі, адпаведныя пазнавальным запытам сучасных навучэнцаў.

Адносна прагнозаў развіцця заўтрашняга дня адукацыі варта пагадзіцца з акадэмікам Р.Б. Карнетавым: перспектывы сістэмы адукацыі залежаць ад інтэлектуальнага развіцця соцыуму, ад таго, як члены грамадства "будуць працаваць і ўзаемадзейнічаць, якой будзе адукацыя, да якога жыцця яна будзе рыхтаваць асобу, якія ідэалы будуць рэалізоўвацца ў педагагічнай практыцы, да якой мадэлі сацыяльнага жыцця школа будзе імкнуцца".[305]

Праца педагога з аўдыторыяй новай фармацыі – рэальнасць сённяшняга, а не заўтрашняга дня. Гэта вымушае да пошукаў тэхналогій, якія забяспечвалі б узровень, што дазваляе існаваць камфортна ў сучасным грамадстве, дзе сама інфармацыя, веды расцэньваюцца як стратэгічны рэсурс. Практыка выкладання вучэбных прадметаў дастаткова аператыўна рэагуе на інавацыі ў сферы выкарыстання тэкстаў рознай функцыянальнай скіраванасці (у тым ліку і малафарматных адзінак), што ўлічваюць кантэкстнасць, інтэрактыўнасць, шматфарматнасць пры распрацоўцы практычных заданняў (у тым ліку на аснове лічбавага кантэнту) і варыянтаў іх рашэння. Традыцыйная вербальная прастора трансфармуецца за кошт несуцэльных, візуальных, сімвальных тэкстаў, аўдыятэкстаў, інфармацыйных рэсурсаў Інтэрнэту, выбару стратэгій і прыёмаў чытання. Гэта выклікае патрэбнасць засвойваць новыя фарматы паўсядзённасці, з якімі сустракаецца навучэнец у жыцці, – тэксты рэкламы, інструкцый, аб'явы, інтэрв'ю, сродкі камунікацыі праз месенджары і г.д.

[305] Корнетов, Г.Б. Вступительная статья / Г.Б. Корнетов // Дьюи, Д. От ребенка – к миру, от мира – к ребенку. – М.: Карапуз, 2009. – С. 5.

Навуковае выданне

ВАСЮКОВІЧ Людміла Сяргееўна

ПРАЦА З ТЭКСТАМ ЯК АСНОВА ФАРМІРАВАННЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ ВУЧНЯЎ

Манаграфія

Падпісана ў друк 26.01.2024. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 10,29. Ул.-выд. арк. 10,57. Тыраж 50 экз. Заказ 1.

Паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.